Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны
музей-запаведнік

КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

# Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі

*да 80-годдзя*
*Полацкага краязнаўчага музея*

(22–23 лістапада 2006 г.)



Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны
музей-запаведнік

КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

# Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі

*да 80-годдзя
Полацкага краязнаўчага музея*

(22–23 лістапада 2006 г.)



Полацк 2008

**ББК 63.3(4Беі)**
**М35**

Укладальнік: **В.Д. Краско,**
загадчык Краязнаўчага музея,
філіяла Нацыянальнага Полацкага
гісторыка-культурнага музея-запаведніка

*На першай старонцы вокладкі фотаздымак Полацкага краязнаўчага музея з фотаальбома: «Полацк». —Мн.: Беларусь, 1973.*

**М35** **Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі**: (да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея) / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — 232 с.: іл.

Зборнік змяшчае матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Полацкага краязнаўчага музея, якая адбылася ў лістападзе 2006 г. у Краязнаўчым музеі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**ББК 63.3(4Беі)+79.1(4Беі)**

Асаблівасці мовы і арфаграфіі аўтараў захаваны.

©Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 2008
© Калектыў аўтараў, 2006

# Змест

**Падсумаванне** .......... 5

**Аўласенка А.С.** Аб гербе «Палата», набытым пад Полацкам у 1579 годзе .......... 7

**Баўтовіч М.М.** Гэральдычная гісторыя Полацку .......... 15

**Воднева І.П.** Перыядычны друк на Полаччыне ў першай палове XX ст. (1917–1936) .......... 33

**Галубовіч В.У.** Шляхта польскага паходжання ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI–XVII стст. .......... 47

**Дзянісаў А.У.** Полаччына на старонках краязнаўчага часопіса «Наш Край» у 1920-я гг. .......... 57

**Захарова Е.Л.** История образования и развития Полоцкой сельскохозяйственной школы (1951–1956 гг.) .......... 67

**Кавалёва Я.В.** Рунічныя сімвалы ў геаметрычным арнаменце ручнікоў Паазер'я .......... 85

**Козел А.В.** Гісторыя аптэкарскай справы на Полаччыне .......... 95

**Копыл С.П.** Малоизвестные страницы боевой биографии 20 гвардейской стрелковой дивизии (174 стрелковой дивизии 1-ого формирования) .......... 105

**Краско В.Д.** Праблемы паказу і інтэрпрэтацыі савецкай гісторыі ў экспазіцыі Краязнаўчага музея .......... 117

**Лисов А.Г.** История Витебской школы художников в искусствоведческой науке и краеведении .......... 125

**Лобач У.А.** Сімволіка храма ў традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння .......... 133

**Недокунева И.В.** Экспериментальный курс «Полоцковедение» как составная часть гражданско-патриотического воспитания .......... 149

**Півавар М.В.** Вывучэнне гісторыі і культуры Полаччыны XVI — пачатку XX стст.: даследчыкі і іх працы (даследчыкі Полаччыны XVI — пачатку XX ст. і іх працы як краязнаўчыя помнікі) .......... **157**

**Поляков С.И.**17-я и 50-я стрелковые дивизии накануне и в начальный период Великой Отечественной войны .................... **177**

**Сяргеенка Н.А.** Мошчы святога Андрэя Баболі ў Полацку ............ **189**

**Усціновіч Ю.Ф.** Праблемы і перспектывы выкарыстання некаторых турыстычных рэсурсаў Полаччыны ў экскурсійна-турыстычнай дзейнасці ................................................ **199**

**Філіпенка У.С.** Традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб прафілактыцы дзіцячых хвароб у дародавы перыяд ................. **211**

**Шарыпкін Р.Л.** Школьны краязнаўчы музей «Мінулае Залесчыны»: дзейнасць, грамадскія сувязі і выхаваўчае ўздзеянне .................. **223**

## Падсумаванне

22–23 лістапада 2006 г. у г. Полацку адбылася гісторыка-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю Полацкага краязнаўчага музея. На канферэнцыю былі запрошаны і выступілі з дакладамі вядомыя краязнаўцы сённяшняй Віцебшчыны, спецыялісты ў галіне гісторыі, мастацтвазнаўства, навукоўцы, супрацоўнікі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, а таксама настаўнікі школ. Тэматыка канферэнцыі ахоплівала разнастайны спектр пытанняў гісторыі і культуры Полаччыны і Беларусі. Удзельнікі канферэнцыі адзначылі заканамернасць правядзення канферэнцыі адзін раз у пяць гадоў. У выступленнях былі прадстаўлены вынікі краязнаўчых пошукаў і дасягненняў, што былі напрацаваны за час, які прайшоў ад папярэдняй канферэнцыі. Навуковыя даклады паказалі карыснасць правядзення канферэнцый з удзелам зацікаўленых спецыялістаў у галіне гісторыі і кразнаўства, што дае магчымасць развіваць музейную справу, выяўляць і спрыяць ахове помнікаў гісторыі і культуры, ініцыіраваць краязнаўчае жыццё і выхаванне моладзі на грунце вывучэння гістарычнай спадчыны.

Удзельнікі канферэнцыі адзначылі плённую працу Полацкага краязнаўчага музея ў культурным жыцці горада, у адраджэнні нацыянальнай культуры, у збіранні музейных калекцый, унікальных экспанатаў і стварэнні новых экспазіцый.

# Аб гербе «Палата», набытым пад Полацкам у 1579 годзе

**Аўласенка Алена Станіславаўна**,
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я*
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

Прадметам даследавання з'яўляецца выява герба «Палата», змешчаная ў кнізе вядомага польскага гісторыка, пісьменніка, гісторыёграфа Барташа Папроцкага (1543–1614) «Herby rycerstwa Polskiego», выдадзеная ў Кракаве ў 1584 годзе, а пазней перавыдадзеная ў 1858 годзе ( рэпрынтнае выданне).[**16**] Таксама ў кнізе змешчаны тэкст граматы аб наданні герба, падпісанай каралём і канцлерам Янам Замойскім 1 студзеня 1580 года.[**15**]

Дапаможнымі крыніцамі ў вывучэнні дадзенага пытання з'яўляюцца польскія гербоўнікі, выдадзеныя ў XIX стагоддзі.[**12**; **14**]

Назва «Палата» ўказвае на малую рэчку, што ўпадае ў Дзвіну і дае назву гораду Полацку, а дакладней, гісторыя ўзнікнення герба звязана з падзеямі, якія адбыліся на гэтай рацэ ў жніўні 1579 года.

1579 год — год узяцця горада Полацка войскамі Стафана Баторыя падчас Лівонскай (Інфлянцкай ) вайны.

Абапіраючыся на высновы гісторыкаў у галіне даследаванняў Лівонскай вайны, неабходна коратка прыгадаць ход вайны, каб вызначыць месца і важнасць падзеі.

Мэтай барацьбы за Інфлянты ў ІІ палове XVI стагоддзя была барацьба за здабыццё балтыйскага ўзбярэжжа і панаванне на ім, за выгодны доступ да мора і свабодны гандаль.

Яшчэ на пачатку XVI ст. у Маскоўскай дзяржаве, дзе правіў Іван ІІІ, нарадзілася канцэпцыя пашырэння тэрыторыі дзяржавы. Што прывяло да памежных войнаў з Літвой на пачатку XVI стагоддзя. З ІІ паловы XVI стагоддзя пунктам інтарэсаў Расіі сталі Інфлянты. Іван IV Жахлівы хацеў запэўніць доступ Расіі да Балтыкі, важны з поглядаў гаспадарчых і палітычных.

Вайна за Інфлянты праходзіла ў два этапы. Першы этап адбыўся з 1563 па 1570 год, у выніку якога Расія здабыла большасць тэрыторыі Інфлянтаў з Рыгай і Парнавай, частку тэрыторый ВКЛ.

З 1575 па 1577 год Іван IV Жахлівы, карыстаючыся безкаралеўем і элекцыйнымі спрэчкамі ў Рэчы Паспалітай, здабыў большасць тэрыторыі паўднёвых Інфлянтаў аж па Дзвіне, акрамя Рыгі і Рэвеля.

У 1575 годзе каралём Рэчы Паспалітай стаў Стафан Баторый, які распачаў падрыхтоўку да новага этапа вайны, што працягваўся з 1577 па 1582 год. Войскі Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам Стафана Баторыя распачалі супрацьдзеянне, затрымалі паход рускай арміі, вярнулі Дынабург і большасць усходніх Інфлянтаў. У 1579 годзе здабыты Полацк, заатакаваныя Смаленшчына, Чарнігаўшчына. У 1580 годзе здабыты Вялікія Лукі. У 1582 годзе ў Яме Запольскім падпісана пагадненне, у выніку якога Расія вярнула Рэчы Паспалітай полацкую зямлю і інфлянцкія тэрыторыі.

Рыхтуючыся да вайны, Стафан Баторый пастанавіў змадэфікаваць тагачасную стратэгію правядзення вайны кароннымі і літоўскімі войскамі, якая заключалася ў імкненні да рашаючага сутыкнення ў полі і разбіцця галоўных сіл. Гэта давала толькі палову выніку, знішчала войска праціўніка, але крэпасць заставалася ў яго руках. Так было перш за ўсё ў войнах з Масквой у XVI стагоддзі. Кароль пастанавіў ударыць па фартэцыі, якая знаходзілася ў маскоўскім валоданні, але не адмаўляўся ад рашаючай бітвы з войскам цара. Адпаведным чынам было падрыхтавана войска: павялічана колькасць пяхоты, армія ўзброена артылерыяй, арганізаваны сапёрскія і інжэнерныя аддзелы, вялікая ўвага надавалася картаграфіі і інфармацыі. Вайна з Масквой зводзілася ў асноўным да трох паходаў, у выніку якіх было здабыта две крэпасці. Не дашло да рашаючай бітвы паміж галоўнымі сіламі.

У 1577 годзе пачалося контрнаступленне. Яно разлічвалася на правядзенне «малой вайны»: невялікія аддзелы ўвайшлі на тэрыторыі, занятыя Масквой, і стараліся блакіраваць, а таксама здабыць гарады і замкі. Гэта дало пэўныя вынікі. Такім чынам, была адбіта крэпасць Дынабург, быў здабыты важны стратэгічны пункт Вендэн. Стафану Баторыю было важным, каб граніца маскоўскага ўплыву не замацавалася па Дзвіне, каб вайна працягвалася , а асноўны ўдар планаваў у іншым месцы.

Вельмі важным для поспеху паходу было акрэсліць кірунак наступлення арміі. Мэтай вайны было адбіць Інфлянты у цара, і гэты кірунак здаваўся найболей відавочным. Але Стафан Баторый вырашыў

інакш — ударыць па тылах Інфлянтаў, па маскоўскіх землях і землях ВКЛ, што былі захоплены Масквой. Такім чынам, Стафан Баторый скарыстаў новую стратэгічную канцэпцыю: замест таго, каб захопліваць і ваяваць непасрэдна за прадмет спрэчкі, польска-літоўскія войскі ўдарылі па вялікарускіх землях, памежных з Інфлянтамі, паступова адразаючы іх ад Расіі.

У акружэнні караля разглядалася мажлівасць удару па Пскову. У выніку было пастаноўлена пачаць кампанію з узяцця Полацка, страчанага ў 1563 годзе. Гейдэнштэйн у сваіх «Записках…» апісвае гэта так: «...главнѣйшею задачею войны онъ (король) поставилъ — освобожденіе Ливоніи отъ непріятеля, и понималъ, что если перенести военныя дѣйствія на Ливонскую территорію, то въ странѣ, обладающей частыми городами и крѣпостями, впродолженіи стольких лѣт раззоряемой, при недостаткѣ припасовъ и при необходимости многократно прибѣгать къ осадамъ, военныя дѣйствія были бы медленны и трудны при томъ не только бы передалъ страну, ради освобожденія; которой предпринялъ войну, снова въ жертву опустошеніямъ непріятеля и своихъ, но и Литву, лишенную защиты, открылъ бы въ тоже время для непріятельскихъ нападеній, направивъ всѣ военныя средства въ другія мѣста. Если же насправиться на Псковъ по другой дорогѣ, чрезъ непріятельскую землю, то онъ считалъ противнымъ правиламъ военнаго искусства, оставивъ въ тылу столько вражескихъ гарнизоновъ, черезъ край непріятельскій и трудно проходимый углубляться такъ далеко въ страну противника; въ случаѣ какой-либо неудачи, не было бы оттуда ни удобнаго отступленія, ни возможности вызвать подкрѣпленія изъ сосѣднихъ пунктовъ. Онъ видѣлъ, что избѣгнетъ того и другаго взятием Полоцка, так какъ этотъ городъ, расположенный у рѣки Двины, открывает легкій доступъ въ Ливонию и въ Литву; продолжая затемъ постепенно движеніе впередъ, онъ могъ бы внести потомъ войну въ самое Московское государство, и потомъ какъ-бы обойдя Ливонию и преградивъ къ ней доступ непріятелю, онъ могъ бы овладѣть ею вполнѣ, не удаляясь далеко отъ Литвы; притомъ обѣимъ, и Литвѣ и Ливоніи, онъ могъ бы подать руку помощи въ случае непріятельских нападеній. Къ этому присоединялось и то обстоятельство, что король кромѣ возвращенія Ливоніи очень много думалъ о томъ, чтобы доставить Литовцамъ и Ливонцамъ судоходство по рѣкѣ Двинѣ, которою

одной только держиться Рижская гавань; плаваніе по ней много содѣйствовало бы охраненію Ливоніи и недопущенію къ ней непріятеля, а вмѣстѣ доставило бы большія удобства для торговли, промышленности. Король виделъ, что завоеваніемъ Полоцка будетъ сдѣлано много для таковой цѣли, ибо гарнизонъ Полоцка господствуеть на значительное протяженіе надъ теченіемъ Двины; изъ этого города посылаются вспомогательныя войска и провіантъ въ Кокенгаузенъ и въ другія крѣпости Ливоніи, отсюда производятся набѣги, вслѣдствие которыхъ останавливается торговля Риги и Вильны. ... Другіе говорили, что осада Полоцка дѣло слишкомъ трудное, чтобы предпринимать его при самомъ началѣ военныхъ дѣйствий: Полоцкъ – городъ сильно укрѣпленный самою природою, а также и искусствомъ, и въ виду своего пограничнаго положенія, весьма тщательно снабженный припасами, пушками, порохомъ и всѣми снарядами, такъ какъ непріятель не могъ сомневаться, что (въ случаѣ нашествія) ему придется выдержать первое нападеніе.» [**3**, с. 45]

Такім чынам, мы бачым, якое стратэгічна важнае значэнне мела ўзяцце Полацка на пачатку другога этапу Лівонскай вайны.

Тое, як браўся горад, у гістарычнай літаратуры асветлена вельмі добра. Хачу толькі адзначыць, што гэта было нялёгкай справай, аблога Полацка пачалася 11 жніўня, а скончылася 30 жніўня.[**5**, с. 19] Добрая абарона і дрэнныя пагодныя ўмовы не давалі магчымасці завалодаць крэпасцю. Пераломны момант наступіў 22 жніўня.[**15**] Тым часам скончыліся дажджы. Шматлікія смельчакі, заахвочаныя Баторыем, кінуліся цераз Палату падпальваць падсохлыя сцены. Сярод гэтых смельчакоў вызначыўся адзін — Валянцін Вансовіч, сын слаўнага грамадзяніна з Львова Якуба Вонса.[**15**]

Грамата, змешчаная ў «Herbach...» Папроцкага, паведамляе, што вышэй згаданы Валянцін Вансовіч, калі былі атрыманы смаляныя лучыны з серай для падпалу, схаваўшы кацёл з гарачым вуголлем, рызыкуючы сваім жыццём, падышоў пад самыя сцены крэпасці. Нягледзячы на жудасныя ўдары гармат, стрэлы і град куляў, нягледзячы на тое, што многія смельчакі ўжо развіталіся з жыццём, нягледзячы на тое, што сам Вансовіч атрымаў раненне ў жывот, ён першы за ўсіх падпаліў вежу. Адкуль агонь хутка разышоўся, загарэліся сцены і сама крэпасць, якая паз-

ней капітулявала. У выніку гэтай вылазкі ў Валянціна Вансовіча была двойчы прабіта рука, прабіты стралой палец, але, нягледзячы на гэта, ён вярнуўся да сваіх.

Гэты подзвіг і быў адзначаны каралём. За свой подзвіг Валянцін Вансовіч атрымаў шляхецкую годнасць, якую мог перадаваць у спадчыну, а таксама прозвішча Палатынскі (ад ракі Палата, праз якую ён перабраўся, і крэпасці, якую ён падпаліў). Замест радавога дрэва быў пажалаваны гербам «Палата», як паведамляе грамата, на фоне чырвонага поля выява прабітай стралой рукі, якая трымае паходню, затым над ёй — двухвяршынная вежа (вежа, якую ён падпаліў), як узор мужнасці яго самога, не атрыманы ў спадчыну, а заслужаны крывёй і доблесцю.

Памеры выявы герба, які падае Папроцкі — 3,0 х 7,5 см. Выява чорна-белая, графічная. Герб «Палата» мае ўсе неабходныя, згодна з геральдычнай навукай, рэгаліі:

– спрошчаная форма шчыта, характэрная для XVI стагоддзя, з кантам;

– чырвонае поле (як згадваюць нам крыніцы); чырвоны колер на гербе — сімвал мужнасці, храбрасці, смеласці, адвагі, бястрашша; але на графічнай выяве не пададзены вертыкальнымі лініямі, як гэта прынята ў геральдыцы;

– эмблема, выява на шчыце: рука развернутая ў левы бок, недалёка ад косткі прабітая знізу стралой, трымае падпаленую паходню; з'яўляецца таксама сімвалам мужнасці, згадвае нам аб подзвігу, здзейсненым Валянцінам Вансовічам;

– шляхецкая карона;

– кляйнод: вежа з харугвамі (але тут існуюць недакладнасці);

«...wieża o dwóch wierzchach? Cztery okna podle siebie w niej, z których dwóch, tak z tej strony, jako i 2 drugiej, chorągwie wywieszone...» — так апісвае кляйнод Каспар Нясецкі ў сваім гербоўніку.[**14**]

«Herbiarz Polski» 1855 года, выдадзены ў Львове, дае наступнае апісанне: «...na hełmie nad koroną zaś wieża o dwóch dachach i czterech oknach, z których dwóch wystaje chorągiewki».[**12**]

Іншае апісанне падае «Ecyklopedya powszechna», выдадзеная ў Варшаве ў 1865 годзе: «nad hełmem i koroną dwie wieże połączone z sobą, każda o jednej bramie i czterech oknach, dwa niżej, dwa wyżej. Z górnych powiewa z jednej i drugiej chorągiew rozwinięta na długiem drzewcu».[**17**]

Паведаміць, чаму так, а не інакш выглядае вежа, даволі складана. Магчыма, гэта ўмоўная выява вежы, графічны сімвал, а магчыма, яна паўтарае выгляд сапраўднай рэальнай пабудовы. Загадкавым застаецца выгляд сапраўднай вежы і яе размяшчэнне. Тагачасныя дакументы малюнак С. Пахалавіцкага «Узяцце Полацка Стафанам Баторыем у 1579 годзе» і «Записки о Московской войне» Р. Гейдэнштэйна таксама не могуць праліць святло на гэтае пытанне. На малюнку С. Пахалавіцкага на паўночна-заходнім краі Верхняга замка (там, дзе менавіта ішоў галоўны штурм) бачны дзве размешчаныя побач вежы з выступаючым у выглядзе вострага мыса прасла сцяны паміж імі. Вежы на малюнку і іх размяшчэнне ў адносінах да праслаў сцен характэрна для размяшчэння вуглавых вежаў.[**8**, с. 102] У той жа час Р. Гейдэнштэйн, апісваючы гэтыя ўмацаванні, згадвае толькі вежу, якая і была спалена.

Адзінае, што можна паведаміць аб вежы, змешчанай на гербе, гэта тое, што згодна з нанесенай штрыхоўкай, яе часткі маюць круглую форму, што дае падставы бачыць не адну, а дзве вежы.

У дадатак хочацца падкрэсліць, што, акрамя вышэй згаданых адзнак, Валянцін Вансовіч атрымаў ад сейма ў 1581 годзе 20 ланаў (лан = 22 – 25 га) з каралеўскіх угоддзяў у Пшэмысльскай зямлі.[**14**] А таксама праз год ваяваў у чыне ротмістра, з такой жа мужнасцю, пад Вялікімі Лукамі. На той час меў гадавалага сына Стафана з Рэгінай Абсалёмавай.[**15**]

**Літаратура**

**1.** Арлоў У. Полацкая вайна /У.А. Арлоў // Таямніцы полоцкай гісторыі. — Мн., 1994.

**2.** Вяроўкін-Шэлюта. У.М. Герб.// Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.5: Гальцы – Дагон/ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 1997. — С. 171–172.

**3.** Гейденштейн Р. Записки о Московской войне. — СПб., 1889. — 336 с.

**4.** Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи. — М.: Планета, 1980.

**5.** Літвін В. Штурм Полацка.// Беларуская мінуўшчына. —1996. — № 1. — С. 17–19.

**6.** Сагановіч Г. Інфлянцкая вайна 1558-82 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.3 Гімназіі — Кадэнцыя / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў / галоўны рэд., і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. —Мн.: БелЭн, 1996. — С. 449–501.

**7.** Слейтер С. Геральдика. Иллюстрированная энциклопедия / Пер. И.Жилинский. — М.: Изд-во Эксмо, 2005. — 264 с., ил.

**8.** Тарасаў С.В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. — Мн.: Беларуская навука, 1998. — 183 с.: іл.

**9.** Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі. — Мн.: Полымя, 1989. — 207 с.: іл.

**10.** Шпунт А. З гісторыі гарадской геральдыкі Беларусі.// Беларускі гістарычны часопіс. — 2003. — №6. — с. 39-46.

**11.** Chaj M., Sokoł W., Wrona I. Historia. — Warszawa: Oficyna wydawnicza Branta, 2005.

**12.** Herbiarz Polski. Iminospis zasłużonych w Polsce ludzi wszystkich stanów i czasów. — Lwyw, 1855.

**13.** Markiewicz M. Historia Polski. 1492-1795. — Kraków: Wydawnictwo literackie, 2004.

14. Niesiecki Kaspar S.I. Herbiarz Polski. — Lipsk, 1841.

15. Paprocki Bartosz. Herby rycerstwa Polskiego. — Kraków, 1858.

16. Polski Słownik Biograficzny. Tom XXV, 1980.

17. Encyklopedya powszechna. T. 21. — Warszawa, 1865.

# Гэральдычная гісторыя Полацку

**Баўтовіч Міхась Мікалаевіч,**
*краязнаўца, г. Полацк*

Тыповы шлях набыцьця шараговым эўрапейскім горадам уласнага гербу шчыльна павязаны з разьвіцьцём мясцовага самакіраваньня. Гарадок, закладзены на зямлі, што належала нейкаму фэадалу, узрастаючы, паступова пачынаў выламвацца з агульнага фэода. Фэадал, спрабуючы трымаць сітуацыю пад кантролем, вырашаў даць паселішчу пэўныя правы, а разам зь імі свой уласны герб дзеля запэўненьня розных юрыдычных дакумэнтаў. Зь цягам часу горад вырастаў і з гэтае вопраткі ды, умацаваўшыся эканамічна, заяўляў пра свае інтарэсы і правы больш цьвёрда. У выніку чарады разmaітых канфліктаў фэадал быў змушаны дзеля агульнага спакою і ўласных прыбыткаў пагадзіцца на шырэйшую самастойнасьць горада. Менавіта адгэтуль, з атрыманьня прывілея на ўласнае гарадзкое права і ўласны герб, бярэ пачатак гэральдычная гісторыя ўжо вольнага гораду.

Гандлёвыя і культурныя кантакты Полацка з гарадамі Паўночнае й Заходняе Эўропы бяруць пачатак яшчэ ў княскі пэрыяд. Ад пачатку XIII ст. пасярэднікам у гэтай справе пачынае выступаць закладзеная ў 1201 г. ля ўтоку Дзьвіны Рыга. Свой першы статут Рыга атрымала ў 1225 г. ад готляндзкага горада Візбу, які ў той час быў цэнтрам гандлю на Балтыцы і ў Паўночна-Ўсходняй Эўропе. У 1280 г. Візбу заключае дамову з эканамічным тандэмам Любэк-Гамбург. Гэтае гістарычнае пагадненьне закладае падваліны Ганзэйскае Лігі. Рыга ў 1282 г. далучаецца да згаданае дамовы і пачынае кіравацца новым юрыдычным кодэксам, то бок Гамбурскім правам. Полацак, вядучы актыўны гандаль з Рыгай і Готляндам, мусіў засвоіць нормы існуючай там праўнай сыстэмы. Але да ўвядзеньня ў 1393 г. у Полацку інстытуту вялікакняскіх намесьнікаў гандлёвыя дамовы ад імя Полацка і ўсёй зямлі падпісвалі і запячатвалі сваімі пячаткамі або князь, або полацкі япіскап. Гэтак захаваліся дамовы 1263 і 1265 гг., падпісаныя князьмі Гердзеням і Ізаслававам, ды дамовы 1300 і 1338 гг., падпісаныя япіскапамі Якубам і Рыгорам адпаведна.

Пры канцы XIV ст. у Вялікае Княства Літоўскае паўднёвым шляхам праз Кракаў прыходзіць Майдборскае (Магдэбурскае) гарадзкое права. Яго, паводле прывілеяў Вялікага князя Вітаўта, атрымалі сталічная Вільня (1387) і вялікакняскія гарады Берасьце (1390) ды Горадня (1391). Погляды ж тагачаснага Полацка і ў складзе ВКЛ заставаліся традыцыйна скіраванымі да Балтыкі. Ён з папярэдняга княскага пэрыяду пачуваецца вольным прыймаць рашэньні, што да балтыйскага гандлю. Таму і першы полацкі намесьнік Мантыгірд у 1396 г. з парады палачанаў аднаўляе гандлёвую дамову з Рыгай, якую ўклаў у 1392 г. полацкі князь Сямён (Лугвень). На дакумэнце ж 1396 г. упершыню замест княскай пячаткі зьяўляецца пячатка ўласна горада зь лінейным надпісам «Пячаць Полацкая і сьвятое Софы».

Гэты дакумэнт дэзавуяваў князь Вітаўт, які сваім лістом ад 23.01.1397 г. паведамляе ў Рыгу, што заключэньне міждзяржаўных дамоваў належыць да кампэтэнцыі Вялікага Князя. Дасьледнік Аляксей Шаланда ў сваёй працы аб полацкай гэральдыцы, слушна адзначаючы палітыку цэнтралізацыі, якую пасьлядоўна праводзіла Вітаўтава адміністрацыя, сьцьвярджае, што дзеля сьціраньня памяці пра былую незалежнасьць Полацкае дзяржавы выява старога герба была замененая на вэрбальную форму. Аднак аўтар не ўзяў пад увагу адрасата лістоў, зацьверджаных гэтай пячаткай. А ім быў рыскі магістрат. Да магістра лісты зацьвярджаліся князем, да рыскага біскупа — полацкім уладыкам. Цягам 1396–1498 гг. дакумэнты, пісаныя ад імя горада, запэўняюцца згаданай полацкай пячаткай, але ўласнага гербу на іх не сустракаецца. Эканамічны і палітычны стан Полацку ад канца XIV ст. вымагаў новых сродкаў вырашэньня паўстаupўшых праблемаў. Верагодна, з увагі на Рыгу і Візбу, у горадзе пачала фармавацца свая сыстэма самакіраваньня. Пацьверджаньнем таго, акрамя ўласнае пячаткі, ёсьць ужываная ад 1440-х гадоў у афіцыйных лістах у Рыгу форма звароту: «бурмістру, войту, радцам і ўсім ратманам... ад баяраў, месьцічаў і ўсяго паспольства». Як відаць, формы азначэньня рыжанаў, кіраваных гамбурскім правам, і саміх сябе з выгляду падобныя, але сутнасна розныя. Выраз гэты выпрацоўваўся цягам папярэдняга часу як форма звароту ад ўсёй гарадзкой супольнасьці.

4 кастрычніка 1498 г. Вялікі князь Аляксандар, жадаючы палепшыць стан Полацка, абвесьціў, што «гэтае места нашае з права літоўскага і рускага і якое там яшчэ будзе трымана, на права нямецкае майдборскае зьмяняем на вечныя часы». Звычайным было наданьне гораду разам з прывілеем на Майдборскае права ўласнае пячаткі і гербу, але згадкі пра гэта ў тэксьце самога прывілею няма. Можна толькі меркаваць, што ўласную пячатку зь гербам горад займеў у той самы час, бо першы (з захаваных) пасьля выхаду прывілея ліст у Рыгу ад 27.08.1499 г. зацьверджаны новай пячаткай. Выгляд пячаткі цалкам адпавядае эўрапэйскім узорам. Надпіс выкананы па колу ў лацінскай мове зь нямецкім акцэнтам

«Sigillum civitatis Ploske» (Пячатка места полацкага). Адразу ж зьмяняецца і форма звароту ў самім лісьце: «бурмістру, войту, радцам і ўсім ратманам... мы войт, бурмістр і ратманы» (роўныя — роўным, вольныя — вольным). Адгэтуль месца афіцыйнай беларускай мовы ў дакумэнтах, пісаных Полацкам да ўрадаў ганзэйскіх гарадоў, заступае нямецкая.

У цэнтры пячатка мае выяву карабля. Дасьледнікі не акцэнтуюць увагі на тым, што гэта за плавальны сродак, і мянуюць яго проста «карабель». Але зважаючы на панаваньне ў XIII–XV стст. у Балтыйскім рэгіёне Ганзы, можна ўпэўнена казаць пра яго ганзэйскае паходжаньне. Поўны кантроль на Балтыцы Ганзэйскай Лізе забясьпечылі ня толькі ўдалыя дамовы і пазьнейшая манаполія, але і новая канструкцыя гандлёвага карабля. Напачатку гэта быў ког, які мог перавозіць тавар вагой 20–100 лаштаў (40–200 тон). Пазьней, у пачатку XV ст., ён быў выціснуты новым тыпам карабля званым голькам. Розьніўся той ад кога наяўнасьцю на трэцяй сьлімзе касога лацінскага ветразя, што шмат дадавала ў манэўры. Апроч таго, вежы на носе і карме былі зынтэграваныя з корпусам. Паглядзеўшы на полацкую пячатку, можам упэўніцца, што гэта тыповы ганзэйскі гольк. У цыркумбалтыйскім рэгіёне не адзін Полацак меў на сваім гербе карабель. Гербамі з выявамі карабля карысталіся нямецкія гарады Кіль, Стральзунд, Вісмар; дацкія — Хэльсінгёр, Кэртэміндэ, Багэнзэ; польскі — Гданьск (Данцыг).

Паводле заўвагі Ганны Харашкевіч, якая спасылаецца на кнігу Ліфляндзкіх, Эстляндзкіх і Курляндзкіх актаў (Liv-, Est- und Curlädisches Urkundenbuch, abt.II, bd.1, hrsg. von L.Arbusow, Riga, 1905), на пячатцы ма-

ецца «выява япіскапа на караблі» [**3**, с. 167]. Анатоль Цітоў, апісваючы пячатку, да словаў Харашкевіч дадае: « ... выява трохмачтавага карабля з надзьмутымі ветразямі, на борце якога стаіць япіскап у мітры з пасталем у левай руцэ, правая выцягнутая ў накірунку карабля. ... » [**5**, с. 225]. Хто ж той япіскап, што стаіць на караблі? Кіраўнік Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь Рассадзін С.Я. зь Міхальчанкам А.М. ідуць далей і мянуюць яго апосталам Пятром у часе плаваньня з Сынопу ў Рым [**1**, с. 95]. Трэба зьвярнуць увагу на адсутнасьць тагачаснага апісаньня герба, што заўсёды было найважнейшым у гэральдыцы. Ніхто са згаданых дасьледнікаў нейкіх дакумэнтаў у пацьверджаньне сваіх словаў не падае. З азначанае прычыны ўсе тлумачэньні зьяўляюцца адно толькі меркаваньнямі. У такой сітуацыі можна вылучыць яшчэ некалькі вэрсіяў прачытаньня выявы полацкага герба.: Першая. Прымем да ўвагі, што сьвяты Мікола надта шанаваўся гандлярамі, і маюцца абразы з сьвятым і ратаваным ім караблём. А таксама тое, што ў Полацку мелася ажно тры Мікольскіх царквы і адна купецкая полацкая ў Рызе. Як відаць, ёсьць падставы прыняць за крыніцу, што стала завадовай пры стварэньні герба, хрысьціянскае паданьне аб апекуне вандроўнікаў — сьвятым Міколе. Другая. Узяўшы за аснову надпіс на старой полацкай пячатцы «пячаць Полацкая і сьвятое Софы», палічыць новую пячатку графічным увасабленьнем стогадовае традыцыі і прачытаць выяву гэткім чынам: карабель - адзнака ўласна гораду, які спэцыялізуецца на марскім гандлі, а істота на ім — гаспадар катэдры Сьвятой Сафіі, япіскап полацкі, без пэрсаналіяў. І гэта таксама мае сэнс. Але ёсьць і трэцяя, якая падаецца больш важкай. Тут трэба шырэй паглядзець на гандлёвыя сувязі Полацка і магчымыя крыніцы пазычаньняў. Гандаль Полацка з Рыгай ад пачатку ня быў простым. Не зважаючы на дамову, заключаную ў 1265 г. князем Ізаслававам, паводле якой вольны гандаль дазваляўся «ў Рызе, Гоцкім беразе, Любцэ», пускаць полацкія тавары далей Рыгі рыскі магістрат не хацеў. Лівонска-готляндзкая галіна Ганзы не жадала выпускаць з рук прыбытак. Пасьля таго, як Рыга атрымала ў 1346 г. ад Ганзы статус гандлёвага цэнтру, яна займела права патрабаваць, каб усе тавары, што рухаліся праз горад, былі выгружаныя, узважаныя і потым пагружаныя зноўку. Пры такіх умовах большая частка тавару (80 %) трапляла да лівонскіх купцоў. Калі гандлёвы ганзэйскі пост (Kontore) у Полацку кантраляваўся Рыгай, дык падобны пост у іншым

горадзе Вялікага Княства Літоўскага Коўне быў пад кантролем Гданьску. У межах самае Ганзы існавала канкурэнцыя між рознымі галінамі. Прадстаўнікі вэндыйска-саксонскае і вэстфалійска-прускае галінаў былі не задаволеныя тым, што лівонскія гарады забаранялі іншаземным гандлярам наўпроставы гандаль у межах іхных муроў. Полацак гэтак сама ня быў у захапленьні ад прапанаваных Рыгай умоваў гандлю, ён шукаў іншых шляхоў. Пашырэньне кантактаў полацкіх купцоў з гданьскімі было ў інтарэсах абодвух бакоў. Аднак ад гэтага губляла Рыга, таму ў студзені 1430 г. на ганзэйскім зьезьдзе ў Любэку яна склала скаргу аб тым, што полацкія гандляры не абмяжоўваюцца гандлем у лівонскіх гарадах, а езьдзяць у Гданьск. Ня дзіва, у сярэдзіне XV ст. Гданьск стаў найбуйнейшым ганзэйскім местам (26000 жыхароў). Дзеля параўнаньня: у Любэку жыло 25000, а ў Гамбургу — 16000 жыхароў. Гандлёвы абарот гораду перавышаў рыскі ў пяць разоў. Дбаў пра полацкі гандаль і Вялікі князь Казімір. Гэтак, 29.07.1440 г. ён піша ліст да гданьскага магістрату, каб паспрыялі ў вырашэньні праблемаў полацкага купца Івана Булавіна. Пасьля пераходу ў 1457 г. Гданьска пад апеку князя Казіміра ўлада яшчэ больш была зацікаўленая ў пашырэньні кантактаў Полацак — Гданьск. Зважалі на гэта і самі палачаны. У часе канфлікту, паўсталага ў 1463 г. з-за патрабаваньняў Рыгі кантраляваць якасьць воску і ставіць на полацкі тавар сваю пячатку, полацкі намесьнік Алехна Судзімонтавіч ад імя гораду ў 1464 г. выказаў пратэст, пішучы, што «А Полцеск тэж хвалячы бога места славутнае, як і іншае, а ня ёсьць ніжшае ў чэсьці і ва ўсім ані Вільні, ані Марыборку, ані Кданьску. І вы ад іх воск бярэце, але пячаткі сваёй да іх воску ня ставіце і яго не калупаеце». Ліст ёсьць спробаю ціску полацкага намесьніка на рыскі магістрат. Усе згаданыя ў лісьце гарады ўваходзяць у агульную дзяржаву, палучаную Крэўскай уніяй, і Алехна Судзімонтавіч хоча давесьці рыжанам, што ў полацкіх гандляроў ёсьць магчымасьць несымэтрычнага адказу. Прымем таксама да ўвагі, што Гданьск разам зь Любэкам, Кёльнам і Брауншвэйгам быў найважнейшым ганзэйскім асяродкам, які падпісваў ад імя ўсяе Ганзэйскае Лігі падстававыя дакумэнты. Таму цалкам лягічна, што дзяржаўная ўлада ВКЛ, надаючы герб гораду, павязанаму трывалымі сувязямі з Ганзэйскаю Лігай, магла ўзяць за аснову герб іншага буйнога ганзэйскага цэнтру тае самае дзяржавы, то бок Гданьску. Паглядзеўшы на адну

з гданьскіх ганддёвых пячатак, мусім прызнаць значнае падабенства. Гданьская пячатка, як відаць, больш штукарская і на гольку мы бачым не адну асобу, але цэлую каманду марынэраў. Тады, магчыма, і на полацкай пячатцы зьмешчаная выява зусім не япіскапа, але капітана гандлёвага карабля або купца. Падобная выява, але са стырнавым, маецца на пячатцы Стральзунда XIV-га ст.

У 80-х гадах XVI ст. Полацак атрымаў зьмененую гарадзкую пячатку. Прычынай таму працяглая вайна з Масковіяй. Горад пасьля захопу яго 15.02.1563 г. маскоўскім войскам цягам шаснаццаці гадоў да 30.08.1579 г. знаходзіўся пад акупацыяй, у часе якой усе органы самакіраваньня былі зьнішчаныя, а колькасьць гарадзкога насельніцва з прычыны рэпрэсыяў і мораў 1563, 1565, 1566 і 1567 гг. скарацілася ў чатыры разы. А калі ўлічыць, што з той чвэрці значная частка была выхадцамі з Маскоўскай дзяржавы, што аселі тут за часы акупацыі (сьведчаньнем таму ліст канцлера ВКЛ Лявона Сапегі да вялікага гетмана Крыштапа Радзівіла ад 20.07.1599 г.), дык мусім казаць пра зьнішчэньне традыцыяў полацкага гандлю і самакіраваньня. Пасьля цяжкое вайны прыйшлося аднаўляць структуры самаарганізацыі ад асноваў. У прывілеі, выдадзеным гораду каралём Сьцяпанам Батурам 15.06.1580 г., адзначаецца: «А к справованьню патрэб местскіх, надаем ім да пячаці местскай герб, карабель акрэнтовы, каторага і перад тым места Полацкае ўжывала ...». Новая выява карабля больш стылізаваная, магчыма, з прычыны перарванае традыцыі, а значыць менш рэалістычная. Надпіс па колу пячаткі пісаны па-польску «Pieczac migsta Polockiego». На афіцыйных дакумэнтах Полацка мадэрнізаваны герб зафіксаваны ад 1587 г. Падобным гербам горад карыстаўся да 70-х гадоў XVIII ст.

У 1776 г., то бок праз чатыры гады пасьля ўключэньня часткі Падзьвіньня і Падняпроўя ў склад Расейскае імпэрыі, Майдборскае права ў далучаных гарадоў было адабранае, а разам зь ім зьніклі і адзнакі вольнасьці – магістрат, пячатка, герб. Аднак левабярэжная частка Полацку (Задзьвіньне) і павету, што засталіся ў Рэчы Паспалітай, працягвалі да другога падзелу (1793 г.) карыстацца гербам з выяваю карабля. Захаваўся адбітак павятовае пячаткі 1791 г., выява на якой яшчэ больш стылізаваная, а па колу зьмешчаны надпіс пра вольны Полацак, хаця той ужо амаль 20 гадоў быў пад расейскім панаваньнем.

Паводле апісаньня, прынятага 21.09.1781 г. расейскім Сэнатам на падставе загаду ад 16.08.1781 г. імпэратрыцы Кацярыны II, гарады ды мястэчкі, што раней уваходзілі ў склад ВКЛ, а пасьля першага падзелу далучаныя да Расеі: Віцебск, Гарадок, Дрыса, Лепель, Магілеў, Полацак, Сураж, Чэрыкаў — атрымалі аднолькавы герб «Пагоня». У верхняй палове тарчы зьмешчаны расейскі арол, як адзнака дзяржаўнае прыналежнасьці. Розьніліся гербы адно толькі колерам поля: у Полацка — срэбраны, у Дрысы — залаты і г.д. Ніводны з гарадоў, што да таго мелі ўласныя гербы: ані Віцебск зь ягоным Спасам, ані Полацак зь ягоным ганзэйскім голькам, ані Магілеў зь ягоным збройным рыцарам — старажытнае адзнакі майдборскіх вольнасьцяў не захавалі. Наданьне новых гербоў было фармальнасьцю, бо практычнага прымяненьня, як у папярэднія часы, яны ня мелі, а цэнтралізацыя ўлады была надзвычайная.

Пасьля 1917 г. стала зусім не да гэральдыкі, гінулі людзі, гінулі традыцыі, гінулі храмы й культурныя каштоўнасьці. Да 60-х гадоў XX ст. праблемы з гэральдыкай не існавала. Сьвяткаваньне 1100-годзьдзя старажытнага гораду прайшло ў 1962 г., як мае быць, пад камуністычнаю тройцай Марксам, Энгельсам і Леніным. Гарвыканкам на той час ачольвала Натальля Кляпацкая, вядомая прыняцьцём у 1964 г. пачварнага рашэньня аб разбурэньні касьцёла сьвятога Сьцяпана (Мікалаеўскага сабору) і часткі будынкаў былой езуіцкай акадэміі, збудаваных пры канцы XVIII ст. паводле праекту генэрала езуітаў Габрыэля Грубэра. Кляпацкая ўсім сэрцам імкнулася будаваць камунізм, зьнішчаючы на гэтым шляху старое і насаджаючы новае. За што сталася годнай атрымаць званьне ганаровае грамадзянкі разбуранага ёй Полацка. Хаця варта адзначыць, што лёсавызначальныя рашэньні прымаліся не мясцовымі органамі ўлады, але партыйным камуністычным кіраўніцтвам.

Аднак зь незразумелых прычынаў нешта ў кіраўнічых колах у стаўленьні да гісторыі пачало зьмяняцца, хаця гэта магло быць працягам будаваньня новага. Так ці інакш, але 13 верасьня 1967 г. полацкі гарвыканкам на чале са згаданай старшынёй Кляпацкай, бадзёра шпацыруючы насустрач 50-й рэвалюцыйнай гадавіне, прыняў рашэньне № 221 аб ладжаньні конкурсу на гарадзкі герб, які «павінен сымбалічна адлюстроўваць гісторыю горада і ягоную героіку, характэрныя асаблівасьці прыроды, сучаснасьць і будучыню Полацка». Такім

чынам, ідэя была закладзеная. «Творчы» калектыў у складзе Пэўзнэра Г.І., Стральцова В.П., Любавіцкага В.К. і Філіпава В.П. дабрасумленна выканаў загад партыі і гарадзкога кіраўніцтва. Так паўстаў герб, выкананы ў колерах БССРаўскага сьцяга (левая верхняя частка — чырвоная, правая ніжняя — зялёная). У ніжняй частцы новага герба быў зьмешчаны ваяр з расейскіх казак, бо паводле аўтараў: « Полацак фарпост на заходніх межах расейскай зямлі, сымбаль вызваленчае барацьбы зь іншаземнымі захопнікамі. Выява ваяра-вершніка характэрная для полацкіх гербаў XIV і XVIII ст. Рэторта, як сымбаль хіміі, зубатае кола — адзнака прамысловасьці.» Як відаць, у аўтараў адсутнічала разуменьне таго, якім мае быць гарадзкі герб. 7 жніўня 1968 г. сваім рашэньнем №145 гарвыканкам афіцыйна зацьвердзіў новы герб. Надрукавалі плякатаў, вымпелаў, буклетаў з выявамі чырвона-зялёнага гербу, але, не зважаючы на намаганьні партыйнага кіраўніцтва, той з прычыны сваёй непрывабнасьці не прыжыўся. Пры канцы 1970-х гадоў між палачанаў за ім трывала замацавалася мянушка «сьмерць з касой». Апошні раз герб сустракаецца на тытуловым лісьце кніжкі «Почётные граждане Полоцка» (1979). Падобна на тое, што сканаў ён, не дажыўшы да 1980 году — векапомнае даты, абвешчанай генэральным сакратаром ЦК КПСС Мікітам Хрушчовым годам канчатковае пабудовы камунізму. Турыстычны плян Полацку ў гэтым годзе выйшаў бяз гэтага савецкага гербу.

І гэткае «бязладзьдзе» доўжылася да 1987 г., калі надышоў час сьвяткаваць 1125-годзьдзе першае летапіснае згадкі пра Полацак. Перад кіраўніцтвам паўстала праблема, якім сымбалем карыстацца ў часе ўрачыстасьцяў. Вырашылі правесьці сьвяткаваньні пад знакам, што спалучаў у сабе рысы традыцыйнага гербу «Пагоня», які за імпэрскім часам быў афіцыйным гербам гораду. Але даць вершніку ў руку меч камуністычныя ўлады збаяліся, таму ўторкнулі прапар, які пазычылі зь герба брэжнеўскіх часоў. Функцыянаваньне гэтага знаку абмежавалася сьвятам і выпушчанымі да яго сувэнірамі: праграмкамі, вымпеламі, кубкамі, талеркамі і г.д. Быў гэта сымбаль сьвята, але ня герб горада. Далей зноўку пацягнуўся час безьгербоўя.

04.02.1992 г. у выніку ліставаньня між камісіяй па культуры полацкага гарсавету і Інстытутам Гісторыі АН Беларусі была атрыманая гістарычная даведка аб гарадзкім гербе. За аснову скарыстаны герб зь

пячаткі 80-х гадоў XVI ст. Даведка сталася тым дакумэнтам, на падставе якога 28.05.1992 г. гарсавет прыняў рашэньне № 14–16 аб вяртаньні Полацку ягонага гістарычнага гербу. Герб часоў Расейскае імпэрыі не разглядаўся з прычыны пашыранасьці яго выкарыстаньня і таму, што аналягічны герб «Пагоня» быў тагачасным гербам Рэспублікі Беларусь. Ад таго часу горад жыве пад гербам, якім адзначанае самакіраваньне паводле Майдборскага права.

Пры канцы хацелася б зьвярнуць увагу на некалькіх праблемаў, павязаных з азначанаю тэмай. Не зважаючы на наяўнасьць у краіне гэральдычнае камісіі, трывалае канцэпцыі ў гэральдычнай справе ня выпрацавана. У традыцыйнай гэральдыцы тарча галоўным элемэнтам не была і адпаведна не апісвалася. З гэтае прычыны ў розныя часы адзін і той самы герб можна бачыць на розных тарчах. Аднак сёньня, паводле дзейнага заканадаўства, зацьвярджэньню падлягае не апісаньне, але графічная выява, і таму да выбару тарчы трэба падыходзіць абярэжна. На дадзены момант склалася парадаксальная сітуацыя, калі гербы старажытных гарадоў, такіх як Полацак, Віцебск, Берасьце, маюць барокавую тарчу XVII-га ст., што не адпавядае часу наданьня гербу, калі яшчэ панавала готыка. Зь іншага боку, новапаўсталыя гарады і мястэчкі набываюць гербы з больш старажытнымі тарчамі: гішпанскай або вараскай, якой на нашых землях не карысталіся. Сталася так таму, што ў пачатку 1990-х гадоў гарадзкія саветы старых гарадоў прымалі гербы на падставе працы Анатоля Цітова [**4**], які выпрацаваў адметную форму тарчы на падставе польскай, апрацаванай у стылі барока. Аднак падобнаю тарчай гарады, кіраваныя паводле Майдборскага права, карысталіся няшмат, цягам усяго часу працягвала пераважаць гішпанская форма. У другой палове 1990-х гадоў пачалося поўнае геральдычнае бязладзьдзе: тарчы вараскія, маскоўскія, вугорскія. Пэўна, варта было б трымацца гістарычнасьці: гербы XV–XVI стст. мусілі зьмяшчацца на гішпанскіх тарчах, тады гербы XVII–XVIII стст. маглі б займець тарчу, прапанаваную Цітовым. Хаця, зважыўшы на Эўропу, убачым, што там абраная стандартная форма тарчы, і ўсе гербы скарыстоўваюць гішпанскую, як традыцыйна больш пашыраную і зручную, што дазваляе зьмясьціць у полі большую выяву. Можа, эўрапейскі досьвед будзе прыдатнейшым. Вяртаючыся да сучаснага полацкага гербу, трэба адзначыць, што карабель на ім выглядае трохі казачным, і вызначыць паводле выявы яго-

ны тып немагчыма. Было б добра дзеля падкрэсьленьня ганзэйскага мінулага Полацка зьмясьціць гістарычную выяву голька (як напрыклад, на гербах Багэнзэ або Кэртэміндэ) з лацінскім ветразем, з аглядальнай пляцоўкай (буцяновым гняздом) на галоўнай мачце, а не на ўсіх трох. Апрача формы тарчы, маюцца варыянты колераў самога поля. Як было адзначанае вышэй, мы ня маем апісаньня гербу. Адсюль вынікае, што поле тарчы не абавязкова мусіць быць сінім. Мора можа быць морам, а паветра — паветрам. З прапанаванымі зьменамі герб болей будзе адпавядаць гістарычнай праўдзе і эўрапейскім стандартам.

## Літаратура

**1.** Рассадзін С.Я., Міхальчанка А.М. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мн. 2005.

**2.** Хорошкевич А.Л. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв., ч. 1. М. 1977.

**3.** Хорошкевич А.Л. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв., ч. 2. М. 1978.

**4.** Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі. Мн. 1989.

**5.** Цітоў А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі. Мн. 1993.

**6.** Аляксей Шаланда. Сымболіка й геральдыка Полацкае дзяржавы ў X–XV стст. // Спадчына, 2003, № 6, с. 22–39.




**Мал. 1.** Пячаткі полацкіх дамоваў канца XIV — пачатку XV стст.



**Мал. 2.** Полацкая пячатка пачатку XVI ст.



**Мал. 3.** Пячатка Вісмара.




**Мал. 4.** Пячатка Хэльсінгора.




**Мал. 5.** Гданьская гандлёвая пячатка XVI ст.



**Мал. 6.** Пячатка Стральзунда XIV ст.



**Мал. 7.** Полацкая пячатка 1587 году.




**Мал. 8.** Полацкая пячатка 1791 году.



**Мал. 9.** Полацкі герб 1781 году.




**Мал. 10.** Полацкі герб 1968 году.



**Мал. 11.** Полацкі знак 1987 году.



**Мал. 12.** Полацкі герб 1992 году.



**Мал. 13.** Сучасны герб Багэнзэ.



**Мал. 14.** Сучасны герб Кэртэміндэ.

# Перыядычны друк на Полаччыне ў першай палове ХХ ст. (1917–1936)

**Воднева Ірына Пятроўна,**
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Музей беларускага кнігадрукавання*
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

Гісторыя газетнай справы на Полаччыне прыняла сістэматычны і мэтанакіраваны выгляд у першай чвэрці ХХ ст. Але і ў другой палове ХІХ ст. палачане былі актыўнымі чытачамі такіх вядомых выданняў, як «Витебские губернские ведомости» (пачалі выходзіць з 1838 г.) і «Полоцкие епархиальные ведомости» (з 1874 г.). Абедзве газеты выдаваліся ў Віцебску, на рускай мове, даволі значным тыражом. Ваенныя падзеі пачатку ХХ ст. унеслі свае змены не толькі ў больш-менш размеркаваны лад жыцця на Беларусі, але і паклалі пачатак выхаду некаторых перыядычных выданняў.

Падчас Першай сусветнай вайны на тэрыторыі горада Полацка размяшчаліся часці 3-й Арміі Заходняга фронту. З кастрычніка 1915 г. у горадзе пачалі выходзіць 3 разы на тыдзень «Последние армейские извествия». Першыя нумары лічыліся выданнямі Штаба арміі для чытання ў ротах, эскадронах, сотнях і батарэях, а з № 3 газета стала органам штаба ІІІ Арміі. У розныя гады рэдактарамі газеты былі Яцко, Шумінскі, Сабалеўскі, Талі, Постнікаў, Піятроўскі [**1**, с.70]. У розных рубрыках газета змяшчала матэрыялы аб ваенных падзеях на фронце, пісала пра цяжкасці жыцця ў тыле, пра голад, хваробы, галечу сярод людзей. На старонках выдання друкаваліся матэрыялы і пра перамены, якія адбываліся ў нашым горадзе ў сувязі з ваеннымі падзеямі. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. унесла новыя змены ў жыццё горада. Рэзка пачало мяняцца палітычнае становішча ў краіне, замест старых выбіраліся новыя органы кіравання. Зразумела, што ўсё гэта паўплывала і на развіццё перыядычнага друку. У новым становішчы газеты, бюлетэні, лістоўкі сталі неабходнымі рэчамі. Праз іх людзі знаёміліся з тымі зменамі, якія адбываліся ў іх жыцці, праз іх станавілася вядома пра новыя парадкі, сходкі, перавыбары.

Першую савецкую газету палачане атрымалі ў красавіку 1917 года. «Революционный голос», які бярэ пачатак з 17.04.1917 г., стаў друкаваным органам Полацкага Савета рабочых дэпутатаў [**2**, с. 318]. Менавіта з гэтай даты пачынае жыццё сучасная полацкая газета. З лютага 1917 г. у горадзе адбываюцца шматлікія выступленні актывістаў, масавыя дэманстрацыі, у якіх прымалі ўдзел розныя пласты насельніцтва. Стала зразумела, што назад ходу ўжо не будзе. У горадзе актыўна пачалі праходзіць выбары ў Савет рабочых дэпутатаў. Пазней быў абраны і выканкам Савета, які з энтузіязмам узяўся за паляпшэнне ўмоў працы і жыцця палачан. На старонках новай газеты, якая з першых нумароў стала вельмі папулярнай, Полацкі савет рабочых дэпутатаў друкаваў свае распараджэнні і пастановы, змяшчаў артыкулы пра новыя парадкі як ў горадзе, так і па краіне ў цэлым. Газета змяшчала шмат аб'яў і паведамленняў. Праўда, умовы выдання былі вельмі цяжкімі: не хапала паперы, абсталявання, спецыялістаў. У жніўні 1917 г. улада зноў апынулася ў руках буржуазіі. Пачаліся масавыя арышты бальшавікоў. У гэты час была закрыта і газета «Революционный голос». Вядома толькі, што апошні нумар выйшаў 22 ліпеня 1917 г.

У гэты час у Полацку працягвала выходзіць газета 3-й Арміі Заходняга фронту. З 2 красавіка 1917 г. яна мяняе назву на «Голос III Армии» [**3**]. Газета, якая выходзіла штодзённа, змяшчала афіцыйныя ўрадавыя дакументы, загады ваеннага камандавання, рэзалюцыі, лісты да салдат і афіцэраў. На працягу лета ў армейскіх часцях вялася актыўная агітацыйная работа. Колькасць бальшавікоў сярод салдат і афіцэраў пастаянна павялічвалася. Пры перавыбарах салдацкіх камітэтаў бальшавікі атрымлівалі ўсё болей галасоў. З вялікай радасцю салдатамі полацкага гарнізона была сустрэта перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі. У асобных карпусах III Арміі пачалі стварацца бальшавіцкія Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты. Пасля доўгіх спрэчак і перавыбараў 14 лістапада ўлада ў III Арміі поўнасцю перайшла да бальшавікоў. Новы склад ВРК прыняў рашэнне аб закрыцці былой газеты «Голос III Армии», якая знаходзілася пад уплывам меншавікоў. І замест яе ў памяшканні былой друкарні, загадчыкам якой стаў І.І. Чапоўскі, пачалі выдавацца «Известия Военно-революционного комитета III Армии». Першы нумар новай газеты выйшаў 21 лістапада 1917 года.

Менавіта армейскія бальшавікі дапамаглі рабочым горада, якія былі на баку новай улады, дабіцца змены абстаноўкі ў горадзе. Выкарыстаўшы свой вопыт, яны адыгралі рашаючую ролю ў канчатковым пераходзе ўлады да бальшавікоў у Полацку. З канца лістапада 1917 г. армейская і гарадская партыйныя арганізацыі, армейскі камітэт і Полацкі Савет рабочых дэпутатаў наладзілі сумесную працу. Іх агульным друкаваным органам стала армейская газета «Известия Военно-революционного комитета III Армии», рэдагаваў якую М.Дз. Цароў, член ВРК і Армейскага камітэта.

Канец 1917г. быў насычаны падзеямі. 26 снежня быў расфарміраваны ВРК. Замест яго створаны прэзідыум Выканаўчага бюро армейскага Савета пад старшынствам С.А. Анучына. І №32 ад 29.12.1917 г. армейскай газеты выйшаў пад новай назвай — «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии». Акрамя цякучай аператыўнай працы, якую камандуючы III Арміі і кіраўнік яе бальшавіцкай арганізацыі С.А. Анучын вёў на месцы, ён пастаянна выязжаў у воінскія часці, вёў агітацыйную работу сярод салдат і насельніцтва [**4**, с. 31]. Вялікую ўвагу ён надаваў і друку. Газета ВРК III Арміі актыўна распаўсюджвалася на Полаччыне. Яна дапамагала беспамылкова тлумачыць палітыку бальшавікоў. Анучын рэгулярна выступаў на старонках армейскай газеты. Так, яго артыкулы «Пролетарско-крестьянская революция», «Единение», «За кого голосовать», «Мир уже близок» дапамагалі разабрацца ў новых парадках, дапамагалі ўявіць, што чакае народ наперадзе [**4**, с. 32].

У канцы снежня 1917г. па ініцыятыве бальшавікоў адбылося аб'яднанне Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў з Саветам сялянскіх дэпутатаў. Старшынёй Савета быў абраны І.Л. Коган, яго намеснікам — Ф.П. Лук'янаў. Друкаваным органам аб'яднанага Савета стала былая газета, якая з пачатку 1918 г. пачала выходзіць пад назвай «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии, Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов». Газета, якая выдавалася на 2 або на 4 старонках, спрабавала дакладна і як мага падрабязней асвятляць жыццё палачан. Яна друкавала звесткі пра ўзяцце пад кантроль усіх прадпрыемстваў горада і маёмасці, пра наладжванне вытворчасці тавараў і прадуктаў першай неабходнасці, пра тых, хто не жадае жыць па-новаму. У газеце друкавалася шмат аб'яў з запра-

шэннем на працу, паведамленняў пра новыя паляпшэнні жыцця і побыту працоўных. Але наладзіць мірнае жыццё ў новых умовах не было магчымасці. Ішла Першая сусветная вайна, і ў выніку наступальных аперацый на ўсходнім напрамку 25 лютага 1918 года ў горад увайшлі немцы. Дзевяць месяцаў горад знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй. Зразумела, што, не паспеўшы ўстойліва стаць на ногі, полацкая газета прыпыніла свой выпуск. І толькі пасля вызвалення горада, у лістападзе 1918 года, з новай сілай пачаў гучаць голас полацкай перадавіцы.

Газета стала органам Полацкага павятовага выканаўчага камітэта і ВРК. З'явілася і новая назва. Першы нумар полацкай «Красной газеты» чытачы трымалі ў руках ужо 22 лістапада, на другі дзень пасля вызвалення горада. У склад рэдакцыйнай калегіі ўвайшлі Кабаніхін, Падалка і Шпаер [**5**]. Газета поўнасцю раскупалася, хаця з-за недахопу паперы выдавалася невялікім фарматам. З № 24 газета стала выходзіць пад новай назвай — «Известия Полоцкого Уездного Совета рабочих, крестьянских, батрацких и красноармейских депутатов», 195 нумар якой, ад 29.07.1919 г., захоўваецца ў фондах НПГКМЗ.

І зноў пачаўся працэс наладжвання мірнага жыцця. Узнаўляліся прадпрыемствы, адкрываліся школы і бібліятэкі, ствараліся новыя працоўныя месцы. На старонках полацкай перадавіцы, сярод матэрыялаў пра жыццё ў горадзе, былі звесткі пра аднаўленне гаспадаркі ў раёне, стварэнне першых бальшавіцкіх гурткоў у вёсках, наладжванне бясплатнага медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

Толькі пражыць мірна палачанам зноў прыйшлося нядоўга. На змену нямецкім акупантам прыйшлі белапалякі. І ў канцы лета 1919 года горад аказаўся захоплены ўжо польскімі войскамі.

З 20 верасня 1919 года па 15 мая 1920 года левабярэжная частка горада апынулася за лініяй фронту. Гарматныя і ружэйныя абстрэлы доўжыліся 8 месяцаў. Яны прынеслі гораду вялікія страты і разбурэнні. Актыўна ўвайшоўшы ў размеранае жыццё палачан, газета стала той весткай, якую ўсе чакалі з нецярплівасцю. Зразумела, што выпуск перыядычнага выдання спыняць ужо было нельга. Таму рэдакцыя полацкай газеты разам з неабходным абсталяваннем была эвакуіравана на станцыю Дрэтунь [**2**, с. 328]. І пад новай назвай — «Октябрьское эхо» — пачала выходзіць з восені 1919 года.

Пасля вызвалення горада, 15 мая 1920 г., газета пад той жа назвай працягнула сваё выданне. Становішча ў горадзе было вельмі складаным. У выніку нямецкай і польскай акупацый горад быў разбураны на 75%. Былі выведзены са строю амаль усе прадпрыемствы. Сотні беспрацоўных, адсутнасць паліва, недахоп жылля — гэта толькі частка тых праблем, з якімі сутыкнуліся палачане. У тыя часы Полаччына была ў складзе РСФСР (з 1.01.1919 г.), і дзяржава аказвала жыхарам горада дапамогу. Полацкая перадавіца, рэдактарам якой у 1921 г. быў Рушук, своечасова і зразумела тлумачыла рабочым і сялянам складанасць становішча ў краіне, заклікала да актыўнага ўдзелу кожнага жыхара нашага горада ў пабудове новага жыцця. На старонках «Октябрьского эха» аператыўна з'яўлялася інфармацыя і пра пабудову чыгуначнага маста, і пра аднаўленне ў сакавіку 1921 года электрастанцыі, і пра пуск цагельнага завода, і пра многае іншае. Загады, надрукаваныя на старонках газеты, уступалі ў сілу з моманту выхаду нумара [6, л. 227]. Але не толькі жыццё Полаччыны асвятлялі супрацоўнікі газеты. У рубрыках «За рубежом», «По Советской России» пісалася пра голад у Паволжы, пра дапамогу палачан галадаючым, пра мяжу з Польшчай і праблемы, якія там узнікаюць. Перыядычнасць газеты была 3 разы на тыдзень. Выходзіла яна на рускай мове, на адным аркушы, у полацкай друкарні, якая размяшчалася на вул. Камуністычнай (у 1921 г. адрас друкарні — вул. К. Маркса, 2). Загадчыкам друкарні быў у 1920 г. М. Бурын. Газета была запатрабаванай і неабходнай у жыцці палачан. Можа, не так хутка, як хацелася, але жыццё ў Полацку паступова наладжвалася.

У 1922 годзе полацкая газета бярэ сабе новую назву. Першы нумар «Красного знамени» выйшаў 18 (або 19) студзеня. М Калмык стаў ініцыятарам і першым рэдактарам новай газеты. Адзін з першых камсамольцаў Полаччыны (1918 або 1919 г.), чалавек актыўны і дзейсны, ён, стаўшы Загадчыкам Агітацыйна-прапагандыскага аддзела Полацкага Павятовага камітэта, стараўся надаць новаму выданню салідны выгляд. Першыя нумары газеты выходзілі тыражом каля 500 штук, але ў планах рэдакцыі было павелічэнне тыражу да 1000 экзэмпляраў. Газета памерамі 31 на 23 сантыметры добра афармлялася, тэксты друкаваліся тэксты рознымі шрыфтамі. У пастаянных рубрыках «По Советской России», «Партийная жизнь», «Сельское хозяйство» друкавалі як невялікія, але якасныя і змястоўныя паведамленні, так і ёмістыя, грунтоўныя матэрыялы па розных галінах навук. Супрацоўнікі рэдакцыі на чале з

М.Калмыком імкнуліся надаць газеце літаратурны напрамак. На старонках выдання часта змяшчаліся прыказкі, прымаўкі, вершы, даваліся практычныя парады. Па словах рэдактара, газета павінна была стаць ініцыятарам, правадніком у барацьбе за новае жыццё [**7**, с. 12]. У пачатку 1920-х гадоў рэдактар газеты быў забіты. Газета, шукаючы новага кіраўніка, спрабавала выжыць у складаных ваенных умовах. Паводле звестак з бібліяграфічных паказальнікаў, у 1922 г. выйшла 10 нумароў газеты «Красное знамя», у 1923 — яшчэ 13 (апошні датуецца 26 мая). І да восені 1924 года газета ў Полацку не выдавалася [**8**, с. 154].

З 16 верасня 1924 года ў горадзе пачала зноў выходзіць газета, ужо пад новай назвай — «Полоцкий пахарь». Выданне стала органам Полацкай акругі, утворанай 17 ліпеня 1924 года. Газета друкавалася ў Полацку на рускай мове, 2 разы на тыдзень. Першая восень для супрацоўнікаў газеты была вельмі складанай: не хапала людзей, грошай на абсталяванне, добрага памяшкання. Гэта дазваляла весці ледзьве не жабрачнае існаванне. З-за бясколернасці шрыфтаў, тэхнічных недахопаў гублялася цікавасць да газеты з боку шырокага кола чытачоў.

Становішча пачало паляпшацца толькі са студзеня 1925 года. «Полоцкий пахарь», рэдактарам яко быў М. Табінскі [**9**, л. 529], пачаў уводзіць новыя формы работы, болей шырока выкарыстоўваць працу селькораў, друкаваць шмат матэрыялаў па сельскай гаспадарцы, медыцыне, ветэрынарыі. Яшчэ ў 1924 г., з №15, газета стала весці рубрыку «Юный пахарь», ініцыятарам якой стаў Полацкі акружны камітэт ЛКСМБ. У 1925г. камсамольская старонка стала называцца «Вясковая камсамолія». Супрацоўнікі газеты вялі актыўную перапіску з чытачамі. Замест 5–6 лістоў у дзень, як было раней, сталі апрацоўваць да сарака штук, што сведчыла яшчэ і аб даверы чытачоў. У кнізе «Полотчина», выдадзенай Полацкім акружным выканкомам у 1925 г., адзначалася, што ў горадзе «мало корреспондентов, работающих на языках национальных меньшинств и освещающих жизнь и деятельность нацменьшинств округа» [**10**, с. 40].

Рэдактар газеты неаднаразова на працягу 1925 г. звяртаўся да гарадскіх улад з прапановай аб прадастаўленні памяшкання для рэдакцыі газеты . Пасля доўгіх размоў і перапісак рэдакцыя газеты пераехала ў Дом Саветаў па праспекту К Маркса, але ненадоўга [**11**, л. 448]. Ужо ў

канцы 1925 года адрас рэдакцыі новы — вугал Невельскай і Крыжовай. Сёння гэта, верагодней за усё, дом № 6 па вуліцы Войкава. Атрымаўшы новае памяшканне, рэдакцыя і друкарня сталі працаваць у адным месцы. Калі ў рэдакцыі з'явіліся свабодныя грошы, пры ёй была адкрыта крама пісьмовых тавараў, было набыта новае абсталяванне і для друкарні. Усё гэта прывяло да з'яўлення новых працоўных месцаў у горадзе. Павелічэнне прыбытку павінна было, па прагнозах рэдакцыі, зменшыць і цану газеты, палепшыўшы пры гэтым яе тэхнічны бок [**11**, л. 111].

З 13 нумара ад 02.02.1926г. чарговы раз мяняецца назва полацкай газеты. «Чырвоная Полаччына» павінна была больш яскрава і ёміста пісаць пра аднаўленне і бурны ўздым у эканоміцы, навуцы, культуры. Газета стала выходзіць як орган Полацкага РКК(б)Б і райвыканкама, чатырохпалосным фарматам, 4 разы на тыдзень і, упершыню, на беларускай мове (у 1926–1927 гг. выходзіла, акрамя беларускай, на рускай і яўрэйскай мовах). Усе гэтыя змены адбыліся ў сувязі з прыходам новага рэдактара — Сцяпана Пятровіча Сямашкі (1926–1929). У сваіх успамінах ён пісаў: «Спачатку было страшнавата, бо пісаць заметкі і артыкулы зусім не тое, што кіраваць газетай, тым больш не маючы спецыяльнай журналісцкай адукацыі. Прыйшлося і працаваць у газеце, і ўзмоцнена займацца самаадукацыяй у галіне газетнай справы» [**12**, с. 3]. Паводле ўспамінаў рэдактара, склад працуючых ў газеце быў зусім невялікі — усяго чатыры чалавекі разам з рэдактарам. Але ўсе яны працавалі, не шкадуючы свайго часу. Для многіх з іх полацкая журналісцкая школа стала першай прыступкай будучай літаратурнай дзейнасці. Працы хапала ўсім. Так, рэдактар, апрача агульнага кіраўніцтва, пісаў перадавыя, падбіраў і апрацоўваў матэрыялы ў партыйны аддзел газеты; сакратар, Пятрусь Броўка, падбіраў і рэдагаваў матэрыялы рабочай і сялянскай моладзі, камсамольскіх ячэек, вёў перапіску з рабселькорамі; астатнія 2 супрацоўнікі — Т. Хадкевіч і Я. Скрыган - лічыліся літработнікамі і выконвалі абавязкі рэпарцёраў у горадзе, выязжалі ў раёны для арганізацыі матэрылаў[**2**, с. 377].

«Чырвоная Полаччына» актыўна супрацоўнічала з масамі. У той час яна мела каля 200 чалавек актыўных рабкораў і селькораў, з якімі падтрымлівалася пастаянная сувязь, кожны з якіх атрымліваў сваё персанальнае заданне. Кожны год рэдакцыя праводзіла канферэнцыі

рабселькораў, на якіх ставіліся звычайна 2–3 пытанні: справаздача рэдакцыі (адна з якіх захавалася ў Полацкім занальным архіве), аб задачах рабселькораў, даклад пракуратуры. З ліку лепшых рабкораў асобныя залічваліся на працу ў рэдакцыю. Напрыклад, калі ў Мінск з'ехаў Янка Скрыган, на яго месца ўзялі рабселькора з Дрысенскага (зараз Верхнядзвінскага) раёна Эдуарда Самуйлёнка [**13**, с. 2].

У другой палове 20-х гг. ХХ ст. у газету прыйшло працаваць многа таленавітай моладзі. Так, яшчэ ў «Полоцком пахаре» журналісцкай працай займаліся Алесь Дудар і Алесь Звонак. У 1926 г. да іх далучыўся Андрэй Александровіч. Менавіта яны склалі касцяк літаратурнай школы Полаччыны ХХст. Пры іх непасрэдным удзеле 7 сакавіка 1925 года [**15**, с. 231–297] на базе студыі пры Полацкім педтэхнікуме быў створаны полацкі філіял літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Да канца 1925 года філія налічвала ўжо 18 маладых пісьменнікаў. І хаця афіцыйна месцам стварэння полацкай філіі лічыцца студыя пры педтэхнікуме, але полацкая акруговая газета таксама стаяла ля вытокаў стварэння літаратурнай школы Полаччыны. Большасць полацкіх маладнякоўцаў былі супрацоўнікамі газеты. Менавіта на старонках полацкай перадавіцы маладыя паэты і пісьменнікі ўбачылі свае першыя творы. Ініцыятарам стварэння і першым кіраўніком філіі быў Алесь Дудар [**16**, с. 70–74]. З кастрычніка 1924 па жнівень 1925 года ён працаваў у полацкай газеце, на старонках якой друкаваліся яго вершы (першая публікацыя — верш «Селькор», 4.02.1925 г.) і ўрывак з паэмы [**16**, с. 392]. Пасля яго ад'езду ў Мінск філію ўзначальвалі Валяр'ян Антонавіч Сянкевіч (загадчык Полацкага акружнога аддзела народнай асветы — 1926–1927гг.) [**18**]. Пэўны час кіраўнікамі літаб'яднання былі Сымон Хурсік, Алесь Звонак., Тарас Хадкевіч (з сакавіка 1928 г), Сцяпан Сямашка, Пятрусь Броўка. Маладнякоўцы былі маладымі і энергічнымі людзьмі. Акрамя асноўнай працы, напісання твораў, яны былі арганізатарамі творчых сустрэч з пісьменнікамі больш сталага ўзросту, з тымі людзьмі, у якіх можна было павучыцца. Так, у 1925, 1926 і 1927 гадах былі наладжаны літаратурныя вечарыны з удзелам Я. Купалы, М. Чарота, З. Бядулі і іншых [**2**, с. 374]. Члены літаб'яднання вялі актыўную перапіску, часта выязджалі ў раёны, дзе праводзілі літаратурныя вечарыны, дапамагалі маладым літаратарам парадай.

У перыяд беларусізацыі полацкая газета стала кузняй кадраў будучых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Так, адказным сакратаром «Чырвонай Полаччыны» ў 1927–1928 гг. быў зусім яшчэ малады Пятрусь Броўка, які быў яшчэ ў 1925 г. накіраваны на камсамольскую працу ў Полацк. Свой літаратурны шлях у перыядычных выданнях ён пачаў з верша «Ой, не шапчы, мая бярозка…» [**18**, с. 211–212 ], надрукаванага ў полацкай газеце 18 жніўня 1926 года. Кіраўнік полацкай філіі Сымон Хурсік, які нарадзіўся на Міншчыне, у 1920-я гады прыехаў працаваць настаўнікам на Полаччыну. У 1925–1926 гг. Хурсік быў супрацоўнікам полацкай газеты. Праз год Сымон пераязжае працаваць настаўнікам у Валынцы на Верхнядзвіншчыну, але часта наведваецца у рэдакцыю сваёй былой газеты. Па ўспамінах Яна Скрыгана, сярод былых калег ён заўсёды ціха, але напорыста вёў гаворку наконт навін у літаратуры, новых плыняў, цікавых пісьменнікаў [**20**, с.101–107]. Максім Гарэцкі ставіў творы С. Хурсіка таго перыяду на першае месца па натуральнасці, цікавасці і жывасці [**15**, с. 231–297]. У 1926–1927 гг. супрацоўнікам газеты быў і будучы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, адзін са стваральнікаў Беларускай энцыклапедыі, Ян Скрыган. На старонках газеты і ў полацкіх альманахах маладнякоўцаў ён друкаваў свае артыкулы, вершы і апавяданнні пад псеўданімамі Янка Відук, Крушына [**21**, с. 198]. Восенню 1928 года ў «Чырвонай Полаччыне» пачаў друкавацца таленавіты беларускі празаік з Верхнядзвіншчыны Эдуард Самуйлёнак, былы рабселькор газеты. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі ў 1930 г. ён перайшоў на пастаянную работу ў газету ў якасці літсупрацоўніка ( працаваў да 1933 г.). Многія ўспаміналі, што Самуйлёнак быў вельмі старанны, заўсёды з павагай адносіўся да рабселькораў, часта чытаў ім свае вершы і апавяданні [**11**, с. 3]. Пасля заканчэння вучобы ў педтэхнікуме (1927–1929 гг.) у газету прыйшоў працаваць Тарас Хадкевіч. Пачынаючы з 1926 года, ён пачаў друкаваць спачатку свае вершы, а потым апавяданні, нарысы, артыкулы [**22**, с. 158]. Вёў сяброўства з Эдуардам Самуйлёнкам і Анатолем Астрэйкам. Нельга не ўспомніць і рэдактара газеты «Чырвонай Полаччына» Сцяпана Пятровіча Сямашку. Ураджэнец Полаччыны свой першы твор выдаў яшчэ ў маі 1925 года ў «Полоцким пахаре». Гэта было апавяданне «Янка-мужык», падпісанае псеўданімам С. Чуткі [**23**, с. 475]. У 1930–1932 гг. у газеце працаваў беларускі паэт, перакладчык Анатоль Астрэйка, які быў чле-

нам Полацкай філіі Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП). Свой першы фельетон « Галацяпства нейтральнасці, альбо як захаваць сябе ад ухілаў» ён надрукаваў 10 сакавіка 1930 года пад псеўданімам Рыгор Жорсткі [**24**, с. 118].

Свае творы пачынаючыя пісьменнікі і паэты маглі ўбачыць не толькі на «Літаратурных старонках» полацкай газеты, але і ў літаратурных альманахах. У лістападзе 1926 года выйшаў першы літаратурны зборнік маладнякоўцаў «Наддзвінне». У наступным 1927г. выйшаў другі альманах, «Росквіт», а ў 1928г. — «Зарніцы».

У 1930-я гг. газета, рэдактарам якой быў А.Рабіновіч, працягвала актыўна асвятляць жыццё роднай Полаччыны, уводзіць новыя формы працы. Так, у 1931г. газета мела выязную рэдакцыю, выдавала газеты-аднадзёнкі «За калгасную сяўбу», «За ўдарныя тэмпы ўборкі», «Полаччына на дровалесазагатоўках» [**8**, с. 255], у 1932 годзе — «Чырвоная змена» на Полаччыне». У газету прыйшло шмат новых супрацоўнікаў — П.А. Шалаеў, Канавалаў, загадчыкам яўрэйскай старонкі быў Аўруцін [**25**, с. 2]. Свой журналісцкі шлях у 1933 г. пачаў і Гірш Майсеевіч Голанд, які і пасля вайны вярнуўся ў шэрагі супрацоўнікаў полацкай газеты. Працаваў у газеце ў былыя часы і будучы галоўны рэдактар полацкай перадавіцы П.А. Шадзеўскі (г.ж. 1921–1999 гг).

Такім чынам, у першай палове ХХст. перыядычны друк на Полаччыне развіваўся актыўна і markdown розна бакова. Нягледзячы на цяжкое становішча ў краіне, недахоп матэрыялаў і кваліфікаваных кадраў, ён змог утрымацца на плаву ў гады грамадзянскай вайны, змог знайсці новыя формы працы, таленавітых супрацоўнікаў падчас беларусізацыі, своечасова пісаць пра галоўныя падзеі на Полаччыне ў 1930-я гг. Нажаль у Полацку захавалася зусім невялікая колькасць газет гэтага перыяду: у асноўным у фондах НПГКМЗ і ў Полацкім занальным архіве.

**Літаратура**

**1.** Периодическая печать Белоруссии.1817-1916 гг.: библиографический указатель. — Мн., 1986.

**2.** Памяць.Полацк. — Мн., 2002.

**3.** Периодические издания Белоруссии в фонде Правительственной библиотеки имени Горького. — Мн. — Ч.1. Газеты. 1900-1941. —1985.

**4.** Манис Н. Память о них жива в Белорусии — Мн., 1988.

**5.** Информационная листовка Информ-Инструментального Подъотдела Отдела Управления Витебского Губисполкома. — 1918 г. —11 декабря. — № 8.

**6.** Зональны государственный архив г. Полоцка (ЗГАП). Ф. 631. — Воп. 1. — С. 4.

**7.** Красное знамя. — 1922. — №6.

**8.** Газеты Беларусі. 1776-1975. //Бібліяграфічны даведнік.. Мн., 2003.

**9.** ЗГАП. Ф.104. — Воп.1. — С.19.

**10.** Полотчина: издание Полоцкого окружного исполнительного комитета. — Полоцк, 1925.

**11.** ЗГАП. Ф.104. — Воп. 1. — С. 51.

**12.** Сямашка С. Памятныя гады// Сцяг камунізма. — 1958. — 25 лістапада.

**13.** Кавалеўскі П. Пісаць жыццё — пачэсная справа// Полацкі веснік. — 2002. — 16 красавіка.

**14.** Лыч Л., Навіцкі Ул. Плюралістычны характар літаратурнага жыцця // Лыч Л., Навіцкі Ул. / Гісторыя культуры Беларусі. — Мн., 1995.

**15.** Гарэцкі М. Успаміны, артыкулы, дакументы. — Мн., 1984.

**16.** Жыбуль В. Два галоўныя скандалісты 20-х.// ARCHE. — 2004. — № 3.

**17.** Дудар Алесь// Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: у 6 т. — Т2. — Мн., 1993.

**18.** Даведка з архіва Краязнаўчага музея.

**19.** Броўка П. Пішу а сэрцы чалавечым. — М., 1979.

**20.** Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. — Мн., 1979.

**21.** Саламевіч Я. Слоўнік беларускіх псеўданімаў. — Мн., 1983.

**22.** Хадкевіч Тарас// Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік у 6 т. — Т6. — Мн., 1995.

**23.** Сямашка Сцяпан// Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік у 6 т. — Т5. — Мн., 1994.

**24.** Астрэйка Анатоль// Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік у 6 т. — Т1. — Мн., 1992.

**25.** Сяргееў А. Чалавек-легенда// Полацкі веснік. — 1997. — 18 красавіка.

# Дадатак

## Супрацоўнікі полацкай газеты, якія былі членамі полацкай філіі «Маладняка»

| Імя і прозвішча | Гады жыцця | Час працы ў газеце | Пасада | Першая публікацыя ў полацкай газеце |
|---|---|---|---|---|
| Дудар Алесь | 1904–1937 | 11.1924–08.1925 | заг. аддзела газеты «Полоцкий пахарь» | верш «Селькор» («Полоцкий пахарь», 4.02.1925 г.) |
| Хурсік Сымон | 1902–1972 | 1925–1926 | заг. аддзела газеты «Полоцкий пахарь», потым «Чырвонай Полаччыны» | апавяданне «3 Першым мая» («Чырвоная Полаччына», 1.05.1926 г.) |
| Звонак Алесь | 1907 | 1925–1926 | адказны сакратар «Полоцкага пахаря» (?), потым «Чырвонай Полаччыны» | верш «Дзён буравая пагоня» (29.04.1926 г., «Чырвоная Полаччына») |
| Александровіч Андрэй | 1906–1963 | 1926 | намеснік рэдактара «Чырвонай Полаччыны» | вершы («Чырвоная Полаччына», 6.04.1926 г.) |
| Сямашка Сцяпан | 1898–1965 | 1926–1929 | Рэдактар «Чырвонай Полаччыны» | апавяданне «Янка-мужык» («Полоцкий пахарь», №16, 1924 г., пад псеўданімам С. Чуткі) |
| Скрыган Ян | 1905–1992 | 1926–1927 | літработнік «Чырвонай Полаччыны» | верш «Перлы дзён» («Чырвоная Полаччына», 15.12.1926 г.) |
| Самуйлёнак Эдуард | 1907–1939 | 1930–1933 | адказны сакратар «Чырвонай Полаччыны» | верш «Партызан» («Чырвоная Полаччына», 17.10.1928 г.) |
| Броўка Пятрусь | 1905–1980 | 1927–1928 | адказны сакратар «Чырвонай Полаччыны» | верш «Ой, не шапшы бяроза…» (Чырвоная Полаччына», 18.08.1926 г.) |
| Хадкевіч Тарас | 1912–1975 | 1929–1931 | заг. аддзела «Чырвонай Полаччыны» | публікацыя («Чырвоная Полаччына», 01.05.1926 г.) |
| Астрэйка Анатоль | 1911–1978 | 1930–1932 | заг. аддзела «Чырвонай Полаччыны» (?) | Фельетон «Галацяпства нейтральнасці, альбо як захаваць сябе ад ухілаў» («Чырвоная Полаччына», 10.03.1930 г., пад псеўданімам Рыгор Жорсткі) |




**Фотаздымак.** Калектыў рэдакцыі і друкарні газеты «Полоцкий пахарь». 1925 г.

# Шляхта польскага паходжання ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI–XVII стст.

**Галубовіч Віталь Уладзіміравіч,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэннт кафедры грамадскіх навук*
*Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт*

Для дарэвалюцыйнай расейскай і савецкай беларускай гістарыяграфій канцэптуальны характар мела праблема паланізацыі шляхты на землях Вялікага Княства Літоўскага[1]. З гэтага рабіліся далёкасяжныя разважанні пра іназтнічны характар пануючага класа і апраўдваліся любыя формы супраціўлення яго прыгнёту. Пры гэтым сам тэрмін «паланізацыя» не ставаўся акрэсленай дэфініцыяй, зразумець сэнс якой дастаткова складана. Не давалася ніякага тлумачэння прычынаў, зместу, працэсу і, нарэшце, канстатаваўся толькі адмоўны вынік гэтай дастаткова цікавай і неадназначнай з'явы. І гэта пры тым, што ўжо ў XIX — пачатку XX стст. наяўная крыніцазнаўчая база (у першую чаргу, выдадзеныя актавыя матэрыялы і гербоўнікі), дала падставу сумнявацца, што да магчымасці буйнамаштабнай фізічнай эміграцыі з тэрыторыі Польшчы ў Вялікае Княства Літоўскае. Адметна, што праблема «польскай экспансіі на Усход» стала таксама і для польскай гістарычнай навукі «адным з ключавых пытанняў у даследаванні гісторыі Рэчы Паспалітай у эпоху Новага часу»[2]. У рэальнасці працэс пранікнення палякаў на Усход даследаваўся толькі ў адносінах да Украіны, дзе гэтая з'ява набыла сапраўды сур'ёзныя маштабы[3]. ВКЛ і яго беларускія паветы і зараз застаюцца недаследаванымі на прадмет польскай каланізацыі: па-ранейшаму толькі ў цэлым канстатуецца наяўнасць перасялення на землі ВКЛ з Кароны, але пра гэта надалей адсутнічае дэтальнае ўяўленне. Сучасная беларуская гістарыяграфія ў пэўнай ступені супакоілася пасля пашырэння і прыняцця тэзы пра культурную самапаланізацыю шляхты ВКЛ, пакінуўшы вывучэнне поль-

---

[1] Напр. гл.: Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. Мн., 2004; Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. С. 140–141.

[2] Litwin H. Napływ szlachty polskiej na Ukrainę 1569–1648. Warszawa, 2000. S. 7.

[3] Грушевський М.С. Історія України-Руси. В. 11 т., 12 кн. К., 1991. С. 235–254, 272–288; Litwin H. Napływ szlachty polskiej na Ukrainę 1569–1648. Warszawa, 2000.

скай эміграцыі як другаснай з'явы. На наш погляд, існуюць паважныя перспектывы для самастойнага даследавання міграцыйных працэсаў у Новы час. Дадзены тэкст з'яўляецца толькі ілюстрацыяй да гісторыі польскай прысутнасці ў ВКЛ на прыкладзе Полаччыны.

Складванне шляхецкага стану на Полаччыне адбывалася напрацягу XV–XVI стст., пры гэтым большасць полацкай шляхты была мясцовага паходжання. Уплывовымі з'яўляліся такія полацкія баярскіх роды, як Корсакі, Палупяты, Лавейкі, Эпімахі, Сялявы. Аднак сярод мясцовых кланаў сустракаюцца выхадцы з іншых краінаў, якія ўжо ў першай палове XV ст. сталі «сваімі». Так, на думку Г. Харашкевіч, найверагодней чэскае паходжанне меў род Радкавічаў, які пазней падзяліўся на Мішкавічаў, Быстрэйскіх і Кубліцкіх[4]. Увогуле чэская прысутнасць на Полаччыне была ў XV–XVI стст. даволі заўважная як сярод баярства, так і мяшчанаў[5]. З замежнікаў папоўнілі шэрагі полацкай шляхты немцы: Ладзяты і Геталты [6]. Адзінства полацкай шляхты парушалася і за кошт суседніх земляў ВКЛ. Да сярэдзіны XVI ст. на Полаччыне аселі прыбылыя пераважна са Смаленшчыны: князі Палубенскія, Масальскія, Глінскія[7]. Тады ж праз сваяцкія сувязі ў лік полацкай шляхты ўвайшлі Есманы і Белазоры[8]. Адметным было і тое, што новапрыбылая шляхта не здолела на Полаччыне эканамічна канкураваць з мясцовымі родамі і заставалася ў цэлым нешматлікай. Дамінацыю мясцовай арыстакратыі не пахіснула нават вялікакняская бюракратыя, якая актыўна набывала тут землі[9]. Такім чынам, сярод шляхты немясцовага паходжання можна заўважыць чэхаў, немцаў, смальнянаў. Толькі ў сярэдзіне XVI ст. фіксуецца адзіны выпадак усталявання на Полаччыне польскага шляхецкага роду, і то пачаткова аселага ў Кіеўскім ваяводстве. Адбылося гэта ў часы ваяводства Станіслава Давойны (на пасадзе з 1542 г.), у атачэнні

---

[4] Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 5 / Сост. А.Л. Хорошкевич. М., 1985. С. 148.

[5] Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 5 / Сост. А.Л. Хорошкевич. М., 1985. С. 158.

[6] Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 5 / Сост. А.Л. Хорошкевич. М., 1985. С. 164–166; Варонін В. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя. Дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. Мн.: БДУ, 2000. С. 73.

[7] Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 5 / Сост. А.Л. Хорошкевич. М., 1985. С. 165.

[8] Варонін В. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя. Дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. Мн.: БДУ, 2000. С. 73. С. 72-73.

[9] Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 5 / Сост. А.Л. Хорошкевич. М., 1985. С. 162-164.

якога быў сын выхадца з Кароны — Фронцка Каспаравіч Радзімінскі, чалавек прадпрымальны і актыўны[10]. З'яўляючыся «служэбнікам» ваяводы, а потым — яго наменікам, Фронцка Каспаравіч хутка набывае на Полаччыне маёмасць[11], чым забяспечвае сабе аселасць, а потым — у 1559 г. — пры падтрымцы С. Давойны атрымлівае прызначэнне на полацкае харуства[12]. Яго нашчадкі сябе называлі Францкевічамі Радзімінскімі і займалі пасады ў полацкай павятовай іерархіі: Міхаіл — падкаморы ў 1583-1603 гг., Міхал — стольнік у 1643–1649 гг.[13].

Радзімінскія, відаць, былі адзіным выпадкам хуткага ўрастання выхадцаў з Кароны ў полацкую шляхецкую грамаду. На шляху перасяленцаў найперш уставала права ВКЛ: Статуты 1529 г., 1566 г. і 1588 г забараняли раздачу маёмасці іншаземцам, якімі таксама лічыліся і палякі[14]. Хаця палякаў, якія не зрабілі сабе кар'еру ў Полацку, без сумнення, было шмат. Яшчэ на пачатку XVI ст. Полацак з'яўляўся стаўкай вялікага князя ў час літоўска-маскоўскіх войнаў, дзе канцэнтравалася вялікая колькасць наймітаў, сярод якіх, без сумнення, былі прадстаўнікі Кароны Польскай. Асабліва ўзрасла польская прысутнасць у час Лівонскай вайны. З палякаў часткова фармавалася наёмнае войска ВКЛ[15]. Польскія жаўнеры складалі амаль палову рэгуляр-

---

[10] Радаман А. Ваяводскія і павятовыя земскія ўраднікі польскага паходжання ў Вялікім Княстве Літоўскім у 2-й палове XVI ст. // На шляху да праўды: Матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф. «Шлях да ўзаемнасці» (Белавежа, 15–17 чэрв. 2000 г.) і «круглага стала» «Ідэя беларускасці і ідэя польскасці на мяжы тысячагоддзяў: да вызначэння паняццяў» (Мінск, 6–7 верасня 2006 г.). Мн., 2001. С. 37.

[11] Адбылося гэта ў прамежку часу ад прызначэння ваяводам С. Давойны ў 1542 г. да рэвізіі Полацкага ваяводства ў 1552 г., у матэрыялах якой Фронцка выступае ўжо як прадстаўнік полацкай шляхты (Полоцкая ревизия 1552 года. М., 1905. С. 48, 60, 123–124). Адметна, што рэвізія дае магчымасць прасачыць, як Фронцка стаў землеўладальнікам: уся яго маёмасць была набытая ў полацкіх земянаў і мяшчанаў.

[12] Варонін В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. Т.5. 1998. Сш.1. С. 33; Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI — першая палова XVII стст.) // Commetarii polocenses historici. 2004. T. I.C. 74.

[13] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI — першая палова XVII стст.) // Commetarii polocenses historici. 2004. T. I.C. 73, 78.

[14] Статут Великого Княжества Литовского 1529 г. Мн., 1960. С. 48; Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мн., 2003. С. 81; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэкст. Давед. Камент. Мн., 2003. С. 118–119.

[15] Янушкевіч А. Ваенныя дзеянні паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у 60-я гады XVI стагоддзя // Białorskie zeszyty historyczne. Z. 14. 2000. S. 37.

нага войска, якое абараняла Полацак падчас аблогі 1563 г.[16]. Яны ж ўдзельнічалі і ў завяршальнай фазе Лівонскай вайны, у тым ліку ў штурме Полацка ў 1579 г.[17] Без сумненняў, істотна паспрыяла росту польскай прысутнасці адкрыццё езуіцкага калегіюма ў 1581 г., паколькі асноўная частка святароў паходзіла з Польшчы[18].

У полацкі шляхецкі асяродак палякі пачалі актыўней пранікаць, хутчэй за ўсё, у канцы XVI ст. і першыя дзесяцігоддзі XVII ст., асабліва пасля далучэння Невельшчыны да ВКЛ. Па дадзеных гербоўнікаў, у Полацкім ваяводстве на працягу адзначанага часу аселі выхадцы з некалькіх каронных сем'яў: Беганьскія, Кланоўскія, Кунінскія, Ласоўскія. Можна высветліць нават геаграфію паходжання польскіх шляхціцаў, аселых на Полаччыне: Беганьскія герба Праўдзіц — пачаткова з Плоцкага ваяводства, дзе мелі родавае гняздо, пазней аселі ў Беганове ў Енджэеўскім павеце[19]; Кланоўскія герба Лешчыц — з Дабжыньскай зямлі[20], Кунінскія герба Ладдзя — з Сандамірскага ваяводства[21], Ласоўскія герба Прус-III пераехалі «у Літву і Беларусь» з Вансоскага павета[22]. Дарэчы, носьбітаў пералічаных прозвішчаў сапраўды няма сярод полацкай шляхты ў сярэдзіне XVI ст.[23]. У сярэдзіне XVII ст. нашчадкі караняжаў ужо настала адносяцца да ліку полацкіх абывацеляў: у прысяжным рэестры 1655 г., напрыклад, фігуруюць Самуіл Астаф'евіч Ласоўскі і Іван Андрэевіч Кунітцкі (верагодна, сын полацкага скарбніка Андрэя Кунінскага)[24]. Нават калі дапусціць, што польскіх сем'яў было болей, то яны складалі мізэрны адсотак ад усіх полацкіх абывацеляў. На жаль, адсутнасць крыніц не дазваляе нам прасачыць, якімі шляхамі першыя прадстаўнікі гэтых родаў сталі землеўладальнікамі ў Полацкім па-

---

[16] Янушкевіч А. Захоп Полацка маскоўскім войскам у 1563 г. // Commentarii polocenses historici. T. II. 2005. С. 7.

[17] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка. Мн., 2002. С. 180.

[18] Блинова Т.Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. Гродно, 2002. С. 59-60.

[19] Boniecki A. Herbarz Polski. Cz.¿. T.I. Warszawa, 1899. S. 204.

[20] Boniecki A. Herbarz Polski. Cz.¿. T.X. Warszawa, 1907. S. 144-145.

[21] Boniecki A. Herbarz Polski. Cz.1. T.XI. Warszawa, 1907. S. 85.

[22] Boniecki A., Reisk A. Herbarz Polski. Cz.¿. T.XVI. Warszawa, 1913. S. 80.

[23] Полоцкая ревизия 1552 года. М., 1905.

[24] Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Т. 4. Крестоприводная книга шляхты Великого Княжества Литовского 1655 г. / Ред. серии И. Граля. Составители Е.Е. Лыкова, М. Кулецкий. Москва-Варшава, 1999. С. 55, 57.

веце. Наўрад ці яны адразу мелі вялікія фартуны ў ВКЛ, але іх нашчадкі актыўна збіралі добра ў розных рэгіёнах княства, у тым ліку, у Полацкім ваяводстве. Тыповым прыкладам можа быць канцэнтрацыя маёмасці ў руках Юзафа Кланоўскага. Матэрыяльны дабрабыт гэтага чалавека павялічваўся з зайздроснай паслядоўнасцю, што адбывалася сінхронна з яго прасоўваннем па кар'ернай лесвіцы. 6.IX.1617 г. ён атрымлівае па кадуковым праве маёмасць полацкага мешчаніна Васіля Пацехі, 3.IV.1625 г. па дажывотным праве — вёску Сідар на Жмудзі ад пані Эвы Пшэбароўскай (Багушовай Акмянскай), 25.III.1626 г. — ажно чатыры дамы ў Полацку (у тым ліку, дом шатланца Карнэлія Шота на Баровай вуліцы), 31.III.1627 г. — кансэнс на перадачу яму вёскі Кушлікі ў Полацкім ваяводстве ад Пятра Паеўскага, 23.VI.1633 г. — маёмасць Крашуты пасля смерці полацкага лентвойта Яна Хармінскага[25].

Нашчадкі польскіх шляхціцаў пачаткова займалі малазначныя пасады ў павятовай іерархіі: Юзаф Кланоўскі быў полацкім стольнікам з 23.XI.1618 г.[26], 5.XII.1635 г. Андрэй Кунінскі прызначаны на ўрад полацкага скарбніка[27], Пётр Беганьскі з 15.III.1636 г. — полацкі чэсьнік[28], а з 3.I.1640 г. — падстолі[29]. Аднак, пазней Кланоўскі і Беганьскі па чарзе займаюць адзін з галоўных павятовых урадаў: падкаморыя полацкага[30]. Сам факт такога хуткага далучэння да павятовай эліты можна дастаткова проста растлумачыць. Усе пералічаныя асобы былі ў той ці іншай ступені звязаныя з дваром ці ўплывовымі асобамі. Той жа П. Беганскі атрымаў пасаду полацкага чэсьніка, ужо з'яўляючыся па чарзе пакаёвым дваранінам Жыгімонта і Уладзіслава Вазаў. У сваю чаргу, Ю. Кланоўскі пачатковую кар'еру зрабіў у якасці скарбовага пісара ВКЛ, заслугі якога ахарактарызаваны наступным чынам: «маючи залецоные службы урожоного Езофа Клоновъского, которые он намъ и Речы Посполитое з молодости лет своих будучы под зверхностью вельможного старосты жомойтъского (Яраша Валовіча — **В.Г.**), а на он час подскарбего земъ-

[25] НГАБ, КМФ-18, спр. 92, арк. 108-108 адв.; спр. 100, арк. 352-352 адв.; спр. 100, арк. 480–481; спр. 102, арк. 56–56 адв.; 106, арк. 433 адв. — 434.

[26] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ), КМФ-18, спр. 95, арк. 147 адв. — 148.

[27] НГАБ, КМФ-18, спр. 111, арк. 494 адв. — 495 адв.

[28] НГАБ, КМФ-18, спр. 111, арк. 548 адв. — 549

[29] НГАБ, КМФ-18, спр. 113, арк. 477–477 адв.

[30] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI — першая палова XVII стст.) // Commetarii polocenses historici. 2004. Т. I.С. 74.

ского потомъ за падканцлерства его розные, а важъные на собе справы нашые и Речи Посполитое носечы з яснымъ повинности его шляхецкое осведченемъ, верне дбале, працовите, з нелитованемъ кошту и здоровя своего отдавалъ, и на сесъ час отдават не переставаетъ» [31].

Пералічаныя вышэй асобы адзначаліся палітычнай актыўнасцю, рэпрэзентавалі Полацкае ваяводства на розных форумах, праўда, не ўсе ў роўнай меры[32]. Бадай, найбольшы вопыт парламентскай дзейнасці быў у Ю. Кланоўскага, які прадстаўляў Полацкае ваяводства амаль на кожным сойме з другой паловы 30-х і ў 40-я гады XVII стагоддзя[33]. Аднак як парламентарыст ён быў вядомы і раней. У чэрвені 1633 г. у прывілеі на імя Ю. Кланоўскага невыпадкова адзначалася: «на сойміках партыкулярных і на соймах генеральных засведчыўся слушнымі парадамі, вернасцю і зычлівасцю»[34]. Тое, што менавіта Ю. Кланоўскі, П. Беганскі, А. Кунінскі прадстаўлялі ваяводства і, у пэўнай ступені, манапалізавалі прадстаўніцтва ад Полацкага павета, можа сведчыць як пра давер да іх асобаў з боку каралеўскага двара, пазіцыі якога былі моцныя на полацкім сойміку, так і пра дасведчанасць гэтых шляхціцаў у палітычным жыцці.

Нельга абмінуць і таго істотнага моманту, што выхадцы з Польшчы з'яўляліся каталікамі па веравызнанні і ўжо гэтым самым уплывалі на «тутэйшых» шляхціцаў.

У прынцыпе, прыведзеных дадзеных дастаткова для ўсведамлення пазіцыяў некаторых прадстаўнікоў шляхты польскага паходжання на Полаччыне. Разам з тым, нам хацелася б паказаць больш дэтальна ў свеце арыгінальных крыніц лёс палякаў на Усходзе. Гэта можна зрабіць на прыкладзе разгалінаванага ў Кароне рода Бажымоўскіх, які ў XVII ст. усталяваўся ў Полацкім павеце. Унікальнай крыніцай для вы-

---

[31] НГАБ, КМФ-18, спр. 95, арк. 147 адв. — 148.

[32] Пра П. Беганскага і А. Кунінскага гл.: Галубовіч В.У. Пасольская інструкцыя ад шляхты полацкага ваяводства на сойм 1640 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі // Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Полацк, 2003. С. 44; Галубовіч В. Каранацыйны сойм 1633 г. і полацкая шляхта // Матэрыялы Другой Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Сімяон Полацкі: Светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць» (Полацк, 18–19 лістапада 2004 г.). Полацк, 2005. С. 30-31.

[33] Галубовіч В. Пасольская рэпрэзентацыя ад Полацкага ваяводства на соймах Рэчы Паспалітай у 1588-1668 гг. // Сельское хозяйство — проблемы и перспективы: сб. науч. тр. Т. 4. Гродно, 2006. С. 344.

[34] НГАБ, КМФ-18, спр. 106, арк. 433 адв. — 434.

святлення гэтага з'яўляецца тэстамент Станіслава Бажымоўскага[35]. Дакумент быў складзены ў Варшаве 18.ІІ.1652 г. і засведчаны менавіта полацкімі шляхціцамі — Пятром Беганьскім і Янам Дзягілевічам, якія прыбылі ў сталіцу з нагоды правядзення чарговага сойма (адбываўся з 26.І. па 14.ІІІ.1652 г.). У кнігі канцылярыі ВКЛ тэстамент быў актыкаваны 26.ІІ.1652 г. Тэстамент утрымлівае важныя звесткі пра карані і «полацкія сувязі» С. Бажымоўскага. Як аказалася, гэты «земянін Яго Каралеўскай Міласці Полацкага ваяводства» паходзіў з Бажымова, званага Дэдабжанамі ў «зямлі Віскай», якая з'яўлялася часткай Мазавецкага ваяводства. Дакументы, пацвярджаючыя наданне шляхецтва яго продкам, былі дадзеныя «Прускімі князямі» і ўнесеныя да актавых кніг зямлі Віскай, а арыгінал захоўваў брат Бажымоўскага — Марцін. Жонка тэстатара — Барбара Ярашынская, народжаная Бялабжэская, паходзіла з Бялабжэгу ў Астраленскім павеце, «дзе яе Айчына і запісана мацярынскае вена». Усе гэтыя ўнесеныя ў тэстамент падрабязнасці, як відаць, мелі значэнне толькі для доказу шляхецтва Марціна Казіміра — адзінага сына і нашчадка С. Бажымоўскага. Адметна, што польскі шляхціц перавёз з сабой на Полаччыну сям'ю, што, аднак, не абмежавала кола яго знаёмых сярод палачанаў.

Тэстамент дазваляе паглядзець больш падрабязна на памеры ўрастання С. Бажымоўскага ў «полацкае асяроддзе». С. Бажымоўскі меў сталыя адносіны з полацкімі мяшчанамі, шляхтай і нават езуітамі. Так, з 10 000 злотых, якія яго сын павінен быў атрымаць, 2 тысячы знаходзілася ў полацкага бурмістра Івана Міхневіча, яшчэ 2 тысячы ў полацкага мешчаніна Паўла Трасніцы і яшчэ адна тысяча злотых была ў полацкага мешчаніна Івана Наплоцкага.

Сярод давераных асобаў С. Бажымоўскага тэстамент згадвае «асаблівага дабрадзея», полацкага гродскага суддзю Яна Буйноўскага, якому давяралася дапамога ў правядзенні пахавання. Справа ў тым, што С. Бажымоўскі, адчуваючы хуткую смерць, загадваў перавезці сваё цела з Варшавы да Полацка. «Апошняя вандроўка» С. Бажымоўскага сапраўды магла быць непрадказальнай, калі б не зімовая пара: на шля-

[35] НГАБ, КМФ-18, спр. 126, арк. 18–22.

ху на Усход трэба было пераадолець каля 800 кіламетраў. Паклапаціўся тэстатар і пра тое, каб «успамін пра наша жыцце заставаўся на свеце». Згодна з яго апошняй воляй, пасля дастаўкі ў Полацк цела належала пахаваць ў склепе у «Іх Міласцяў Айцоў Езуітаў Полацкага Калегіюма», там, дзе ўжо спачывала жонка С. Бажымоўскага. Відаць, С. Бажымоўскага як веруючага чалавека з полацкімі езуітамі звязвалі нейкія асабістыя адносіны. Полацкія езуіты на падставе тэстамента атрымлівалі на касцельныя цырымоніі 1000 злотых, якія непасрэдна ў рукі рэктара калегіюма абавязаны быў як найхутчэй перад пахаваннем перадаць сын нябожчыка. Акрамя гэтага, С. Бажымоўскі ахвяраваў 100 злотых на шпіталь пры Полацкім калегіюме і яшчэ 50 злотых на праваслаўны (рускі) шпіталь, які знаходзіўся ля Полацкага замка. Усю нерухомую маёмасць С. Бажымоўскі перадаваў сыну. Як вынікае з тэстаменту, пакінутага было нямала: уладанні гэтага «полацкага земяніна» знаходзіліся ў Інфлянтах, каля Невеля і Себежа ў Полацкім ваяводстве. Верагодна, найбольшая і лепшая частка маёмасці ўсё ж знаходзілася не ў Інфлянтах, паколькі С. Бажымоўскі звязваў сябе менавіта з Полаччынай.

Усталявацца ў Полацкім ваяводстве С. Бажымоўскі здолеў дзякуючы ўласным вайсковым заслугам і палітыцы Жыгімонта Вазы па каланізацыі новадалучаных да Рэчы Паспалітай земляў. «Сцвярджаць гэта дазваляюць апублікаваныя яшчэ ў XIX ст. у «Гістарычна-юрыдычных матэрыялах» прывілеі[36]. З Полаччынай С. Бажымоўскі, як высвятляецца, настала быў звязаны на працягу больш чым 30 гадоў. Напрыканцы 1620 г., а дакладней — 7. XII.1620 г., кароль падпісвае прывілей, згодна з якім С. Бажымоўскі атрымаў па ленным праве з дазволам перадаваць маёмасць сваім нашчадкам па мужчынскай лініі шэраг уладанняў падданых маскоўскага цара на Невельшчыне ў Часопскім стане: маёнткі Аляксея Няпеніна, Пракопа Лаўрона, Нікана Ладышынскага, а таксама вёску Мошына з маёнтка Фёдара Ладышынскага. Заслужыў ён такое шчодрае падараванне дзякуючы ўдзелу ў Інфлянцкай і Маскоўскай экспедыцыях, дзе служыў пад кіраўніцтвам рэферэндарыя ВКЛ Аляксандра Корвіна Гасеўскага, і асабістымі рэкамендацыямі каралевіча Уладзіслава[37]. Апошняе мае даказваць удзел С. Бажымоўскага ў паходзе Уладзіслава на Маскву ў 1617–1618 гг. За атрыманыя маёнткі

[36] Историко-юридические материалы. Т. XXI. Витебск, 18. С. 275-277, 312-314.

[37] Историко-юридические материалы. Т. XXI. Витебск, 18. С. 276.

новы ўладальнік павінен быў асабіста, ці прадстаўляючы наўзамен «добрага шляхціца», удзельнічаць у абароне Невельскага замка, дзе абавязваўся мець дом, прыслужніка з мушкетам і іншай зброяй, а таксама харчовы запас на палову года[38].

Атрыманая маёмасць была не толькі ўзнагародай, але і заўсёднай праблемай з-за блізкай маскоўскай мяжы. Усведамляючы гэта і «бачачы нетрываласць таго месца», С. Бажымоўскі ў сваім тэстаменце даручаў сыну забраць з Невеля звон, які быў перададзены туды толькі на час[39].

Гісторыя землеўладальнікаў Бажымоўскіх на Полаччыне фактычна скончылася ў 1654 г., калі Невель быў захоплены маскоўскім войскам, а юрыдычна праз сем гадоў — 22.IV.1659 г., калі Мацей Казімір Бажымоўскі атрымаў згоду Яна Казіміра Вазы на перадачу сваіх маёнткаў Марціну Рэйтану. Гэты прывілей утрымлівае дакладныя назвы тых добраў, ад якіх пазбаўляўся М.К. Бажымоўскі: Лаўцы, Тапары, Беразова, Балоздыні і Падлужжа[40]. Здзелка была замацавана актыкацыяй каралеўскага «кансэнса» ў кнізе дзяржаўнага архіва ВКЛ[41]. Матывы такой трансакцыі невядомыя, аднак можна напэўна сцвярджаць пра не апошнюю ролю ў гэтым ваеннага часу.

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што гісторыя Полаччыны стваралася не толькі яе карэннымі жыхарамі. Яна багатая ўсімі тымі традыцыямі, якія прыносілі сюды прадстаўнікі самых розных культур, а іх вывучэнне не можа не зацікавіць сучасных даследчыкаў.

---

[38] Историко-юридические материалы. Т. XXI. Витебск, 18. С. 277.

[39] НГАБ, КМФ-18, спр. 126, арк. 21.

[40] Историко-юридические материалы. Т. XXI. Витебск, 18. С. 313.

[41] НГАБ, КМФ-18, спр. 130, арк. 392–392 адв.

# Полаччына на старонках краязнаўчага часопіса «Наш Край» у 1920-я гг.

**Дзянісаў Антон Уладзіміравіч,**
*аспірант*
*кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт*

Часопіс «Наш Край» з'яўляўся афіцыйным друкаваным органам створанага ў 1923 г. Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК) і выдаваўся ён у Менску з кастрычніка 1925 г. па кастрычнік 1930 г. За час свайго існавання, менавіта гэты часопіс быў паказчыкам плённай і вельмі актыўнай дзейнасці беларускіх краязнаўцаў. Рэдактарамі часопіса былі Мікалай Азбукін, а пазней Змятрок Бядуля (Самуіл Плаўнік). Выдаўцы «Нашага краю» ставілі задачы па вывучэнню прыродных і прадукцыйных сіл Беларусі, духоўнай традыцыі яе народаў, імкнуліся папулярызаваць краязнаўчыя даследаванні сярод шырокіх працоўных масаў насельніцтва. Яны імкнуліся вывесці краязнаўчы рух з адносна вузкіх акадэмічных межаў, чым, на іх думку, характарызавалася краязнаўства дарэвалюцыйнае, і зрабіць яго масавай з'явай. Матэрыялы, якія публікаваліся ў часопісе, адлюстроўваюць 3 асноўныя напрамкі даследаванняў: прыроднагеаграфічны, грамадска-эканамічны і культурна-гістарычны. Шмат увагі надавалася ў «Нашым краі» формам і метадам краязнаўчай працы, стварэнню краязнаўчых гурткоў і таварыстваў, збору матэрыялу. Было апублікавана больш за 100 розных анкетаў, інструкцый і праграмаў па розных галінах краязнаўчай дзейнасці, якія на той час былі неабходнымі шараговым краязнаўцам на месцах. Адметнай увагі заслугоўвае раздзел «Хроніка», дзе друкавалася інфармацыя аб дзейнасці ЦБК, акруговых і раённых краязнаўчых таварыстваў, падводзіліся вынікі дзейнасці, асвятляліся краязнаўчыя канферэнцыі і з'езды.[1]

Навукоўцы лічаць, што матэрыялы даследаванняў, апублікаваныя ў часопісе, не страцілі сваёй навуковай і метадычнай каштоўнасці і на сённяшні момант[2]. На жаль, шмат помнікаў мінуўшчыны, апісаных

[1] Соркіна І. Праблемы мястэчак Беларусі на старонках часопіса «Наш край». // Гістарычны альманах. Гародня, 2004. Е. 10. С. 141-142.

[2] Ліднэр. Р. Гісторыкі і ўлада: нацыянальны працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. СПб., 2003. С. 195.

даследчыкамі 1920-х гг., ужо не існуе. Значна змяніліся і краявіды, жывёльны і раслінны свет Беларусі. Таму інфармацыя аб іх, якая размешчана на старонках «Нашага краю», сёння набывае характар унікальнай. Вялікая колькасць матэрыялу прысвечана Міншчыне, Барысаўскай акрузе, Случчыне, Магілёўшчыне. Полаччына займае на старонках часопіса «Наш край» сваё адметнае месца.

Першая публікацыя, прысвечаная Полаччыне, з'яўляецца ў першым нумары часопіса «Наш край» за кастрычнік 1925 г. Гэта артыкул вядомага мастацтвазнаўцы Мікалая Шчакаціхіна «Фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра». Ён зрабіў грунтоўнае даследаванне аднаго з найбольш старадаўніх архітэктурных помнікаў Беларусі і прыйшоў да высноў адметнасці полацкай архітэктурна-мастацкай школы, якая сфарміравалася ў XII ст., ад наўгародскай і кіеўскай[3]. Публікацыя была дапоўнена фотаздымкамі. Больш грунтоўна да гэтай тэмы М. Шчакаціхін звярнуўся ў сваёй манаграфіі «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва».

Вынікі выкрыцця і даследавання рэдкага віду раслін змяшчае. артыкул М. Збітоўскага «Морва на Полаччыне».

Прыродазнаўчы або прыродна-геаграфічны напрамак маюць працы Р.Н. Гацко «Водная расліннасць Полацкай акругі» — па матэр'ялах экспедыцыі Навуковага Краязнаўчага таварыства БДУ, А. Мацейчыка «Аб расліннасці ў ваколіцах возера Крывога Полацкае акругі». Артыкулы змяшчаюць падрабязнае апісанне вынікаў даследаванняў раслiннага і жывёльнага свету Полаччыны.

Культурна-гістарычнаму напрамку дзейнасці адпавядаюць артыкулы І. Карадзей «Помнікі старасветчыны і краявіды Вульскага і Расонскага раёнаў Полаччыны». Аўтар адзначаў, што «Полаччына вельмі багата рознымі помнікамі старасветчыны і прыгожымі краявідамі. З гэтага боку ёй трэба аддаць першае месца на Беларусі». Сярод курганоў, велізарных камянёў і каменных крыжоў у артыкуле вылучалася «Багатыр-гара»вышынёю 18 м з легендай, што гэта — месца пахавання «жанчыны-багатыркі». Такога ж кшталту публікацыя В. Гасцёнка «Некаторыя з помнікаў Асвейскага раёну». Аднымі артыкуламі рэдакцыя часопіса не абмяжоўвалася, у 1-м нумары за 1926 г. былі на-

[3] М. Шчакаціхін. Фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра. // Наш край. 1925. № 1. С. 17–27.

друкаваны матэрыялы да гістарычнай бібліяграфіі Полаччыны, больш за 60 твораў і кніг расійскіх, польскіх і нямецкіх даследчыкаў, якія вывучалі Полацкі край[4].

Па-чацвёртае, руны, як і арнамент, у сваёй большасці маркіраваліся чырвоным колерам — гэта найбольш архаічны і ўўніверсальны спосаб мадэліравання рытуальных аб'ектаў. Акрамя таго, у рунічных ведах існуе чыстая немаркіраваная руна. Яна разглядаецца як непазнанае ці бог Одзін. Пустата — гэта канец, пустата — гэта пачатак. У гэтай незапоўненасці руны змяшчаецца магічны патэнцыял. Пустая і адначасова поўная зместу, яна ахоплівае паўнату быцця, усё, што павінна было здзейсніцца.[**19**, с. 35–37] Сэнсавае ўяўленне немаркіраванай руны вельмі падобна на немаркіраваную белую тканіну ручніка. [**20**, с. 62–73]

Па-пятае, духоўны і эмацыйны стан майстроў пры нанясенні знакаў, рун ці арнаменту, был ў аднолькавым, ён патрабаваў канцэнтрацыі і духоўнай чысціні стваральніка і павінен быў перадацца рэчы. [**18**, с. 127–137; **21**, с. 6–7 ]

Такім чынам, на думку аўтара, руны — гэта больш падобная універсальная сістэма сімвалаў, з дапамогай якой мы можам прачытаць геаметрычны арнамент беларускіх ручнікоў.

Параўноўваючы асноўныя беларускія геаметрычныя арнаментальныя матывы з рунамі, мы знаходзім шмат аналагаў у Старэйшым Футарку. Так, дамінуючым арнаментам у беларусаў з'яўляецца ромб — сімвал жаночага пачатку, зямлі, урадлівасці, падобны рунічны знак інгаз — бог зямлі, паспявання. Пясочны гадзіннік — сімвал багіні, яе жыццёвай энергіі і здольнасці да рэгенерацыі, дагас — дзень, новы пачатак; крыж — зямля, геба — дар, партнёрства і г. д.

Адным з так званых рунічных знакаў з'яўляецца свастыка, як чатырох, так і трохгалінкавая. Выява свастыкі ў славянскім свеце сустракаецца паўсюдна, але не часта. Гэта і натуральна, бо свастыка — сімвал агню, і ў некаторых выпадках урадлівасці — знак занадта «моцны» і больш значны для выкарыстання.

Калі разглядаць больш складаныя сімвалы, то іх трэба раскласці на састаўныя часткі. Разгледзім некаторыя з іх. Так, знак сонца ў беларускім арнаменце ўяўляе сабой ромб з праменнямі. У рунічных ведах знак ромба мае інгваз — васемнаццатая руна, пад якой Одзін разумеў урадлівасць. Прамяні — гэта руна ангуз — у магіі яе выкарыстоўвалі дзеля ўсілення магічнай энергіі. Такім чынам, пры спалучэнні ангуз і інгваз мы маем сімвал урадлівасці ўзмоцнены вызваленай магічнай энергіяй. Па сутнасці сваёй гэты сэнс вельмі падобны на тлумачэнне сімвала сонца.

Возьмем супрацьлеглы сімвал беларускага арнаменту — зямля. Гэта ромб, але прамяні накіраваны ўнутр ромба. Зноў мы маем спалучэнне рун ангуз і інгваз, але ў дадзеным выпадку ангуз перавернуты, гэта значыць, мае супрацьлеглае значэнне, калі ў рунах песні Одзіна — гэта руна «вызвалення», то яе амбівалентны сэнс будзе «зняволенне». Такім чынам, па сваёй сутнасці спалучэнне рун можна вызначыць як «зняволенне ўрадлівасці», гэта значыць, карані раслін, якія дадуць ураджай, знаходзяцца ў зняволеным стане — у зямлі. Таму так часта ў беларускім арнаменце два сімвалы, сонца і зямля, ідуць побач.

Разглядзім, для прыкладу, узор язычніцкага боства Ярылы. Ён утварае спалучэнне рун інгваз і кенас. Калі са зместам інгваз мы знаёмы — яна руна ўрадлівасці, то кеназ — руна якая адносіцца да рун Одзіна, яе выява — правобраз сляда ступні, які сустракаецца ў наскальных малюнках. Раней лічылася, што наступіўшы на след другога, можна знайсці ўладу над ім. Такім чынам, сэнсавае значэнне спалучэння гэтых рун — «пакіданне сляда ўрадлівасці». На першы погляд, гэта тлумачэнне не ўказвае нам на бога земляробаў Ярылу, але, згодна з беларускімі народнымі песнямі, куды Ярыла наступаў нагою, там падымалася «жыта капною», што, па сутнасці, і з'яўляецца нічым іншым, як «пакіданне сляда ўрадлівасці» [**22**, с. 312 ]. Такім чынам, спалучэнне рун інгваз і кенас — гэта сімвал Ярылы.

Возьмем з'яву прыроды — дождж. Будзе дождж ісці, будзе хлеб расці. Адразу гэта прыказка растлумачвае нам сімвал кроплі, замкнёны ў ромб, — урадливасць. Кропля ж прадстае нам у выглядзе двюх перакрыжаваных рун — дагас. У гэтай руны боскае імя — імя бога дня Дага. У венедаў гэты бог шанаваўся пад імем Дажджбога[**17**, с. 160–161]. Дажджбог — з'яўляецца вярхоўным боствам славянскага пантэону. Ён назірае за Хорсам, кантралюючы яго ўсходы і заходы, прамяністасць і цепладайнасць Ён жа пасылае на зямлю і жыватворную сілу дажджу [**23**, с.74]. Такім чынам, сімвал увыглядзе пастаўленага на вугал квадрата, скампанаванага з чатырох трохвугольнікаў мае, ў агульным плане значэнне боства Дажджбога, а ў асобным — дажджу. Цікава адзначыць, што ўзор моцнай сям'і вельмі падобны да сімвалу дажджу ў арнаментальных беларускіх матывах, і гэта нездарма, бо Дажджбог быў яшчэ ахоўнікам вяселляў [**1**, с. 155].

Такім чынам, сімвалы традыцыйнага беларускага арнаменту можна прачытаць з дапамогай рунічных знакаў.

Разгледзім спалучэнне сімвалаў на ручніках. Для прыкладу, возьмем тры з фондаў ЦРНК, датуемыя пачаткам XX ст., атрыманыя ад жыхаркі горада Полацка Вяль Алы Цімафееўны, майстрам якіх была яе бабуля, Бярэзіна Зінаіда з в. Слабада Шумілінскага раёну.

На першым ручніку прадстаўлены два віды ромба, першая рамбічная фігура падзеленая на чатыры часткі — сімвал сям'і , асновы ўсяго народнага жыцця. Другі ромб складзены з маленькіх ромбікаў — сімвал зямлі — карміцелькі, поля, роўна засеянага дбайнай рукой селяніна. Уверсе невыяўлены па М. Кацару ўзор. Магчыма, гэта продкі і іх абярэг [**1**, с. 21].

Зробім спробу з дапамогай рун таксама прачытаць дадзены ручнік. З выявай першага ромба мы ўжо знаемы — гэта сімвал Дажджбога, які адначасова быў і ахоўнікам сям'і.

Другі ўзор — гэта спалучэнне двух вядомых рун геба і інгваз — дар урадлівасці. Больш складаным з'яўляецца невядомы знак зверху, які атрымліваецца дзякуючы спалучэнню трох рун — кенас, геба і атала. Пры сэнсавам злучэнні — гэта моц продкаў якая дае дабро. На вызначынасць і іншасць указвае і маркіраванне дадзенага знаку іншым колерам.

Такім чынам, агульны сэнс дадзенага ручніка ў двух разнастайных варыянтах прачытання падобны. У ім майстрыха прасіла сваіх продкаў аб дапамозе захаваць ураджай дзеля добрай магутнай сям’і.

Другі ручнік можна адразу назваць ураджайным, бо яго галоўным элементам з’яўляецца «вялікае сонца» альбо спалучэнне сімвалаў сонца і зямлі. Знізу і зверху да іх далучаецца элемент у выглядзе літары «м», у М. Кацара — гэта знак вадзяніка, вільгаці [**1**, с. 72]. Звычайныя маленькія ромбікі ўверсе — гэта зерне. Такім чынам, гэта пажаданне добрага ўраджаю з дапамогай сонца, зямлі і дажджу.

Разгледзім гэты ж ручнік з дапамогай рунічных ведаў. Першы цэнтральны ўзор мы ўжо разглядалі — гэта вызваляючая энергія сонца, якая трымае ў сабе плоднасць. Літара «м» — руна эвас, праобразам якой, магчыма, быў конь, намаляваны ў пячоры гары Магдаліны ў Карынціі. У старажытнасці конь увасабляў боскую дапамогу, дзейсную праяву саміх багоў на матэрыяльным узроўні. Такім чынам, гэта «вызваленая» боская дапамога ўрадлівасці.

Трэці ручнік — адзін з самых цікавых. Асаблівасць дадзенага тыпу заключана ў люстэркавай кампазіцыі арнаментальных канцоў, якая з’яўляецца выключэннем сярод іншых беларускіх ручнікоў; яны амаль абавязкова маюць аднолькавыя па сваіх кампазіцыях канцы. Ручнікі вылучанага тыпу можна назваць «замкнутымі». Арнамент іх набывае семантычную завершанасць і прачытваецца толькі ў пазіцыі звязання, змыкання канцоў ручніка. Аб прызначэнні  гэтых тканін можна толькі здагадвацца, бо звесткі пра іх абрадавае ўжыванне ў свой час не былі сабраны. Ручнікі такога тыпу звязаны з вясельнай сімволікай старажытнага дахрысціянскага ўяўлення аб аб’яднанні родаў, сем’яў у адзінае цэлае. Гэтая асноўная ідэя шлюбу, сімвалічна выяўленная ў вясельным абрадзе звязаннем рук маладых [**24**, с. 92 ].

Разгледзім дадзены ручнік з дапамогай рун. Найбольш бачныя сімвалы — гэта крыж і ромб (геба і інгуз), а вось ансуз і адал больш нівеліраваныя. Пачнём з крайніх ніжніх і верхніх сімвалаў. Спачатку ідзе руна адала, затым крыж (геба) , які плаўна пераходзіць у руну ансуз, і шляхам чаргавання апошняй руны атрымліваецца ромб. Такім чынам, ручнік складаецца са спалучэння рун ансуз, геба і адал. Але ў гэтым выпадку не трэба разглядаць руны па адной , бо ў сукупнасці

яны ўтвараюць рунічную формулу, якую трэба чытаць з цэнтра ручніка: ансус, геба і адал. Гэта формула прызначалася для ўмацавання і гарманізацыі адносін у сям'і, росту ўзаемаразумення, павагі і кахання ў шлюбе.

Такім чынам, два спосабы прачытання маюць адзіны сэнс, гэта значыць, што некаторыя невядомыя арнаментальныя сімвалы беларускага геаметрычнага арнаменту можна прачытаць з дапамогай рунічных ведаў.

У беларускай этнаграфіі сабралася некаторая колькасць даволі цікавых сімвалаў, якія, на жаль, па сённяшні дзень не маюць дакладнай расшыфроўкі ў сувязі з блытаннем сэнсу саміх інфарматараў ці ўвогуле страты інфармацыі. Такім прыкладам могуць быць ручнікі з Пастаўскага і Шаркаўшчынскага раёнаў, якія маюць адзін і той жа малюнак, вядомыя значнай колькасці навукоўцаў, бо яны друкаваліся і ў Кацара і ў Лабачэўскай, варыянты падобных ручнікоў змяшчаюцца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Іх асновай з'яўляецца сімвал — ромб з трыма адросткамі ўнізе і трыма ўверсе , і па аднаму з кожнага боку. Але калі прыглядзецца, то мы бачым ужо вядомае спалучэнне рун геба і інгваз – дар урадлівасці. Гэту гіпотыэзу могуць пацвердзіць і лініі, яднаючыя дадзеныя сімвалы, наконт гэтага гавораць і напрамкі рысак, яднаючыя дадзеныя сімвалы, перакрыжаваныя ў выглядзе спалучэння рун геба і інгуз.

Незвычайны сімвал, які нагадвае матылька, сустракаецца яшчэ на адным ручніку Полацкага раёна. У аснову яго пакладзена руна атала — ахова продкаў, да яе далучаецца руна кенас з двума ромбамі (інгвас) па канцах. Такім чынам, гэта дапамога і ахова продкаў ураджаю (урадлівасці).

Як найбольш тоесныя сімвалы - руны ўтвараюць элементы беларускага арнаменту. Хучэй за ўсё, руны маглі існаваць на тэрыторыі Беларусі і ў час станаўлення этнічных племянных аб'яднанняў: крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Па сваіх функцыях магічныя рэчы з рунамі і ручнікі аднолькавыя, а «чытанне» вядомых па зместу беларускіх геаметрычных сімвалаў, падобнае па сэнсу з расшыфроўкай гэтага сімвала з дапамогай рунічных ведаў. Хацелася адзначыць адну асаблівасць, у беларускім арнаменце сустракаюцца практычна толькі руны Старэйшага Футарка, што можа яшчэ раз з'явіцца доказам аб старажытнасці, а гэта сведчыць аб універсальнасці дадзеных знакаў.

Такім чынам, беларускі геаметрычны арнамент можна прачытаць з дапамогай рунічных сімвалаў, і дадзеныя веды выкарастаць у расшыфроўцы невядомых знакаў беларускага арнаменту.

**Літаратура**


**1.** Кацар М.С. Беларускі арнамент . Ткацтва. Вышыўка/ Навук. рэд. Я.М. Сахута. — Мн. : Бел Эн, 1996. — 208 с.

**2.** де Моран. История декоративно – прикладного искусства/ пер с фр. — М.: Искусство, 1982. — 577с.: илл.

**3.** Фадеева Татьяна. Образ и символ. Универсальный язык в символике и в истории культуры. — М.: Новалис, 2004. — 256 с.

**4.** Пілецкі В. Змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу дахрысціянскай Беларусі. Гісторыя: праблемы выкладання, № 3, 2004.

**5.** Дернович С.Д. Скандинавские древности эпохи викингов в Беларуси/ С. Д. Дернович. — Мн.: Бел. наука, 2006. — 86 с.:илл.

**6.** Дзярновіч С. Аб знаходжанні нарманаў у Полацку ў IX–XII стст. Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі, 1998.

**7.** Іоў А. В. «Скарб» вікінга з поймы Бярэзіны/Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі, 2002.

**8.** Дучыц Л.У. Маскавічы// Полацкі летапісец, № 1 (2), 1993.

**9.** Дернович С. Староевропейские древности эпохи викингов с территории Полоцко-Витебского Подвинья/Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі , 2002.

**10.** Каплярчук А. Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў. Мн.: Энцыклапедыкс, 2002. — 266 с.

**11.** Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). — Мн.: Наука и техника, 1978. — 160 с.: илл.

**12.** Сказание исландских или скандинавских саг о Полоцке, князьях полоцких и р. Западной Двине// Полоцко-Витебская старина. — Витебск, 1916. — вып. 3.

**13.** Бегичева В. Илья Муромец//Наука и религия, № 9, 2006.

**14.** Платов А. Славянские руны: два века исследования/ «Варвары».Сборник статей по истории древнего мира и средневековой Европы. М.: Метагалактика, 1999. — 304с.

**15.** Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды — Мн.: Маст. літ., 1990. — 366 с.: іл.

**16.** Урбан П. Да пытання этнічнай прыналежнасці старажытных ліцвінаў. — Мн.: ВЦ «Бацькаўшчына», МП «Бесядзь», 1994. — 107 с.

**17.** фон Наменьи Гезе. Священные руны. Магические символы Севера. — М.: «Велигор», 2005 — 384с.

**18.** Торссон Эдред. Руническое учение: введение в изотерическую рунологию/ пер. с англ. — М.: София, Геллиос, 2002. — 320 с.

**19.** Песчел Э. Руны для начинающих/ Пер. с англ. Ю. Евтушенкова. — М.: ФАИР ПРЕСС, 2003, — 192 с.

**20.** Крук Янка. Симводіка беларускай народнай культуры. — Мн.: Ураджай, 2001. — 350 с.: іл.

**21.** Лысенко О.В., Комарова С. В. Ткань. Ритуал. Человек. Традиции ткачества славян Восточной Европы. — СПб.: Астур, 1992.

**22.** Славянская мифология/Авт. сост. В.В. Адамчик. — Мн.: Харвест, 2005. — 320 с.: илл.

**23.** Каранеўская І. Даждбог// Мастацтва, № 9, 1998.

**24.** Лабачэўская В. Повязь часоў — беларускі ручнік. — Мн.: Беларусь, 2002. — 231 с.: іл.

# Гісторыя аптэкарскай справы на Полаччыне

**Козел Аксана Васільеўна,**
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Краязнаўчы музей*
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

Узнікненне першых аптэк і развіццё аптэкарскай справы на тэрыторыі Беларусі, асабліва на Полаччыне, да сённяшняга часу мала асветлена ў літаратуры. Амаль адсутнічаюць звесткі аб развіцці аптэкарскай справы ў Полацку ў ранні перыяд (XVI–XVIII стст.)

Сярод лекавых сродкаў беларускіх лекараў у эпоху развітога феадалізму, як і раней, значнае месца займалі зёлкі. У выдадзеных беларускім гарадам граматах на самакіраванне, сярод іншых прывілеяў, даваўся дазвол на гандаль «перецем, имберем, микдалом, гвоздикой, кветом мушкатовым, кгалканом, цытваром и иншыя зельямі дорожшие фунтом», як было запісана ў грамаце, дарованай Полацку 14 кастрычніка 1498 года [**5** , с. 135].

Доўгі час лекары самі займаліся гатаваннем лекаў і іншых сродкаў з мясцовай сыравіны расліннага, жывёльнага, зрэдку, мінеральнага паходжання. Вядома, што ў XV ст. з Беларусі ў Маскву прывозілі лекі, якія тады называліся «атрута».

Аптэкі ў Беларусі ў літаратурных крыніцах узгадваюцца ўжо ў сярэдзіне XVI ст. У XVI-XVIII стст. на Беларусі было каля 40 аптэк, у тым ліку ў Полацку. Да XVIII ст. работа аптэкара аддзялілася ад рамяства лекара, а лекі сталі выгадным таварам, трыманне ж аптэк — прыбытковай галіной гандлю. Да канца XVIII ст. у аптэках гатавалі не толькі лекі, але і парфюмерыю, кандытарскія вырабы і алкагольныя напоі, гандлявалі і ўсходнімі араматычнымі сродкамі (шафран, перац, імбір, карыца). Гэтыя традыцыі захаваліся да сённяшняга часу [**3**, с. 66].

Аптэкі належалі не толькі прыватным асобам, але і каталіцкім манастырам, бо езуіцкім калегіумам. Манахі ад аптэк атрымлівалі вялікі прыбытак, так як іншаземныя лекі атрымлівалі значна хутчэй, чым ад сваіх братоў манаскіх ордэнаў.

На тэрыторыі Полацкага езуіцкага калегіума была ўзведзена аднапавярховая аптэка з мансардай, сутарэннем і сушыльняй для зёлак [**9**, с. 5]. Лекавыя сродкі збіралі як у месцах сапраўднага прарастання, так і на спецыяльных аптэкарскіх агародах, часткі завозілі з-за мяжы. Была і фармацэўтычная лабараторыя, дзе гатавалі медыцынскія сродкі. Можна меркаваць, што лекары езуіты для гатавання лекаў выкарыстоўвалі ваду з крыніцы, што знаходзілася на тэрыторыі мястэчка «Спас». Пасля таго, як ваду адстойвалі, на донцы быў зямельны апсадак, а вада атрымлівала лекавыя і карысныя якасці [**4**, с. 38].

Доўгі час справа аптэкарская і лекарская былі непадзельнымі. Аптэкар Станіслаў з Полацка называў сябе ў чалабітнай рускаму цару «лекарем» (в 1654 г.), а цар і ваявода ў перапісцы называлі яго «аптэкарам». У некаторых лістах з Рускай дзяржавы выказваліся патрабаванні даслаць з беларускіх гарадоў не толькі «зелья», але і «лекарей», як, напрыклад, было «велено Полоцкого аптекаря Ивана Михайлова к Москве». Што сведчыць аб значнасці, аўтарытэтнасці і прафесіяналізме лекараў і аптэкараў Полацка [**3**, с. 65].

У 1761 г. польскі кароль Аўгуст 111 выдаў грамату манаскаму ордэну бернардынцаў на адкрыццё аптэкі ў Полацку. Вядома, што пры уніяцкім манастыры існавала аптэка ў 1765 г.[**1**, с. 32].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у 1792 г. Полацк адышоў да Расійскай імперыі. У губернях арганізаваны прыказы грамадскай апекі, якія адчынялі і трымалі богаўгодныя ўстановы (бальніцы, сіроцкія прытулкі, дамы смуткуючых). Можна лічыць, што з іх узнікненнем звязаны пачатак дзяржаўнага лекавага забеспячэння бальніц і адкрыццё дзяржаўных аптэк. У Полацкай губерні Прыказ з'явіўся ў 1781 г., пры ім дзейнічала аптэка. Шматпрофільныя аптэкі-лаўкі ператвараюцца ў спецыялізаваныя фармацэўтычныя ўстановы. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. медыка-фармацэўтычная навука мела агульны поспех, і аптэкарская справа атрымала навуковую аснову.

Для збору лекавых раслін у Маскоўскім прыказе грамадскай смуты існавала некалькі аптэкарскіх агародаў, дзе былі «сажены травы, кои в росписи для собирания написаны, а тех трав на лугах, полях и в лесах нет». Для павелічэння аптэкарскіх агародаў расліны пастаўлялі з прыватных гадавальнікаў і аптэкарскіх агародаў іншых рэгіёнаў. У 1666 г. полацкі ваявода І. Сумарокаў дакладаў князю Аляксею Міхайлавічу, аб

зборы і адпраўцы ў Маскву 20 пудоў карэння кансаліды чорнай, сабранай у Полацкім павеце з травою і зямлёю, а пасля абяцаўся выслаць сушанае карэнне [7, с. 481].

Акрамя таго, распаўсюджванне расійскага аптэкарскага заканадаўства (1789, 1836) абумовіла дзяржаўны кантроль і рэгламентацыю аптэкарскай справы, што выявіла высокія патрабаванні да адкрыцця і работы новых вольных (прыватных) аптэк.

У канцы XIX ст. у горадзе працавала тры прыватныя аптэкі. Першая — належала Прашынскаму і размяшчалася на вуліцы Віцебскай, другая належала Гінзбургу на Верхне-Пакроўскай у доме Левіта, трэцяя — удаве Правіхорыя на вуліцы Віцебскай у памяшканні дома Энштэйна. Акрамя аптэк, у горадзе была аптэка пры Кадэцкім корпусе, дзе лекавыя сродкі адпускаліся навучэнцам і служачым навучальнай установы. Акрамя таго, у горадзе працавалі дзве аптэкарскія крамы, якія знаходзіліся ў маёмасці прыватных асоб. Каб узняць канкурэнтаздольнасць, уладальнікі адчынялі лаўкі для прыцягвання наведвальнікаў [**11**, с. 173].

А ў пачатку XX ст., згодна з даведнікам па гораду Полацку, выдадзеным у прыватнай друкарні Х. Клячко ў 1910 годзе, у горадзе пражывала больш за 50 тысяч чалавек. Насельніцтва абслугоўвалі аптэкі і аптэкарскія крамы, дзе можна было атрымаць кваліфікаваную медыцынскую кансультацыю. Аптэкі, аптэкарскія крамы знаходзіліся ў цэнтры горада на галоўнай вуліцы — Віцебскай (сёння праспект К. Маркса). Аптэка Беластоцкага і Лунца (старая аптэка) — на вуліцы Віцебскай, Баярынблюма пад жалезным арлом — на Ніжне-Пакроўскай, а на вуліцы Азараўскай — аптэка Яўрэйскага дабрачыннага таварыства, дзе бясплатна выдавалі лекі бедным. Аптэкарскія магазіны Капейкіна, Піруцінскага, Эмануэля, Дайноўскага, Блінніка размясціліся на вуліцы Віцебскай [**6**, с. 19].

Пасля рэвалюцыі 1917 г. пачынае распрацоўвацца сістэма фармацэўтычных устаноў. 29 студзеня 1919 г. падпісаны дэкрэт аб нацыяналізацыі аптэк. Але нацыяналізацыя іх пачалася значна раней. З увядзеннем у 1921 г. у дзяржаве НЭПА аптэкі былі перададзены ў арэнду прыватным асобам [**2**, с. 5].

Пры здачы ў арэнду заключалася тыпавая дамова. Неабходна адзначыць, што меў месца і незаконны прыватны гандаль медыкаментамі на рынках. У перыяд НЭПа адбыўся зварот ад бясплатнасці да платнасці лекавага забеспячэння (памер платы па расійскай аптэкарскай таксе на 1911 г. павялічыўся ў 2 разы) [**10**, с. 49].

Толькі 8 чэрвеня 1922 г. на аснове пастановы камісіі Віцебскага губернскага аддзела аховы здароўя ствараецца праўленне аптэчнымі прадпрыемствамі (далей аптэкакіраванне). На яго ўскладаліся наступныя абавязкі: закупка і распаўсюджванне медыцынскага абсталявання і інструментаў, забеспячэнне медыкаментамі і закупка лекавых раслін, зёлак і інш.

Пасля тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу, 22 ліпеня 1925 г. зацверджана палажэнне аб акруговых аптэкакіраваннях рэспублікі. Створаны аддзел Полацкай акруговай аховы здароўя. Пачаўся новы этап у развіцці фармацэўтычных установ. У горадзе працягваюць работу аптэкі, крамы гігіены і санітарыі, аптэкарскі склад і 8 аптэк па Полацкай акрузе, з'яўляюцца новыя [**8**, с. 66].

Інфармацыя аб развіцці аптэкарскай справы ў Полацку пасля рэвалюцыі адрывачная. Але вядома, што ў 1920 г. пры Народнай бальніцы працавала аптэка. Аптэкі выконвалі галоўную ролю — забеспячэнне насельніцтва медыцынскімі прэпаратамі. У пачатку 20-х гг. наладжваецца сістэма забеспячэння медыкаментамі і прадметамі догляду за хворымі праз існуючыя аптэкі.

У той час аптэкакіраванне забяспечвала ўсе лекавыя ўстановы Полацкай акругі медыкаментамі, перавязачнымі матэрыяламі, інструментамі. Неабходна адзначыць, што некаторыя сацыяльныя групы — (чырвонаармейцы, зарэгістраваныя беспрацоўныя, выхаванцы дзіцячых дамоў, калекі, застрахаваныя) і некаторыя ўстановы горада (Дом дзіцяці, гінекалагічная амбулаторыя, венералагічны і туберкулёзны дыспансеры) захоўвалі права на бясплатнае атрыманне лекавых сродкаў.

У дадзены перыяд адбываюцца змяненні ў кіраванні і забеспячэнні медыкаментамі з розных гарадоў і рэгіёнаў Савецкага Саюза. У кастрычніку 1922 г., замест фармацэўтычнага пададзела Наркамздрава Беларусі, з'яўляецца арганізацыя «Белмедторг» гаспадарчага разліку (г. Мінск, плошча Незалежнасці, 29), у якой хутка павялічваецца

асартымент і таваразварот, пастаўкі зубаўрачэбнага, аптэчнага, хірургічнага інвентару. Медыкаменты закупаліся ў аптова-рознічнай краме (Савецкая, 7), хіміка-фармацэўтычнай (Універсітэцкая, 4), парфюмерна-аптычнай (Савецкая, 7), аптова-рознічнай краме хімічных тавараў (Няміга, 9) [**10**, с. 117]. З Масквы пастаўляўся рыбны тлушч, а акцыянернае таварыства Дзяржмедторг за рэдкія лекі — санцілавыя таблеткі і цытварнае семя — патрабавала распіску. У Адэсе закуплалася не толькі абсталяванне (занды, плявацельніцы), але і мыла, духі, адэкалон, крэм для абутку. З Ленінграда пастаўляліся спіртныя напоі, з друкарні (вул. Камісараўская, 32) закупаліся сігнатуры, этыкеткі, рэцэптурныя бланкі [**18**, с. 198, 423, 483]. Заключалася дамова з аптовымі магазінамі саюзных рэспублік. Дэфектуры папаўняліся са склада аптэкакіравання раз ў 10 дзён. Заказы атрымлівалі праз 2-3 дні [**15**, с. 86]. Як пастаяннаму кліенту, полацкаму аптэкакіраванню даваліся крэдыты на закупку медыкаментаў [**18**, с. 815].

У асартыменце аптэк таго часу налічвалася да 300 найменняў лекаў. Сярод іх — карэнне іпекукуаны, карэнне сенегі, настой опію, настой кандуранга, спірт дэнатурат, парашок морфія; з перавязачных матэрыялаў — вата, марля, бінты крухмальныя [**8**, с. 69]. У 1929 г. камісія па ахове здароўя падрыхтавала спіс моцна дзеючых сродкаў, якія адпускаліся без рэцэптаў. У графе А ўказвалася атрута, якая без рэцэпта не выдавалася. Усе лекі, якія паступалі ў аптэкі, падвяргаліся і кантрольнаму аналізу. На ўпакоўцы ставілася дата выпуску і вага [**21**, с. 116, 144].

Медыкаменты складваліся ў спецыяльным пакоі, вялікія - у кладоўцы. Частка парашкападобных медыкаментаў і зёлак захоўвалася ў вялікіх скрынях з накрыўкамі, часткова ў шкляным посудзе, перавязачны матэрыял у зачыненых шафах [**15**, с. 86, 123].

Абслугоўванне было платным. Па правілах аптэкакіравання, на кожны медыкамент падаваўся рэцэпт на асобным лісце. Гатаванне простага лекавага сродку каштавала 18 капеек, складанага — на 15 % даражэй [**15**, с. 108]. Аддзел аховы здароўя лічыў неабходным павялічыць водпуск сродкаў на медыкаменты, зрабіць больш таннымі рэцэпты – коштам да 7 капеек [**22**, с. 7]. Адгалоскі палітыкі калектывізацыі знайшлі сваё месца ў новых правілах абслугоўвання ў аптэках. У 1928 г. аддзел аховы здароўя рэкамендаваў правесці дыферэнцыяцыю насельніцтва на

беднах і заможных, не адпускаць бясплатныя рэцэпты «кулацкаму класу», а жыхары сельскай мясцовасці атрымалі прывілеі — атрымліваць лекі па сабекошту [**20**, с. 145].

1-я аптэка была перагружана працай. Загадчык Гельштэйн дакладаў: «У нас громадный ручной отпуск медикаментов, в базарные дни он достигает до 500 человек в день. В аптеке всегда бывают толпы народу и очень шумно. Обращение пультрантов с публикой очень вежливое, но все-таки трудно всех удовлетворить, бывают нарекания и недовольства со стороны последних, в особенности» [**15**, с. 85]. Здараліся і непрыемныя выпадкі. Так, у 1925 г. пультрантцы (відаць, гэта пасада санітаркі) Левет з 2-й аптэкі была аб'яўлена вымова за безадказныя адносіны да службовых абавязкаў, за няўважлівыя адносіны пры водпуску гатаванага лекавага сродку. Яна памылілася і пераблытала прозвішчы хворых, выдала медыкамент не па назначэнні.

Дзве гарадскія аптэкі не задавальнялі попыт насельніцтва. З'явілася неабходнасць адкрыцця яшчэ адной аптэкі.

На паседжанні Гарадскога савета было разгледжана пытанне аб неабходнасці адкрыцця 3-й гарадской аптэкі. Савет зыходзіў з таго, што аптэка не павінна прыносіць прыбытак, нягледзячы на тое, што гэта не гандлёвая ўстанова і прыбытак не абавязкова павінен быць. 1 лютага 1926 г. на вул. Крыжовай адкрылася 3-я аптэка [**15**, с. 19, 107].

Для аптэчных устаноў быў усталяваны парадак работы. Працоўны дзень пачынаўся ў 9 гадзін раніцы і заканчваўся ў 9 вечара. Працавалі ў 2 змены: першая — з 9 гадзін раніцы да паловы чацвёртай, 2-я змена — з паловы чацвёртай да 10 гадзін вечара. Так як аптэкі знаходзіліся блізка адна да адной ў цэнтры горада, было вырашана, што яны будуць працаваць па чарзе ў начны час [**15**, с. 92, 116].

У архіве захаваўся спіс супрацоўнікаў аптэчнай сеткі па Полацку і Полацкаму раёну за 1926 г. Колькасць супрацоўнікаў Полацкага акруговага аддзела аховы здароўя складала 45 чалавек. Загадчык полацкім аптэкакіраваннем быў Туў М.М. [**14**, с. 10].

Аналіз статыстычных дадзеных даў магчымасць выявіць наступнае: у асноўным штат аптэкарскіх супрацоўнікаў быў укамплектаваны за 1925–1926 г. Толькі 45% мелі фармацэўтычную адукацыю. Трое вучыліся і праходзілі практыку ў аптэцы. З ліку рабочых аптэк толькі

чацвёра мелі адукацыю. Адмова Полацкага аддзела аховы здароўя ад платных стажораў сведчыць, што ў 1926 г. штат фармацэўтаў ў горадзе быў поўнасцю ўкамплектаваны [**17**, с. 327].

Тут працавалі спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Для хуткай падрыхтоўкі кадраў рыхтавалі па ўскоранай праграме на курсах. Так, пры Смаленскім фармацэўтычным тэхнікуме, па рашэнню аддзела профільнай адукацыі, былі адкрыты 9-цімесячныя курсы для аптэкарскіх работнікаў, дзе вывучалі фармакагнозію, батаніку, анатомію, гігіену, гісторыю аптэкарскай справы, матэматыку, грамадскія навукі, аказанне першай медыцынскай дапамогі, рэцэптуру і тэхналогію. Па заканчэнні курсаў выдавалася пасведчанне. У архіве захаваўся такі дакумент аб наданні звання фармацэўта Фейгінай-Гольман Леі Залманаўны, якая скончыла курсы ў маі 1924 г. [**14**, с. 221].

У 1928 г. полацкім фармацэўтам была прадастаўлена магчымасць вучыцца на 4-хмесячных курсах па ўдасканаленню спецыялізацыі ў Мінску пры Нацыянальным Камітэце Аховы здароўя, дзе будучыя спецыялісты павінны былі азнаёміцца з навейшымі даследаваннямі ў хіміка-фармацэўтычнай прамысловасці і развіццём аптэкарскай справы [**20**, с. 70].

Паколькі фармацэўтычная прамысловасць была слаба развіта, адчуваўся недахоп медыкаментаў па ўсіх найменнях, што прывяло да жорсткага кантролю за іх расходваннем. Кантроль за рухам тавару ажыццяўляла медыцынская камісія. Асаблівую ўвагу надавалі расходу спірту. Спірт адпускаўся выключна па рацэптах урачоў, за іх подпісам і пячаткай [**13**, с. 7]. Згодна з правілам, рэгістраваўся яго раход, як для аптэк, так і для лекавых устаноў. Полацкі акруговы аддзел аховы здароўя атрымліваў спірт па разаваму пасведчанню ад цэнтральнага праўлення дзяржаўнай манаполіі «Цэнтраспірт» з Віцебска. Адмяраўся спірт па рэцэптах ў аптэках вёдрамі. Урачы мелі права выпісваць спірт, як для пацыентаў, так і для карыстання ў кабінеце. Загадчыку аптэкі дазвалялася адпускаць лекі і інвентар — тэрмометры, шпрыцы, хлораформ і эфір — толькі з подпісам галоўнага ўрача. Медыкаменты са скончыным тэрмінам належалі знішчэнню толькі з дазволу кіраўніцтва аптэкакіравання [**8**, с. 67].

Па распараджэнні загадчыка Акружнога аддзела Шапавалава, аптэкі кожны месяц прадстаўлялі справаздачы аб прададзеных леках і спісы спісаных медыкаментаў.

У 1925 г. Акруговая інспекцыя аховы здароўя распрацавала план развіцця гарадскіх аптэк і аптэк сельскай мясцовасці на бліжэйшыя 5 гадоў. Было вырашана з 1925 па 1929 г. аб'яднаць аптэкі з бальнічнымі аптэкамі вёсак Дрыса, Ветрына, Валынцы, Кублічы, Асвея, Ула. Росіцкую аптэку перавесці ў Асвейскую бальніцу [**12**, с 126]. У 1929 г. адкрылася аптэка ў Краснаполлі, а Расонскую аб'ядналі з бальнічнай аптэкай. У 1930 г. павінна была пачаць работу 4-я аптэка ў г. Полоцку за Дзвіной, а да 1932–1933 гг. у кожнай сялянскай бальніцы адчыніць аптэку [**8**, с. 70].

Такім чынам, у 1920-я гады была сфарміравана сістэма аптэкарскіх устаноў у Полацку і Полацкай акрузе. Добра наладзілася забеспячэнне медыкаментамі, быў наладжаны жорсткі кантроль за медыкаментамі. Асартымент быў даволі разнастайны і ўключаў не толькі лекарскія сродкі, але і парфюмерыю. Штат быў укамплектаваны поўнасцю. Значны ўплыў аказала «Новая эканамічная палітыка» — усе аптэкі былі пераведзены на дзяржразлік. Планавалася адкрыццё новых аптэк, што подразумявала павелічэнне штату і яго кваліфікаванасць. Але, нягледзячы на развіццё аптэкарскай справы, на працягу дзесяцігоддзя аптэкакіраванне не дасягнула дарэвалюцыйнага ўзроўню, калі ў Полоцку працавала 9 аптэк і аптэкарскіх крамаў.

**Літаратура**

**1**. Глушанко В.С. , Петрище Т.Л. История и современные проблемы лекарственного обеспечения населения: Материалы научной конф., посвященной 60-летию государственной аптеч. службы Гродненской обл. / Редкол. Н.Н.Грицкевич (гл.ред) и др. — Гродно, 2000. — 272 с.

**2**. Гореньков В.Ф. Фармация Беларуси XX Века /В.Ф. Гореньков, С.В. Гореньков. — Мн.: Минсктипроект, 2001. — 272 с.

**3**. Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорус. медицины. — Мн.: Наука и техника, 1987. —271 с., 16 . ил.

**4**. Мальдзіс А.І., Грыцкевіч В.П. Шляхі вялі праз Беларусь, — Мн.: 1980.

**5**. Памяць: Гіст. Дакум. хроніка Полацка /Рэд. кал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд) і іш.; Маст Э.Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 2002. — 912 с.: іл.

**6**. Путеводитель по городу Полоцку. Изданіе Полоцкаго Церковнаго Братства. Типографія Х.В.Клячко. Полоцкъ, 1910.

7. Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570–1667). — Мн.: Высшая школа, 1963, — 534 с.

**8**. Садовникова Т.С. История аптечной службы г. Полоцка и полоцкого района // Краткая история Витебской «фармации»: Материалы к конференции «Партнёрство в лекарственном обеспечении». / Гл. ред. Ю.Б. Войтехович.

**9**. Справаздача . Комплексны навуковы пошук па аб'екту добраўпарадкавання тэрыторыі комплекса езуіцкага калегіума г. Полацка. Выканаўца В.В. Глíннік. Мінск. 2004.

**10**. Тищенко Е.М. Здравохранение Белоруссии в XIX–XX веках: Монография. — Гродно, 2003. — 269 с.

**11**. Установа Дзяржаўны Гістарычны архіў у Мінску (НГАБ). Ф. 473, Воп. 4, Д. 1746.

**12**. Установа Дзяржаўны Занальны архіў у Полацку (далей УДЗА ў Полацку). Ф. 113, Воп. 1, С. 85.

**13**. УДЗА Ф. 113, воп. 1, С. 86.

**14**. Там жа С. 92;

**15**. Там жа С. 93;

**16**. Там жа С. 99;

**17**.Там жа С. 124;

**18**. Там жа С. 125;

**19**. Там жа С. 137;

**20**. Там жа С. 139;

**21**. Там жа С. 153;

**22**. Там жа С. 160.

# Малоизвестные страницы боевой биографии 20 гвардейской стрелковой дивизии

(174 стрелковой дивизии 1-ого формирования)

**Копыл Сергей Петрович,**
*директор*
*Центр допризывной подготовки г. Полоцка*

В 9 часов утра 9 мая 1945 года передовой отряд 20 гвардейской стрелковой дивизии вышел в австрийский город Грац. Тыловые части и учреждения фашистской армии складывали оружие, из окон выглядывали испуганные обыватели.

На западной окраине города произошла встреча с разведкой американцев, которые наступали со стороны Италии.

Пришла долгожданная победа!

Отныне в военных энциклопедиях и справочниках дивизия будет значиться как «20-я гвардейская Криворожская, Краснознамённая, ордена Суворова II степени стрелковая дивизия».

В составе войск Западного, Калининского, Юго-Западного и 3-го Украинского фронтов она участвовала в оборонительных боях под Полоцком и Великими Луками, Московской оборонительной операции, Ржевско-Вяземской и Ржевско-Сычёвской наступательных операциях, в боях на реке Северский Донец, в Изюм-Барвенковской операции. Её солдаты и офицеры освобождали Украину, Молдавию, Румынию, Болгарию и Югославию, громили врага в Венгрии и Австрии.

За героизм и мужество, проявленные в боях с немецко-фашистскими захватчиками, 16 980 бойцов и командиров дивизии были награждены орденами и медалями, а восьми воинам было присвоено высокое звание Героев Советского Союза.

А начиналась история 20 гвардейской стрелковой дивизии в далёком 1940 году. Её рождение связано с реальной угрозой втягивания СССР в крупномасштабную войну. Согласно уточненного плана строительства армии на третью пятилетку (1938–1948 гг.), Народный Комиссар Обороны Маршал Советского Союза С.К. Тимошенко в июле подписывает приказ о формировании ряда соединений РККА. И среди них 174-ой стрелковой дивизии, штатной численности мирного време-

ни в 4 483 человека. Формируется она в короткие сроки, в период с 15 августа по 1 сентября, в Чебаркульских военных лагерях Челябинской области на территории Уральского военного округа.

Создание нового коллектива — процесс сложный, а порой и болезненный. Необходимо было не просто принять бойцов и командиров из разных полков, дивизий и учреждений, получить молодое, необученное пополнение, но и объединить их общими задачами.

Для этой цели требовался грамотный, волевой командир, безгранично преданный Родине.

Всеми этими качествами обладал комбриг Алексей Иванович Зыгин. Судьба Алексея Ивановича типична для старших командиров Красной Армии того времени. Родился он 30 марта 1896 года в слободе Большая Мартыновка, ныне Ростовской области, в бедной семье. С детства ему пришлось много и тяжело работать. Тем не менее, Алексей Иванович окончил церковно-приходскую школу, а затем экстерном сдал экзамены за реальное училище. Он участник 1-й мировой войны с 1915 года. В воинском звании «прапорщик» успешно командовал ротой 2-го Карского крепостного полка на кавказском фронте. После Февральской революции солдаты избрали его в полковой комитет. Стихийный развал царской армии привёл А.И.Зыгина домой. Однако мирной жизни не получилось. Уже в декабре 1917 года ему пришлось возглавить оборону Большой Мартыновки, которую пытались взять белогвардейские части генерала Красильникова. Трёхтысячный отряд под его руководством успешно оборонялся в течение 35 суток, пока на помощь не пришла Красная Армия. Этот эпизод хорошо описан в известной повести А.Н. Толстого «Хлеб».

В этот период происходит знакомство А.И. Зыгина с командующим фронтом К.Е. Ворошиловым и ныне забытым героем гражданской войны Б.М. Думенко.

И с этого момента его судьба и судьба РККА становятся неразделимыми. В 1919 году Алексей Иванович командует полком в 37 стрелковой дивизии. Был дважды ранен. Ранения вынудили перейти его на штабную работу.

В 1928 году он успешно оканчивает Высшие командные курсы «Выстрел». В 1929 году получает назначение на должность коменданта города Ростов-на-Дону, а оттуда — на Дальний Восток, где его

опять ждала командная работа, должность командира стрелкового полка. Алексей Иванович служит под руководством командующего ОКДВА В.К. Блюхера.

Может быть, это знакомство сыграло свою роковую роль, когда летом 1938 года начальник Благовещенского укрепрайона, кавалер орденов «Красное Знамя», «Красная Звезда» и медали «XX лет РККА», комбриг А.И. Зыгин был арестован.

На следствии он держался стойко, виновным себя не признал. Это позволило ему избежать печальной участи многих товарищей. В 1940 году Алексей Иванович был освобождён. Ему было возвращено воинское звание, награды. Он был восстановлен в партии, в которую вступил ещё в 1919 году.

После курса лечения его путь лежал в Белоруссию, в город Слуцк, а оттуда на Южный Урал.

К моменту приезда комбрига А.И. Зыгина в Чебаркульские лагеря формированием дивизии занимался и. о. начальника штаба майор Иван Иванович Лапковский. Вот эти два командира сумели спланировать боевую и политическую подготовку так, что по итогам года дивизия была названа в числе лучших Уральского военного округа.

Помимо своих непосредственных обязанностей, комбриг А.И.Зыгин исполняет обязанности начальника Челябинского гарнизона.

В конце декабря 1940 года — начале января 1941 года высший командный состав армии и флота, политическое руководство страны приняли участие в совещании и двух оперативно-стратегических играх, на которых отрабатывались вопросы теории и практики будущей войны.

С учётом рекомендаций этих мероприятий командованием и штабом дивизии планируется боевая и политическая подготовка на летний период 1941 года. Этот процесс охватывал все категории военнослужащих и должен был завершиться 1 июля. Известно, что каждый начальник должен обучать своих непосредственных подчинённых тому, что необходимо на войне. В группу командира дивизии входят командиры стрелковых и артиллерийских полков, отдельных частей, подразделений и их заместители.

При штабе дивизии создаются две группы слушателей курсов немецкого и английского языков. Группы небольшие, всего по пять человек каждая. Но этот маленький штрих меняет представление наших современников о командирах Красной Армии как малограмотных военачальниках.

Теория должна закрепляться на практике. Так в период с 5 по 8 февраля 1941 года в Чебаркульских лагерях были проведены отрядные учения с 628 стрелковым полком, 197 отдельным разведывательным батальоном, 2-м дивизионом 598 легкого артиллерийского полка и 331 отдельным батальоном связи. В зимних условиях были успешно отработаны темы: «Наступление усиленной стрелковой роты» и «Оборона стрелковой роты». За грамотные действия по руководству боем командиру 628 стрелкового полка майору Григорию Викентьевичу Павлюку и его заместителю по политчасти батальонному комиссару Кривлину А.И.Зыгиным была объявлена благодарность.

Помимо плановых мероприятий, командованию дивизии приходиться решать, так называемые, вводные. Дополнительно формируется еще один гаубичный полк. А 9 марта начинается отмобилизование сапёрного батальона по штатам военного времени, в апреле отправленного для обустройства новой западной границы СССР.

В марте-апреле из дивизии уходит большая группа военнослужащих. Одни увольняются в запас, выслужив установленные сроки службы, другие пополняют вновь формируемые дивизии.

В апреле месяце дивизия переходит на новый штат 4/120. Согласно ему, численность личного состава в мирное время увеличивается до 5864 человек. Этот текущий некомплект пополняется за счет очередного призыва молодого пополнения.

Кроме того, в конце мая — начале июня, под видом Больших учебных сборов (БУС), в дивизию призывается еще 6000 человек.

Складывается такое положение, когда за счет резкого увеличения личного состава до 12000 военнослужащих боеспособность дивизии уменьшилась.

Перед командованием стоит задача в короткие сроки поднять боевую выучку, хотя бы до уровня декабря 1940 года.

В мае для дальнейшего прохождения службы в соединение прибывает большая группа командиров (122 человека). И среди них, по окончании Военной академии им. М.В. Фрунзе, полковник Геннадий Александрович Черкасов — на должность начальника штаба дивизии.

В период с 21 по 23 мая им планируется выход дивизии в лагеря. На зимних квартирах остается 598 артиллерийский полк майора Ивана Ивановича Батляева. Остальные совершают марш железнодорожным транспортом с соблюдением мер противовоздушной и противохимической обороны.

Чтобы понять, каким образом 174 стрелковая дивизия в июне 1941 года оказалась в г. Полоцк, необходимо пояснить замысел советского руководства на начало войны на Западном Театре Войны.

На этот случай в СССР был разработан и утвержден 12 февраля 1941 года «Мобилизационный план № 23». Согласно ему, на территориях Ленинградского военного, Прибалтийского, Западного и Киевского особых , а также Одесского военных округов должны были развертываться соответственно Северный, Северо-Западный, Западный, Юго-Западный и Южный фронты. Их войскам ставилась задача по надежному прикрытию отмобилизования, сосредоточения и развертывания армии и флота. В числе армий, выдвигаемых на запад после отмобилизования, должна была быть 22 Армия, формируемая в Уральском военном округе.

В июне 1941 года 174 стрелковая дивизия входит в состав 62 стрелкового корпуса 22 А и по плану должна была убыть в район Витебск — Себеж — Великие Луки.

В ночь с 12 на 13 июля комбриг А.И. Зыгин был срочно вызван из лагерей к командиру корпуса генерал-майору Ивану Петровичу Карманову, который поставил ему задачу на отправку дивизии, со всем имуществом и приписным составом сборов к новому месту дислокации. Убытие первых железнодорожных эшелонов намечалось на 20 июня.

Для уточнения и доработки «Мобилизационного плана № 23», а также получения приписного состава в случае войны, в городе Челябинск оставалась мобилизационная ячейка.

Известие о вероломном нападении Германии на СССР застало дивизию в эшелонах.

К исходу 25 июня её части и подразделения разгрузились в районе железнодорожной станции Идрица.

26 июня командующий войсками 22 А генерал-лейтенант Филипп Афанасьевич Ершаков приказал выдвинуть дивизию на северный берег реки Западная Двина на участок Улла — Бешенковичи. Однако ухудшение обстановки на фронте вынуждает его изменить первоначальную задачу. Теперь 174 стрелковой дивизии приказано сосредоточиться в Полоцком укреплённом районе, подчинив себе части гарнизона. Для марша используется немногочисленный транспорт автомобильного батальона и железнодорожный состав.

Утром 29 июня части дивизии начинают прибывать в город Полоцк. Полностью она сумела сосредоточиться только к исходу 6 июля, когда передовые полки уже были втянуты в бой.

Остается открытой дата первого боя. В воспоминаниях бывшего командира 390-ого гаубичного артиллерийского полка майора Григория Кузьмича Колоколова рассказывается о первой схватке с врагом на Полотчине у деревни Кутняны утром 27 июня 1941 года. Однако послевоенные воспоминания вступают в противоречие с Журналом боевых действий полка, подписанным самим командиром, его заместителем по политической части и начальником штаба осенью 1941 года. А из него (Журнала БД) следует, что первый бой состоялся утром 4 июля, когда противник пытался форсировать реку Ушача в районе совхоза Банонь. Окончательно прояснить этот момент в военной истории Полоцка могут только дальнейшие архивные исследования.

29 июня комбриг А.И. Зыгин отдаёт первый боевой приказ на организацию обороны Полоцкого боевого участка. Он принимает решение организовать боевые действия силами своей дивизии, без одного стрелкового полка, оставленного в резерве командира корпуса, пятью батальонами укрепрайона, частями и подразделениями 17 и 50 стрелковых дивизий.

Из 56-ого корпусного, 390-ого гаубичного артиллерийских полков 21-ого (витебского) стрелкового корпуса, своего 730-ого гаубичного полка он приказывает создать артиллерийскую группу дальнего действия под командованием командира 56 КАП майора Якова Епифановича Музыченко.

598 легкий артполк, по-дивизионно, придаётся 494 и 508 стрелковым полкам. На танкоопасных направлениях развертывается один противотанковый дивизион, а второй дивизион и часть 494 стрелкового полка остаются в резерве командира дивизии.

Получая с гарнизонных и окружных складов боеприпасы, ГСМ, продовольствие, медикаменты и фураж, войска Полоцкого боевого участка успешно сдерживают атаки танковой и двух моторизованных дивизий немцев.

В отдельные моменты бои носили исключительно ожесточенный и драматический характер.

Приведу выдержку из боевого донесения № 4 штаба 174 с.д. от 7 июля 1941 года: «Отряд под руководством Зыгина, перейдя в наступление, к 11:30 вышел на ручей севернее Луначарское, причем понес большие потери.

К 12:00 противник повел атаку танками при поддержке 8…10 орудий и массы минометов.

Часть четвертой стрелковой роты 2 батальона 494 стрелкового полка и пулеметный взвод второй пульроты дрогнули.

Лично применив оружие и пристрелив командира пульвзвода, (Зыгин) восстановил первоначальное положение…»

12…13 июля противник подтягивает пехотные армейские корпуса.

Введя в бой еще 5 пехотных дивизий, имея господство своей авиации в воздухе и используя в массовом количестве бронетехнику, фашистское командование сумело переломить ход борьбы в свою пользу.

Чтобы избежать окружения, Военным Советом 22 А принимается решение на отвод частей и соединений 62 стрелкового корпуса в район Великих Лук.

В условиях непрерывного огневого воздействия комбригом А.И. Зыгиным и его штабом планируется и успешно проводится операция по отходу вверенных ему войск. Ему с боем удается вывести большую часть личного состава и тяжелого вооружения, обеспечив выход управления корпуса и соседней 186 стрелковой дивизии.

За время боев под Полоцком было уничтожено более 2500 солдат и офицеров противника, 29 орудий, 35 танков, 31 самолет, 15 бронемашин, 91 автомашина, 15 минометов и 51 пулемет. Захвачено 129 пленных, 10 пулеметов, 7 мотоциклов и штабная машина с документами.

За героизм и мужество сотни красноармейцев и командиров были награждены орденами и медалями, а Алексей Иванович Зыгин удостоен высшей награды Советского Союза — ордена «Ленина». А также ему было присвоено воинское звание «генерал-майор».

2 августа А.И.Зыгин убыл в госпиталь по ранению и в дивизию больше не вернулся.

А дивизия, набираясь опыта в боях, сполна испила горькую чашу отступлений и окружений 1941 года. Только в декабре месяце ею командовали 4-е командира дивизии.

В составе войск 20, 22, 29, 30 и 31 армий Западного и Калининского фронтов она участвует в тяжелейших сражениях в так называемом Ржевском выступе. Фашистское командование признало, что Ржев – это русский Верден, ставший символом человеческой мясорубки Первой мировой войны.

13 марта 1942 года Постановлением Президиума Верховного Совета СССР 174 стрелковая дивизия преобразована в 20 гвардейскую стрелковую дивизию.

В бою восточнее рубежа Ржев — Вязьма 12 января 1943 года, когда пулеметный огонь немецкого ДЗОТа остановил наступление батальона автоматчиков, командир взвода гвардии лейтенант В.П. Ванюков в броске закрыл своим телом амбразуру, обеспечив успех атаки.

За мужество и героизм ему первому в дивизии было присвоено звание «Герой Советского Союза».

В феврале 1943 года дивизия перебрасывается на Юго-Западный фронт. А в марте в составе 4-ого гвардейского стрелкового корпуса она участвует в боях на Залиманском плацдарме. О накале сражения гово-

рят потери дивизии. Только за 5 дней, с 5 по 9 марта, 20 гвардейская стрелковая дивизия потеряла 2252 человека убитыми и ранеными. В выписке из приказа, подписанного комдивом генерал-майором Петром Яковлевичем Тихоновым от 6 марта, говорится: «…Ни шагу назад!!! Кто уйдёт от реки Северского Донца, тот предатель и изменник. И таких — расстреливать на месте…»

На реке Северский Донец дивизия вела тяжелейшие бои до 10 сентября. А затем участвовала в наступлении и 26 сентября, пройдя 225км и преодолев 9 рубежей обороны гитлеровцев, вышла к реке Днепр.

После отдыха во 2-м эшелоне, пополнения личным составом, техникой и вооружением, дивизия участвовала в наступлении на Криворожском направлении.

Бывший начальник оперативного отделения штаба дивизии Фёдор Павлович Бологов так описывает те события: «[22 ноября]… После постановки дымовой завесы мы с майором Морозовым остались на командном пункте 2 батальона [57 гв. сп.]…и увидели, как дружно поднялись в атаку 6-я рота, как первой ворвалась она во вражеские траншеи. Я спросил у майора Сыченко:

– Кто командует этой ротой?

–[Старший лейтенант] Екатерина Степановна Новикова.

Это мужественная 23-летняя девушка, делившая с красноармейцами все тяготы окопной и боевой жизни, с 4 октября 1943 года умело командовала стрелковой ротой. Она не раз проявляла храбрость и инициативу. Воины роты не только уважали её, они гордились ею. …2 января 1944 года [Екатерина Степановна] была тяжело ранена осколком вражеской мины и отправлена в госпиталь».

Приказом Верховного Главнокомандующего № 76 от 22 февраля 1944 года 20-й гвардейской стрелковой дивизии было присвоено звание – Криворожская.

В апреле того же года за героизм и образцовые действия по разгрому вражеской группировки в районе города Одесса, дивизия была награждена орденом Красного Знамени.

В августе 1944 года за освобождение советской Молдавии Соединение удостоено ордена Суворова II степени, а её 60-й гвардейский полк — ордена Кутузова III степени.

А далее, через Румынию, Болгарию, Югославию, Венгрию и Австрию гвардейцы шли к победе.

В послевоенное время дивизия дислоцировалась в Украине в городе Кривой Рог. Как и вся Советская Армия она прошла путь реформирования. В 1945 году она стала 25 гвардейской механизированной, в1957 году — переформирована в 37 гвардейскую танковую, а в 1965 году — переименована в 17 гвардейскую танковую дивизию.

**Литература**

**Бологов Ф.П.** В штабе гвардейской дивизии. — Москва: Воениздат, 1987.

**Военный энциклопедический словарь**. — Москва: Воениздат, 1986.

**Воспоминания ветеранов 20 гвардейской стрелковой дивизии**: В.В. Берлина, А.В. Гладышевой, А.Е. Кальченко.

**Захаров М.В.** Генеральный Штаб в предвоенные годы. — Москва: АСТ, люкс, 2005.

**Исаев А.** Анти Суворов. — Москва: Яуза, Эксмо, 2005.

**Лихачёв В.** Его именем названа улица. — Витебск, 1988.

**Материалы Музея 20 гвардейской стрелковой дивизии школы-интерната № 3 города Челябинска**. Директор музея — К.Г. Колесникова.

Материалы сайтов: **www.soldat.ru**, **www.rkka.ru**.

**Мельтюхов М.И.** Упущенный шанс Сталина. — Москва: Вече, 2002.

**Письмо сына бывшего командира артиллерийского взвода 174 стрелковой дивизии Б.П.Распопова**.

**Фонды** 22 А, 62 ск, 20 гв. Сд, 56 кап, 390 гап, ЦА МО Российской Федерации.

# Праблемы паказу і інтэрпрэтацыі савецкай гісторыі ў экспазіцыі Краязнаўчага музея

**Краско Вольга Давыдаўна,**
*загадчык філіяла*
*Краязнаўчы музей*
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

Сёння мы адзначаем 80-годдзе Полацкага краязнаўчага музея. Музей нарадзіўся ў цікавыя гады агульнай беларускай гісторыі, калі праводзілася палітыка беларусізацыі. 1926-1929 гг. былі часам высокага ўзлёту музейна-краязнаўчага руху ў БССР. Да гэтай дзейнасці далучаюцца асобы рознага сацыяльнага становішча, рознай ступені падрыхтоўкі, але ў асноўным інтэлігентных прафесій і навучэнцы. Полацкі музей з'яўляўся на той час адным з 7 акруговых музеяў. Але гэта быў і час, калі палітыка беларусізацыі супярэчліва перапляталася з палітыкай выкрыцця нацыянал-дэмакратызму, апагеем якой стала сфальсіфікаваная справа, т.зв. «Саюза вызвалення Беларусі». Менавіта па гэтай справе ў 1930 г. быў асуджаны першы дырэктар музея Мялешка Сяргей Міронавіч. Але музей працягваў сваё жыццё. Не выкінуць з гісторыі той факт, што ў ліку першых устаноў, якія неслі ў масы культуру і адукацыю, савецкая ўлада ўсё ж засноўвала школы, бібліятэкі і музеі. Абавязкова — музеі, з мэтай увекавечыць і тое, што адбудзецца за гады праўлення Саветамі. І яна мела рацыю. Трэба прызнаць, што савецкія гістарычныя музеі, на жаль, унеслі сваю лепту ў скажэнне гістарычнай свядомасці людзей.

У 1996 г. годзе Полацкі краязнаўчы музей адзначаў сваё 70-годдзе. У тыя гады музей, экспазіцыя якога доўгі час будавалася на падставе тыпавой тэматычнай структуры, апынуўся ў цяжкім становішчы. Мадэль гістарычных экспазіцый, створаная музеязнаўцамі яшчэ ў 60-х гг. XX ст., увайшла ў супярэчнасць з рэальным жыццём. Яе павучальны характар і накіраванасць на прапаганду дасягненняў СССР прывялі да пэўнага адчужэння экспазіцыі ад грамадства. У грамадстве пачалася дыскусія наконт таго, што такое савецкі перыяд? Што гэта такое наогул? Тупік? Не ў тым сэнсе, што далейшае развіццё ідзе другім чынам, а ў тым сэнсе, што гэта проста пустое месца, нейкая «чорная

дзірка». Адна крайнасць — поўнае адмаўленне чагосьці больш-менш станоўчага ў савецкай сістэме, адмаўленне таго, што гэта было нейкае чалавечае развіццё, погляд на то, што было проста чорнае пустое месца. Зразумела, музейным супрацоўнікам значна бліжэй і здаецца значна правільным другі погляд. Погляд, што гэта ненатуральнае, супярэчлівае развіццё, у якім злачынства злучалася з вялікімі дасягненнямі, у якім амаральнасць і душэўнае спусташэнне перапляталася з высокімі ўзлётамі індывідуальных душ і народнай душы ў цэлым. Мы ўвесь час сутыкаемся з вельмі неабыякавымі адносінамі да мінулага. І прадметам з'яўляецца не толькі які-небудзь аспект у савецкай гісторыі, няхай вельмі трагічны, вельмі страшны, але і само існаванне гэтага перыяду, які не толькі сёння выклікае да сябе вельмі розныя адносіны, але і, безумоўна, будзе выклікаць такія ж неабыякавыя адносіны цяжка ўявіць яшчэ колькі часу. Ва ўсякім разе, Рымскую імперыю гісторыкі вывучаюць ужо пару тысяч гадоў і ўзнікаюць новыя пытанні, новыя працы. Думаецца, што «савецкі перыяд» — гэта з'ява, якую можна параўнаць па маштабу, па свайму значэнню з тым, што ў гісторыі чалавецтва называецца Рымскай імперыяй. У нейкіх аспектах, безумоўна. І вывучацца яна будзе так жа доўга. І вельмі шкада і недапушчальна, калі мы нічога не зробім для таго, каб у наступных пакаленняў быў нейкі цэласны вобраз гэтай эпохі, гэтай краіны, гэтага грамадства. Музей павінен кіравацца не імкненнем прадставіць нейкія новыя схемы гісторыі, заснаваныя на адмаўленні дзеля адмаўлення, а крытычным, разумным падыходам да нашай спадчыны, неабходнасцю раскрываць падзеі і з'явы ў іх складанасці і супярэчлівасці, тлумачыць прычыны трагічных пераломаў нашай гісторыі, каб не дапускаць іх паўтарэння. Гісторыя горада – безупынны працэс, нельга выкінуць з яго цэлыя перыяды жыцця народа і горада, таму што парушацца сувязі, пераемнасць пакаленняў. Паўстануць і ўжо паўсталі цяжкасці і пры правядзенні экскурсій. Нікому не патрэбна даказваць, што гісторыя савецкага часу павінна быць. Пытанне заключалася ў другім: як паказаць гэты перыяд, каб ён асабліва моцна гучаў у экспазіцыі. Гэта праблема для супрацоўнікаў музея з'яўлялася тады вельмі важнай. Узнікла неабходнасць змянення прыярытэтаў, з'явілася патрэбнасць пераасэнсаваць і распрацаваць новую канцэпцыю.У гэтым жа годзе другі паверх экспазіцыі музея, так званы «савецкі перыяд», быў зачынены на рээкспазіцыю ў сувязі з тым, што супрацоўнікі

музея ўсведамлялі неабходнасць перагляду гісторыі савецкага перыяду. Цікава тое, што гэтая экспазіцыя працавала не так доўга. Яна была створана ў 1991 г. Але гэта быў час, калі не толькі кожны месяц, але і кожны дзень быў напоўнены нейкімі падзеямі, зменамі ў грамадстве. Таму гэтая экспазіцыя, думаю, што не памылюся, састарэла ўжо ў ходзе стварэння і патрабавала пастаяннага абнаўлення. Ацэньваючы сітуацыю, у якой аказаўся музей, навуковыя супрацоўнікі перагледзелі сваю дзейнасць. Ужо першыя крокі ў працы, асабліва аналіз існуючай экспазіцыі, паказалі складанасць задачы. Нягледзячы на тое, што былі ўведзены ў навуковы абарот многія матэрыялы, выявіліся дадатковыя праблемы, якія звязаны з нявывучанасцю і недастатковасцю дакументаў важнейшых перыядаў савецкай гісторыі.

Невялікі па працягласці савецкі перыяд гісторыі ўвабраў у сябе столькі гераічных і трагічных з’яў, што стаў працягам нялёгкага мінулага. Як і раней, з прычыны свайго геапалітычнага становішча, Полацк нярэдка аказваўся ў цэнтры падзей. І хоць характар жыцця якасна змяніўся, але асноўны яго напрамак захаваўся: з аднаго боку — самаадданая праца народа і нядрэнны яе плён, з другога— цяжкі шлях да яго, шмат нястач, трывог і пакут. На аснове аб’ектыўнага гістарычнага аналізу фондавых калекцый, камплектавання новых матэрыялаў, працы ў архівах супрацоўнікі імкнуліся пераадолець старыя схемы і догмы, па-новаму, навукова-аб’ектыўна падысці да аналізу і ацэнкі вядомых падзей і фактаў, асвятліць па магчымасці «белыя плямы», каб уключыць у экспазіцыю новыя матэрыялы і вынікі апошніх даследаванняў па асобных праблемах.

За гэтыя гады музей набыў грунтоўны вопыт у распрацоўцы праблем гісторыі горада, збіральніцкай, фондавай, экспазіцыйнай і адукацыйнай дзейнасці. Яго вынікі ўвасабляліся ў навуковых канцэпцыях, гістарычных даведках, распрацоўцы тэматычных экскурсій і музейна-педагагічных праграм. Большая частка навуковай прадукцыі атрымала выхад у форме часовых экспазіцый, выставак. На парозе стварэння новай паўнавартаснай экспазіцыі па гісторыі савецкага грамадства супрацоўнікі музея вырашылі пайсці па шляху стварэння сістэмы выставак экспераментальнага характару. Такія выставы дазвалялі сканцэнтраваць увагу на тых тэмах і праблемах, якія абавязкова планавалася прадставіць у будучай экспазіцыі

Новыя падыходы да выставачнай дзейнасці – гэта пошукі новых форм яе арганізацыі. Пры стварэнні выставак мы сталі больш звяртацца ў дзяржаўныя архівы, да калекцыянераў, у розныя грамадскія арганізацыі. За аснову выставачнай дзейнасці супрацоўнікі музея ўзялі не пералік юбілейных дат, а тыя праблемы, над якімі працаваў музей у сучасны час. Стварэнне такіх выстаў дало падставу для адкрыцця сёння новай экспазіцыі.

Мінулая экспазіцыя ахоплівала перыяды з 1917 па 1941 г. і з 1945 па 1985 г. Экспазіцыя, якую стварылі мы сёння, — толькі перыяд ад Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Паказ пасляваеннай гісторыі — складаная задача. Думаецца, што сёння мы яшчэ не зусім падрыхтаваны для яе паказу. І другая прычына такой перыядызацыі: мы не можам сёння паказаць цалкам перыяд савецкай гісторыі з-за недахопу памяшкання і наяўнасці асобнага Музея баявой славы. Таму мы сёння пайшлі па напрамку стварэння стацыянарнай выставы «Полацк у міжваенны час», якая задумана як частка пастаяннай экспазіцыі Полацкага краязнаўчага музея.

Калі гаварыць пра галоўную ідэю экспазіцыі, то гэта — стварэнне цэласнага вобраза ўсяго таго, што ярка прысутнічала ў свядомасці розных сацыяльных груп і пакаленняў людзей, якія прайшлі праз гэты перыяд. У асноўным гэтыя людзі ўжо пайшлі з жыцця. Вось тое, што ярка прысутнічала ў іх свядомасці: іх надзеі, іх страх, іх канфармізм, іх мары, тое, чым яны ганарыліся, тое, чаго яны саромеліся, тое, што яны хацелі ўтаіць і не заўважыць, і падзеі, і адносіны да іх — усё гэта прадстаўлена ў экспазіцыі. Сам-насам з кнігамі, дакументамі, кінафільмамі вельмі цяжка стварыць і мець перад сабой такі цэласны вобраз гістарычна дакладны, эмацыянальны, праўдзівы, шматпланавы і аб'ёмны. Але музей — гэта якраз тая форма культуры чалавечай, якая дазваляе з такімі вобразамі працаваць. Вось, уласна кажучы, першапачатковая ідэя. І з нашага пункту погляду, метадычным прыёмам пабудовы экспазіцыі (не зрокавага вобраза, а ідэйнага сэнсу экспазіцыі) з'яўляецца выяўленне, рэканструкцыя і паказ таго, што людзі лічылі значным у тыя гады: у 20-ыя, 30-ыя гг. Вось для чаго патрэбны залы створаннага 80 гадоў таму краязнаўчага музея — каб напамінаць грамадству аб перажытых памылках. А каб іх не паўтараць, патрэбна ведаць гісторыю мінулага.

У адпаведнасці з гэтай ідэяй мы вылучаем дзве асноўныя задачы:

1) раскрыць падзеі і з'явы ў гісторыі горада ў іх складанасці і супярэчнасці, з пазіцый праўдзівага гістарызму, аб'ектыўнасці, заснаванай на крыніцазнаўчай базе;

2) садзейнічаць аднаўленню і фарміраванню гістарычнай свядомасці наведвальнікаў, разумення сучаснасці праз гісторыю.

І тут варта адзначыць некаторыя аспекты. Па- першае, важнае значэнне набывае тэзіс аб адзіным гістарычным працэсе. Абмежаванне гістарычных працэсаў рамкамі пэўных перыядаў — з'ява ўмоўная. Пры такім падыходзе храналагічная паслядоўнасць захоўваецца толькі пры дзяленні экспазіцыі на вялікія адрэзкі (залы). Галоўная ўвага тут з'асяроджваецца на адлюстраванні гістарычных з'яў, а не на пераліку падзей. Трэба прызнаць, што нашы экспазіцыі вызначаліся ўмоўнасцю і схематычнасцю. Так, Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года і грамадзянская вайна разглядаліся як самастойныя гістарычныя раздзелы. Сёння мы аб'ядноўваем гэтыя падзеі, таму што фактычна грамадзянская вайна была працягам барацьбы за ўладу. Па-другое, пераасэнсавання патрабавала і такая важная для музейнай экспазіцыі праблема, як роля некаторых асоб у гісторыі. Экспазіцыя ў значнай ступені «населена» людзьмі, як кіруючымі работнікамі, дзеячамі культуры і навукі, так і простымі працаўнікамі. Розны іх лёс, розныя іх справы, але супрацоўнікі імкнуліся адпаведна рэчаіснасці паказаць не толькі тых, хто заўсёды не быў абдзелены ўвагай, але і тых, каму не знаходзілася раней месца ў экспазіцыі. Ад гэтага наша гісторыя стане паўней. Гісторыя савецкага грамадства заўсёды пісалася як вынік дзейнасці камуністычнай партыі, таму мы, натуральна, не можам ігнараваць ролю, якую яна заўсёды выконвала. Але, у адрозненне ад папярэдняга абавязковага праслаўлення, гэтая роля паказана больш аб'ектыўна: з недахопамі, пралікамі.

Асаблівасці гісторыі горада гэтага перыяду дазволілі падзел экспазіцыі на два ўмоўныя вялікія раздзелы, кожны з якіх размяшчаецца ў асобнай зале. Першы раздзел храналагічна ахоплівае перыяд з 1917 па 1924 г. — перыяд, калі Полацк уваходзіў у склад РСФСР. Гэты раздзел пачынаецца з падзей Лютаўскай рэвалюцыі. Звяржэнне царызму стала пачаткам імклівага ходу гістарычнага працэсу, які за кароткі

час прывёў да кастрычніцкіх падзей. Полацк уступіў у новы этап свайго развіцця. Трэба адзначыць, што ў Полацку, як і на Беларусі ўвогуле, грамадзянскай вайны ў шырокіх памерах не было. У 1918–1920 гг. большая частка тэрыторыі Полацкага павета была акупавана інтэрвентамі. Экспазіцыя гэтай тэмы ўключае некалькі самастойных комплексаў, дзе паслядоўна раскрываюцца падзеі акупацыі Полацка нямецкім войскам, першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні Савецкай улады, барацьба з Польшчай. Пераход горада ад вайны да міру адбываўся ў цяжкай абстаноўцы. Гаспадарчы крызіс, інфляцыя, першыя гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні, узнікненне адміністрацыйна-тэрытарыяльных партыйных ячэек, палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы, узнікненне першых савецкіх устаноў адукацыі і культуры — усе гэтыя падзеі багаты гістарычным зместам. Другі раздзел хранлагічна ахоплівае перыяд з 1924 па 1941 г. Пры пабудове гэтага раздзела навуковыя супрацоўнікі зыходзілі з таго, што 20-я гады ў першую чаргу характарызуюцца дзейнасцю новай эканамічнай палітыкі. Яна была значным паваротам у жыцці грамадства, першым і апошнім крокам у адыходзе ад пераважаўшага тады ўяўлення аб сацыялізме як унітарнай сістэмы. Дэмакратычныя праявы нэпа атрымалі распаўсюджанне і ў Полацку. Сельская гаспадарка, а затым і прамысловасць, адчулі яго дабрачынны ўплыў. Значны рух наперад мела кааперацыя. Адметны след пакінула праца па ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі, развіцці пад яе ўздзеяннем культуры і навукі.

У канцы 20-х гг. новая эканамічная палітыка была адкінута Сталіным і яго акружэннем прэч. Пачалося стварэнне дыктатарскага рэжыму. Кіраўніцтва партыяй стала валявым парадкам паскараць тэмпы індустрыялізацыі і калектывізацыі. У экспазіцыі разглядаюцца гэтыя працэсы ў цеснай сувязі з развіццём адміністрацыйна-каманднай сістэмы і культу асобы. Зыходзячы з наяўнасці дакументаў, у экспазіцыі ў пэўнай ступені адюстраваны сталінскія рэпрэсіі супраць рабочых, інтэлігенцыі. Наогул жыццё беларускага народа ў гэты асабліва складаны перыяд разглядаецца з пазіцый неверагоднага спалучэння гераічнай працы людзей і трагічнага лёсу шмат каго з іх.

Безумоўна, экспазіцыя працягвае несці ідэалагічную нагрузку і зараз, пры зусім іншай ідэалогіі. Тут захоўваецца ўвесь гістарычны матэрыял. Ён экспануецца ў залах і нясе на сабе адбітак часу: эпоху, куль-

туру, перыяд гісторыі, геаграфію, народ, які пражывае на канкрэтнай тэрыторыі. Усякая выстаўка выконвае ўжо інфармацыйную, выхаваўчую, навуковую задачы. І шмат якія пастулаты з мінулага разглядаюцца сёння па-іншаму. Мы прытрымліваемся аднаго меркавання — гісторыю трэба паказваць праўдзіва. І тыя моманты, пра якія па ідэалагічных меркаваннях у савецкі час не гаварылі, зараз падаюцца інакш: аднаўляюцца імёны забытых людзей, падзеі трактуюцца з розных пунктаў гледжання. Напрыклад, цудоўныя матэрыялы, якія прадстаўляюць дзейнасць камісіі па ахове даўніны. Альбо палітыка беларусізацыі. І там ужо гаворыцца не пра заслугі бальшавікоў, а пра заслугі старой інтэлігенцыі. І ў падачы матэрыялаў супрацоўнікі нічога не перакрэсліваюць. Толькі бясстрасная канстатацыя бяспрэчных фактаў. Мы добра ўсведамляем важнасць аб'ектыўнасці і не кідаемся з адной крайнасці ў другую. І калі ёсць экспазіцыя, прысвечаная рэпрэсіям, то там прадстаўлены ўсе доказы (праз дакументы, лёс людзей) таго, што гэта такое. Знайшлося месца і паказу стварэння піянерскіх і камсамольскіх арганізацый, калектывізацыі. Не ўсё, як відаць, было афарбавана ў чорны колер. Наведвальнікі атрымаюць магчымасць прасачыць, як развівалася ў тыя гады медыцына і ўстановы народнай адукацыі і культуры Полацка. Не прапушчаны ні адзін перыяд з жыцця горада ў тыя часы.

На заканчэнне хачу адзначыць, што галоўная задача музея ў сучасны перыяд — стварыць карціну праўдзівую, з аднаго боку і пабудаваную на строга навуковай аснове, вострай і актуальнай — з другога боку.

# История Витебской школы художников в искусствоведческой науке и краеведении

**Лисов Александр Генадьевич,**
*кандидат искусствоведения,*
*доцент кафедры отечественной и всеобщей историѐ*
*Витебский государственный университет им. П.М. Машерова*

В условиях постсоветского времени, когда были переосмыслены принципиальные подходы к авангардному искусству, художественная жизнь Витебска первых послереволюционных лет неизменно вызывает огромный интерес специалистов. В русскоязычных изданиях о художниках М. Шагале, К. Малевиче, каталогах крупнейших московских и петербургских выставок, посвященных творческим экспериментам послереволюционного времени и отдельным художникам, стали частыми материалы, связанные с художественной жизнью Витебска. В качестве примера можно отметить, что за последние два десятилетия авторы публикаций об одном из крупнейших мастеров искусства 20 века, основоположнике творческой и мировоззренческой концепции супрематизма Казимире Малевиче неизменно оценивают витебский период его деятельности как важнейший. Не удивительно, что велик интерес исследователей из ближнего и дальнего зарубежья, белорусских специалистов к документам витебского архива, коллекциям местных музеев. Как оказывается, витебский период жизни и творчества ряда художников, связанных с местной школой, если и не выглядит белым пятном, то, во всяком случае, представляется слабо изученным. Многие имена, которые названы в солидных монографиях рядом с крупными художниками М. Шагалом и К. Малевичем, вовсе не дают повода для глубоких оценок и рассуждений. Искусствоведческая наука в связи с необходимостью переосмыслить феномен Витебска остро нуждается в фактическом материале. И такой материал может дать истории искусства поиск, который ведется местными специалистами, историками, краеведами.

С 1991 года в Витебске проводится большая работа по изучению жизни и творчества Марка Шагала. В последние годы значительная ее часть ведется и координируется Музеем Шагала в Витебске. Не-

обходимо напомнить, что начало этой работе, как и созданию самого музея, было положено именно усилиями местных краеведов. Регулярно проводятся Шагаловские чтения, издается ряд местных изданий: «Шагаловский сборник» с материалами чтений, «Бюллетень музея Марка Шагала», альманах «Шагаловский международный ежегодник». Среди местных изданий о Шагале нужно назвать книги витебского краеведа А.М. Подлипского[1], статьи Л.В. Хмельницкой. Интерес зарубежных специалистов к витебской ситуации рубежа 1910-х — 20-х гг. сделал возможным участие в местных шагаловских мероприятиях целого ряда крупных ученых. Работа местных специалистов и краеведов, с одной стороны, и московских, петербургских искусствоведов, ученых из ближнего и дальнего зарубежья, с другой стороны, стала единонаправленной и плодотворной. В Витебске это привело к переменам в отношении местных властей к творчеству художника, созданию дома-музея. Важной частью программы стало проведение на родине М. Шагала четырех выставок его произведений из коллекции, принадлежащей его семье (1997, 2002, 2004, 2005 гг.). Публикации материалов значительных российских конференций, каталогов крупнейших московских и петербургских выставок последних лет, посвященных Шагалу, не обходятся без ссылок на работы витебских исследователей [2].

Усилия витебских историков, искусствоведов, краеведов были направлены на изучение родословной Марка Шагала, раннего периода его биографии, творчества витебского периода, круга его общения, памятных мест, связанных с его деятельностью. Это лишь схематичная попытка обозначить в общем виде главные направления поиска, который проводился и ведется в последние годы.

Схожая ситуация складывается в отношении изучения творческой биографии Казимира Малевича. В Витебске проводились пленер, конференции, издается под редакцией Т.В. Котович специальный сбор-

---

[1] Подлипский А.М. Васильковые годы Марка Шагала, или Витебск в жизни и творчестве художника. — Витебск, 1997; Он же. Витебские адреса Марка Шагала. — Витебск, 2000; Он же. Марк Шагал. Основные даты жизни и творчества. — Витебск, 2000; Он же. Вторая родина Марка Шагала (Художник и Лиозненщина). — Витебск, 2002.

[2] Показателен в этом отношении каталог последней, самой крупной российской выставки произведений М. Шагала, которая проходила в 2005 году в Государственной Третьяковской галерее в Москве и Государственном Русском музее в С.-Петербурге.

ник «Малевич. Классический авангард. Витебск». В настоящее время в печати находится уже девятый его выпуск. Сборник занял важное место в библиографии работ, посвященных художнику. Все издания последних лет, выпущенные такими крупнейшими российскими собраниями, центрами по изучению наследия Малевича, как Государственная Третьяковская галерея и Государственный Русский музей, делают отсылки на витебский сборник [3]. Большая работа, связанная с комментированием витебских документов, освещающих биографию художника, была проведена в связи с подготовкой московским издательством «Русский авангард» двухтомника «Малевич о себе. Современники о Малевиче»[4].

Но ситуация выглядит не так уж беспроблемно и идеально, как может показаться. Если контакты витебских исследователей с представителями московского и петербургского искусствоведения стали достаточно традиционными и едва ли могут сегодня кого-то удивлять, то вот консолидации усилий с представителями белорусской академической науки, направленными на изучение витебского искусства послереволюционных лет, не сложилось. Контакты между работниками музейных учреждений Витебска и Минска, нужно признать, в определенной ступени осуществляются. А вот отсутствие контактов с представителями академической, вузовской столичной науки очевидно. Это приводит к появлению публикаций, в коих развиваются идеи о псевдо-белорусских корнях К. Малевича и тому подобные соображения[5]. К этому достаточно прибавить, что усилиями украинских историков-краеведов родословная художника изучена до XVIII столетия[6].

---

[3] В круге Малевича: соратники, ученики, последователи в России 1920–1950-х гг. — СПб.: Palac Ed., 2000; Казимир Малевич в Русском музее. — СПб.: Palac Ed., 2000; Альманах «Уновис» № 1. Факсимильное издание. — М., 2003.

[4] Малевич о себе. Современники о Малевиче. Письма. Документы. Воспоминания. Критика. В 2-х тт. / Авторы-составители И.Вакар, Т. Михиенко. — М.: RA, 2004,

[5] За последние десятилетия поиском белорусских корней Малевича был озадачен целый ряд авторов: Прыпойскі Р. Мастак-рэфарматар і празорца // Голас Радзімы, 1978, 30 сакавіка, с. 7; Шунейка Яўген. Супрэмус, або Творца беспрадметнага мастацтва // Мастацтва Беларусі, 1989, № 2, с. 53–59; Конан У. Вобраз Казіміра Малевіча: факты і міфы //Мастацтва, 1998, № 12, с. 2–5;

[6] Результаты большой исследовательской работы по реконструкции генеалогического древа рода Малевичей, которую провел украинский искусствовед С.П. Папета, опубликованы в кн.: Малевич о себе. Современники о Малевиче. Письма. Документы. Воспоминания. Критика. В 2-х тт. / Авторы-составители И.Вакар, Т. Михиенко. — М.: RA, 2004,

Значительная работа ведется зарубежными и российскими специалистами по изучению жизни и творчества Л.М. Лисицкого, становление художнического дарования и один из периодов профессиональной деятельности которого связаны с Витебском. Анализ изданий, посвященных художнику, которые вышли в последние годы в США, странах Европы, России, свидетельствует, что тема «Витебский период в жизни и творчестве Лисицкого» продолжает быть актуальной[7].

В Государственном Русском музее в течение ряда лет проводится подготовка выставки произведений художницы В.М. Ермолаевой. Число ее работ, известных специалистам, составляет около 500. Публикаций, специально посвященных витебскому периоду деятельности художницы, пока нет. Работы, посвященные творчеству мастеров такого уровня, как Лисицкий и Ермолаева, ведутся в привязке, прежде всего, к крупным музейным коллекциям.

Важным направлением деятельности, связанным с изучением местной школы художников, является возвращение имен, реконструкция биографий ее представителей. В витебском круге Шагала и Малевича было немало одаренных художников, чьи имена до сих пор не признаны и не достаточно оценены. С их биографиями и творческим наследием все выглядит не так благополучно, как с широко известными деятелями, на изучение которых направлены значительные усилия. Результатом работы крупного исследователя русского авангарда В.И. Ракитина стали две монографии о художниках, входивших в супрематическую группу УНОВИС, созданную Малевичем в Витебске. Это книги о Н.М. Суетине и И.Г. Чашнике. Но вот такие имена как И.Т. Гаврис, И.И. Червинко, братья Носковы, братья Векслеры, Л.А. Юдин хотя и часто называются в числе членов УНОВИСа, но сведений об их биографиях собрано мало. Острой проблемой является и то, что о творчестве этих художников можно судить лишь по отдельным произведениям в московских и петербургских музейных собраниях. В белорусских музейных фондах они отсутствуют. А ведь профессиональная искусствоведческая оценка возможна лишь при наличии музейных коллекций.

---

[7] Примером может случить новая книга американской исследовательницы Ненси Перлофф «Situating El Lissitzky. Vitebsk, Berlin, Moscow. Edited by Nancy Perloff and Brian Reed (Getty Research Institute)». Хотя Витебск и обозначен в названии книги как одна из главнейших точек, связанных с деятельностью художника, раздел о его витебском периоде небольшой.

Сохранились сведения о том, что И.И. Червинко был собирателем и хранителем архива УНОВИСа. Он до начала Отечественной войны жил в Витебске. Остается открытым вопрос о том, был ли его архив оставлен в Витебске и погиб в 1941 г. в захваченном гитлеровцами городе, или какая-то его часть оказалась вывезена. Утерян он безвозвратно, или есть шанс на то, что он разыщется.

Одной из ключевых фигур Витебской художественной школы является живописец Ю.М. Пэн, основоположник художественного образования в городе, первый учитель многих тех художников, которые принесли местной школе всемирную славу. Ситуация с наследием Пэна выглядит заметно лучше, чем с произведениями других представителей школы. Витебскому краеведческому музею принадлежит большая коллекция его работ (166 живописных и 17 графических). Это обстоятельство делает перспективным изучение его творчества академической наукой, музейными работниками. В 2004 году в Витебске проходила конференция, посвященная 150-летию со дня рождения художника. Она показала, что творческая биография Пэна недостаточно изучена. Усилия краеведов могли быть полезны в поиске ответов на многие вопросы его биографии.

Важной теоретической проблемой становится обоснованность использования термина «витебская художественная школа». Несмотря на то, что значимость самого феномена местной художественной традиции для становления национального белорусского искусства XX века сомнения не вызывает, признается учеными, существуют возражения ряда специалистов против применения этого понятия. Аргументом делается традиционная классическая трактовка понятия «художественная школа». Она предполагает определенные черты стилевого единства или преемственность в деятельности художественно-образовательных учреждений, связанных с фактором места. Но в работах ряда крупных российских ученых развиваются идеи, которые по-новому представляют смысл понятия в контексте искусства XX века.

Рассуждая о смысле понятия «стиль» применительно к русскому искусству конца XIX — начала XX вв., Д.В. Сарабьянов отмечает, что на этом этапе истории искусства меняется взаимоотношение личности художника и стиля. «Художник-новатор превращался в непосредствен-

ного создателя нового стиля. Школе надлежало идти по его следам, распространяя стиль, закрепляя за ним завоеванную территорию»[8]. Сарабьянов вводит понятие «школы-стиля» или «стиля-школы». Ситуация в искусстве 20 века в корне противоречива. С одной стороны, она меняет положение личности, художника-новатора, делая его творцом школы, с другой стороны она предполагает принципы коллективного творчества, нивелируя индивидуальное начало, провозглашая принцип коллективного творчества. Смена лидера в школе, в т.ч. такой, как Витебское художественное училище, означает и смену провозглашаемых определяющими творческих принципов и педагогических принципов.

Петербургский искусствовед М.Ю. Герман в своей книге «Парижская школа» определяет ее как «синтез интернациональных корней, традиций и поисков с искусством французским», обозначение фактора места и времени, «период позитивного приятия полистилизма как объединяющего и стимулирующего начала»[9]. Одновременно он признает, что «Парижская школа не представляет собой целостного художественного явления, объединенного общностью целей, теоретической программой, пластическими принципами или просто профессиональными убеждениями». И это не дает ему повода отказаться от намерения утвердить термин «парижская школа».

Рассуждая о полистилизме, различиях в понимании творческих задач, принципов обучения искусству можно сравнить таких разных художников, работавших в Витебске в межвоенный период, как М. Шагал, К. Малевич, М. Керзин, И. Ахремчик. На наиболее значительных этапах истории художники-педагоги Витебской школы, единственного на территории нынешней Беларуси художественно-образовательного центра профессионального уровня в период с 1918 по 1941 гг., непременно демонстрировали четкое понимание задач преподавания искусства, целостность методической системы, ощущали значимость традиции даже в тех случаях, когда декларировали отказ от подходов к искусству и методике своих предшественников. Обоснование термина «витебская художественная школа» представляется нам не как чисто тео-

---

[8] Сарабьянов Д.В. Стиль и индивидуальность в русской живописи конца XIX — начала XX века // Сарабьянов Д.В. Русская живопись. Пробуждение памяти. — М., 1998, с. 193.

[9] Герман М.Ю. Парижская школа. — М., 2003, с.10.

ретическая проблема, но в связи в той музейно-экспозиционной и исследовательской работой, которая даст возможность наполнить термин глубоким содержанием.

Краеведческие изыскания подчас вызывают упреки в мелкотемье, в отсутствии значимых для академической науки выводов и обобщений. Такое отношение к краеведению как своего рода любительству улавливает в 1920-е гг. один из организаторов краеведческого движения в Беларуси Н.И. Касперович[10]. Разрабатывая методику организации краеведческой работы, он говорит о необходимости связать её с деятельностью крупных научных центров, с проектами академической науки. Координации усилий профессионалов ведущих научных центров и региональных исследований, разработка самостоятельных программ, объединяющих поиск краеведов, является задачей региональной вузовской науки и музейных центров. Одной из перспективных тем, которые могут стать основой для такого рода деятельности, является изучение художественной традиции Витебщины.

---

[10] Каспяровіч М.І. Краязнаўства. Нарысы. — Менск, 1929, с.154.

# Сімволіка храма ў традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння

**Лобач Уладзімір Аляксандравіч,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі*
*Полацкі дзяржаўны універсітэт*

Асаблівасцю практычна любой традыцыйнай супольнасці з'яўляецца спецыфічны механізм фіксацыі, захавання і трансляцыі інфармацыі, які, у адрозненне ад мадэрных грамадстваў, грунтуецца не на універсальнай знакавай сістэме — пісьмовасці, але на ўсёй сукупнасці элементаў навакольнага свету, з дапамогай якіх і складаецца мегатэкст культуры. « У «вуснай» культуры ў інфармацыйных мэтах максімальна выкарыстоўваліся... падручныя сродкі. Прыроднаму і культурнаму атачэнню чалавека (элементам ландшафта, начынню, часткам жытла, ежы, адзенню і да т.п.) надаваўся знакавы характар. Усе гэтыя семіятычныя сродкі разам з моўнымі тэкстамі, міфамі, тэрмінамі сваяцтва, музыкай і інш. з'явамі культуры валодалі адзіным і агульным полем значэнняў, у якасці якога выступала цэльная карціна свету» [**1**, с. 11]. Такім чынам, аб'екты і з'явы навакольнага свету, апрача свайго непасрэднага, утылітарнага значэння (хата, як пабудова для пражывання людзей) надзяляліся і значэннем вышэйшым, сімвалічным (хата, як мікрамадэль космасу), якое праяўлялася, збольшага, у сітуацыях рытуальнага плану. «Прачытанне» даследчыкам сімвалічных сутнасцяў традыцыйнай культуры прынцыпова важнае для разумення яе ўнутранай структуры, логікі і сістэмы светапоглядных каштоўнасцяў. «Дагэтуль «маўклівая большасць», практычна выключаная з гісторыі, аказваецца здольнай гаварыць на мове сімвалаў, рытуалаў, жэстаў, звычаяў, прымхаў і данесці да ведама гісторыка хоць бы частку свайго духоўнага універсума» [**2**, с. 115–116].

Уся прасторавая наяўнасць, адлюстраваная ў традыцыйнай карціне свету, умоўна падзяляецца на «поле Прыроды» (элементы прыроднага ландшафту: лес, поле, балота, гара, возера, рака і г.д.) і «поле Культуры» (Т. Цыўян), якое змяшчае ў сабе ўсе элементы прасторы, звязаныя з чалавекам і ягонай стваральнай дзейнасцю (горад, вё-

ска, хата, храм, млын, гумно і г.д.). Прастора культуры адрозніваецца ад прыроднага атачэння тым, што яе асноўныя структурныя адзінкі з'яўляюцца плёнам вытворчай дзейнасці чалавека і не маюць ідэнтычных аналагаў у свеце прыроды. Акрамя таго, у міфапаэтычных уяўленнях беларусаў, адлюстраваных, да прыкладу, у касмаганічных легендах, прыродныя локусы (лес, горы, балоты, рэкі і інш.) з'яўляюцца першаснымі ў храналагічным плане, паколькі былі створаныя (Богам, Чортам, Воламам) у пракаветныя міфалагічныя часы, у той час як аб'екты культуры, збольшага, належаць рэальнай гісторыі, калектыўная памяць пра якую вымяраецца ў традыцыйнай супольнасці прыблізна трыма стагоддзямі [**3**, с. 20]. Нягледзячы на празрыстую утылітарную прагматыку, амаль усе элементы культурнага ландшафту маюць надзвычай ёмісты і высокі семіятычны статус і, у значнай колькасці выпадкаў, характарызуюцца полісемантычнасцю і рытуальнай поліфункцыянальнасцю.

Асобнае месца ў міфапаэтычнай карціне свету займае храм, які ў большасці этнакультурных традыцый з'яўляецца «ісцінна святым месцам, домам багоў» [**4**, с. 44]. Яго выключны статус сярод элементаў традыцыйнага культурнага ландшафту падкрэсліваецца і тым, што, у адрозненне ад іншых аб'ектаў «поля Культуры», толькі храм будуецца і функцыянуе з улікам вышэйшай сімвалічнай прагматыкі, але не прагматыкі утылітарна-гаспадарчай. Толькі храм (і ўсе яго відавыя адмены: свяцілішча, капішча, касцёл, царква, капліца) па сваім сутнасным вызначэнні прызначаны для камунікацыі паміж светам людзей і сакральнай сферай. Адсюль, у міфапаэтычнай карціне свету храм выступае, як «цэнтр усёй сакральнай прасторы», як прадметнае ўвасабленне ідэі «сусветнага дрэва», «сусветнай восі» (Axis mundi), якая злучае ўсе сферы светабудовы [**5**, с. 341]. Пры гэтым, храм, сімвалічна ўвасабляючы міфалагічную кропку першапачатку і рытуальнай чысціні, арганізуе вакол сябе не толькі прасторавую, але і часавую плашчыню светабудовы. «Храм — гэта адначасова і самае святое месца, і карціна Свету, ён асвячае не толькі Космас у цэлым, але і касмічнае жыццё. Аднак, гэтае касмічнае жыццё ўяўлялася у выглядзе кругавой траекторыі і ідэнтыфікавалася з Годам. Год разумеўся як замкнёнае кола, ён меў пачатак і канец, але адначасова і тую асаблівасць, што ён мог «адраджацца» ў форме Новага Года. З кожным Новым Годам наступае «новы»,

«чысты», «святы»(яшчэ не спажыты) час» [**4**, с. 52]. Невыпадкова, што ў рытуальных фальклорных тэкстах беларусаў, прымеркаваных да найбольш крытычных момантаў калектыўнага быцця (Каляды, Вялікдзень, Купалле), калі адбываецца пераход ад Старога да Новага, адраджэнне (аднаўленне) свету, яго структура апісваецца як будаўніцтва царквы. У Калядных песнях вобраз гэтага храма мае падкрэслена касмічныя характарыстыкі:»Пчолачкі гудуць, цэркаў будуюць. / Да збудавалі з трыма вярхамі, / З трыма вярхамі, з трыма акнамі. / У першым акенцы — ясен месячык, / У другім акенцы — ясна сонейка, / У трэцім акенцы — ясныя зорачкі» [**6**, с. 112]. Наноўзбудаваны храм узнаўляе не толькі толькі трохчасткавую вертыкальную структуру «свайго» свету, але рэструктурызуе і яго гарызантальную плашчыню. Яе абрысы ўказваюцца ўмоўнай лініяй, што злучае міфалагічную царкву і галоўнае (буйнейшае) паселішча мікрарэгіёна, які, у вачах традыцыйнай супольнасці, і з'яўляецца ўвасабленнем ўсяго «чалавечага свету». «Як на горке, на гарэ, / На высокай, на траве / Там стаяла царкоўка, / На царкоўке — макоўка, / На той макоўке — златы крэст, / А на тым красту — ластаўка. / Яна сядзіць высока, / Чуець, відзіць далёка: / – А што ў Клясціцах дзеіцца? / – Дзевяць дзевак жэняцца...» [**7**].

Міфалагема «новага храма» прысутнічае і ў традыцыйнай вясельнай абрадавасці беларусаў Падзвіння, дзе сімвалізуе пераход маладога і маладой у прынцыпова новы жыццёвы статус — мужа і жонкі. «Пасля вянчання спяваюць каля царквы:» Рад-радзенёк Іванька, што ў новэй цэркаўке пабуваў, / На белам рушнічку пастаяў, / Мар'юшку за ручку падзяржаў, / Залатыя пярсцёнкі памяняў» [**8**, с. 390–391]. Прастора храма, выступаючы неад'емным кампанентам рытуалаў пераходнага тыпу (Радзіны / Хрышчэнне, Вяселле / Вянчанне), уяўляе сабой прастору падкрэслена знакавую, дзе паводзіны і ўчынкі, звычайныя ў штодзённым жыцці, «прачытваюцца» як пэўныя прадказанні жыццёвай долі галоўных фігурантаў рытуалу: дзіцяці і маладых. Так, на Падзвінні верылі, што, калі падчас хрышчэння дзіця крычыць у храме, то будзе жыць доўга, хоць і будзе з характару сярдзітым, калі ж паводзіць сябе ціха — будзе рахманым, але недаўгавечным; калі дзіцёнак мачыўся ў купелі — гэта азначала, што ўсе прысутныя «пап'юць піва» на яго вяселлі, а канец спавівальнага пояса, калі дакранаўся падлогі царквы, азначаў, што дзіцёнак будзе мачыцца ў ложку да сталага ўзросту

[**9**, с. 20–21]. Не меньш знакавымі былі паводзіны і акалічнасці пад час вянчання. Калі нехта з маладых меў хоць-якую хваробу ў часе вянчання, то, як лічылася, гэтая хвароба «завянчаецца» з чалавекам навечна; вянчаліся, незалежна ад пары года, у кажухах, што мусіла забяспечыць заможнае жыццё ў шлюбе; строга пільнавалі, каб між маладых у храме ніхто не прайшоў, бо ў зваротным выпадку гэта мусіла б прывесці да распаду сям'і [**9**, с. 60–61].

Разам з тым, закранаючы глыбінную сутнасць рытуальнай традыцыі беларусаў, не варта перабольшваць у ёй сімвалічнай функцыянальнасці хрысціянскага храма, якая шмат у чым была абумоўлена канкрэтным палітычным і соцыя-культурным кантэкстам эпохі. «У царкву беларусы ходзяць толькі для баўлення часу; хрысцяць дзяцей, вянчаюцца ў царкве толькі таму, што без гэтага нельга...» [**10**, с. **13**]. У пэўнай ступені «сітуацыю можна параўнаць з сучаснай, калі нараджэнне дзіцяці, шлюб і смерць чалавека абавязкова рэгіструюцца ў Загсе – афіцыйнай дзяржаўнай установе, што ніякім чынам не адлюстроўвае ўнутраных поглядаў людзей на сістэму дзяржаўнай улады» [**11**, с. 49]. Для беларускай традыцыйнай супольнасці безумоўны прыярытэт мела менавіта рытуальная традыцыя:»У нас пабрацца, та гэто зрабіць вяселейко, а вянчацца ў цэркві так, бо таго патрабуе начальство да поп – ведамо, яму за вянец карысць» [**12**, с. 180]. У гэтай сувязі паказальнымі з'яўляюцца назіранні, зробленыя пад час палявых этнаграфічных экспедыцый 1995–2006 гг., якія праводзіліся Полацкім дзяржаўным універсітэтам на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Большасць інфармантаў, распавядаючы пра бытаванне сямейнай абрадавасці ў 1950-60-х гадах, засведчылі пераемнасць і цэласнасць рытуальнай традыцыі, безадносна зведзенай да мінімума грамадскай актыўнасці царквы. Важкім фактарам дэградацыі рытуальнай традыцыі сталі не зачыненыя савецкімі ўладамі храмы, але імклівыя працэсы урбанізацыі і мадэрнізацыі беларускай вёскі.

З другога боку, ігнараванне сімвалічнай і функцыянальнай ролі храма ў рытуальным жыцці беларускай традыцыйнай супольнасці гэтаксама з'яўляецца вульгарным скажэннем ці неразуменнем рэчаіснасці. У гэтым сэнсе пазнака А. Лісоўскага (інфарматара П. Шэйна) аб тым, што беларусы ў царкве толькі «бавяць час», з'ўляецца яскравым свед-

чаннем павярхоўнага погляду на народную культуру. Ніжэй паспрабуем выявіць і акрэсліць сімвалічныя ролі храма ў традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння.

**Храм як цэнтр «крызіснай сеткі».** Паводле Т. Шчапанскай, пад «крызіснай сеткай» трэба разумець адну з сістэм арганізацыі тэрытарыяльных сувязяў, па каналах якой «цыркулюе інфармацыя, звязаная з рознага роду парушэннямі, крызісамі, няшчасцямі. Вузлы гэтай сістэмы — святыя месцы, тыя асабліва шанаваныя святыні, якія прыцягвалі паломнікаў. У самым агульным выглядзе функцыю крызіснай сістэмы можна вызначыць так: падтрыманне эколагадэмаграфічнай раўнавагі» [**13**, с. 110]. Іншымі словамі, пасродкам «крызіснай сеткі» найбольш эфектыўна здзяйсняецца дараабмен паміж светам людзей і сакральнай сферай, калі ў выніку *ахвяравання, абракання* (якое трэба разумець не толькі як перадачу матэрыяльных каштоўнасцяў, але і выкананне асабістага зароку: дайсці да «святыні» пешкі, на каленях, не спажываючы ежы, не размаўляючы і г.д.) людзі атрымліваюць зваротны дар — аднаўленне жыццёвага ладу і парадку (здароўе, ураджайнасць, дождж пасля засухі ) у межах лакальнай супольнасці.

У якасці цэнтра Сусвету, месца пачатковага і ідэальнага, храм з вялікай частотнасцю фігуруе як «крызісны цэнтр» у такім архаічным жанры фальклору, як замовы. Уяўнае падарожжа суб'екта замовы ў міфалагічную кропку першапачатку і чысціні азначае пазбаўленне ад хваробы:»Вадзіца-царыца, ўсяму сьвету памашніца, з-пад меж, з-пад гор, з-пад белага камня. Мора — на моры бел камень ляжыць, на камне царква стаіць, а ў той царкве прэстол стаіць, за тым прэстолам паненка сядзіць. Нічога не знаіць, не маіць — толькі ад уроцы памагаець. Не яна памагаіць — сам Гасподзь Бог і мой лёгкі дух» [**14**]. Калі размова ідзе пра дараабмен з канкрэтным сакральным аб'ектам (святы камень, крыніца-прошча, ахвярны крыж, капліца, храм) на першае месца выходзіць канцэпцыя *ахвяры* (*ахвяравання*) даволі падрабязна распрацаваная ў народнай свядомасці беларусаў Падзвіння:» Да, там была ахвяра. Вот гэта называлася, што ахвяра. Бывала ў майго дзядзькі ў аднаго не гадаваліся дзеці, а не гадаваліся дзеці ў яго за тое, што жаніўся на Вербніцу ў самый пост. Адна нядзелька да Вялікадня, а ён тут жаніцца. Ай, крычалі, эта ж умесце жылі, гэта яшчэ ў маім дзецтве было. Папа мой, гэта ж старшы брат, крычаў, крычалі брацця-сёстры: «Не жаніся».

Не, край яму нада жаніцца. І так во два — адзін дзядзька мой, другі — брат мой, і жаніліся во так у Вербніцу. Ну і якая ж у іх жызьнь страшная і няпутная. І ў гэтага дзядзькі чацвёра дзяцей радзілася, усе чацвёра ўміралі. Ды ўміралі, хай Бог абнясець, страшнай смерцю, крычалі, гэта ж у парцізаншчыну гэту, у вайну. Дык ён крычаў, тры гады дзіцёнку было, крычаў дзень і ноч, і папа мой ужо ня мог атратаваць, з сябе выхадзіў і ўсё крычаў на яго: «галайка ты». Во так яго абзываў, во такое слова плахое было «галайка»: «Галайка ты, жаніўся на Вербніцу!» І ўміралі гэдак дзеці, што ў жывога і вочкі павыкачваліся, і ўсё. Ну, дык вот тады гэта бабушка, што мяне ўчыла, яна сказала так, і гэта ўжо после вайны, яна сказала: «Ня будзець, Надзя, у цябе і гэта дзіцё гадавацца. Награшылі вы дужа. Дык вот вазьміце ахвяру». А якую ахвяру сказала: «Ідзіце вот када дзень прысвітой Ефрасінні Полацкай нашай, вот ідзіце на Ефрасініну цэркву і дайце ахвяру. Ахвяру вот такую – купіце там палаценьчыка ці платочык які». Ну, вот і радзіла гэта жанчына дзевачку. Ну, і тады ўзялі ахвяру гэту, і яны паняслі, і гэту дзевачку пяшком насілі аж у Полацк. Дык усё з майго дзядзькі смяяліся, што садзі ў мяшок і нясі на плячах. Гэта ж далёка перанесці, дык ужо і парадашная была. І вот, як прыйдзеш у цэркву, нада купіць свечачку, запаліць свечачку і паставіць, і во гэту ахвяру, што прымерна яны няслі, нада было палажыць, дзе храняцца мошчы Ефрасінні. І када там ужо нейкія капеечкі былі, дык у тую скрабёначку кідалі, што ля яе тут блізенька стаіць. Ну, хто ўмеў, ну даўныя людзі ўсе ўмелі Богу маліцца, ну тут во нада сваімі словамі. Када ў чалавека гора, када ў чалавека беда, када ў чалавека нездароўе, нада маліць сваімі славамі, усё раўно да Бога дайдзець гэта. «Госпадзі, дай мне сілу, дай мне волю, дай мне ўцішэньнейка, дай мне ўспакаеньнейка, дай мне смірэньнейка», каб чалавек смірыўся ка ўсяму. Даець Бог добрае — бяры, даець плахое — бяры. Ну і вот яны хадзілі. Ну і як схадзілі, ну і тая Любачка вырасла і ўжо ў яе і ўнукі ёсць, і праўнукі. І нада хадзіць кажан год на гэту святую Ефрасінню ў цэркву, і там палажы ты там рубаль, свечачку запалі, ну і можа там насавы платочак палажаш. Вот і ахвяра, вот гэта была ахвяра» [**15**]. Паказальна ў нашым выпадку з'яўляецца тое, што ў якасці сакральнага цэнтра ўсяго рэгіёна фігуруюць мошчы прападобнай Ефрасінні, царкоўнае ўшанаванне якой на Полацкай зямлі пачалося, верагодна, яшчэ ў канцы XII ст. [**16**, с. 358]. Вера ў цудадзейнасць гэтай святыні выяўляецца і ў практыцы звароту да яе на-

ват у выпадку такой страшнай хваробы, як эпілепсія. «Прыпадак. А гэтага (загавора) не знаю. У мяне была гэдак унучка, дык сколькі ей рады не давалі, а тады ў Полацак у цэркву звазілі пад Ефрасінню. Дык вродзе прапала гэта» [**17**]. Прыярытэтны статус такіх святыняў, як Сафійскі сабор у Полацку, храм (мошчы і ўласна вобраз)св. Ефрасінні знайшоў сваё адлюстраванне нават у мясцовай замоўнай традыцыі: «Ішоў сам Бог напярод, Ісус Хрыстос пасярод, Марыя пазаду, вяла Яна ў чараду. Яна яго палюбіла, залатым вусом надзяліла. Залатым вусом, залатым паясом, залатым кіёчкам. Яна яго спадабала, к сібе на помач пазвала. Сьвятая Марыя, Сьвятая Ефрасіньня, Сьвятая Сафія праз брод кроў пралівалі, Хрыста на помач пазвалі: «Стань нам памошнікам ад Марынінага залатніка»[**18**].

У сельскай мясцовасці сімвалічныя функцыі храма вельмі часта пераносяцца на «міні-храм» — капліцу, што збольшага маркіруе прыроднае месца гіерафаніі (праяўлення свяшчэннага). На тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў якасці такіх культавых месцаў найбольш часта фігуруюць святыя крыніцы. Ахвяраванне чалавека ў дадзеным выпадку адбывалася па стандартнай схеме: праз прынясенне матэрыяльных дароў (грошы, палатно, ручнікі) ці праз асабістае фізічнае выпрабаванне, звязанае з пераадоленнем прасторавай адлегласці паміж хворым і святыняй. «У нас чалавек бязногі быў. Гэдак балелі і ламілі (ногі). І ня мог (хадзіць). І лячыўся і ня вылячыўся. А пад Яна (капліца над аднайменнай крыніцай ля в.Чарневічы Глыбоцкага р-на) ахвяраваўся. Дзе пайшоў, дзе пераначаваўся. Прыйшоў, а там ваду давалі. Ён ваду піў, націраўся. Атыйшлі ногі. Яшчэ пяць гадоў жыў!»[**19**]; «Ну і вот, эта яшчэ мой папа расказываў. Тут, у Матырыне, быў чалавек, хлопец. І то лі прыўраждзёны, ну ня відзеў, малады чалавек, і ня відзеў, сляпы. А тады яму прысніўся сон, што дапаўзі да крыніцы, да (возера) Ління, і дастань вады, і напійся, і памыйся — і будзеш відзець. Ну, і што вы думаеце, дык поўз чалавек гэты на каленьках, эта даўно дужа было, але гэта было дзесьвіцельна верна, чалавек гэты поўз на каленьках, дапоўз да гэтай (крыніцы). Ішоў чалавек упярод ужо, а ён поўз за ім. Дапоўз да тый крыніцы, дастаў, папіў вады, памыўся і чалавеку адкрыліся вочы» [**15**]. Уласна кажучы, і сама капліца магла з'явіцца ў выніку ахвяравання. Так, у паданні пра Чарневіцкую крыніцу гаворыцца:» Ну вот, гавораць, што ішоў чалавек у бор і будзець ён сеч бор. Ся-

чэць ёлку, з гэтай ёлкі пашла кроў. Тады аказаўся чалавек. Кажыць: «Я Іян-крысьціцель. Я должан жыць на вадзе тут.» Гэта расказывалі даўнія, старыя дзяды-прадзеды. Так, стаіць чалавек. Стаіць чалавек: «Тут должан быць Ян-крысьціцель.» Ну а тады на гэта месца прыхадзілі людзі. Там вада цякла, прыхадзілі. Тады граф Лужыцкі прыехаў, у яго нехта быў сьляпы там, нехта там быў з дзяцей. Ну, і памог гэтай вадой. І вада гэта зразу памагла. І стаў відзець там бальны гэты. І ён пастроіў тады капліцу на гэтым месцы» [**20**]. Пераканаўчым сведчаннем жывучасці народнай традыцыі з'яўляецца той факт, што падобнае ахвяраванне не ёсць адзнакай толькі далёкай мінуўшчыны:» Там вада пастаянна бяжыць, яна бяжыць і бяжыць. Капліца зроблена. А тут у бары красіва: такая пагурак, лагчынка і капліца новая. У нас брыгадзір ня меў здароўя і ён рашыў пастроіць новую» [**15**].

Сітуацыя поліканфесійнасці, характэрная для беларускай этнічнай прасторы, наклала свой адбітак на народны механізм ахвяравання ў храм. Культавы будынак, прыналежны іншай канфесіі, у міфапаэтычнай карціне свету суадносіўся са сферай «чужога» і, адпаведна, разглядаўся як найбольш эфектыўная зона камунікацыі з іншасветам. Яшчэ ў пач. XX ст. вядомы беларускі этнограф Е. Раманаў пазначаў: «Калі хвароба сур'ёзная, заказваюць літыя ці розныя металічныя выявы розных хворых частак цела: галавы, ног, рук, вушэй, вачэй, грудзей, тулава і г.д. Гэтыя выявы нясуць у бліжэйшы касцёл і кладуць там перад шанаваным абразом, як ахвяру. Адначасова просяць ксяндза адслужыць за плату імшу перад тым абразом за здароўе хворага. Так робяць праваслаўныя. Католікі, наадварот, просяць адслужыць абедню ў праваслаўнай царкве» [**21**, с. 309]. Падобная практыка фіксуецца ў зонах канфесійнага памежжа на тэрыторыі Падзвіння і ў наш час. «Вось як мне вельмі балела нага, я няпоўныя два месяцы ляжала ў бальніцы, там мне яе і абагравалі і уколы давалі, быта нага і не баліць. Пакуль я прыйшла з аўтобуса дамоў, я апяць на нагу ступіць не магу. Тады прыйшла да мяне падруга праваслаўная. У мяне ўзяла кветкі-півоні, яна кажа: «Занясу ў цэркаў». Я нарвала ей самых лепшых і кажу ей, каб занесла іх бацюшку. Каб ён памаліўся, кветкі ў алтар пастаўце, мне можа перастанець балець нага — і па сей дзень у мяне нага не баліць. І паколькі я каталічка, але кветкі баба занясла ў праваслаўную цэркву, і мне памагло» [**22**].

Асаблівай формай крызіснай камунікацыі паміж калектывам і храмам з'яўляецца *ахвяраванне абыдзённых рэчаў* . Прыналежачы да т.зв. рытуалаў аказіянальнага тыпу, яно абслугоўвае крызісныя сітуацыі, якія ствараюць рэальную пагрозу ўсёй супольнасьці (вайна, пошасць, эпізотыя, засуха). Найчасцей у якасці абыдзённай ахвяры фігуруе палатно (наміткa, ручнік), якое выраблялі ўсе жанчыны вёскі ў межах сутак (дня) з супольна сабранай сыравіны (увасабленне калектыўнай долі) пасродкам выканання ўсёй паслядоўнасці тэхналагічных аперацый. «Ва ўсіх падобных абрадах паўната і завершанасць усяго працэсу, яго «спрэсаванасць» у часе надавалі прадуктам працы сакральнасць і магічную сілу» [**23**, с. 489]. Новае палатно сімвалізавала абноўлены, пазбаўлены дэвіяцый светапарадак і ахвяравалася ў храм (капліцу). Як паказваюць матэрыялы палявых даследаванняў, асабліва практыкаваўся выраб абыдзённага палатна ў часе апошняй вайны. «– *А вот ці можа ўвайну ўжо, ці рабілі наміткі такія, абыдзённыя?* — Рабілі. І вот сама дажа помню, што бабы дом той згарэў. І вот сабраліся ўсе бабы. І пралі, і лён мялі, і чапалі, і ўжо і пралі, сколькі баб сядзела і с калаўротамі. І пралі, тады ўжо снавалі, нада ж і аснаваць было, і ткалі. І мы ўжо праз окны глядзелі, там хата такая была — окны нізка, ну дак нам ужо даступна было. Ну, хто мог. Хто мог…Ужо ж сабіраліся: ты там тонка ня можаш прасці, значыць ты мні лён. Ага… – *Усе лён прыносілі патроху?* — Ага, усе! Усе снапамі прыносілі. Гэта я ўжо сама, гэта на маей памяці. – *А вот дзеля чаго рабілі гэта?* — Ну, эта ат усіх як усё роўна дар, ат усіх як усё роўна заступа якая ат усіх (бед). Ну, прасілі людзі. Кажды сваё прасіў. – *Так тыя наміткі, іх у цэркву?* — Усё няслі ў цэкрву! Ну і тады і баба гаварыла, што становяцца яны на калені і ўжо молюцца і мы тожа ззаду каля парога тожа станем, як усе так і мы ужо падражалі. Ага! Ну і просіць кажды сваё. Каму там на сям'ю, каму дзяцей, каму… Ну вот так кланяюцца і молюцца. І ўжо так усердна молюцца, прама да ізнемажэнія… Гэтай наміткай яны прама накрывалі этат ужо алтар» [**24**].

**Храм як прастора сакралізацыі** рэчаў (рэчываў) і прадметаў (вада, хлеб, соль, зёлкі і інш.) функцыянуе амаль выключна ў кантэксце найбольш значных рытуалаў каляндарнага цыклу. У межах каляндарнага года менавіта ў храме адбывалася асвячэнне (і т.ч. «легітымізацыя» з боку афіцыйнай царквы) рэчаў і рэчываў, што мелі высокі семіятычны

статус у традыцыйнай супольнасці і часта выкарыстоўваліся ў мэтах, супрацьлеглых хрысціянскім нормам. Так, на Вадохрышча асвячалі ваду, што з'яўлялася моцным апатрапеем і спрыяла развядзенню пчолаў; у Чысты Чацвер — мак, соль, малако ў мэтах супрацьдзеяння чараўнікам; на Вербніцу — вярбу, якую маглі прыносіць у храм цэлым дрэвам з каранямі; на Вялікдзень – яйкі, вялікодныя стравы і нават сала, якім націралі рукі, каб яны не трэскаліся падчас работы [**9**, с. 243], на Спаса — яблыкі; на Успенне — зёлкі, гародніну, неабжатыя каласы жыта [**10**, с. 173], а таксама асот, які потым саджалі на палетках, каб ён цалкам звёўся. Хлеб асвячалі на Юр'я, Міколу, Купалу і Іллю. Але асабліва шанаваліся ў народзе купальскія зёлкі, якія асвячаліся ў храме і з'яўляліся надзвычай эфектыўным магічным сродкам з шырокім спектрам дзеяння. «Ну вот на Святога Івана дзеўкі зёлкі збіралі, гэта нада было абязацельна на Купалку збіраць усе *зёлкі*. Цяпер называецца *зверабой*, а даўней гэта трава, гэтыя зёлкі называлісь *свентаян*. Ён очэнь быў лячэбны ад усяго веку, ад пакуль вякоў, вот ён і называўся свентаян, патаму што празднік жа Іван. Вот па польску гэта свентаян, а па нашаму Іван. Дык вот гэта самае на Купальскую ноч сабіралі ўсе зёлкі, а на наўтро на Івана ішлі свяціць. Хто ішоў у касцёл вот свяціць, хто ішоў у цэркву, но абязацельна. Гэты зёлкі очэнь шчаталіся лячэбныя, вот када там дзеці балеюць, пугаюцца там када там... Цяпер жа ж лечуць таблеткамі ды ўколамі, а даўней жа лечылі толькі, толькі зёлкамі ды загаворамі. Вот і гэтыя зёлкі очэнь шчыталіся лячэбнымі. Кіпяцяць тады, када гэтымі зёлачкамі пояць дзяцей, бываюць дзеці не спяць...» [**15**]. Пры гэтым прынцыпова важным было пільнаваць рытуальныя прадпісанні, па-за якімі і асвячэнне ў храме не мела ніякае моцы. Так, на Усходзе Віцебшчыны, як адзначыў Е. Раманаў, дзяўчаты і маладухі, збіраючы зёлкі раніцай 6 ліпеня, «абавязкова спяваюць купальскія песні, бо інача кветкі не будуць мець гаючае сілы, нават пасля асвячэння іх у царкве» [**21**, с. 211–212]. Такім чынам, прыродная сакральная моц пазначаных прадметаў толькі ўзмацнялася і акумулявалася ў храме моцай уласна Божай. Так, напрыклад, пасвячаючы на Вялікдзень жыта, беларусы Падзвіння магічным чынам павялічвалі яго ўрадлівасць. «У суботу рана «бабкі» пяклі, яйкі красілі, сыры рабілі, варылі каўбасы і мяса. У гэты дзень пад 11 часоў вечара ішлі ў царкву на ўсяночную. Бралі з сабою сявалкі з пасвянцоўкай (жытам для пасвячэння). Калі бацькі прыязджалі з царквы, маці налівала

вады ў міску, бацька клаў пасвянцонае яйка, усе дзеці па чарзе мылі твары» [**25**]. Пры гэтым, трэба заўважыць, што храм у міфапаэтычнай карціне свету быў далёка не адзіным прасторавым локусам з выразнай функцыяй сакралізацыі. Падобныя ўласцівасці былі характэрныя практычна ўсім «святым месцам» (крыніцам, азёрам, камяням, асобным дрэвам), дахрысціянскім паводле свайго свайго паходжання. Так, у ваколіцах Лепеля вядомы культавы камень-следавік з характэрнай назвай «Божы» ці «Залаты»: »Сьлядкі там гэтыя чысьцілі... Старыя людзі хадзілі і зерне туды, у сьлядкі, сыпалі, каб добры уражай быў. Ну, яшчэ хадзілі на Вялічка, яйкі сьвянцілі... Да каменя хадзілі, яйкі пакладуць у сьлядкі — во так і сьвянцілі» [**26**].

З другога боку, нельга не ўзгадаць і тыя рэчы, якія мелі статус сакральных праз сваю атрыбутыўную прыналежнасць да храма (абразы, свечы, убранне святара і да т.п.) і выкарыстоўваліся вяскоўцамі ў разнастайных магічных практыках. У прыватнасці, воск царкоўных свечак разглядаўся як дзейсны сродак у любоўнай магіі. «Малады мужчына тайком бярэ ў царкве тры сплавы ад трох розных свечак, тайком тры разы абносіць іх вакол дзяўчыны, што ўпадабаў, і зноў адносіць сплавы ў царкву: дзяўчына хутка палюбіць яго. Тое ж робіць і дзяўчына ў адносінах да хлопца з аднолькавай мэтай»[**9**, с. 50]. У народнай медыцыне беларусаў Падзвіння як радыкальны сродак пазбаўлення ад падвею разглядаюцца «папоўскія рызы», якія трэба было скрасці ў царкве і, запаліўшы, пакурыць імі хворага [**27**].

**Храм як аператыўная магічная прастора**. Паколькі храм у міфапаэтычнай карціне свету выступае як дзейсны і непасрэдны канал камунікацыі з іншасветам, месца, дзе магчымыя звышнатуральныя метамарфозы, то «цэрквы часта ўспрымаліся сялянамі як асаблівыя «чарадзейскія» месцы, а святары, царкоўны прытч — як своеасаблівыя валхвы, чараўнікі»[**28**, с. 26]. Так, практычна па ўсёй Беларусі, «пры цяжкіх родах ішлі да святара прасіць, каб ён адкрыў «царскія» вароты» у храме [**29**, с. 30]. Аналагічная працэдура прадпрымалася і са зваротнай мэтай. Калі чалавек доўга аганізаваў перад смерцю, «царскія вароты» адчынялі дзеля таго, каб чалавек без пакутаў пакінуў свет жывых [**30**, с. 152]. У Віцебскай губерні дзеля таго, «каб лепш гадаваліся авечкі г.зн. каб атрымаць лепшы прыплод, прысутныя ў цэркві на Раство Хрыстова гаспадары спяшаюцца па некалькі разоў кашлянуць пад

час воклічаў святара. Асабліва часта гэта робіцца пры чытанні Евангелля і пры казанні, калі воклічы святара больш працяглыя» [**9**, с. 226]. Шэраг народных практык, якія рэалізоўваліся менавіта ў храме, ішлі ў разрэз не толькі з царкоўнымі прадпісаннямі, але і хрысціянскай мараллю ўвогуле. Дзеля таго, каб сурова адпомсціць свайму зламысніку, вясковец «у першы святочны дзень, прыйшоўшы ў царкву, купляе 5-ці альбо 3-х капеечную свячу, запальвае яе не са свяцільні, а з супрацьлеглага канца, абводзіць ёю тры разы вакол галавы, прыгаворваючы: »Закруціў я свячу святую ў цэркві вакруг свае галавы. Божа ласкавы, Матка найсветша, каб гэдак скруціў ў напасць маіх непрыяцеляў! Перавярнуў я свячу святую да гары нагамі, — каб гэдак перавярнула, перакруціла ў тры напасці маіх непрыяцеляў! Каб іх цэлы род успрагла, скруціла! Як гэта свечка ясна гарыць, каб гэдак у маіх непрыяцеляў пад сэрцам гарэла, да іх пякельным агнём смаліла, як я, невінен, плягі (ці напасці) цярпеў» [**10**, с. 295]. У часе Вялікоднай службы ў храме можна было выявіць ведзьмаў-малочніц: »Каб убачыць малочных ведзьмаў усяго наваколля трэба пад час Вялікоднай усяночнай паглядзець на молячыхся ў царкве жанчын цераз дзірачку агарка лучыны, адкуль сам-сабою выпаў сучок» [**9**, с. 243]. Паралельна храм фігуруе ў прыёмах прадукавальнай і лекавай магіі. Лічылася, што чалавек, які здолеў абыйсці царкву пад час хроснага Вялікоднага ходу з поўнай прыгаршней грошай, не ўпусціўшы ніводнай манеты, той не будзе мець патрэбу ў грошах на працягу цэлага году[**9**, с. 243]. Хвораму ж на ліхаманку раілі, як заспее вечаровы прыпадак, найхутчэй ісці да царквы, аббегчы яе тры разы, паклаўшы манету на царкоўны ганак, а потым ісці дадому задам на перад [**9**, с. 276].

**Храм як асяродак святочнага часу.** Вышэй ужо была пазначана сутнасная сувязь храма і касмічнага часу. Большасць прыведзеных прыкладаў сведчаць пра тое, што рытуальна-сімвалічныя функцыі храма выяўляюцца, перадусім, у рамках хранатопа, які злучае ў непарыўным адзінстве сакральную прастору і сакральны (святочны) час. «Месца культу, напрыклад храм, станавіўся цэнтрам ня толькі сваёй прасторы, але ў народных уяўленнях таксама і асяродкам свята. Такія месцы былі сакралізаваныя пасродкам беспасярэдняй прысутнасці Бога (святыні) альбо інцэдэнтальнага кантакту са светам звышнатуральным...» [**31**, s. 107]. Свята як сакральны прамежак часу характарызуецца забаронай

(поўнай ці частковай) на працу гаспадарчую, выключна ўтылітарную. На першы план выходзяць каштоўнасці сімвалічнага кшталту і рытуальныя формы паводзінаў, бо самое свята атрымлівае санкцыю «не са свету сродкаў і неабходных умоваў, а са свету вышэйшых мэтаў чалавечага існавання, г.зн. са свету ідэалаў» [**32**, с. 14]. Аднак, пры гэтым сімвалічны і акцыянальна-эмацыйны змест беларускіх народных святаў быў прынцыпова адрозным ад нормаў хрысціянскай этыкі. У той час, як «тон афіцыйнага свята мог быць толькі маналітна сур'ёзным...» [**32**, с. 15], то народнае свята носіць падкрэслена смехавы і, праз гэта, аптымістычны, жыццясцвярджальны характар. Гэтая, здавалася б, супярэчнасць здымалася ў традыцыйнай супольнасці праз рэалізацыю адмысловага святочнага сцэнара паводзінаў, калі наведванне храма і карчмы (часта ў кантэксце кірмашу) былі не ўзаемавыключнымі, але ў роўнай ступені абавязковымі элементамі свята. «Бываюць тут часам *у нядзелю кірмашы*; людзі збіраюцца з бліжэйшых вёсак у *касцёл*. <...> Пасля набажэнства ўсе збіраюцца ў адным месцы, дзе-небудзь паблізу *карчмы*; тут з'яўляецца некалькі жыдкоў са стужкамі, іголкамі і рознымі бліскучымі аздобамі для адзення; падае голас адмысловая беларуская дуда. Распачынаецца музыка пад адкрытым небам; скачуць да поту, іх радасць часта пераходзіць межы прыстойнасці. А журботныя плакальшчыцы, якія нядаўна заліваліся слязамі над магілаю мужа і бацькі, скачуць пад мелодыю дуды» [**33**, с. 85–86]. Паколькі царкоўная служба і казані былі малазразумелымі і не прыцягвалі ўвагу вяскоўцаў, то ў святочнай сітуацыі праяўлялася і сацыяльна-камунікатыўная функцыя храма ў межах традыцыйнай супольнасці: «Народ гэта ціскаецца ўпярод, тоўкаюць друг дружку, — самі не молюцца і другім не даюць. Бабы сабраліся ў кутку і як тыя сарокі сакочуць — адна другую абгаворваюць, толькі сваркі заводзяць, а другія дрэмлюць, стоячы. Хлопцы з дзеўкамі смяюцца» [**34**, с. 375]. Варта адзначыць, што падобныя паводзіны ў храме былі ўласцівыя не толькі для праваслаўнай, але і для каталіцкай паствы, на што і наракае шляхціц Завальня: «У касьцёле чуеш адны шэпты ды смех; здаецца, для таго толькі і прыйшлі, каб паказаць свае модныя ўборы» [**33**, с. 110]. Пры гэтым, паводле традыцыйных уяўленняў, такія паводзіны не з'яўляліся дэвіянтнымі і цалкам адпавядалі народнай канцэпцыі свята, у той час як знявага святочнага (храмавага) часу гаспадарчай (утылітарнай, але не сімвалічнай) актыўнасцю ад-

назначна расцэньвалася як цяжкі грэх чалавека, пакаранне за які з боку вышэйшых, сакральных сіл (Бога, персаніфікаванага свята ці святыні) было вельмі суровым. «Ну вот, у нас такі Барысёнак, ён даўно памёр ужо. Іван Барысёнак. Ну гадоў пятнаццаць, а можа і большэ, як памёр. Ён быў партны. І ён не прызнаваў Бога. Не верыў у Бога. Ані ў цэркаў ні разу не хадзіў. І вот ён шыў палушубкі. Ну і тады, на Пасху, на первы дзень Пасхі, не дашыў ён палушубак. Тады давай, паснедалі і стаў шыць палушубак. Палушубак пашыў, а тады яго ўзяло і скруціла. Дзевяць дней пажыў і памёр. Ну тады пакаяўся, кажуць, як скруціла, гаворыць: «Мяне Бог пакараў!» [**35**].

Такім чынам, падсумоўваючы папярэднія заўвагі адносна сімволікі храма ў народнай культуры беларусаў Падзвіння, можна прыйсці да высновы, што яго статус і рытуальныя функцыі ў традыцыйнай супольнасці былі значна шырэйшымі і больш ёмістымі ў параўнанні з культавымі канонамі ўласна хрысціянства і мелі грунтам міфалагічную ў сваёй аснове карціну свету.

**Літаратура**

**1**. Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. СПб.,1993.

**2**. Гуревич А.Я. Смерть как проблема исторической антропологии: о новом направлении в зарубежной историографии // Одиссей. Человек в истории. М., 1989.

**3**. Цивьян Т.В. Лингвистические основы балканской модели мира. М., 1990.

**4**. Элиаде М. Священное и мирское. М., 1994.

**5**. Топоров В.Н. Пространство // Мифы народов мира. Энциклопедия в 2-х т. М., 1991. Т 2.

**6**. Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992.

**7**. Зап. аўтар у 1992 г. ад Коршун Кацярыны Міхайлаўны, 1929 г.н., у в.Юхавічы Расонскага р-на.

**8**. Вяселле: Абрад. Мн., 2004.

**9**. Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии.Витебск, 1897.

**10**. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. СПб., 1902.

**11**. Лобач У.А. Беларуская традыцыйная культура і хрысціянская царква ў ХІХ-пач. ХХ ст. // Веснік ПДУ. Гуманітарныя навукі.— 2005. — № 1.

**12**. Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн, 1998.

**13**. Щепанская Т.Б. Кризисная сеть (традиции духовного освоения пространства) // Русский Север: К проблеме локальных групп. СПб.,1995.

**14**. Зап. аўтар у 1996 г. ад Дзяцел Галіны Іванаўны, 1933 г.н, у в. Багданава Чашніцкага р-на.

**15**. Зап. У. Лобач, У. Філіпенка ў 2006 г. ад Рудзёнак Зінаіды Аляксееўны, 1932 г.н., у в. Матырына Ушацкага р-на.

**16**. Мельнікаў А. Ефрасіння Полацкая //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі:У6 т. Т.3. Мн.,1996.

**17**. Зап. У. Лобач, А. Халадкова ў 2006 г. ад Аўтух Дар'і Цімафееўны, 1912 г.н., у в. Вашкова Ушацкага р-на.

**18**. Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2006 г. ад Піскуновай Валянціны Пятроўны, 1936 г.н., у в. Пола Ушацкага р-на.

**19**. Зап. аўтар у 2003 г. ад Капуста Раісы Уладзіміраўны, 1923 г.н., у в. Галенчына Мёрскага р-на.

**20**. Зап. У. Філіпенка і студ. ПДУ: В. Наважылава,Т. Ржэчыцкая ў 2003 г. ад Жук Еўфрасінні Гаўрылаўны, 1925 г.н., і Шчарбіцкай Вольгі Сямёнаўны, 1923 г.н., у в. Пучкоўскія Мёрскага р-на.

**21**. Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып.8. Вильно, 1912.

**22**. Зап. студ. ПДУ А. Балтрукевіч у 2005 г. ад Запруднік Гелены Мечыславаўны, 1926 г.н., у в. Рафалова Браслаўскага р-на.

**23**. Толстая С.М. Обыденные предметы // Славянские древности: Этнолингвинистический словарь в 5-ти т. Т.3. М., 2004.

**24**. Зап. У. Лобач, У. Філіпенка ў 2006 г. ад Рудзёнак Аляксандры Іванаўны 1937 г.н., у в. Матырына Ушацкага р-на.

**25**. Зап. аўтар у 1999 г. ад Богуш Веры Сцяпанаўны, 1912 г.н., у в. Слабада Ушацкага р-на.

**26**. Зап. аўтар у 2004 г. ад Міхно Івана Фёдаравіча, 1936 г.н., у в. Вял.Поўсвіж Лепельскага р-на.

**27**. Зап. аўтар у 1999 г. ад Лосева Сяргея Іванавіча, 1914 г.н., у в. Вял.Дольцы Ушацкага р-на.

**28**. Власова М. Новая АБЕВЕГА русских суеверий. СПб., 1995.

**29**. Кухаронак Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX–XX ст. — Мн., 1993.

**30**. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні.Мн.,1986.

**31**. Niczyporuk D. Czas i przestrzen w swiatopogladzie mieszkancow wsi. Lublin. 2002.

**32**. Бахтин М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура Средневековья и Ренессанса. М.,1990.

**33**. Баршчэўскі Ян. Выбраныя творы. Мн.,1998.

**34**. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. II. СПб.,1893.

**35**. Зап. аўтар у 2005 г. ад Варкулевіч Вольгі Сямёнаўны, 1921 г.н., у в. Войлавічы Шумілінскага р-на.

# Экспериментальный курс «Полоцковедение» как составная часть гражданско-патриотического воспитания

**Недокунева Ирина Валерьевна,**
*учитель истории*
*УО «Полоцкая государственная гимназия №1»*

Любовь к родному городу, гордость за него — это составная часть патриотического воспитания. Именно с этого начинается осознание себя как гражданина своего государства.

«РОДНАЯ СТРАНА СТАНОВИТСЯ ЕЩЁ БОЛЕЕ РОДНОЙ, ЕСЛИ ЗНАЕШЬ ЕЁ ИСТОРИЮ», — говорил М. И. Калинин. Неудивительно, что седая история Полоцка с давних времён и по сей день привлекает внимание не только исследователей, но и нас, живущих в этом городе.

В городе ведётся планомерная и системная работа по созданию условий, формирующих личность, которая любит, ценит и уважает историю своей Родины, своего края, города. Результатом этой работы стало создание учебно-воспитательного проекта «Мы — полочане», главной целью которого является:

– воспитание уважения и преданности своему государству, любви к малой родине, отчему краю;

– формирование готовности юных полочан жить и трудиться в своём городе, участвовать в его развитии, социально- экономическом и культурном обновлении.

Проект включает в себя 2 составляющие: образовательную и воспитательную.

Образовательная часть состоит из программы «Первые шаги к Полоцковедению», которая реализуется в дошкольных учреждениях города, и факультативного курса «Полоцковедение», который введён в 5–9 классах общеобразовательных школ города.

Воспитательная часть сформулирована в городской комплексно-целевой программе «Мы — Полочане», которая состоит из программ-направлений: «Мы и культура Полоцка», «Мы и здоровый образ жизни», «Мы и экология Полоцка», «Мы и экономика Полоцка», «Мы и история Полоцка» и «Мы гордимся тобою, Полоцк».

Более подробно хотелось бы остановиться на образовательной части проекта, в частности, на факультативном курсе «Полоцковедение».

Комплексное краеведение, которое ещё со времён Геродота и Страбона охватывало все стороны природы, истории, населения, экономики, культуры и политики изучаемых регионов, постепенно потеряло свой универсализм. Проблему синтеза различных знаний и призван решить курс «Полоцковедение».

Актуальность данного курса обусловлена различными факторами:

**1**. Мы живём в городе с вековой историей и не знать её просто непростительно;

**2**. Нам есть чем гордиться не только в прошлом, но и в настоящем;

**3**. Невозможно воспитать истинного патриота, если ты не патриот своей малой родины.

Основными целями и задачами курса являются:

**1**. Создавать ситуации для усвоения учениками знаний о жизни полочан с древнейших времён до современности в единстве исторического процесса;

**2**. Пробуждать и развивать познавательный интерес и уважение к историческому и культурному наследию родного города;

**3**. Развивать умения анализировать и сравнивать полученную информацию, осмысливать проблемы общественного развития в прошлом и настоящем своего края;

**4**. Содействовать воспитанию патриотизма, уважения к истории Полоцкой земли, её культуре, содействовать стремлению сохранять и приумножать достижения родного края.

После изучения программы «Полоцковедение» ученики должны уметь:

**1**. Анализировать и обобщать исторические факты, связанные с историей Полоцка, формулировать выводы, определять хронологию событий, их последовательность, соотносить событие с эпохой;

**2**. Работать с исторической картой, уметь её читать, использовать как источник знаний;

**3**. Изучать исторические источники (письменные, материальные), выбирая из них новые знания;

**4**. Составлять связные рассказы по определённым темам;

**5**. Вести дискуссию, формулировать своё мнение, оценивать ответы других учеников;

**6**. Давать оценку отдельным явлениям культуры, их художественной и духовной ценности;

7. Давать характеристику отдельным историческим личностям, определять моральную сущность их действий;

**8**. Описывать памятники материальной и духовной культуры, орудия труда, предметы быта наших предков;

**9**. На основе конкретных примеров раскрывать характерные черты быта и нравов полочан.

Вся работа над программами делится на 3 периода:

**Первый** — лето 2004 г., разработаны программы для 5–6 и 9 классов.

**Второй** — 2004-2005 учебный год, в течение года учителя истории города работали в составе экспериментальной группы, внося коррективы в программы, и делились опытом проведения занятий.

**Третий** — лето 2005 г., программы для 5–6 классов были переработаны с учётом замечаний и в связи с переходом на 12-летний срок обучения, программы для 7–8 классов созданы.

Содержание курса выстраивалось комплексно, делалась попытка сынтегрировать знания, которые получены учениками на уроках истории, географии, белорусской и русской литературы, на курсе «Моя Родина — Беларусь».

На начало 2006–2007 учебного года составлены программы для 5–9 классов и их содержание обусловлено различными факторами:

**1**. Начинать курс было предложено с программы для 5 класса «Славутыя землякі і памятныя мясціны Полацка». Программа предполагает использовать большое количество занятий на экскурсии в музеи и пешеходные прогулки по городу. Таким образом, учащиеся, узнавая о наиболее ярких событиях прошлого, получат общее представление о судьбоносных вехах истории полоцкой земли.

**2**. 6 класс — это средневековая история. Именно в это время Полоцк достиг своего могущества. И благодаря знаниям, которые получат ребята на курсе, они смогут убедиться в этом и проникнуться ещё большим уважение к родному городу.

Полоцковедение в средних классах даёт возможность сформировать первый целостный «портрет» родного края, его «каркас», который в дальнейшем будет содержательно дополняться на уроках истории, географии и на других предметах.

**3**. Программа 7–8 классов предусматривает изучение одного из самых непростых периодов в истории Полоцка, поэтому оно не только обогощает учащихся новыми знаниями, но и учит достойно выходить из очень сложных жизненных и исторических ситуаций.

**4**. На государственном экзамене за курс базовой школы по истории Беларуси ученики достаточно часто показывали неудовлетворительный уровень знаний по истории Полоцка. Это и обусловило создание программы для 9 класса как части комплексной подготовки к экзамену.

Изучая курс «Полоцковедение», ребята сами смогут дать оценку различным событиям, происходившим и происходящим в жизни города.

Полоцковедение в старших классах выполняет роль «сборочного цеха», в котором знания о крае, полученные ранее, будут отшлифовываться до конечного «продукта» — целостного восприятия образа родной полоцкой земли.

Оценки по курсу не выставляются, но необходимо, чтобы ученики знали, что полученные знания они должны будут применить при ответе на билеты по истории Беларуси в 9 классе и это повлияет на итоговый балл за экзамен.

Для каждого класса запланировано резервное время, которое учитель может использовать по своему усмотрению. Можно подробнее изучить материал, который вызвал интерес у учеников. Также учитель может изменять некоторые формулировки тем уроков, но в границах заявленных тем и периодов.

Работа учителя по данной программе предусматривает творческий подход, широкое использование знаний по истории Полоцка, материалов выставок полоцких музеев и ориентированна на организа-

цию самостоятельной и творческой деятельности учеников. Должны использоваться различные формы занятий: дидактические игры, диспуты, составление эссе и заочных путешествий, написание рефератов и творческих работ, посещение музеев, походы по родному краю, встречи с краеведами и просмотр краеведческих видеофильмов.

Зимой 2005 года в школах проходила проверка преподавания курса «Полоцковедение». По её результатам можно сделать выводы о том, что курс ребятам нравится и многие отмечают, что интерес к истории у них возрос. Они стали бережнее относится к своему городу и к тому, что их окружает. И нашей задачей на будущее является этот интерес углублять и расширять различными методами.

Учителя при подготовке к занятиям могут использовать различные источники: периодика, публицистика, художественная литература, результаты раскопок, выставки, музеи города, интернет-ресурсы и методический сборник ГОРОО.

Методический сборник — это совместный труд учителей города и методического кабинета ГОРОО. Здесь можно найти и саму программу курса с целями и задачами, и материалы по географии к программе 6 класса, и материалы в помощь учителям и ученикам в виде поурочных опорных конспектов для 5–6 классов, разработок методических рекомендаций к урокам в 8 классе, и уроки учителей города в рубрике «Открытый урок», справочный материал, который поможет учителям, а также список литературы, составленный работниками центральной библиотеки специально к курсу. Надеемся, что данное издание окажет большую помощь всем работающим по курсу «Полоцковедение».

На протяжении последнего года учителя города творчески подошли к преподаванию курса, в результате чего сложился настоящий методический комплекс, который помогает в подготовке занятий и их проведении. Учителями города разработаны уроки по программам 7–8 классов, уроки составили два сборника, которые можно использовать при подготовке к занятиям.

Кроме этого, учениками и работниками учреждений образования города было создано большое количество творческих работ (стихов, сочинений, эссе, картин), которые вошли в сборник «Капелька моей души». Он состоит из разделов: «Преданья старины глубокой»;

«Признание»; «Это мой город»; «Капелька моей души»; «Полочанка»; «Город древний, город молодой»; «Этот город — самый лучший город на земле»; творческие работы учащихся ПГГ № 1.

Ещё один сборник «Полоцк глазами школьника» включает 24 исследовательские работы учеников города по различным темам: «История моего города»; «Полоцк современный»; «Наши земляки»; «Экология Полотчины»; «Промышленные предприятия города — наши шефы»; «Полоцк литературный».

Такой интерес к истории и современности своего города, к людям и памятным местам доказывает результативность курса «Полоцковедение» и всей системы воспитательной работы в городе. «Уважение к минувшему — вот черта, отличающая образованность от дикости», — говорил А.С. Пушкин.

Любой учебный предмет предполагает наличие учебника или учебного пособия. С такой проблемой столкнулись и мы, учителя города. Написать учебник — работа сложная и ответственная, кроме того, определённые сложности есть и с рецензированием. По истории Полоцка есть очень много различных источников, и создать что-то особенное достаточно сложно. Так пришла идея создания электронного пособия.

Материалы пособия также можно использовать и на других занятиях, тематически связанных, так как при комплектации тексты не адаптировались к возрасту учащихся 5 класса, а сохранялись в авторском варианте. Учитель сам решает, какие тексты он рекомендует учащимся для самостоятельной работы, а какие для работы в классе при соответствующих комментариях (возможно частичное использование отдельных статей).

Представленные в пособии материалы призваны расширить знания о Полоцке, его прошлом и настоящем. Пособие включает **122** текстовых документа, **124** рисунка и фотографии, **9** презентаций и **3** программы, выполненные в программе флеш-анимации. Материалы пособия сгруппированы в пять разделов, разбитых на темы, к каждой из которых предлагается опорный конспект и тесты (всего их **16**), которые помогут диагностировать степень усвоения теоретического материала учениками. Для стимулирования учеников тесты составлены таким образом, что ученик, ответивший правильно на **50 %** (процент может

быть изменен для любого теста по желанию преподавателя) вопросов, получает возможность выхода на страничку «Отдохни», где ему предлагается на выбор **6** игр, в которые он может поиграть, пока остальные устраняют пробелы в знаниях.

Формы и типы занятий учитель выбирает сам в зависимости от предложенного по теме материала, особенностей класса, уровня работоспособности и т.д. Хотелось бы обратить внимание, что тексты могут быть предложены не только для ознакомления с новым материалом, но и для поиска ответов на конкретные вопросы, а также для выполнения заданий творческого характера (например, составить или разгадать кроссворд). Презентации могут использоваться как для приобретения знаний с использованием наглядно-образного метода, так и для проверки усвоенных знаний (например, если предложить ученикам составить подписи к слайдам).

Если говорить о структуре пособия, то кнопки слева (их 5) соответствуют разделам программы 5 класса. При нажатии на любую из них в основном рабочем поле появляются темы соответствующего раздела и разнообразные материалы. Кроме этого, под надписью «тест» скрывается тест к данной теме, а под надписью «опорный конспект» — краткая схема изучения данной темы. Если рядом с названием изучаемого вопроса находится несколько документов, то это значит, что под каждым из знаков скрыт отдельный документ. Открыв, его можно читать в этом же окне или развернуть на весь экран с помощью кнопки.

Для работы на уроках «Полоцковедения» разработан макет тетради, где на каждой страничке помещён герб города, а на последней — основные даты по истории города.

О важности изучения истории говорили во все времена. Оратор Древнего Рима Цицерон считал, что «история — это учительница жизни, потому что не знать того, что было до твоего рождения, означает навсегда остаться ребёнком». Известный русский историк В.О. Ключевский образно выразился, что «история — это фонарик в будущее, который светит нам из прошлого». Изучение истории даёт человеку путеводную нить в будущее. Каждый образованный человек должен знать историю своей родины, своего города, своего народа. Академик Д.С. Лихачёв считал: «Знание далёкого прошлого Отчизны, многострадального и героического, позволяет глубже понять,

увидеть корни подвижнического, мужественного служения интересам родной земли, интересам своего народа. Если вы любите свою страну, Вы не можете не любить своей истории, не можете не беречь памятников прошлого».

И закончить мне хотелось бы белорусской поговоркой: «Хто не памятае свайго мінулага, будзе вымушаны перажыць яго зноў».

# Вывучэнне гісторыі і культуры Полаччыны XVI — пачатку XX стст.: даследчыкі і іх працы

(даследчыкі Полаччыны XVI — пачатку XX ст. і іх працы як краязнаўчыя помнікі)

**Півавар Мікалай Васільевіч,**
*настаўнік гісторыі*
*Лужаснянская гімназія для таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці*

Полацк, як адзін з самых старажытных гарадоў усходніх славян, у розныя часы заслужана прыцягваў увагу даследчыкаў. Праведзенымі намі росшукамі выяўлены імёны больш за 100 навукоўцаў, аматараў, якія прычыніліся да даследавання гісторыя і культуры Полацка і навакольляў на працягу XVI — пачатку XX стст. Змясціць звесткі пра іх і бібліяграфію іх даследаванняў у межах дадзенага артыкула немагчыма. Больш змястоўная інфармацыя змешчана ў кнізе «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI — 1944 г.»[1]. У нашым паведамленні мы абмяжуемся кароткім аглядам асоб, якія вывучалі Полацкі рэгіён, і іх прац з XVI па пачатак XX ст.

Першым даследчыкам, хто вывучаў Полацк і яго наваколлі, верагодна, можна лічыць польскага і беларускага храніста М. **Стрыйкоўскага**. У другой палове XVI ст., у час сваёй службы ў ВКЛ, ён вандраваў па Беларусі, збіраў і вывучаў звесткі пра фартэцыі, гарадзішчы, замчышчы, храмы. Адначасова знаёміўся з мясцовымі летапісамі, бібліятэчнымі зборамі, сямейнымі летапісамі, хронікамі, метрыкамі, мемуарамі. Матэрыялы з іх былі скарыстаны пры напісанні самага значнага і вядомага яго твора «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» (1582)[2]. І для цяперашняга даследчыка «Хроніка» цікавая каштоўнымі звесткамі пра старажытныя помнікі Полацка. Так, у ёй сказана, што яшчэ ў старажытныя часы тут існавалі Сафійскі сабор, манастыр на Бельчыцы, які быў акружаны сцяной з вежамі, а таксама жаночы манастыр на Палаце і царква св. Спаса. Асобна Стрыйкоўскі шукаў

[1] Півавар М. В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. — 1944 г.: даведнік. — Віцебск: Віцебск. абл. друк., 2006. — 176 с.: фат.

[2] Kronika Polska, Litewska, Zmódzka i wszystkej Rusi… przez Maciej Osostenciusa Stryikowskiego // Drukowano w Krulevsku i Cerzego Osterbergera. MD XXXII. T. 2.

пабудовы часоў Альгерда. Вывучаў Барысавы камяні XII ст., але даў іх няправільнае апісанне. Замест арыгінальнага тэксту ён прывёў лацінскі пераклад. Лічыў памылкова, што надпісы належаць князю Гінвілавічу.

Таксама ў другой палове XVI ст. на Полаччыне жыў і працаваў інжынер, мастак, картограф С. **Пахалавіцкі**. Ён склаў «Вопіс Полацкага княства», «Карту Полацкай зямлі» і «План аблогі Полацка войскамі Стафана Баторыя ў 1579 г.» (абодва награвіраваны Т. Трэтэрам у 1580 г. у Рыме). Выканаў малюнак штурму Полацка 29.08.1579 г. Верагодна, разам з інжынерам П. Франкусам працаваў над аксанаметрычнымі выявамі 6 крэпасцей на Полаччыне: Казьяны, Красная, Сітна, Сокал, Суша і Туроўля. Малюнкі Пахалавіцкага — каштоўны матэрыял для рэканструкцыі фартыфікацыі і забудовы Полацка 2-й паловы XVI ст.

Уніяцкі царкоўны дзеяч, гісторык І. **Кульчынскі** некаторы час жыў у Полацку ў базыльянскім манастыры пры храме св. Сафіі (дзе ў той час захоўваўся крыж Ефрасінні). Пакінуў апісанне гэтай рэліквіі. Даследаваў Полацкія помнікі старажытнасці. На думку Л. Аляксеева, І. Кульчынскі з'яўляецца першым даследчыкам беларускіх старажытнасцей[3].

Польскі гісторык, бібліёграф, рэлігійны дзеяч Ян **Ласіцкі** (Łasicki) ў працы «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнне, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татараў... » (1582) апісваў (часам з акцэнтуацыяй увагі на негатыўным) сямейныя абрады, народнае адзенне, стравы і іншыя бакі матэрыяльнай культуры беларусаў, а таксама асаблівасці архітэктуры Полацка. Апісаў тры старажытныя збудаванні горада і вельмі шкадаваў, што ўсё іншае ў 1563 г. зруйнаваў цар Іван IV.

Рускі стольнік М. Цызараў у 1701 г. па загадзе Пятра І зрабіў «Чарцёж» ракі Дзвіны[4]. На сваю аксанаметрычную карту М. **Цызараў** нанёс усе аб'екты, якія могуць цікавіць іншую краіну, перш за ўсё аба-

---

[3] Алексеев Л.В. Игнатий Кульчинский – первый исследователь белорусских древностей // Древности славян и Руси. М. 1988; Ён жа. Археология и краеведение Беларуси...; Марозава С. Кульчынскі І. // ЭГБ. Т. 4. — С. 303.

[4] Чертеж и описание 1701 г., декабря 11, учиненное стольником Максимом Цызаревым, начав от Витепска вверх до вершин Двины реки, с показанием сел, деревень, лесов и судов по оной реке ходящих // Река Западная Двина. Сост. и изд. А. Сапунов. Витебск, 1893. — С. 52–53, 501–506.

рончыя ўмацаванні. Тым самым аўтар пакінуў для гісторыі матэрыялы пра тагачасны стан помнікаў архітэктуры і археалогіі. Асабліва падрабязна складзена схема Полацка.

Правіцель (губернатар) Полацкага намесніцтва (1784–1791) А.М. **Лунін** у аўтабіяграфічных «Запісках» змяшчае звесткі пра грамадскае жыццё Полацкага намесніцтва. Са жніўня 1790 г. па праграме Вольнага эканамічнага таварыства кіраваў і асабіста ўдзельнічаў у складанні «Тапаграфічнага апісання Полацкага намесніцтва», за што атрымаў конкурсны залаты медаль. Полаччыне прысвечаны неапублікаваная праца, якая знаходзіцца ў публічнай бібліятэцы ў Пецярбургу[5].

З Полаччынай звязаны род Абрампальскіх. Яго прадстаўнікі займаліся вывучэннем старажытнасцяў краю. Так, які жыў у другой палове XVIII — першай пал. XIX ст. Гіляры **Абрампальскі** (Obrąpolski) па пастанове Адукацыйнай камісіі правёў люстрацыю маёнткаў полацкіх езуітаў (на левабярэжнай Полаччыне). У 1774 г. ён прадставіў у архіў маршалка Міхаіла Іераніма Радзівіла зробленую на 36 старонках люстрацыю 9-ці буйнейшых фальваркаў[6]. Дакумент з'яўляецца каштоўнейшай крыніцай па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст., у якой змяшчаюцца статыстычныя матэрыялы і прапановы аўтара па павышэнні даходнасці маёнткаў.

## Першая палова XIX ст.

У маёнтку Нача Лепельскага павета ў першай палове XIX ст. жыў другі прадстаўнік роду Абрампальскіх — калекцыянер, аматар старажытнасцяў Алаізі Юзаф Ян **Абрампальскі**. Разам з К. А. Гаворскім ён раскапаў некалькі кругападобных курганоў уздоўж Альгердавай

---

[5] Историческое и хозяйственное описание Полоцкого наместничества вообще и частно городов и уездов оного с приложением генеральных геометрических карт всего наместничества и прочих уездных карт особо с городскими планами и гербами, собранное и в порядок приведенное трудами его превосходительства г. генерал-поручика бывшего правителя сего наместничества члена Экономического общества и кавалера Александра Михайловича Лунина, сообщенного от него в дар Вольному экономическому обществу 18 декабря 1792 г. // Дзяржаўная публічная бібліятэка імя Салтыкова-Шчадрына, ф. Вольнага эканамічнага таварыства, архіўны вопіс № 405.

[6] Lustrator Połocki z Dobr Ex iezuickih, ad Archivium J.O. [Jasne Oswicionego] Xcia; Jmci. Radziwiłła, Mar.Gener. Konf.: W:X:L. CD (Люстрацыя полацкая паезуіцкай маёмасці, у архіў прывялебнага князя, ягомасці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага)

дарогі з Полацка ў Вільню. У адным з іх быў знойдзены шкілет чалавека і прасліца («кружочак»). Мясцовыя карэспандэнты графа М. Румянцава — Н. Гаратынскі, А.М. Дарашкевіч і І. Сышчанка знаёміліся з ягонай калекцыяй і набылі для расійскага калекцыянера татарскія, шведскія, грэчаскія, польскія манеты[7].

В. **Бучынскі** ў Полацку стварыў першы на Беларусі літаратурна-навуковы часопіс «Miesięcznik Połocki» («Полацкі месячнік»), быў яго рэдактарам (1818–1820). Забяспечваў друкаванне ў часопісе цікавых матэрыялаў пра Полацк і Полаччыну.

Даследаваў Полаччыну і беларускі і польскі пісьменнік, этнограф, фалькларыст, выдавец, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян **Баршчэўскі**. Падарожнічаў па Беларусі, вывучаў побыт і культуру сялян, апісваў курганы, гарадзішчы, запісваў фальклорныя творы, абрады, паданні, легенды. Быт і культура краю шырока адлюстраваны ў 4-томным зборніку «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (Т. 1–4, (1844–1846), у «Нарысе паўночнай Беларусі» (1843), ва «Успамінах з наведвання радзімых старон» («Rocznik literacki», 1844). Адзначым, што ўсе згаданыя працы засноўваюцца на матэрыялах Полаччыны.

Падарожнічаючы па краі, Баршчэўскі звярнуў увагу на помнікі старасветчыны. Назіраў «насыпныя горы» ў ваколіцах бацькавага фальварка Мурагі каля воз. Нешчарда. Увага да помнікаў старажытнасці і, у прыватнасці, да помнікаў археалогіі ўзнікла ў Я. Баршчэўскага дзякуючы асабістаму знаёмству з археолагам А. Плятэрам і яго багатымі калекцыямі[8].

Маёнтак полацкага памешчыка В. **Рэўта** (Газдава-Рэўт) пры дарозе з Віцебска ў Полацк быў своеасаблівым культурным цэнтрам наваколля, які прыцягваў увагу літаратараў, людзей мастацтва. Яго валадар збіраў і публікаваў беларускі фальклор, шырока выкарыстаў яго ў вершаванай аповесці «Żona» («Жонка») (1844). Свае творы і фальклорныя запісы друкаваў у альманахах «Nezabudka» («Незабудка»), «Rocznik literacki» («Літаратурны штогоднік»), «Rubon» («Рубон»).

---

[7] Козлов В.П. Колумбы российских древностей. М., 1981. — 68 с.; Гербоўнік беларускай шляхты / Т. Капіца, Н. Леўчык, С. Рабачонак. — Т.1. Мн., 2002. — С. 62.

[8] Каханоўскі Г.А. Вандраванні // Маладосць. 1984. № 10; Ян Баршчэўскі: дыялог з часам і ў часе. Матэрыялы III міжнародных чытанняў 15–16 снежня. г. Віцебск. Віцебск: ВДУ ім. П.М. Машэрава. 2002. — 116 с.

Расійскі гісторык, археограф В.М. **Тацішчаў** вывучаў і ўвёў у навуковы зварот «Полацкі летапіс», які да нашых часоў не дайшоў.

На пачатку XIX ст. старажытныя ўмацаванні Полацка вывучаў К. **Халдзіеўскі**. Даследчык карыстаўся пераважна пісьмовымі крыніцамі. Яго праца носіць апісальны характар. Рукапіс захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі АН Літвы [Ф. 148. Арк. 1–312].

Пэўны час займаўся разборам фонду бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі Г. **Шапялевіч**.

У першай палове XIX ст. у Рускае геаграфічнае таварыства дасылаў свой рукапіс «Апісанне Полацкага намесніцтва» **Афанасьеў**[9].

З даследчыкаў першай паловы XIX ст. прыгадаем З.Я. **Даленгу-Хадакоўскага** (сапр. Чарноцкі Адам), — славяназнаўцу, пачынальніка беларускай, польскай, украінскай археалогіі, фальклярыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Старажытны Полацк упершыню апісаны даследчыкам з пункту гледжання археолага. Хадакоўскі збіраў у Полацку звесткі пра горад ад розных асоб, у тым ліку і царкоўнікаў, якія яму «расказвалі пра справы зусім не манастырскія»[10].

У 1815 годзе праз Полаччыну падарожнічаў батанік, натураліст А.К. **Башняк.** Пакінуў цікавыя звесткі пра краявіды, населеныя пункты Беларусі. Рабіў апісанне ландшафту, прычым не толькі апісваў краявіды, але і імкнуўся вызначыць геалагічнае мінулае Беларусі, яе глебы, клімат, лясы, карысныя выкапні, асабліва на Полаччыне. «Запіскі … » ўтрымліваюць апісанне Полацка, мястэчак Белае, Клясціцы і інш.

У першай палове XIX ст. пад кіраўніцтвам генерал-маёра М.В. **Без-Карніловіча** праводзілася тапаграфічнае і вайскова-статыстычнае вывучэнне Віцебскай губерні. На аснове атрыманых звестак напісаў ваенна-статыстычны агляд Віцебскай губерні, у якім даў ацэнку правіянтных і дарожна-транспартных магчымасцей краю і выдаў кнігу «Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии...»[11]. Даследаваў замчышча каля в. Сакалішча Полацкага павета. Ужываў

[9] Беларусы: У 8 т. Т.3: Гісторыя этналагічнага вывучэння. — С. 187; Пазднякоў В. Рускае геаграфічнае таварыства // ЭГБ. Т. 6/1. — С. 138.

[10] Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі... — С. 35

[11] Витебская губерния. СПб., 1852; Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. СПб., 1855. (Репр. изд. Мн., 1995).

звесткі, атрыманыя ад даследаванняў і аналізу легенд і паданняў, для тлумачэння абрадаў, вераванняў старажытнага чалавека. Напрыклад, запісаў каля Полацка са слоў старажылаў, што поруч з колішнім возерам Валоўе, якое знаходзіцца на левым беразе Палаты, амаль насупраць Багародзіцкага манастыра, было капішча Перуна.

Вывучэннем Прыдзвіння, а разам з ім, зразумела, і Полаччыны, займаўся краязнаўца, гісторык, бібліяфіл, паэт М.І. **Борх**. Жыў у сваім маёнтку Прэлі (пол. Prele, лат. Preljlu) Дынабургскага павета. Стварыў хатнюю музейную калекцыю, экспанаты якой яму дасталіся ад продкаў, але шмат чаго збіраў сам. Напрыклад, рукапісы, старадрукі, любыя матэрыялы, звязаныя з гісторыяй Інфлянтаў (Прыдзвіння). Цікавіўся віцебскімі старажытнасцямі [Каханоўскі], пісаў пра полацкія помнікі [Г. Кісялёў]. Збіраў паданні, звязаныя з гісторыяй Прыдзвіння. Уступіў у палеміку з расійскімі гісторыкамі адносна Ефрасінні Полацкай у «Тыгодніку Петербурскім». Надрукаваў у «Рубоне» фрагмент даследавання, прысвечанага Ефрасінні/Прадславе (Wyjątek z dzieła «Dzieje w legendzie» // Rubon. T. II). У 1843 г. скончыў аповесць «Жыццё кн. Ефрасінні» (Żywot ks. Eufrozyny). Твор меў памеры 50–60 друкаваных аркушаў, складаўся з 2-х тамоў, утрымліваў спасылкі на гістарычныя крыніцы, меў 5 аўтэнтычных дакументаў. На жаль, твор так і не быў выдадзены. Нават невядома, што стала з рукапісам. Пісаў «нарманскую» аповесць пра князёўну Рагнеду (Rohneda).

Аўтар працы «Два словы пра Дзвіну»[12] Р. Друцкі-Падбярэзскі згадвае пра Борха ў сваіх артыкулах: «...корпаўся ў старажытных хроніках, пісаў нешта пра Ефрасінню Полацкую...».

Значную ролю ў даследаваннях Полаччыны ў сяр. — другой палове XIX ст. адыграў археолаг, гісторык, выдавец Кс.А. **Гаворскі**. З 1840 г. працаваў выкладчыкам Полацкай духоўнай семінарыі. У 1850-х гг. выкладаў там царкоўную археалогію і пісаў артыкулы на гэтую тэму.

У пачатку 1850-х гадоў даследаваў 10 курганоў на Полаччыне, упершыню апісаў іх будову. Пісаў пра раскопкі курганоў, даследаванні каменных крыжоў. Вывучаў старажытную «Альгердаву дарогу» з Полацка на Вільню, рэшткі старажытных пабудоў Полаччыны, некалькі гарадзішчаў, на якіх апісаў могільнікі больш позняга часу. Раскопваючы курганы, звярнуў увагу на незвычайную форму асобных гаршчкоў, якія адрозніваліся ад тых, што былі знойдзены каля Полацка. Адно

з гарадзішчаў уздоўж Альгердавай дарогі Гаворскі выявіў у Начы-Шпакоўшчыне, на беразе ракі Начы. З дапамогай мясцовага аматара Алаіза Абрампальскага ён раскапаў некалькі кругападобных курганоў. Падыход К. Гаворскага да вывучэння курганных пахаванняў у Полацкай зямлі ацэнены Л. Аляксеевым.

Пісаў пра гісторыю праваслаўных цэркваў на Беларусі. Аўтар ненадрукаванай работы «Гісторыя Полацкай епархіі». Аўтар артыкулаў пра Маркаў манастыр у Віцебску, Барысаглебскі манастыр у Полацку і іншых. Апублікаваў важныя для гісторыі Беларусі дакументы, арыгіналы многіх з якіх пазней загінулі (Гаворскі карыстаўся не існуючымі зараз манастырскімі архівамі).

К. Гаворскі імкнуўся ахапіць даследаваннямі ўсю тэрыторыю Полацкай зямлі. Шмат чаго зрабіў, але толькі частка яго спадчыны стала здабыткам навукі[13].

У этнаграфічным плане Полаччыну даследаваў збіральнік бел. музычнага фальклору, выдавец, педагог, кампазітар А.А. **Грыневіч**. Зрабіў каля 33 запісаў узору меласу, дзіцячых гульняў на Полаччыне і Тураўшчыне[14].

Шмат матэрыялаў з Падзвіння сабраў краязнаўца, археолаг, біёлаг, калекцыянер Адам **Плятэр** (Броэль-Плятэр). У выніку падарожжаў па Заходняй Дзвіне апісаў помнікі архітэктуры, археалогіі, гістарычныя мясціны, «Барысавы камяні». Асабліва цікавіўся гісторыяй Полацка. На аснове знойдзеных матэрыялаў напісаны яго працы «Аб даўніх трунах і старажытнасцях, адкрытых у Інфлянтах Польскіх»

---

[13] Поездка (14 сент. 1852) из г. Полоцка по направлению, так называемой Ольгердовой дороги; Археологические разыскания в окрестностях г. Полоцка // Зап. имп. Археологического о-ва. СПб., 1853. Т. 5; Древние акты и документы XVI и XVII века... преимущественно относящиеся до Западного края, с примеч. и объяснен. К.Говорского // Витебские губернские ведомости. 1858. № 3–8, 12–14, 22–28, 35, 38; О введении, распространении и судьбе кальвинизма в Белоруссии // ВГв. 1958. № 12 (пад Беларуссю разумеў Полацкае і Віцебскае ваяводствы); Исторические сведения о Полоцком Софийском соборе. С двумя отрывками из неизданной истории Полоцкой епархии // Там жа. № 39–52; О начале христианства в бывшем Полоцком княжестве // ВГв. 1859. № 2; О Полоцких православных епископах от начала Полоцкой епархии до времен унии // ВГв. 1859. №5–7; О Витебских общественных увеселениях. // ВГв. 1860 г.; Историко-Статистическое описание Витеб. губернии // ВГв. 1860 г.; Историческое описанне полоцкого Борисо-Глебского монастыря // Вестн. Западной России. 1865. Кн. 5, нояб.

[14] Ліс А. Грыневіч А.А. // ЭГБ. Т. 3. — С. 163.; Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі. Кн.1. — С. 151.

(1845), «Пошукі гістарычныя...» (1844), «Пра старажытныя камяні з надпісамі, знойдзеныя ў рацэ Дзвіне...» (1843), «Полацк» (1843) і іншыя[15].

## Румянцаўскі гурток

Асобна адзначым асоб, якія ўваходзілі ў склад гуртка, які стварыўся пры канцлеры Расійскай імперыі, мецэнаце М.П. Румянцаве. Дзякуючы яго інтарэсам і фінансавай падтрымцы, шэраг мясцовых даследчыкаў далучыўся да вывучэння старажытнасцяў Полацкага краю. Пералічым іх.

**Галадкоўскі** (кан. XVIII — перш. палова XIX ст.), чыноўнік у Полацку. Прымаў удзел у дзейнасці румянцаўскага гуртка. Разам з Дарашкевічам і пісарам Сышчанкам рабіў апісанне і капіраванне матэрыялаў Полацкай грэка-уніяцкай духоўнай кансісторыі. У 1825 г. агледзелі магістрацкія і павятовыя архівы Віцебска, дзе імі была знойдзена і скапіравана справа пра забойства біскупа Іасафата Кунцэвіча ў 1623 г. і шмат іншых архіўных помнікаў.

**Гарыжскі** Іван Андрэевіч (канец XVIII — перш. палова XIX ст.), спадарожнік П.І. Кепена ў падарожжы па Беларусі ў 1819 годзе (рабілася на сродкі графа М.П. Румянцава). Збіраў матэрыял для кнігі па гісторыі Полацкай зямлі «История Полоцкого княжества с обозначением литовских историков», якая не была надрукавана. Па меркаванні Л.В. Аляксеева, Гарыжскі быў першым, хто спрабаваў даследаваць па пісьмовых і рэчавых крыніцах (Рагвалодаў камень) гісторыю Полацкай зямлі (Беларусі).

**Грыгаровіч** Іван Іванавіч, беларускі гісторык, археограф, краязнаўца, мовазнавец, пісьменнік. Ім зроблена першая спроба навуковага апісання Спаса-Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку («Весткі пра старажытны храм Хрыста Збавіцеля, пабудаваны ў XII ст. прападобнай Ефрасінняй паблізу Полацка»).

---

[15] O starożytnych kamieniach z nadpisami znajdujących sie w rzece Dzwinie (od XIII wieku) koło Połocku i Dziesny // Rubon. Wilno, 1842. T. 2; Połock // Rubon. Wilno, 1843.
¹ 4; Historyczna wiadomość o Cerkwi Przemienienia Panskiego (Spasa) położonej koło Połocka, o krzyżu darowanym tejże Cerkwi przez Swięta Eufrazyne i o pielgrymcetej swiętej do Jerozolimu // Rubon. Wilno, 1849. T. 9.

**Дарашкевіч** А.М. (кан. XVIII — перш. палова XIX ст.), штатны наглядчык полацкіх народных вучылішчаў, сябра Румянцаўскага гуртка. З'яўляючыся членам камісіі па разборы езуіцкіх архіваў у 1823 г., паведаміў М. Румянцаву, што ў гарадскім і павятовым архівах Полацка захоўваюцца старажытныя граматы 400-гадовай даўнасці. На працягу 1824 г. Дарашкевіч сумесна з пісарам Сышчанкам і чыноўнікам Галадкоўскім рабілі апісанне і капіраванне матэрыялаў Полацкай грэка-уніяцкай духоўнай кансісторыі.

**Кепен** Пётр Іванавіч (1793–1864), вучоны-статыстык, бібліёграф, этнограф, акадэмік РАН. Адзін са стваральнікаў і член Румянцаўскага гуртка, Расійскага Геаграфічнага Таварыства. Знаходзіўся ў 1819 г. на Беларусі ў камандзіроўцы для рэвізіі паштова-перакладных станцый. Ажыццявіў беглае знаёмства з архівамі Полацка, Віцебска і Магілёва і давёў звесткі пра іх графу М. Румянцаву. Другую вандроўку здзейсніў у 1821 годзе. Па даручэнні і на сродкі Румянцава даследаваў мясцовыя старажытнасці для кнігі «Список русских памятников», якая выйшла ў 1822 г. Падарожнічаў сумесна з І.А. Гарыжскім, які збіраў матэрыялы па гісторыі Полацкай зямлі. У творах, напісаных па матэрыялах экспедыцыі, пакінуў звесткі пра Полацкія, Віцебскія, Аршанскія старажытнасці і «Барысавы камяні». Другая вандроўка Кепена па Беларусі адбылася ў 1821 годзе падчас якой ён вывучаў і пакінуў звесткі пра крыж Ефрасінні Полацкай. Даследчыка больш цікавілі не ўсе старажытнасці, а толькі з датаванымі надпісамі (Рагвалодаў камень, крыж Ефрасінні). Дзённікі вандровак Кеппена — адна з першых спроб вывучэння старажытных помнікаў Полаччыны і Беларусі.

**Кунцэвіч** (першая пал. XIX ст.), архіварыус полацкай грэка-уніяцкай духоўнай кансісторыі. Сябра Румянцаўскага гуртка на Беларусі. Займаўся краязнаўчымі даследаваннямі Віцебшчыны.

**Сышчанка** І. (кан. XVIII — пач. XIX ст.), служачы Полацкага казначэйства. З'яўляўся карэспандэнтам І. Грыгаровіча. На працягу 1824 г. Сышчанка сумесна з Дарашкевічам і чыноўнікам Галадкоўскім рабілі апісанне і капіраванне матэрыялаў Полацкай грэка-уніяцкай духоўнай кансісторыі. У студзені 1825 г. па распараджэнні М. Румянцава правёў тры экспедыцыі ў пошуках помнікаў старажытнасці па Беларусі (у большасці сваёй сучаснай Віцебшчыны). Агледзеў кляштары Друйскага і Дзісенскага паветаў, азнаёміўся з архівамі Лепельскага павета.

**Шулакевіч** Іаіль (Ізаіаш) (кан. XVIII — пач. XIX ст.), архімандрыт Бельчыцкага, Барысаглебскага манастыроў у Полацку, карэспандэнт графа М. Румянцава ў першай чвэрці XIX ст. Збіраў старажытныя дакументы, вёў невялікія раскопкі. Вывучаў старажытнасці ў наваколлі Полацка. Праводзіў раскопкі. Так, напрыклад, адкапаў у полацкім Барысаглебскім манастыры рэшткі старажытнай царквы [Аляксееў Л. С. 32]. Як сведчыць П.І. Кепен, ездзіў у в. Бяздзедавічы (за 20 вёрст ад Полацка) да памешчыка Абрампальскага для спісання надпіса на камяні. Па меркаванні В.П. Казлова, менавіта І. Шулакевіч адшукаў у Сафійскім саборы Полацкага базыльянскага манастыра адзін з самых старажытных славянскіх рукапісаў — Дабрылава Евангелле 1164 г., якое было набыта М.П. Румянцавым за грашовы ўклад у манастыр.

## Жыхары Полацка, якія вывучалі горад

Прыгадаем працы палачан па гісторыі і культуры роднага горада. Перш успомнім пра беларускага гісторыка, археолага, краязнаўца І.І. **Далгова**. Вывучаў гісторыю Полацка са старажытных часоў, даследаваў археалагічныя помнікі Полаччыны і склаў іх рэестр. Вялікую вядомасць атрымалі экскурсіі Далгова па Полацку. Праводзіў археалагічныя раскопкі курганоў у маёнтку Сітна, набыў у сялян гэтай вёскі калекцыю манет для музея кадэцкага корпуса. Разам з П.П. Пакрышкіным вывучаў кладкі старажытнай Сафіі пад падлогай сучаснай. Пасля адкрыцця Н.Н. Кайгародавым фрэсак працаваў над стварэннем там «падземнага музея». Уваходзіў у склад гісторыка-статыстычнага камітэта для складанні і апісанні цэркваў і прыходаў Полацкай епархіі. Напісаў гісторыю кадэцкага корпуса (1835–1890-я гады) і стаў адным з арганізатараў музея ў ім. Абраны правадзейным членам Віцебскай навуковай архіўнай камісіі, удзельнік 9-га археалагічнага з'езда (1893, Вільня). Пакінуў шмат артыкулаў, прысвечаных гісторыі краю[16].

[16] Прошлое и настоящее Белоруссии вообще и Витебской губернии в частности // ВГв. 1896. № 63–79; 1897. № 19 і інш.; Наш край // ВГв. 1898. № 113–114; Полоцкий кадетский корпус. Витебск, 1899; Празднование 75-летия существования Полоцкого кадетского корпуса 6 декабря 1910 г. Полоцк, 1911. – 156 с.

Аўтарам выдання «Полоцкий кадетский корпус. Исторический очерк 75-летия его существования» з'яўляўся падпалкоўнік, выхавацель корпуса В.П. **Вікенцьеў**[17].

Асноўнай працай Н.Н. **Кайгародава** з'яўляецца «Полотск и его церковно-исторические древности». У «Полацка-Віцебскай даўніне» быў надрукаваны артыкул «О достопамятных Свято-Евфрасиньевских днях в Полоцке 20–23.05.1910»[18].

Пісаў пра Полацк генерал-маёр артылерыі, ваенны пісьменнік Л.Л. **Кірпічоў**[19].

Выкладчык Полацкага кадэцкага корпуса Г. **Лявіцкі** змясціў артыкул «Город Полоцк Витебской губернии», у якім аналізуецца роля горада ў гісторыі краю, падзеі 1812 г., сучасны для аўтара стан месца[20].

Таксама педагог Полацкага кадэцкага корпуса, краязнаўца А.К. **Марэль** шмат працаваў над гісторыяй горада Полацка і над вывучэннем архіўных дакументаў з мінулага Полацкага кадэцкага корпуса. Большасць прац прысвечаны Полацку, змяшчаліся ў розных выданнях і газетных публікацыях[21].

Цікавыя звесткі пра Полацк можна пачэрпнуць з успамінаў М.І. **Зорына**, у якіх асвятляюцца падзеі грамадскага жыцця Віцебшчыны на мяжы XIX–XX стагоддзяў. Ён жа з'яўляецца аўтарам публікацыі «Минувшее и настоящее г. Полоцка»[22].

---

[17] Полоцкий кадетский корпус. Исторический очерк 75-летия его существования (1835–1910). Полоцк, 1910. — 396 с.

[18] Полотск и его церковно-исторические древности (церковно-историко-археологические очерки) // Светильник. 1914. № 2. — С. 7–37; Екиманские древности. СПб., 1912; О достопамятных Свято-Евфрасиньевских днях в Полоцке 20–23.05.1910 // Полоцко-Витебская старина. 1911.

[19] Полоцк: Военный сборник. СПб., 1885.

[20] Город Полоцк Витебской губернии // ВГв. 1886. № 88.

[21] История г. Полотска и возникновение здания Полотского кадетского корпуса. Вильна, 1907; Историческая записка о плаце Полоцкого кадетского корпуса. Полоцк, 1890; О былом Полоцка // Витебские губернские ведомости. 1892. № 81–83, 85, 90; Монетный клад // Витебские губернские ведомости. 1893. № 56; Еще о находках монет в пределах Витебской губернии // Витебские губернские ведомости. 1894. Январь.

[22] Минувшее и настоящее г. Полоцка. Краткий ист. очерк. Полоцк, 1910; Организация и торжественное открытие Витебского учительского института // Веснік ВДУ. 2000. № 3. — С. 13–17.

Дырэктар кадэцкага корпуса (1834–1888) генерал-маёр А.П. **Тыртаў** у 1888 г. прапаноўваў арганізаваць у Полацку музей мясцовых старажытнасцей і стварыць гурток аматараў археалогіі. Сярод яго прац некалькі і па мясцовай гісторыі[23].

## Другая палова XIX — пачатак XX ст.

Асоб, якія найбольш вызначыліся вывучэннем Полаччыны ў гэты перыяд, прыгадаем, з прычыны значнай колькасці матэрыялу, у алфавітным парадку.

Гісторыі Полаччыны прысвечана праца М.М. **Аглобліна** (Оглоблин) «Тлумачальная нататка да карты Полацкага павета другой паловы XVI ст»[24].

**Аляксееў** Е. (сяр. XIX ст.). Аўтар працы, прысвечанай Полацку і яго цікавасцям, змешчанай у часопісе «Ілюстрацыя»[25].

**Альбіцкі** Уладзімір (мяжа XIX–XX ст.), святар. Аўтар кнігі «Полоцкий Спасо-Ефросиниевский монастырь. Краткий исторический очерк» (1897). Праца ўяўляе сабой цікавы нарыс, змешчаны раней у «Полацкіх епархіальных ведамасцях»[26].

**Арсеньеў** Васіль Сяргеевіч, гісторык, генеалог, адзін з ініцыятараў і стваральнікаў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, яе першы старшыня (1909–1910). Ім вывучаліся помнікі даўніны ў Полацку, былі выяўлены, падрыхтаваны і выдадзены дакументы па гісторыі Віцебшчыны[27].

**Брадовіч** М. (сяр. XIX ст.), вучоны-манах з Кобрына, спрабаваў напісаць гісторыю Полацкай епархіі. З яго смерцю, ў 1879 годзе, архіў быў прададзены і рукапіс страчаны.

---

[23] Некоторые пояснения к описанию жития преподобной Ефросиньи Полоцкой // Витебские губернские ведомости. 1893. № 93–99 (тое ж асобным выданнем)

[24] Объяснительная записка к карте Полоцкого повета во второй половине XVI века // Сборник Археологического института. — Т. III, IV. — 1880.

[25] Полоцк и его примечательности // Иллюстрация. СПб., 1861.

[26] Альбицкий Вл. Полоцкий Спасо-Ефросиниевский монастырь. Краткий исторический очерк. Витебск: Губ. типо-литография, 1897. — 12 с.

[27] Из прошлого Полоцкой Епархии. (Документы по архиву губерн. правления, 1824 г.). Витебск, 1910

**Брэжга** (Brežgo) Баляслаў Рычардавіч, гісторык, архівіст. Б. Брэжга — аўтар больш за 120 друкаваных прац, з якіх каля 30 прысвечаны гісторыі Віцебшчыны і ўтрымліваюць цікавыя звесткі пра Полацк: «Архивы полоцко-витебского края в прошлом и настоящем» «Архівы і архіўная спадчына ў Віцебшчыне» // Віцебшчына. Віцебск (Т. 1, 1925); «Ахова помнікаў старажытнасці на Віцебшчыне» // Беларуская школа ў Латвіі (Рыга, 1932), «Замкі Віцебшчыны» (Вільня, 1933), «Лёс іезуіцкіх і гімназічных бібліятэк у Полацку і Віцебску», «Аб паходзе палачан у 1106 годзе і аб Дзвінскіх камянях з надпісамі».

**Бяляеў** Іван Дзмітрыевіч, рускі гісторык-славянафіл. У «Гісторыі Полацка ці Паўночна-Заходняй Русі» (1872) прааналізаваў сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва, гісторыю царквы, адміністрацыі Кіеўскай Русі і ВКЛ[28].

**Васілеўскі** Даніла Мінавіч, краязнаўца, літаратуразнавец. З 1910 г. пачаў збіраць фальклор на Полаччыне (в. Старыца Мікалаеўскай воласці Полацкага павета). У 1917–1919 гг. працаваў у розных установах у Полацку.

**Вяроўкін** Міхаіл Лаўрэнцьевіч. З дапамогай А. Сапунова апісаў у асобнай брашуры архіў Полацкай духоўнай кансісторыі. Дапамагаў А. Сапунову ў падрыхтоўцы да выдання «Віцебскай даўніны». Адзін са складальнікаў і рэдактараў «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» (Т. 17–26). У каментарыях да дакументаў падкрэсліваў ролю праваслаўнай царквы ў гісторыі Беларусі XVI–XVII стст. Публікацыю інвентароў суправаджаў уласнымі падлікамі агульнага даходу сялян, велічыні іх надзелаў, павіннасцей і інш.

**Гіжыцкі** Ян Марэк Антоні, гісторык каталіцкай царквы ў ВКЛ, краязнаўца. Найбольшую цікавасць з боку гледжання краязнаўства Полаччыны выклікаюць некалькі прац, сярод якіх праца «Матэрыялы да вывучэння Полацкай акадэміі і залежных ад яе школ» («Materjały do dziejów Akademii Połockiej i szkół od niej zależących»)[29].

---

[28] Беляев И. Д. История Полоцка или Северо-Западной Руси от древнейших времен до Люблинской унии. М.: Синодальная типография, 1872. — 456 с.

[29] Natatka o Akademii i szkołach jezuitów w Połocku. Poznań, 1899; Materiały do dziejów Akademii Połockiej i ziem szkól od niej zależnych. Zebrał I.G. Kraków: Druk.W.L.Anczyca i Spółki, 1905. — 288 s.

**Данілевіч** Васіль Яфімавіч (Уладзімір Яўгенавіч), украінскі гісторык, археолаг. Працаваў у археалагічных экспедыцыях на Полаччыне і Падзвінні. Па заканчэнні універсітэта напісаў медальнае сачыненне «Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV ст.» (1896). Пазней Данілевіч выдаў кнігі: «Пути сообщения Полоцкой земли до конца XIV столетия» (1898), «К вопросу о Параскеве-Пракседе княжне полоцкой» (1905)[30]. Аўтар прац па нумізматыцы, сфрагістыцы, фальклоры, этнаграфіі.

Выдатны беларускі архівіст, археограф, гісторык, крыніцазнавец, краязнаўца Дз.І. **Даўгяла** прысвяціў Полаччыне некалькі краязнаўчых артыкулаў і нарысаў[31].

**Дуброўскі** Міхаіл, протаіерэй, выкладчык Полацкай настаўніцкай семінарыі. Аўтар кнігі «Житие преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в г. Полоцке женского монастыря и находящейся в ней святыни». Невялічкая кніга перавыдавалася ў 1885, 1887, 1894 гг. Таксама з'яўляўся аўтарам кнігі «В память 50 летия воссоединения с Православною церковию Белорусских униатов» (1898)[32].

**Захараў** Іван Дзмітрыевіч (сяр. XIX ст.), рускі мастак. У сярэдзіне XIX ст. вандраваў па Полаччыне. У сваёй кнізе «Путевые записки русского художника» (1854)[33] пакінуў каштоўныя апісанні быту, адзення, святаў, нораваў, архітэктуры, некаторых калекцый краю. Пакінуў апісанне калекцыі палкоўніка А.І.К. (ініцыялы пакуль што не расшыфраваны), якога Захараў наведаў у яго маёнтку Крашуты пад Полацкам (па дарозе на Невель).

**Красавіцкі** Міхаіл Іванавіч, святар, краязнаўца. Друкаваў артыкулы з жыцця Полацкай епархіі ў «Віцебскіх губернскіх ведамасцях»,

---

[30] Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV ст. Киев, 1896; Пути сообщения Полоцкой земли до конца XIV столетия. Юрьев, 1898; К вопросу о Параскеве-Пракседе княжне полоцкой. Харьков, 1905.

[31] Довгялло Д.И. Крест преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой. Витебск, 1895; Полоцкая епархия к 1903 году. Составил преподаватель духовной семинарии Д.И. Довгялло. Витебск: Типолитография, 1903. — 106 с.

[32] Житие преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в г. Полоцке женского монастыря и находящейся в ней святыни. Полоцк, 1885. — 34 с.

[33] Захаров И.Д. Путевые записки русского художника. Ч.1. СПб., 1854.

«Полацкіх епархіяльных ведамасцях», «Церковно-Общественном Вестнике»[34].

**Кусцінскі** Міхаіл Францавіч, беларускі археолаг, краязнаўца, фатограф. Зрабіў для Пецярбургскай Акадэміі Мастацтваў табліцу з пералікам курганоў і гарадзішчаў па кожным павеце Віцебскай губерні. Упершыню на Беларусі пачаў фатаграфаваць працэс раскопак, складаць фотатэку помнікаў старажытнасцей Віцебскай і суседніх губерняў. Вывучаў Барысавы камяні – манументальныя помнікі эпіграфікі XII ст. на тэрыторыі Беларусі. У 1870–1880-я гг., акрамя Лепельскага павета, даследаваў Полацкі, Віцебскі паветы, але вынікі не друкаваў.

**Леанардаў** Дзмітрый Сяргеевіч, беларускі гісторык і педагог. Аўтар працы «Полацкі князь Усяслаў і яго час»[35], у якой даў нарыс гісторыі Полацкага княства X–XII стст., яго ўнутранага становішча і ўзаемаадносін з іншымі старажытнарускімі землямі.

**Максімаў** Сяргей Васільевіч, літаратар, этнограф. У сакавіку – красавіку і летам 1868 г. вывучаў Паўночную Беларусь (Полацк, Веліж, Усвяты). Ніякіх навуковых справаздач аб сваёй экспедыцыі ці якіх-небудзь фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў не апублікаваў. Уражанні і назіранні аб паездцы па Беларусі ляглі ў надрукаваную пазней кнігу белетрызаваных нарысаў «Прыстанак і жыхар. З нарысаў Беларусі», «Краіна крывічоў», «Куль хлеба» і інш.[36].

**Мантойфель** Густаў (Manteuffel; Manteuffel-Szoegle), польскі і нямецкі гісторык, этнограф. Доўгі час быў карэспандэнтам такіх выданняў, як «Слоўнік геаграфічны каралеўства Польскага», «Wielka Encyklopedia Powszechna Ilustrowana», «Kwartalnik Litewski» і іншыя, дзе пісаў на тэмы, звязаныя з Прыдзвіннем[37].

**Пакрышкін** Пётр Пятровіч, расійскі архітэктар, дзеяч у галіне рэстаўрацыі помнікаў сярэдневяковай архітэктуры. Даследаваў Полацкі Сафійскі сабор (1909).

---

[34] Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их хранение // Полоцко-Витебская старина. Вып. 1. Витебск, 1911. — С. 56–57; Исторические древности и древния истории // Полоцко-Витебская старина. Т. 3. — С. 313–324.

[35] Полоцкий князь Всеслав и его время // Полоцко-Витебская старина. 1912. Вып. 2; 1916. Вып. 3; Памяти действительного члена Витебской ученой архивной комиссии Ив.Ив. Долгова // Полоцко-Витебская старина. Витебск, 1911. Кн. 1. Ч. 2.

[36] Обитель и житель: Из очерков Белоруссии // Древняя и новая Россия. СПб., 1876 Т. 2. — С. 127–148, № 8. — С. 201–212; Куль хлеба и его происхождение. СПб. 1873

[37] Połack // Słownik geograficzny. T. 8. — S. 714–722

**Паўлінаў** Андрэй Міхайлавіч, архітэктар, даследчык, гісторык рускай архітэктуры і культуры. Першым у рускай археалогіі паставіў пытанне аб дамангольскай архітэктуры Полацка і Віцебска. Даследаваў у Полацку храмы Св. Сафіі, Спаса-Ефрасіннеўскі і помнікі Бельчыцкага манастыра. Дзякуючы працам А.М. Паўлінава даследаванні старажытнай архітэктуры Полацкай зямлі сталі на навуковую аснову[38].

**Пічэта** Уладзімір Іванавіч, гісторык-славіст. Акадэмік АН БССР (1928), АН СССР (1946). Полацку прысвечана праца «Полацкая зямля ў пачатку XVI ст.» // 400-лецце беларускага Друку (1926).

**Сазонаў** Аляксандр Міхайлавіч, першы архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг з 1862 па 1886 г. Падрыхтаваў да выдання акты XVII ст., узятыя з кніг Полацкага магістрата за 1633, 1638, 1643 гг. У артыкуле «О бунте» (1864) апісаў паўстанне полацкіх гараджан 1633 г., прывёў імёны актыўных удзельнікаў[39].

**Сапуноў** Аляксей Парфенавіч, гісторык, археограф, краязнаўца. Буйнейшымі даследаваннямі вучонага па гісторыі Полацка-Віцебскай даўніны сталі выданне дакументаў па гісторыі Віцебшчыны «Витебская Старина» і «Река Западная Двина» (ib., 1893). Па плану аўтара, другі том «Віцебскай Даўніны» павінен быў ахапіць гісторыю Полацка, чацвёрты ў дзвюх частках — гісторыю Полацка ў перыяд валодання ім Іванам Жахлівым (1563–1579) і Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у перыяд праўлення цара Аляксея Міхайлавіча (1654–1667). На жаль, Сапуноў змог выдаць толькі I, IV і V тамы.

Пералічым некаторыя іншыя важныя, на нашу думку, працы А.П. Сапунова: «Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке» (ib., 1890); «Полацкі Сафійскі сабор» (1888), «Дзвінскія або Барысавы камяні» (1890), «Універсітэт у Полацку» (1908) і інш[40]. Храналічны спіс прац А.П. Сапунова змяшчаецца ў выданні Л. Хмяльніцкай «Гісторык з Віцебска» [С. 219–228].

---

[38] Древние храмы Витебска и Полоцка // Труды IX археологического съезда в Вильне в 1893 г. Т. 1. М., 1895

[39] О бунте // ВГв. 1864. № 4; (Созонов) Опись церковных и монастырских имений Полотского воеводства, отданных королем Стефаном Баторием Полоцкой иезуитской коллегии, при основании оной. Составлена Скуминым-Тышкевичем. Перевод с польского // Памятная книга Витебской губернии на 1867 г. Витебск, 1868. — С. 99–121.

**Свідзерскі** Лука Фёдаравіч (мяжа XIX–XX стст.), аўтар кнігі «Иоанн Крассовский, полоцкий униатский архиепископ. Жизнь и деятельность» (1911)[41]. Змяшчае біяграфічныя звесткі пра стан Полацкай епархіі ў канцы XVIII — першай чвэрці XIX ст. (колькасць уніяцкага насельніцтва, цэркваў, капліц, кляштараў, духавенства; грамадскае, духоўнае жыццё уніятаў; падзеі ў губерні пасля 1812 г., бібліяграфічныя звесткі пра І. Красоўскага (1776–1827) і інш.).

**Семянтоўскі** (Семянтоўскі-Курыла) Аляксандр Максімавіч, беларускі і рускі этнограф, археолаг, краязнаўца, фалькларыст. Апісваў гісторыю Віцебскай губерні, Барысавы камяні, Полацкі Сафійскі сабор, сабор у Бельчыцах, старажытныя помнікі, археалагічныя знаходкі, крыж Лазара Богшы і іншыя[42]. Заслугоўваюць увагі таксама і працы А. Семянтоўскага, якія ўтрымліваюць каштоўныя звесткі па гісторыі і культуры Полаччыны: «Валасныя суды ў Віцебскай губерні», «Аб ярмарках і кірмашах Віцебскай губерні», «Беглы статыстычны нарыс прыроды і насельніцтва Віцебскай губерні» і інш.

---

[40] Витебская старина (Документы и материалы). Сост. и издатель А.П. Сапунов. Т. 1, 4, 5. Витебск, 1883–1888; Древности Спасо-Ефросиниевского девичьего монастыря в Полоцке. Витебск, 1885. — 23 с.; Полоцкий Софийский собор. Витебск, 1888. — 20 с.; Древние иконы божией матери в Полоцкой епархии. Витебск, 1888. — 15 с.; Католическая легенда о Параскеве, княжне Полоцкой. Витебск, 1888. — 47 с.; Исторические судьбы Полоцкой епархии с древнейших времен до пол. 19 в. Витебск, 1889. — 174 с.; Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке. Витебск, 1890. — 34 с.; Двинские или Борисовы камни. Витебск, 1890. — 31 с.; Река Западная Двина. Историко-географический обзор. Витебск, 1893. — 512 с.; Достоверность отрывка из Полоцких летописей, помещенных в истории Рос. Татищева под 1217 г. // «Чтения Имп. об. истории, и древ. Рос. при Московском университете». 1894. Т. III.; Университет в Полоцке. Историческая справка. Витебск, 1908. — 41 с.; Пребывание императрицы Екатерины II в Полоцке. Б.м. Б.г. — 28 с.; Сказания исландских или скандинавских саг о Полоцке, князьях полоцких и р. Западной Двине. Б.м. Б.г. 1916. —32 с.; Рисунки крепостей, построенных по велению царя Ивана Грозного после завоевания Полоцка в 1563 году. Б.м. Б.г. — 15 с.

[41] Иоанн Крассовский, полоцкий униатский архиепископ. Жизнь и деятельность. Витебск: Губ. тип., 1911. — 452 с.

[42] Полоцкий Борисоглебский монастырь // Памятная книжка Витебской губ. на 1866 г. СПб. 1866. — С. 38–51; Список церквей, монастырей и духовенства бывшей Белорусской епархии за 1839 г. // Памятная книжка Витебской губернии на 1867 г.; Памятники старины Витебской губернии. СПб., 1867. — 74 с.; О ярморках и кирмашах Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии на 1867 г.; Полоцк: историко-статистический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1878 г. Витебск, 1878; Полоцкая Софийская церковь // Памятная книжка Витебской губернии на 1878 г. Витебск, 1878

**Сергій** (Васілеўскі) (1830 – ?), іераманах. Аўтар кнігі «Витебский Марков Свято-Троицкий Монастырь», артыкулаў, якія змяшчаліся ў «Памятных кніжках Віцебскай губерні». [43]

**Струкаў** Дзмітрый Міхайлавіч, вядомы мастак Маскоўскай Аружэйнай палаты, археолаг, педагог. Удзельнік экспедыцыі Рускага археалагічнага таварыства ў 1864 годзе для выяўлення старажытнасцей Беларусі. Да справаздачы Струкавым быў падрыхтаваны альбом на 200 лістах. Віцебскай губерні прысвечана 83 малюнкі (42 % ад агульнай колькасці).

Сярод іншых, замаляваў на шляху да Полацка камень «з трыма патэльнямі» каля в. Залессе, што ў 3-х вярстах ад Махіроўскага манастыра і сляды літар на ім (№ 50–51), царкву ў в. Крывое Полацкага павета, будынкі Махіроўскага манастыра. У Полацку намаляваў і вычарціў 31 ліст ватмана (віды горада, план Кадэцкага корпуса, Мікольскага сабора, Ефрасіннеўскай царквы і царквы Бельчыцкага манастыра, а таксама «планы, фасады і разрэзы тых жа цэркваў і манастыроў». Спаса-Еўфрасіннеўскаму манастыру было прысвечана 12 малюнкаў. У С-Пецярбургу захоўваюцца матэрыялы і малюнкі, на якіх замаляваны пячорныя храмы ў Полацку[44].

**Сыценка** І.Ф., аўтар і складальнік некалькіх гістарычных нарысаў, прысвечаных Полаччыне. Датуюцца 1888 годам. Сярод іншых, «Гістарычны нарыс аб старажытнасці Полацкага княства», «Гістарычны дзявочы погляд на старажытнасці Полацкага княства». Захоўваюцца ў Санкт-Пецярбургу, у Інстытуце гісторыі і матэрыяльнай культуры [Фонд Імператарскай археалагічнай камісіі. Спр. 13а. Л. 3–9] і [Ф. 1. Спр. 13а. Л. 10–25][45].

**Сямеўскі** Міхаіл Іванавіч, грамадскі дзеяч, пісьменнік. Аўтар некалькіх артыкулаў, прысвечаных Полацкаму кадэцкаму корпусу[46].

---

[43] Жизнеописание преподобной Ефросинии княжны Полотской // Памятная книжка Витебской губернии на 1864 г.

[44] Романов Е.Р. Альбом художника Д.М. Струкова как результат экспедиции по Северо-Западному краю в 1864 г. Вильна: Тип. Иос. Завадзкаго.

[45] Вяртанне — 3. Зборнік артыкулаў і дакументаў. — С. 80. Віцебская губерня — С. 78–103.

[46] Полоцкий кадетский корпус (1835–1885 гг.) // Русская Старина. 1885. Вып. 4.

**Ціхаміраў** Іван Аляксандравіч, гісторык, пісьменнік. Выклікае цікавасць даследаванне, прысвечанае гандлёвым сувязям Полацка з Лівоніяй у XIV ст.[47]

**Чысцякоў** Іван (Ф.), штатны фатограф імператарскай археалагічнай камісіі. Быў накіраваны ёю ў Полацк па прапанове І.А. Шляпкіна, які рыхтаваў корпус усіх старажытнарускіх надпісаў і крыжоў. Захавалася 19 негатываў (знойдзены П. Аляксеевым у Ленінградзе), з якіх усе унікальныя.

**Шэйн** Павел Васільевіч, этнограф, фалькларыст, педагог. Праца «Беларускія песні» з'яўляецца самай буйной сярод аналагічных зборнікаў 60–70-х гг. XIX ст. У ёй сабрана больш за 1000 беларускіх народных песень, 10 казак, легенд, паданняў, некалькі запісаў прыкмет, замоў і забабонаў. Прыводзяцца 2 апісанні радзінных абрадаў з м. Якімань (Экімань) Полацкага павета, запісаныя П. Шэйнам ад інфарматараў.

**Эвальд** Эдуард Фёдаравіч (1832–?), выкладчык рускай мовы, краязнаўца. Служыў у Полацкім Дваранскім вучылішчы. Публікаваў артыкулы пра старажытнасці Беларусі ў мясцовых і сталічных выданнях[48].

**Яўсееў** К., выкладчык семінарыі, аўтар кнігі «Судьбы школьного просвещения в Северо-Западной Руси»[49] (1908), у якой аўтар разглядае пад Паўночна-Заходняй Руссю тэрыторыю былога Полацкага княства і потым ВКЛ. Даследаваў генезіс сістэмы адукацыі на гэтых землях.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў розныя часы Полаччына прыцягвала ўвагу шэрагу даследчыкаў, якія стварылі значную колькасць прац, што маюць дачыненне да гісторыі і культуры горада і яго наваколляў. Наспеў час стварэння грунтоўнай манаграфіі, прысвечанай гісторыі даследавання Полаччыны і асоб, якія прычыніліся да яе вывучэння.

---

[47] Торговые сношения Полоцка с Ливонией в XIV стол. // Журн. Мин. нар. просв. 1877. № XII.

[48] Полоцкая старина // Санкт-Петербургские ведомости. 1854. № 229.

[49] Судьбы школьного просвещения в Северо-Западной Руси. (Публичная лекция). Витебск: губ. типография, 1908. — 27 с.

# 17-я и 50-я стрелковые дивизии накануне и в начальный период Великой Отечественной войны

**Поляков Сергей Ильич,**
*заведующий филиалом*
*Музей боевой славы*
*Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник*

После окончания гражданской войны, исходя из того, что Полоцк стал городом пограничным, а, кроме того, являлся важным центром транспортных коммуникаций, военно-политическое руководство страны принимает деятельные меры к защите города на случай возможной войны. Именно поэтому в период между войнами в городе и его окрестностях содержался большой гарнизон. В первое время его основу составляла 5-я стрелковая дивизия, которая дислоцировалась в Полоцке и Ветрино до 1939 года. С окончанием работ по строительству укрепленного района гарнизон пополнили его части. С 1936 года в городе дислоцируются части 50-й стрелковой дивизии, а с августа 1940 года ещё и 17-й СД. Таким образом, примерный численный состав войск Полоцкого гарнизона в предвоенные годы составлял от 30 до 40 тысяч человек. При этом учитывалось то обстоятельство, что мобилизационные ресурсы Полоцка и Полоцкого района были довольно ограниченными.

17-ю стрелковую дивизию (вначале она называлась 1-я Витебская) сформировал в 1918 году из отдельных отрядов Красной гвардии Сергей Сергеевич Каменев — будущий Главнокомандующий Вооруженными силами РСФСР. Бывший полковник Генерального штаба в 1918 году занимал пост начальника штаба III-й армии РККА в Полоцке. За боевые заслуги дивизия и все ее полки были удостоены Почетных Красных Знамен ВЦИК. С.С.Каменев был почетным красноармейцем 1-й роты 50-ого стрелкового полка этой дивизии.

В 1918 году дивизия освобождает от немецкой оккупации Минск и Могилев, в 1919 году участвует в боях на Восточном фронте, затем возвращается в Белоруссию, где принимает участие в войне с Польшей, ведя бои, в том числе, и на полоцкой земле.

После гражданской войны штаб дивизии и ее головной 49-й полк размещаются в Нижнем Новгороде (с 1932 г. — Горький). 50-й полк размещался в Рязани, а 51-й во Владимире.

Командиром 50-ого полка, а позже комиссаром и начальником политотдела дивизии был Иван Степанович Конев, будущий маршал.

Представляется интересным, что с 17-й СД связано имя еще одного маршала — Николая Васильевича Огаркова — начальника Генерального штаба Вооруженных Сил СССР. Он с началом Великой Отечественной войны был в дивизии полковым инженером.

В мае 1938 года командиром дивизии был назначен Терентий Кириллович Бацанов. Дивизия не была для него новой, так как в гражданскую войну он воевал в ней, будучи командиром роты и батальона. В это же время в дивизии проходит службу командир пулеметной роты 278 стрелкового полка лейтенант Андрей Ефремович Писаренко — полочанин и будущий Герой Советского Союза.

В конце 1939 года приказом наркома обороны СССР 17-я стрелковая дивизия была включена в состав Северо-Западного фронта. С января по 12 марта 1940 года соединение принимало участие в финской кампании.

За бои на Карельском перешейке дивизия, её командир и один из полков были награждены орденом Красного Знамени. В наградном листе командира 15-ого стрелкового корпуса, куда входила 17-я СД написано: «В тяжелых боях на Карельском перешейке за предполье укрепленного района тов. Бацанов, пренебрегая опасностью для жизни, руководил боем и своим бесстрашием и личным примером воодушевлял бойцов и командиров. При прорыве укрепленного района дивизия овладела большим количеством железобетонных сооружений, захватила много оружия и боеприпасов ... »

В марте 1940 года дивизия возвратилась в Горький, однако вскоре была переброшена на границу с Литвой, но и там не задержалась, совершив марш к границе с Румынией. С конца августа 1940 года дивизия находилась в Полоцке, составляя резерв командующего Западным ОВО.

12 июня 1941 года генерал-майор Бацанов получил распоряжение о сосредоточении соединения в составе 21-ого стрелкового корпуса в районе г. Лида Гродненской области. С целью «не спровоцировать немцев на нападение» марш совершался только в ночное время. За ночь проходили по 40-70 км.

В одной из радиопередач радиостанции «Эхо Москвы» в 2004 году приводилась выдержка из письма ветерана 17-й СД Анатолия Николаевича Семяшкина, где говорилось: «Наша 17-я стрелковая дивизия базировалась близ Полоцка. В мае-июне (12 или 15 июня — **С.П.**) был приказ перейти на летние лагеря. Комдив воскликнул: «Чем же я буду воевать, подушками, что ли? Ни один патрон, ни один снаряд не был отправлен вместе с нами. Все осталось на складах». И это почти соответствовало действительности. По приказу, во избежание провокаций со стороны немцев, дивизии, уходившие к границе, имели с собой, да и то в обозе, только небольшую часть боекомплекта.

Части дивизии, совершив марш, должны были сосредоточиться в определенных комдивом Бацановым местах к 23 июня. 21 июня 109 отдельный батальон связи дивизии уже расположился лагерем в непосредственной близости от государственной границы. Николай Никанорович Скворцов, служивший в батальоне связи в 1941 году, вспоминает: «22 июня, едва забрезжил рассвет, немцы начали артподготовку, а через полчаса в лагерь ворвались вражеские мотоциклисты и рассеянным автоматным огнем изрешетили все палатки. Команды открывать огонь не было. В присланном из штаба армии пакете было сказано: «на провокацию не поддаваться, огонь не открывать!» Был приказ окопаться и занять оборону. Наконец бойцам раздали боевые патроны и гранаты. Вскоре появились немцы. Они шли лавиной в полный рост, поливая пулеметным и автоматным огнем окопы наших ребят. Появились убитые и много раненых…»

Командующий Западным фронтом генерал армии Павлов в течение первого дня войны несколько раз менял боевую задачу 21-ого СК, но приказания до корпуса и его дивизий не доходили. Связь отсутствовала, а комкор генерал-майор Борисов с оперативной группой прибыл в район Лиды только 23 июня. В соответствии с его приказом дивизия заняла оборону на рубеже р. Дитва. В полдень 24 июня начались первые тяжелые и кровопролитные бои. В это время 3-я танко-

вая группа немцев вышла уже в район Молодечно, создавая непосредственную угрозу Минску с севера. Павлов же, считая, что главные события развернутся в районе Лиды, продолжал сосредотачивать там войска. Частям 17-й СД пришлось вести борьбу не только с наступавшим с фронта противником, но и с подразделениями врага в тылу.

25 июня, выяснив замысел немцев окружить войска Западного фронта в минском «котле», Военный совет отдал войскам директиву начать отход в ночь с 25 на 26 июня.

По воспоминаниям ветеранов дивизии генерал Бацанов отдал полкам приказ прорываться с боем на Слуцк-Калинковичи. Маршрут отхода пролегал через оборонительные сооружения Минского укрепленного района, предстояло также форсировать Неман. Мосты были разрушены, машины перетягивали канатом по дну реки. Под сильными бомбежками немцев дивизия несла большие потери. Когда прорвались к Минскому УРу, выяснилось, что там уже находятся немцы. В ходе боя с врагом, засевшим в наших ДОТах, в первой цепи атакующих шел комдив Бацанов. После прорыва обороны противника дивизия разделилась на отряды, каждому из которых была поставлена боевая задача — используя болота, леса и овраги пробиваться на восток. 109-й отдельный батальон связи, с которым был и генерал Бацанов, с боями вышел на юго-восток к реке Птичь. Здесь из отходящих частей дивизии был создан сводный отряд, а в конце июля из остатков 17-й и 24-й стрелковых дивизий была сформирована 24-я СД, вошедшая в 3-ю армию. Командиром дивизии был назначен Терентий Кириллович Бацанов. 17-я дивизия была расформирована, но ее солдаты и офицеры, оставшиеся в живых, продолжали героически воевать под командованием своего командира.

24 июля 1941 года 3-я армия вошла в состав Центрального фронта, который с 25 августа вел ожесточенные бои с врагом в междуречье Днепра и Десны, пытаясь помешать танкам Гудериана замкнуть кольцо окружения вокруг войск Юго-Западного фронта под Киевом. Оказавшись в середине сентября в окружении, 24-я СД была расчленена на несколько изолированных групп, которые отражали натиск врага до последней возможности. Происходило это в Полтавской области. С этого момента по учетным данным генерального штаба дивизия числится погибшей в боях.

В объяснительной записке от 4 октября 1941 года начальник штаба 24-й СД (бывший командир 55-ого СП 17-й дивизии) Григорий Гордеевич Скрипка писал: «Ведя бой в сентябре 1941 года в окружении в районе Прилуки Украинской ССР, дивизия попала в окружение и была частично разбита, часть попала в плен. Командир дивизии был убит». Речь идет о событиях, когда, ведя бои в окружении, погибли командующий Юго-Западным фронтом Михаил Петрович Кирпонос и начальник штаба фронта генерал-лейтенант Василий Иванович Тупиков. Они и генерал-майор Бацанов в 1956 году посмертно были награждены орденом Отечественной войны 1 степени, а в 1989 году медалью «За оборону Киева».

В память о генерале Бацанове и других воинах 17-й Краснознаменной стрелковой дивизии в городе Горьком в 1989 году в Кремле на одном из зданий была открыта мемориальная доска.

В июле 1941 года в Москве, среди 12 других, была сформирована 17-я дивизия народного ополчения Москворецкого района, которая с 26 сентября стала именоваться 17-я стрелковая дивизия. Она вела кровопролитные бои с врагом на Можайской линии обороны столицы в составе 43-й армии. На 16 октября 1941 года (период боев на малоярославецком направлении под Тарутино) в дивизии насчитывалось 4469 человек. Её командиром был полковник Петр Сергеевич Козлов, а военкомом — бригадный комиссар С.И. Яковлев. Ведя невероятно тяжелые бои с превосходящими силами немцев, дивизия оставила занимаемый рубеж. В результате Тарутино, дважды переходившее из рук в руки, было захвачено врагом. О тяжести боев говорит тот факт, что отступая, 980 артполк потерял всю свою матчасть, а в 1312 стрелковом полку в живых осталась фактически только одна рота.

22 октября 1941 года командующий 43-й армией получил приказ за подписью Жукова и Булганина, в одном из пунктов которого говорилось: «… командира 17-й СД немедленно арестовать и перед строем расстрелять, 17-ю дивизию заставить вернуть Тарутино, во что бы то ни стало, включительно до самопожертвования». 24 октября 1941 года дивизия в количестве 960 человек отступила на восточный берег р. Нара. Командир и военком были расстреляны. В 2006 году оба были полностью реабилитированы. 60 лет эти люди числились в списках «пропавших без вести».

После битвы за Москву дивизия в составе 48 армии участвует в Смоленской наступательной операции, в Курской битве, освобождает Украину и Белоруссию, ведет тяжелые бои с немцами в Восточной Пруссии. В июле 1944 года дивизия удостоена почетного наименования «Бобруйская» и награждена орденом Красного Знамени.

50-я стрелковая дивизия начала свою биографию с мая 1936 года. Местом ее формирования стал Полоцк. Первоначально в состав дивизии вошли: Управление военно-строительных работ (УВСР) № 27, ряд частей Полоцкого укрепленного района и пополнение из 5, 27, 33 и 64-й стрелковых дивизий Белорусского Военного округа. Скорее всего, это было третье формирование дивизии, так как в 1921 году 50-я СД вместе с 27-й Омской СД входили в группу войск низовья Волги. В мемуарной литературе упоминается  также факт формирования дивизии за номером 50 в 1934 году.

Командиром вновь сформированной дивизии стал начальник УВСР № 27, а по-другому комендант Полоцкого укрепленного района ,Трифан Иванович Шевалдин. Первый командир 50-й СД в звании штабс-капитана был участником первой мировой войны, в гражданскую войну был командиром батальона, помощником командира и командиром полка. В июне 1941 года назначается командующим Ленинградским ВО, а в сентябре 1941 года — командующим 8-й армией, героически оборонявшей Ораниенбаумский плацдарм, прикрывая подступы к Ленинграду со стороны Финского залива. В 1945 году Трифан Иванович командовал войсками Белорусско-Литовского Военного округа. После войны жил в Куйбышеве. Награжден двумя орденами Ленина, тремя орденами Красного Знамени и многими медалями.

Самое непосредственное участие в формировании дивизии принимал командир ее 150-ого стрелкового полка майор Аркадий Александрович Борейко, уроженец Полоцкой земли, который в 1943 году, уже в ранге командира 9-ого гвардейского стрелкового корпуса, станет Героем Советского Союза.

К декабрю 1936 года формирование было в основном завершено, и дивизия вошла в состав 4-ого стрелкового корпуса, штаб которого располагался в Витебске. Командиром этого корпуса в 1928 году был Я.Ф.Фабрициус.

В 1939 году 50-я стрелковая участвовала в освобождении Западной Белоруссии. Тогда маршрут ее похода пролегал через Глубокое, Поставы, Вильно, Гродно, Белосток и Городок (Минской области). До декабря 1939 года местом дислокации дивизии был Белосток.

Первое боевое крещение дивизия получила на Карельском перешейке в феврале 1940 года. В это время дивизией командовал комбриг Степан Илларионович Еремин. Под его командованием соединение показало себя слаженной и хорошо подготовленной боевой силой. Это подтверждается следующими фактами. После окончания 13 марта 1940 года боевых действий на Карельском перешейке 359 стрелковый и 202 артиллерийский полки за мужество и доблесть, проявленные в боях, были награждены орденами Красного Знамени. 9 воинов дивизии были удостоены звания Героя Советского Союза, 22 — награждены орденом Ленина, 237 — орденом Красного Знамени. Среди награжденных орденом Ленина был командир дивизии, а орденом Красного Знамени — заместитель командира дивизии подполковник А.А. Борейко.

С марта по декабрь 1940 года дивизия была расквартирована в районе г. Лида, а с января 1941 года местом ее дислокации вновь стал Полоцк.

К середине мая 1941 года части дивизии были пополнены личным составом, оружием, боевой техникой и находились в лагерях. Во второй половине июня планировалось проведение полковых, а в августе — дивизионных тактических учений. Но 15 июня был получен приказ, которым дивизии предписывалось сосредоточиться в районе Сморгони. Маршрут движения: Полоцк-Ветрино-Гроздево-Вилейка-Молодечно-Сморгонь. Передвижение войск разрешалось приказом только ночью. Вечером 18 июня от Зеленого городка начался марш.

Война застала части дивизии на дневке в районе Дуниловичей (Минская область). На второй день войны было получено боевое распоряжение командующего 13-й армией, которому подчинили дивизию. Из распоряжения следовало, что дивизия должна оборонять рубеж Сморгонь-Свиридовичи, прикрывая, таким образом, г. Молодечно.

Немцы не предполагали встретить здесь организованное сопротивление и отчаянно рвались вперед. Но с ходу прорвать оборону дивизии противнику не удалось, ее части упорно сопротивлялись и только под сильным давлением превосходящих сил врага вынуждены были отходить, задерживая гитлеровцев на каждом выгодном рубеже.

Одним из таких рубежей стала река Березина. Немцы стремились воспрепятствовать переправе дивизии на ее левый берег. Однако дивизия сумела прорваться к реке севернее Борисова и форсировать ее, несмотря на сильное авиационное и артиллерийское противодействие врага.

В боях под Борисовом в дивизии появились первые орденоносцы. Ими стали танкисты экипажа танка лейтенанта Барашкова, которому был вручен орден Ленина. Члены его экипажа получили ордена Красной Звезды.

В первых числах июля дивизия вышла в район Витебска, где была включена в состав 19-й армии генерала Конева. К этому времени потери дивизии в людях превысили половину списочного состава.

После кровопролитных боев на рубеже Западной Двины 50-я стрелковая в ходе Смоленского сражения, получив пополнение, оказывала героическое сопротивление войскам 3-й танковой группы Гота, существенно затрудняя их продвижение в обход Смоленска на Ярцево - крупный узел транспортных коммуникаций. В середине июля дивизия на протяжении 2-х недель оборонялась на ярцевском направлении. И не только оборонялась, но и контратаковала врага в составе оперативной группы войск Западного Фронта. 21 июля при выходе из окружения в бою на ярцевском направлении погибли командир дивизии генерал-майор Василий Павлович Евдокимов, комиссар дивизии Владимир Петрович Сумар и начальник штаба полковник Александр Трофимович Плешаков. Со 2 августа обязанности командира дивизии возлагаются на полковника А.А.Борейко

Осенью 1941 года в составе 5-й армии дивизия ведет тяжелые и ожесточенные бои на подступах к Можайску, в тех самых местах, где в 1812 году проходила Бородинская битва. 16 октября в дивизию прибыл новый комдив — Никита Федорович Лебеденко (полковник А.А.Борейко был ранен ). Генерал-майор Лебеденко уже тогда имел богатый послужной список. В гражданскую войну воевал в бри-

гаде Котовского, где был награжден двумя орденами Красного Знамени, третий орден ему вручили за бои на Карельском перешейке. В августе 1944 года за умелое отражение контрудара противника в районе г.Барнаув (Польша) командиру стрелкового корпуса Н.Ф. Лебеденко присвоили звание Героя Советского Союза. Среди наград этого человека 2 ордена Ленина, 6 орденов Красного Знамени, 2 ордена Суворова, орден Б. Хмельницкого.

15 ноября 1941 года началось генеральное наступление немцев на Москву. В книге «Навстречу Победе» о боевом пути 5-й армии говорится: «С 15 ноября гитлеровцы то и дело, не считаясь с потерями, пробовали проникнуть к Кубинке то на правом, то на левом фланге 50-й стрелковой дивизии. Но дивизия стойко сдерживала их вплоть до 24 ноября, после чего по приказу командарма организованно отошла и заняла оборону по правому берегу Москвы-реки… »

В конце декабря дивизия вела бои у д. Крюково.

Дальнейший боевой путь дивизии не менее примечателен. Его наиболее яркие детали входят в полное название соединения – 50-я стрелковая Запорожско-Кировоградская, Краснознаменная, орденов Суворова и Кутузова дивизия.

Наверное, было бы несправедливо не сказать о 5-й стрелковой дивизии — ветеране Полоцкого предвоенного гарнизона.

Сформирована в сентябре 1918 года как 2-я Пензенская пехотная дивизия. С октября 18 года — 5-я стрелковая. За успешные боевые действия в Гражданской войне награждена Почетным революционным Красным Знаменем. В сентябре 1939 года участвовала в освобождении Западной Белоруссии. В Полоцке дислоцировалась 17 лет. В ходе войны вела бои в Прибалтике, где дислоцировалась с 1940 года в составе 11-й армии. В 1941 г. в ходе контрнаступления советских войск участвовала в Московской битве, а позже в боях под Сталинградом, освобождала Белоруссию. В октябре 1942 года стала именоваться 44-я гвардейская стрелковая дивизия. В июле 1944 года получила наименование «Барановичская». На боевом Знамени дивизии — орден Ленина и орден Суворова II степени. 22 воина из состава дивизии удостоены звания Героя Советского Союза. Но об этой дивизии рассказ еще впереди.

Среди воинов, защищавших белорусскую землю и остановивших врага на подступах к Москве, было немало полочан. Они пополнили дивизии, дислоцировавшиеся в Полоцке накануне и с началом Великой Отечественной войны. Эти люди в полной мере испытали тяжесть боев первых дней войны. Большинство из них погибли, но сумели остановить врага на подступах к Москве. Восстановить для Полоцка их имена — непростая, но, надо надеяться, выполнимая задача.

## Литература

**В боях за Белоруссию**. Мн.: Беларусь, 1974 г.

**Великая Отечественная война 1941–1945.** Энциклопедия. М.: Советская энциклопедия, 1985 г.

**Ганичев Д.В., Мурнов Д.З.** Дорогами мужества. Боевой путь 50-й стрелковой Запорожско-Кировоградской орденов Суворова и Кутузова дивизии. М.: Воениздат, 1988 г.

**Дважды Краснознаменная**. М.: Московский рабочий, 1977 г.

**Военно-исторический архив**. 2006 г., № 10, 11.

**Исаев А.** Георгий Жуков, Последний довод короля. М.: Яуза, ЭКСМО, 2006 г.

Материалы сайтов: **www.soldat.ru**, **www.rkka.ru**.

**Полководцы гражданской войны**. М.: Молодая гвардия, 1960 г.

**Рокоссовский. К.К.** Солдатский долг. М.: Воениздат, 1972 г.

**Софронов Г.П.** Неподвластное времени. М.: Воениздат, 1976 г.

# Мошчы святога Андрэя Баболі ў Полацку

**Сяргеенка Наталля Алегаўна,**
*вядучы навуковы супрацоўнік*
*Краязнаўчы музей*
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

Андрэй Баболя, выдатная асоба ў гісторыі Палесся, у пасмяротны час амаль 114 год быў звязаны з Полацкам. Дзякуючы знаходжанню ў горадзе мошчаў пінскага пакутніка горад ператварыўся ў значны цэнтр паломніцтва каталіцкага насельніцтва Расійскай імперыі. Аналіз матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага і Полацкага архіваў дазваляюць прадставіць найбольш поўную карціну абставін знаходжання мошчаў святога Андрэя Баболі ў Полацку.

30 студзеня 1808 года, праз намаганні генерала езуіцкага ордэна Тадэвуша Бжазоўскага, пінскую рэліквію, мошчы Андрэя Баболі, перавезлі ў Полацк. Труну з целам змясцілі ў асобную крыпту ў касцёле св. Стэфана. У Нацыянальным гістарычным архіве захоўваюцца матэрыялы [**2**], згодна з якімі ў сцене, якая аддзяляла касцёл ад крыпты, езуіты зрабілі маленькае вакенца, якое з цягам часу перарабілася ў дзверы. Труну з целам паставілі на ўзвышша, якое нагадвала раку. З цягам часу каля ракі быў пастаўлены езуіт, які распавядаў аб пакутах каталіка-місіянера, не пажадаўшага адрачыся ад веры. Пачалі рабіцца набажэнствы пакутніку за веру, святы ў гонар яго, святочныя хрэсныя ходы. Пашырэнне культу Андрэя Баболі і ўзмацненне езуіцкага ордэна ў Полацку вызывалі абурэнне мясцовай улады. Па матэрыялах архіва, адразу пасля высылкі езуітаў з Пецярбурга ў 1815 годзе ў Полацку праваслаўныя вернікі пачалі наступ на езуіцкі ордэн. У 1816 годзе арганізуецца зварот да ўлады Расійскай імперыі аб прыняцці мер супраць пакланення Андрэю Баболі. Але моцныя пазіцыі каталіцкага насельніцтва на той час у Полацку і вяртанне цэнтральнай адміністрацыі ордэна з Пецярбурга ў Полацк не дазволілі змяніць сітуацыю.

Пасля смерці Т. Бжазоўскага, у 1820 годзе, рускім царом быў падпісаны дэкрэт аб выгнанні езуітаў з Расіі. У 1830 годзе памяшканне касцёла св.Стэфана было перададзена праваслаўным. Каталіцкая рэліквія, мошчы Андрэя Баболі, пераносіцца ў 1831 годзе ў Дамініканскі

касцёл Божай Маці і адыходзіць Дамініканскаму манастыру. Манастыр займаў паўночны бок цэнтральнай плошчы горада і знаходзіўся побач з былымі езуіцкімі пабудовамі.

Такім чынам, на цэнтральнай плошчы Полацка пачалі існаваць побач праваслаўная і каталіцкая ўстановы — новаасвячоны праваслаўны Мікалаеўскі кафедральны сабор і Дамініканскі касцёл Божай Маці.

Згодна з архіўнымі дадзенымі, у Дамініканскім касцёле для захоўвання труны з целам Андрэя Баболі, таксама, як і ў касцёле св. Стэфана, была зроблена асобная крыпта ў выглядзе капліцы. З касцёла ў капліцу вёў зручны для вернікаў ход. Відавочна, што культ шанавання Андрэя Баболі ў Полацку падтрымліваўся, нягледзячы на русіфікатарскую палітыку ўрада.

У 1850 годзе ў цэнтры старажытнай плошчы быў усталяваны помнік-капліца ў гонар вайны 1812 года. У 1846 і 1851 годзе былі зацверджаны планы гарадской забудовы, згодна з якімі ўся плошча ператваралася ў вучэбны плац Кадэцкага корпуса [**3**, с. 285–286 ]. Было запланавана перакрыць вусці вуліц, якія павінны выходзіць на плошчу, жалезнымі загарадзямі з брамамі. Мэтай такіх перабудоў, па сведчанню Вікенцьева, было жаданне ахаваць вучняў ад мясцовага насельніцтва. Але ж гэтыя перабудовы фактычна прывялі да ізаляцыі Дамініканскага манастыра і касцёла. Распачынаюцца судовыя цяжбы за валоданне зямлёй, у тым ліку з боку Дамініканскага касцёла [**2**].

Адначасова з ізаляцыяй апошняй каталіцкай установы ў горадзе, у 1852 годзе, праваслаўная епархія праз Васілія Лужынскага звяртаецца да обер-пракурора св. Сінода графа Пратасава з просьбай распарадзіцца пахаваць рэшткі Андрэя Баболі ў зямлю, каб канчаткова спыніць існаванне культу каталіцкага пакутніка ў Полацку [**2**]. У адказ на гэта Ватыкан 30 кастрычніка 1853 года праводзіць беатыфікацыю Андрэя Баболі. Папа Пій IX падчас вялікай урачыстасці абвяшчае Андрэя Баболю благаслаўлёным, «каб у такі цяжкі час і сярод такой вялікай колькасці непрыяцеляў вернікі Хрыста атрымалі новы прыклад, які павялічыў бы іх адвагу ў барацьбе» [**1**].

Згодна з булай — святам благаслаўлёнага Андрэя Баболі аб'яўляўся восьмы дзень смерці пакутніка, які прыпадаў на 23 мая па старому стылю. Звяртае ўвагу тое, што 23 мая — гэта і дзень памяці Еўфрасінні Полацкай, шанаванне якой таксама адбывалася ў горад-

зе. Святы, якія сталі праводзіцца ў Полацку адначасова і ў гонар Андрэя Баболі, і ў гонар Еўфрасінні Полацкай , далучалі і аб'ядноўвалі вялікую колькасць як праваслаўных, так і каталіцкіх вернікаў. Такім чынам, шанаванне каталіцкага пакутніка Андрэя Баболі разам з шанаваннем Еўфрасінні Полацкай аб'ядноўвавала хрысціянскіх вернікаў. Кансалідацыя вернікаў на працягу 10 год зноў прыцягвае ўвагу ўладаў да пытання знаходжання мошчаў Андрэя Баболі ў Полацку.

Пасля паўстання 1863 года Дамініканскі кляштар у Полацку быў зачынены, але касцёл быў пакінуты як парафіяльны [**4**, с. 193 ]. Адразу, у 1864 г., генерал-губернатар Мураўёў звяртаецца да цара з патрабаваннем пахавання Андрэя Баболі. Пачаўся разгляд дадзенай справы [**2**, **1**]. Каталіцкі святар Феліцыян Палюшкевіч піша пра ўрадавую камісію, якая прыехала ў Полацак з Пецярбурга з інспекцыяй, падчас якой у капліцы касцёла са столі звалілася цэгла і, падаючы, параніла аднаго з чыноўнікаў. Убачыўшы ў гэтым «ўмяшальніцтва Баболі», чыноўнікі пакінулі цела ў спакоі. Архіўныя звесткі, якімі мы валодаем, тлумачаць невырашэнне пытання пахавання Баболі прыхільнасцю да лацінства генерал-ад'ютанта Патапава, ад якога залежала вырашэнне гэтай справы. Відавочна, у 60-я гады XIX ст. пытанне пахавання мошчаў Андрэя Баболі вырашана не было ў сувязі з запалоханасцю ўладаў існуючай канфесійнай сітуацыяй у Полацку.

Мошчы засталіся на месцы, у былым Дамініканскім касцёле —цяпер адзінай каталіцкай установе ў горадзе. У другой палове XIX ст. працэсіі ў горадзе падчас рэлігійных святаў былі забаронены, але Полацкая каталіцкая дыяцэзія захоўвала культ мошчаў, набажэнствы. Працягвалася «канкурэнцыя» праваслаўнай і каталіцкай парафій у Полацку. У 1871 годзе праваслаўная епархія дабілася перадачы сярэдняга пальца правай рукі св. Еўфрасінні Полацкай [**5**, с. 55], але насельніцтва шанавала і Баболю, аб чым сведчыць прымаўка: «Андрэй Баболяй, дай денег поболей» [**2**].

Пасля прыняцця ў 1905 годзе закону аб верацярпімасці святы памяці і пакланення каталіцкаму пакутніку пачалі праводзіць зноў. Хрэсныя ходы з Двінска, якія пачыналіся 16–17 мая, збіралі шмат каталіцкіх вернікаў у пілігрымку. У Полацк 23 мая прыбывала ад 20 да 30 тысяч паломнікаў, праваслаўных і каталікоў. Хрэсныя ходы праходзілі побач, на плошчы, якая на карце 1910 года ўжо пазначана як плош-

ча Волі. Каталіцкія працэсіі адрозніваліся пышнасцю і мнагалюднасцю. «Епархіальныя ведамасці» за 1907 г. [**6**, с. 1272] адзначаюць небывалы ўздым польска-каталіцкага руху ў Паўночна-Заходнім краі, які магчыма параўнаць з рухам 60-х. Рэлігійныя святочныя працэсіі мелі выгляд палітычных маніфестацый, на касцельных харугвах былі выявы Іасафата Кунцэвіча і езуіта Баболі з надпісамі. Відавочна, што аб шанаванні мошчаў Андрэя Баболі ў Полацку ведалі за межамі Полаччыны. Рабіліся фотаздымкі [7], якія прадавалі ў віленскіх крамах, друкавалі ў польскіх выданнях.

У экспазіцыі Краязнаўчага музея прадстаўлены адзін з гэтых фотаздымкаў з выявай былога Дамініканскага касцёла. Добра бачна вялікая колькасць вернікаў да мошчаў Андрэя Баболі ў Полацку, пры гэтым неабавязкова вернікаў-каталікоў. У фондах запаведніка маецца рукапіс вучня Кадэцкага корпуса Грамбека, у якім апісаны ўражанні аб наведванні мошчаў у касцёле вучнямі праваслаўнага веравызнання [**8**, арк. 5].

Згодна з дакументамі Нацыянальнага гістарычнага архіва [**2**], у 1909 годзе ў крыпце касцёла пасярэдзіне на ўзвышшы стаяла адчыненая грабніца, у якой пад прутавай сеткай знаходзіліся мошчы Андрэя Баболі. Цела было пакрыта аблачэннем чырвонага колеру. Сама крыпта была ўпрыгожана чорным аксамітам, на якім мацаваліся маленькія абразы ці іншыя падарункі, якія вернікі прыносілі да Баболі. Перад мошчамі было размешчана распяцце. Вынікі катаванняў езуіта не выстаўляліся відавочна, але ж наведвальнікаў здзіўляў памер грабніцы — каля двух аршын. Малы памер грабніцы вернікі тлумачылі вынікамі бязлітасных катаванняў і знявечанняў езуіта.

У фондах запаведніка мы маем успаміны савецкага краязнаўцы Івана Дэйніса «Полацк у XX ст.»[**9**, арк. 27]. У дзіцячым узросце ён прысутнічаў на святах 23 мая ў Полацку. Ва ўспамінах ён таксама пацвярджае мнагалюднасць, святочнасць рэлігійных працэсій у горадзе ў гэты дзень. Пры гэтым звяртае ўвагу меркаванне Дэйніса аб тым, што ўлады Расійскай імперыі далі дазвол Полацкай епархіі на перанос мошчаў Еўфрасінні Полацкай менавіта ў сувязі з жаданнем узмацніць праваслаўную абшчыну ў Полацку і ураўнаважыць яе палажэнне з палажэннем каталіцкай полацкай дыяцэзіі. Сапраўды, больш за 100-гадовае знаходжанне мошчаў Андрэя Баболі ў Полацку зрабіла горад значным і

вядомым цэнтрам паломніцтва каталіцкіх вернікаў Расійскай імперыі. Іншая карціна была ў праваслаўнай епархіі. Ні будаўніцтва новых праваслаўных храмаў, ні дзяржаўная падтрымка духоўнай праваслаўнай адукацыі ў горадзе не прыносілі такіх значных вынікаў Полацкай епархіі.

Гэта зноў выклікала жаданне ўладаў пазбавіцца ад каталіцкай рэліквіі. Віцебскі губернатар ставіць пытанне перад дэпартаментам духоўных спраў аб пераносе мошчаў з Полацка ў маі 1909 г.[**2**] Былі падрыхтаваны грунтоўныя сакрэтныя матэрыялы, у якіх падрабязна апісвалася гісторыя культу Андрэя Баболі і сучасная сітуацыя сумешчанага святкавання праваслаўнымі і каталіцкімі вернікамі 23 мая ў горадзе. Падкрэслівалася недапушчальнасць хрэсных ходаў у адзін дзень на невялікай плошчы. Выказвалася перасцярога аб магчымых беспарадках, асабліва пасля чакаемага прыбыцця мошчаў Еўфрасінні Полацкай і святаў у Кафедральным Мікалаеўскім саборы. У дэпартамент духоўных спраў іншаземных споведаў быў зроблены зварот адносна распараджэння аб ліквідацыі культу мошчаў Андрэя Баболі ў Полацку і пераносе іх у Мінскую губерню альбо ў іншыя гарады Віцебскай губерні, такія, як Дрыса, Двінск, Рэжыца.

27 жніўня 1909 года па справе аб мошчах Андрэя Баболі на імя віцебскага губернатара прыйшоў адказ ад міністра духоўных спраў: «Адмовіць». «Такое распараджэнне мела б характар прымусу рымска-каталіцкай веры, што супярэчыла б Указу ад 17 красавіка і маніфесту 17 кастрычніка 1905 года» [**2**]. У Нацыянальным гістарычным архіве маецца арыгінал і іншага каштоўнага дакумента. 26 кастрычніка 1910 года міністр унутраных спраў Сталыпін сакрэтна «рэкамендуе ў Полацк пакінуць справу пераносу мошчаў Андрэя Баболі ў сувязі з пераносам мошчаў Еўфрасінні Полацкай» [**2**]. Распараджэнні былі выкананы, і мошчы Андрэя Баболі зноў былі пакінуты ў Полацкім касцёле.

Такім чынам, пасля 1910 года і пераносу ў Полацк мошчаў Еўфрасінні Полацкай горад становіцца значным цэнтрам паломніцтва як праваслаўных. так і каталіцкіх вернікаў. Каб пазбегнуць магчымых сутыкненняў, паліцэйскае кіраўніцтва забяспечвала парадак узмоцненнымі коннымі атрадамі. У горадзе рамантаваліся будынкі,

адчыняліся новыя гасцініцы, рэстараны, брукаваліся вуліцы. Знаходжанне ў Полацку дзвюх хрысціянскіх святынь безумоўна спрыяла хуткаму развіццю і аўтарытэту горада.

Сітуацыя змянілася пасля пачатку вайны і перамены ўлады.

Стаўленне бальшавікоў да царквы вызначалася варожасцю і адбывалася ў некалькіх накірунках: знішчэнне нелаяльных царкоўных дзеячаў, канфіскацыя царкоўных маёмасцяў і антырэлігійная прапаганда[**11**, с. 187–191]. Каталіцкі касцёл у Полацку заняў асобную пазіцыю да палітыкі ўрада і спрабаваў процістаяць уладам.

Ужо 29 чэрвеня 1921 года Полацкім рымска-каталіцкім камітэтам на паседжанні было праведзена абмеркаванне пытання аб ускрыцці мошчаў св. Баболі. На паседжанне былі запрошаны прадстаўнікі ўлады. Дазволу на раскрыццё мошчаў Андрэя Баболі ў 21 годзе не было атрымана [**10** ].

У сакавіку 1922 года на аб'яднаным паседжанні Полацкай павятовай камісіі па канфіскацыі каштоўнасцей з храмаў і малітоўных дамоў Павятовым камітэтам дапамогі галадаючым, прадстаўніком духавенства ад рымска-каталіцкай царквы, дэканам Бараноўскім Леанардам Мікалаевічам, не была прынята пастанова аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей. Дэканам была выказана асобная думка наконт дапамогі галадаючым і прапанавана заплаціць грошы ў 2-х разовым эквіваленце за касцельныя каштоўнасці [**10**].

Нягледзячы на гэта, атрады ГПУ арганізуюць у горадзе кампанію «Баявік», у якую ўваходзяць мерапрыемствы па канфіскацыі царкоўнай маёмасці ў асноўных цэрквах горада і раскрыццё мошчаў Еўфрасінні Полацкай і Андрэя Баболі [**11**, с. 187–191]. 10 мая 1922 года ў касцёле былі канфіскаваны срэбраныя каштоўнасці: крыжы, ордэн «Станіслава» і залатое сэрдца вагой 1 залатнік 72 долі золата. Агульная вага срэбраных рэчаў — 21фунт 21 залатнік 24 долі срэбра. Касцельны савет адмовіўся ад падпісання акта канфіскацыі [**10**].

23 чэрвеня 1922 года было праведзена раскрыццё мошчаў Андрэя Баболі спецыяльна створанай камісіяй, удзельнічаць у якой каталіцкае духавенства, полацкі дэкан і настаяцель полацкага касцёла Восіп Казіміравіч Дзямян і пробашч касцёла Восіп Станіслававіч Лук'янін адмовіліся [**13**, с. 90–94 ]. Замест каталіцкага духавенства на раскрыцці мошчаў Андрэя Баболі прысутнічаў настаяцель Мікалаеўскага сабора

Мікалай Пестман. Каталіцкі савет адмовіўся выдаць ключы ад апячатанай епіскапам Ропам грабніцы Андрэя Баболі. Камісія з прадстаўнікоў ГПУ і мясцовай улады вырашыла ўскрыць труну і правесці экспертызу. Агляд і экспертыза мошчаў праходзіла ў касцёле паўтары гадзіны. Нягледзячы на адсутнасць відавочнай фальсіфікацыіі ў труне з мошчамі, якую канстатаваў Пятро Восіпавіч Дэйніс, полацкі вучоны-археолаг, былы старшыня камісіі па ахове помнікаў старажытнасці і мастацтва, яны былі канфіскаваны ў царквы і праз 5 дзён — 28 чэрвеня 22 года — перададзены ў Маскву [**12**, с. 252].

Вестка аб раскрыцці мошчаў Еўфрасінні Полацкай і Андрэя Баболі выклікала пратэст веруючых, як у Полацку, так і за мяжой.

18 ліпеня 1922 года ноту пратэсту савецкаму ўраду зрабіла Польшча [**12**, с. 250]. У Полацку каталіцкае і праваслаўнае духавенства пачало праводзіць агітацыю і выказваць незадавальненне ўскрыццём мошчаў А.Баболі і Е.Полацкай, аб гэтым сведчаць сакрэтныя справаздачы ад 16 ліпеня 22 года Полацкага выканкама[**10**].

15 ліпеня 1922 года(праз 3 тыдні пасля раскрыцця мошчаў Андрэя Баболі) полацкія каталіцкія парафіяне павінны былі сустрэць вернікаў з Вульскага касцёла, каб разам зрабіць «хрэсны ход кругам плошчы Волі» ў Полацку. Менавіта ў гэты ж дзень, 15 ліпеня 1922 г., згодна з загадам № 130 Віцебскага губернскага выканаўчага камітэта ў павеце было аб'яўлена ваеннае становішча, якое існавала да канца года[**10**]. За гэты час былі праведзены арышты. Па справе «Аб мошчах благаславённага Андрэя Баболі» былі арыштаваны пробашч полацкага касцёла Лук'янін В.С. і дэкан Дземян В.К., якія былі расстраляны ў 1937 годзе.

У Маскве са снежня 1922 года мошчы Андрэя Баболі дэманстраваліся ў памяшканні папулярнай паказальнай выставы па ахове здароўя наркамздрава. Там яны былі зноў ускрыты маскоўскай камісіяй. У акце агляду, які быў праведзены 18 студзеня 1923 года, сярод іншага бало пазначана: «…каких-либо следов грубого механического насилия, могущих установить причину смерти покойного, на сохранившихся частях трупа не обнаружено» [**14**, с. 84–91]. Вынікі камісіі, якая праводзіла агляд мошчаў, фотаздымкі мошчаў Андрэя Баболі былі надрукаваны ў часопісах «Революция и церковь» і зборніку матэрыялаў «О святых мощах» і доўгі час час выкарыстоўваліся ў антырэлігійнай прапагандзе.

У Полацку разораны касцёл быў зачынены ў 1926 годзе. У жылых памяшканнях былога Дамініканскага манастыра існавала Польская школа. Напярэдадні вайны ў будынках, згодна з успамінамі жыхароў горада, была турма, у якой трымалі польскіх ваеннапалонных. Падчас вайны касцёл быў узарваны. Зараз на яго месцы сквер. Праз былую вуліцу Прабойную, з былой плошчы Волі, добра бачны сучасны будынак касцёла Андрэя Баболі, мелодыя званоў якога кожны дзень нагадвае пра гісторыю 114-гадовага знаходжання мошчаў святога Андрэя Баболі ў Полацку.

**Літаратура**

**1**. Кс. Феліцыян Палюшкевіч SJ Святы Андрэй Баболя: Рымакаталіцкі Касцёл на Беларусі. — (Дадзеныя із Інтэрнэта www.Catholic. ву).

**2**. Национальный исторический архив, ф.1430, оп.1, д. 47606, л. 8–13, 25, 26.

**3**. Викентьев В.П. Полоцкий кадетский корпус. Исторический очерк 75-летия его существования. — Полоцк. 1910.

**4**. Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. — Мн.: БелаЭн. 2000. — 216с.:іл.

**5**. Гарошка Леў А. Святая Еўфрасіння-Прадслава, Патронка Беларусі. — Мн.: Маст. літ. 1996.

**6**. Из Северо-Западного края. // «Прибавления к «Церковным ведомостям № 31». — С.-Петербург. Синодальная типография. 1907.

**7**. Паштоўка з выявай Дамініканскага касцёла. — (НПГКМЗ КП9 –5592/3).

**8**. Грамбек С.В. Воспоминания бывшего кадета Полоцкого корпуса. — Воронеж. 1966. Рукапіс.(НПИКМЗ КП5–2731/6).

**9**. Дейнис И.П. Полоцк в XX веке. (1905–1967 гг.). Машынапіс. (НПИКМЗ КП5–2774).

**10**. Учреждение «Зональный государственный архив г. Полоцка» — ф. 51, оп. 1, д. 128, л. 702; д. 91, л. 68; д. 129, с. 363; д. 40, л. 33, 34, 152, 126; д. 90, л. 28; д. 128, л. 702; ф. 54, д. 66, л. 145; д. 30, л. 152, 126.

**11**. Сяргеенка Н.А. Аперацыя «Баявік»: мерапрыемствы савецкай улады па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі мошчаў святых на Полаччыне на пачатку 1920-х г.//Проблемы славяноведения. Сборник научных статей и материалов. Выпуск 6. — Брянск, БГУ, 2004.

**12**. Гісторыя Беларусі: У 6т. Т.5. Беларусь у 1917–1945 гг./ А.Вабішчэвіч [і інш.] — Мн.: «Экаперспектыва», 2006. — 613 с.

**13**. Революция и церковь, №1–2, 1924.

**14**. О святых мощах. Сборник материалов. — М.: Госполитиздат, 1961.

# Праблемы і перспектывы выкарыстання некаторых турыстычных рэсурсаў Полаччыны ў экскурсійна-турыстычнай дзейнасці

**Усціновіч Юры Фёдаравіч,**
*аспірант*
*Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы*

*Пад Полаччынай, на думку аўтара, у дадзеным выпадку можна разумець, акрамя самога горада і Полацкага раёна, таксама яшчэ і асобныя аб'екты, якія сёння не ўваходзяць у Полацкую адміністрацыйную адзінку, але гістарычна звязаны з Полацкам і таму могуць быць уключанымі ў турыстычныя маршруты. Пад турыстычнымі рэсурсамі маецца на ўвазе сукупнасць прыродных і створаных чалавекам аб'ектаў для выкарыстання ў мэтах турызму. Прадстаўленыя ў гэтым артыкуле погляды і прапанаваныя для разгляду турыстычныя рэсурсы — гэта суб'ектыўны падыход аўтара, а таму выказаныя тут думкі не з'яўляюцца неаспрэчнымі.*

На сучасным этапе турызм, як міжнародны, так і ўнутраны, аказвае значны станоўчы ўплыў на развіццё эканомікі ў свеце. Дадзеная акалічнасць стала магчымай дзякуючы пераўтварэнню турызму з элітарнай у масавую з'яву. Працэс набыцця турызмам масавага характару пачаўся ў свеце пасля завяршэння Другой сусветнай вайны і працягваецца ў наш час [**1**, с. 9]. Праўда, у савецкія часы турызм на Беларусі не атрымаў значнага пашырэння. Для разумення сучаснага стану і ролі турызму ў Полацкім рэгіёне падаецца мэтазгодным сказаць некалькі слоў аб прычынах адзначанай з'явы.

Па-першае, на думку партыйнага кіраўніцтва рэспублікі, яе тэрыторыя не лічылася перспектыўнай для развіцця турызму [**2**, с. 205]. Як і не звярталася ўвага на каштоўнасць многіх культурна-гістарычных аб'ектаў. Яны падвяргаліся ці частковаму разбурэнню, ці поўнаму знішчэнню. Асабліва гэта датычыцца рэлігійных архітэктурных помнікаў. На жаль, Полацкі рэгіён таксама аказаўся падвергнуты адмоўнаму ўздзеянню адзначанай акалічнасці.

Па-другое, моцна разбураная падчас Вялікай Айчыннай вайны народная гаспадарка рэспублікі не мела ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе неабходных сродкаў для ўкладання ў паспяховае развіццё турыстычнай галіны. Таксама матэрыяльны ўзровень насельніцтва не спрыяў значнаму росту яго зацікаўленасці ў здзяйсненні турыстычных паездак.

Сітуацыя з развіццём турызму пачала змяняцца толькі ў 60-я гады XX стагоддзя. Найлепшым жа для развіцця агульнарэспубліканскага турызму стаў 1968 год [**2**, с. 217]. У першую чаргу гэта было звязана з поспехамі эканамічнага развіцця ў БССР. Аднак, уплыў турызму на эканоміку рэспублікі, у параўнанні з тагачаснымі сусветнымі тэндэнцыямі [**3**, с. 43], з'яўляецца мізэрным.

Цікавы той факт, што ў 1969 годзе па колькасці занесеных у дзяржаўны рэестр экскурсійных аб'ектаў Віцебская вобласць толькі нязначна саступала (усяго на два аб'екты) Мінскай вобласці. Помнікі архітэктуры, гісторыі, археалогіі, прыроды і непасрэдна музеі Віцебшчыны складалі амаль 21 % ад аналагічных аб'ектаў усёй рэспублікі [**2**, с. 218]. Значная частка помнікаў і музеяў з гэтай лічбы знаходзілася якраз у межах Полаччыны, што магло станоўча паўплываць на развіццё турыстычнай інфраструктуры рэгіёна пры спрыяльных акалічнасцях. Але застой у эканамічным развіцці ўсяго СССР хутка пачаў адбівацца і на развіцці турызму. Яго паказчыкі так і не перавысілі ў наступныя гады дасягненняў 1968 года.

З распадам СССР пачалося складванне нацыянальнай турыстычна-экскурсійнай сістэмы і зараджэнне турыстычнага бізнесу ў рэспубліцы. Агульнарэспубліканскія органы турыстычнай сістэмы і недзяржаўныя турыстычныя арганізацыі нашай краіны набылі сучасны выгляд ў 1996 годзе [**2**, с. 225].

Для паспяховага развіцця турызму неабходна мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка, без яе немагчыма забяспечыць яго ўстойлівае развіццё, якое не будзе наносіць шкоды прыродным рэсурсам, культурным і іншым каштоўнасцям, нацыянальнай эканоміцы і г.д. Але і залішняя дзяржаўная манаполія, груваcткасць заканадаўства, і неапраўдана высокае падаткаабкладанне не прывядуць да пастаяннага росту даходаў ад турыстычнай дзейнасці.

Кіраўніцтва рэспублікі ў апошнія гады звяртае пільную ўвагу на развіццё турыстычнай галіны. Аднак, спадчына, што засталася ад савецкіх часоў сучаснай нацыянальнай турыстычнай сістэме рэспублікі, мае шмат недахопаў. На выпраўленне гэтых недахопаў якраз і была скіравана Нацыянальная праграма развіцця турызму на 2001–2005 гады. А менавіта яна прадугледжвала развіццё ў Беларусі сучаснага высокаэфектыўнага і канкурэнтаздольнага турыстычнага комплексу рыначнага тыпу, які б забяспечваў задавальненне патрэб як айчынных, так і замежных грамадзян у турыстычных паслугах і значны ўклад турызму ў развіццё нацыянальнай эканомікі за кошт павелічэння колькасці працоўных месцаў, паступленняў ад падаткаў і замежнай валюты, захавання і рацыянальнага выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны [**1**, с. 103].

Паводле афіцыйных дадзеных, у выніку прадпрынятых захадаў план па аказанню турыстычна-экскурсійных паслуг за 2005 год выкананы на 137, 5 %. У 2005 годзе Беларусь наведала на 24 тысячы замежных турыстаў больш, чым у 2004 годзе. Павялічваецца ёмістасць і ўнутранага турыстычнага рынку. За 2005 год, упершыню ў гісторыі развіцця ўнутранага турызму, больш чым 50 тысяч грамадзян Беларусі абралі вандроўкі з начлегам па ўнутраных маршрутах [**4**, с. 3].

Сапраўды, пэўныя станоўчыя зрухі ў развіцці турызму на Беларусі сталі заўважанымі, але адзначаная праграма па развіццю турызму на 2001–2005 гады не была выканана па ўсіх параметрах. Як для рэспублікі ў цэлым, так і для Полаччыны ў прыватнасці, асобныя кампаненты турыстычнай інфраструктуры засталіся на нізкім, які не адпавядае не толькі міжнародным стандартам, але і запатрабаванням грамадзян нашай краіны, узроўні. Яшчэ неабходна ўдасканальваць і паляпшаць і прыдарожны сэрвіс, і гатэльнае абслугоўванне, і арганізацыю вольнага часу і адпачынку, і забеспячэнне эфектыўнага функцыянавання інфармацыйных сістэм.

У новай Нацыянальнай праграме па развіццю турызму да 2010 года прадугледжваецца павелічэнне прыёму замежных грамадзян больш чым у пяць разоў. Аб'ёмы планавых турыстычна-экскурсіўных паслуг павінны ўзрасці аж у чатырнаццаць разоў. Што датычыцца 2006 года,

то намечана павялічыць на 30 % колькасць замежных турыстаў у нашу краіну. У выкананні пастаўленых задач важная роля адводзіцца органам мясцовай улады [**4**, с. 3].

Нягледзячы на абнадзейваючыя заявы афіцыйных дзяржаўных колаў, многія прыватныя тураператары і турагенты дастаткова скептычна ацэньваюць сучасны стан і перспектывы развіцця турызму і яго інфраструктуры, асабліва што датычыцца ўязнога турызму. Праўда, некаторыя з іх усё ж адзначаюць, што набіраюць сілы тэндэнцыі на паляпшэнне сітуацыі. Але цяпер недасканаласць заканадаўства, падатковай сістэмы і бюракратызм ствараюць шмат перашкод для прыватнага турбізнесу, а пры выключнай дзяржаўнай манаполіі гаварыць аб паспяховым развіцці галіны будзе несправядліва. Агульныя настроі прыватнага турбізнесу прадэманстраваў дырэктар турыстычнай кампаніі «Знешінтурыст». На яго думку, у Беларусі ёсць што паказаць гасцям з замежжа, але з-за неразвітасці інфраструктуры іншаземныя турысты накіроўваюцца праз рэспубліку ў асноўным транзітам. У нашай краіне іх можна затрымаць толькі на 1–2 дні, дый толькі тады, калі адбываюцца пэўныя міжнародныя спартыўныя мерапрыемствы. Таму ўязны турызм, на жаль, існуе толькі па загаду. Дзяржава ўстанавіла норму для турыстычных фірм, каб каля 10 % ад іх кліентаў складалі замежныя турысты, і кампаніі ўсімі праўдамі-няпраўдамі імкнуцца яго абысці. Паказальным ёсць той факт, што даход, які турыстычная кампанія атрымлівае на ўязным турызме за год, на выязным яна можа атрымаць у разгар сезона пры ўдалых абставінах усяго за тыдзень. Пры гэтым няма патрэбы ўтрымліваць неабходны для прыёму замежных турыстаў штат супрацоўнікаў [**5**, с. 6].

Трэба адзначыць, што ў Полацку гарадскія ўлады і кіраўніцтва Полацкага музея-запаведніка мэтанакіравана займаюцца пытаннямі развіцця турыстычнай інфраструктуры. У снежні 2005 года была прынята доўгатэрміновая праграма развіцця Полацка як культурна-гістарычнага цэнтра Беларусі на 2006–2015 гады. Яна непасрэдна накіравана на пераадоленне недахопаў у турыстычнай інфраструктуры. Бліжэйшым планам праграмы з’яўляецца стварэнне сучаснага гатэльнага комплексу і сеткі аб’ектаў грамадскага харчавання. Прадугледжваецца зацікавіць у развіцці турыстычнай інфраструктуры горада

прадстаўнікоў дробнага бізнесу [**6**, с. 2]. Плануецца, што рэалізацыя гэтай праграмы дазволіць павялічыць колькасць турыстаў, што наведваюць Полацк, у два разы [7, с. 8].

Значным поспехам з'яўляецца тое, што расійскія турыстычныя фірмы запланавалі ўжо з 2006 года істотна павялічыць колькасць экскурсійных паездак у Полацк. Ледзьве не кожны год у апошнія часы ў горадзе адкрываюцца ці новы музей, ці новы помнік. Сёння ў Полацку налічваецца 12 музеяў. Самыя маладыя з іх — Прыродна-экалагічны і Дзіцячы. Апошні з адзначаных з'яўляецца адзіным музеем падобнага тыпу на Беларусі. У сродках масавай інфармацыі змешчана паведамленне, што плануецца яшчэ адкрыццё аднаго новага музея – Музея маці і, таксама, этнакомплексу пад адкрытым небам, які будзе называцца «Полацкім пасадам»[**6**, с. 2]. За год Полацк наведваюць больш як 220 тысяч гасцей [**8**, с. 5]. Найбольшай жа папулярнасцю сярод іх, калі прааналізаваць прапановы турыстычных кампаній, карыстаецца Сафійскі сабор, шмат турыстаў і паломнікаў прымае Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр. Іншыя музеі і экскурсійна-турыстычныя аб'екты горада, як правіла, наведваюцца на выбар.

Поспехі кіраўніцтва Полацкага музея-запаведніка былі адзначаны ў студзені 2006 года прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сёння Полацкі музей-запаведнік — гэта не проста стандартная ўстанова культуры, а адзін з лідэраў музейнай справы ў краіне. Нездарма ў лютым 2006 года была агучана ідэя аб наданні Полацку статуса горада-музея. І тут горад выступае піянерам, бо на Беларусі практыкі надання падобнага статусу гарадам яшчэ не існавала [7, с. 8].

Такім чынам, Полацк на дадзены момант валодае адным з найлепшых у краіне музейных патэнцыялаў. Па словах аднаго з карэспандэнтаў, немагчыма за адзін дзень азнаёміцца з усімі экспазіцыямі музеяў [7, с. 8].

Аднак у Полацку пераважае турыст аднаго дня. Не ў малой ступені гэта з-за таго, што у горадзе не прадугледжана для турыстаў задавальняючая розныя густы і ўзросты арганізацыя вольнага часу і адпачынку, не ў лепшым стане і функцыянаванне інфармацыйных сістэм, харчовае абслугоўванне, вельмі нізкая магчымасць горада ў прадстаўленні турыстам нумароў. Іх, як правіла, не хапае. Атрымліваецца, што каб упэўнена мець месца ў гасцініцы, турысту альбо турыстычнай

кампаніі, да якой ён звернецца, неабходна датэрмінова замовіць месца, але браніраванне месцаў павялічвае кошт паслуг адразу на 50 %. Гэта адна з прычын, чаму прыватныя полацкія турыстычныя кампаніі не зацікаўлены ў распрацоўцы шматдзённых тураў у Полацк і яго ваколіцы. Кошт падобных паслуг становіцца для кліентаў вельмі высокім, а таму не карыстаецца папулярнасцю. Аднак міжнародная практыка адваротная. Турыстычныя фірмы, што браніруюць месцы для сваіх кліентаў, могуць прадставіць ім нумары па зніжаных коштах. І ўвогуле, у міжнародным турыстычным бізнесе менавіта гатэльны сэрвіс дае 68 % ад усіх паступленняў [**1**, с. 215].

Супрацоўнік адной з полацкіх турыстычных кампаній пацвердзіў, што лічба турыстаў, жадаючых правесці колькі дзён у Полацку, вельмі нізкая, звяртаюцца яны за такой паслугай дастаткова рэдка. Таму і фірме гэта можа прынесці нязначны прыбытак. Да таго ж, каб праводзіць экскурсіі па горадзе, прыватная турыстычная кампанія павінна атрымаць спачатку дазвол у Міністэрстве спорту і турызму. Працэдура афіцыйнага надання дзяржаўных стандартаў, дзе дэталёва прапісваюцца маршруты экскурсій, вельмі працяглая і ўтрымлівае шмат непрыемных бюракратычных момантаў. Калі ж, напрыклад, з-за рамонту вуліцы экскурсію па ўстаноўленым маршруце правесці немагчыма, і фірма без чарговага ўзгаднення з Міністэрствам нават нязначна зменіць маршрут, яна парушыць заканадаўства з усімі выцякаючымі з гэтага наступствамі. Акрамя таго, згодна з сённяшнім заканадаўствам, прыватная турыстычная кампанія не мае права для ажыццяўлення турыстычнай дзейнасці наймаць экскурсавода па дамове, а павінна мець яго ў сваім штаце супрацоўнікаў. Але пры існуючай сітуацыі такая штатная адзінка будзе для фірмы стратнай. Прыведзеныя прыклады –гэта далёка не ўсе цяжкасці, якія павінна будзе пераадолець прыватная турыстычная фірма, якая паспрабуе заняцца развіццём унутранага і ўязнога турызму. Таму і аддаецца перавага гэтымі кампаніямі турызму выязному.

Характэрнай асаблівасцю развіцця сусветнага турызму стала кааперацыя. Гэта форма арганізацыі пастаянных эканамічных сувязей паміж спецыялізаванымі, але самастойнымі прадпрыемствамі па вытворчасці і арганізацыі турыстычных паслуг. У дадзеным выпадку працэсы кааперацыі выступаюць не як самамэта, а як сродак па-

вышэння якасці і прыбытковасці турыстычных паслуг [**1**, с. 74]. Па-іншаму склалася сітуацыя ў нас. Адзінага каардынацыйнага цэнтра, які б займаўся хаця б толькі абменам інфармацыі, у горадзе няма, а калі і пачаць яго ствараць на сучасным этапе, то існуе рэальная пагроза яго бюракратызацыі. Таму сёння асобныя ўстановы, да якіх звяртаецца турыст, працуюць, не каардынуючы сваю дзейнасць з іншымі. Не кажучы ўжо аб узгодненасці працы паміж турыстычнымі кампаніямі, музеямі, гасцінічнымі комплексамі, прадпрыемствамі транспарту і г.д., не заўсёды скаардынавана дзейнасць і паміж асобнымі ўстановамі культуры горада. Напрыклад, Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка таксама можа выклікаць зацікаўленасць у турыстаў, асабліва калі ўлічваць рост увагі ў наш час да асобных рамёстваў. У Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур рэгулярна праводзяцца выставы асобных майстроў, больш таго, наведвальнікі пры жаданні маглі б непасрэдна з дапамогай майстра азнаёміцца і паспрабаваць сябе ў якім-небудзь рамястве. У наш час гэта дастаткова папулярна сярод турыстаў. Але ў інфармацыйна-турыстычнай літаратуры аб Полацку звестак аб Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур не сустрэнеш.

Трэба ўлічваць, аднак, што з ростам патрабаванняў да турыстычнай інфраструктуры аднаго музейнага патэнцыялу будзе недастаткова. Турыстычны рынак Беларусі, нягледзячы на пэўныя праблемы, развіваецца. І з яго развіццём будзе ўзрастаць канкурэнтная барацьба паміж асобнымі турыстычнымі цэнтрамі. Барацьба за турыста можа быць паспяховай тады, калі не задавальняцца толькі тым, што Полацк з'яўляецца адным са старажытнейшых гарадоў, быў першай сталіцай на беларускіх землях, мае помнікі архітэктуры, пачынаючы ад XII стагоддзя, дванаццаць музеяў і шмат помнікаў. Сёння важна ўлічваць і прагназаваць зацікаўленасць і прыярытэты патэнцыяльных турыстаў, напрыклад, праз анкетаванае апытанне наведвальнікаў музеяў. І больш таго, скарыстоўваючы свае адметныя перавагі, фарміраваць гэтыя прыярытэты. Бо, як паказвае статыстыка, толькі 48 % кліентаў, што звяртаюцца да паслуг турыстычных кампаній, дакладна ведаюць, куды б яны жадалі адправіцца ў турыстычную паездку [**1**, с. 84]. Астатнія 52 % можна і неабходна пераўпэўніваць наведаць менавіта Полацк. На дадзены ж момант, як паказала апытанне ўдзельнікаў выставы «Турбізнес 2006», полацкі накірунак у сталічных турфірмах абірае

для здзяйснення экскурсійных паездак толькі каля 10 % мінчукоў. А замежны турыст, як правіла, рэдка выязджае за межы сталіцы для задавальнення турыстычна-экскурсійных патрэб. Часта ён увогуле не валодае інфармацыяй аб існаванні такога горада ў Беларусі, як Полацк.

Калі мець на ўвазе, што пачала актыўна развівацца інфраструктура як новых турыстычных цэнтраў, такіх, як спартыўна-аздараўляльныя комплексы «Лагойск» і «Сілічы», так і тых, дзе захаваліся замкі ці адбываюцца штогадовыя спецыялізаваныя фэсты альбо дзе для прываблівання турыстаў прыбеглі да іншых неардынарных падыходаў, то лічба асоб, што мэтай сваёй вандроўкі абяруць Полацк, можа паменшыцца. Паказальныя ў гэтым плане выказванні супрацоўніцы віцебскай турыстычнай кампаніі «Спадчына». Так, яна адзначыла пэўнае зніжэнне колькасці экскурсій з Віцебска ў Полацк і звязала гэта са з'яўленнем у Віцебску свайго аргана, а хутка будзе, па яе словах, устаноўлены і другі. Такім чынам, манаполія Полацка на жывую арганную музыку ў Віцебскай вобласці страчана.

Для паспяховай барацьбы за турыста, асабліва замежнага, можа адыграць станоўчую ролю рэалізацыя праекта, які быў прэзентаваны 22 верасня гэтага года у Мінску. Шведскія, латвійскія і беларускія тураператары зацікавіліся ў сумесным асваенні прыроднага патэнцыялу на Паўночнай Беларусі і стварэнні адметнага музейнага комплексу пад адкрытым небам [**9**].

Істотным пралікам, на думку аўтара, з'яўляецца тое, што да гэтага часу Полацк так і не стаў месцам правядзення штогадовых фэстаў сярэднявечнай культуры. Дзе ж іх праводзіць, як не ў самым старажытным на Беларусі горадзе? Рух прыхільнікаў рэканструкцыі сярэднявечнай культуры ў нашай краіне стаў набываць папулярнасць напрыканцы 90-х гадоў XX стагоддзя. Зараз ён як мае шмат прыхільнікаў, так і прыцягвае вялікую ўвагу турыстаў. Гэта паказалі праведзеныя фэсты сярэднявечнай культуры ў Навагрудку, Нясвіжы, Міры, Лідзе і г.д. Але каб арганізаваць падобны фэст у Полацку і зрабіць яго традыцыйным і рэгулярным, цяпер будзе патрабавацца значна больш высілкаў, як фінансавых, так арганізацыйных і разумовых, чым на самым пачатку XXI стагоддзя.

Яшчэ, падаецца, будзе станоўча ўплываць на абранне менавіта Полаччыны мэтай экскурсійна-турыстычнай вандроўкі ўвядзенне ў турыстычную сферу тых рэсурсаў, падрыхтоўка якіх да прымальнага ўзроўню не будзе звязана са значнымі фінансавымі затратамі.

Тут варта спыніцца на такім патэнцыйным аб'екце, як возера Янова. Ужо само па сабе возера, пры ўпарадкаванні берагоў і прылеглых тэрыторый, магло б стаць месцам масавага адпачынку. Больш таго, ля возера было выяўлена язычніцкае капішча. Рэканструкцыя язычніцкага капішча і ўпарадкаванне самога возера, з задачай уключэння яго ў кола экскурсійна-турыстычных рэсурсаў, не пацягне за сабой вялізных выдаткаў. Пры ўдалым вырашэнні задачы па стварэнні ля возера Янова новага турыстычнага аб'екта, ён мае ўсе шансы стаць унікальным, бо будзе спалучаць у сабе і прыродна-экалагічныя і культурна-гістарычныя рысы. Такі аб'ект будзе выглядаць прывабна і для ўнутранага, і для замежнага турыста.

З мэтай разгляду магчымасці ўключэння мясцін, звязаных з Інфлянцкай (Лівонскай ) вайной 1558–1582 гадоў, у экскурсійна-турыстычныя маршруты, аўтарам былі здзейснены экспедыцыі вясной 2006 года на тыя тэрыторыі Полаччыны, дзе пасля 1563 года ўзводзіліся маскоўскія замкі. У ходзе экспедыцый высветлілася, што месцы, дзе існавалі замкі, на сённяшні дзень не могуць зацікавіць турыстаў, бо не захаваліся самі фартыфікацыі, а месцы не маюць адпаведнай інфраструктуры. Аднак, праз вызначаныя тэрыторыі пралягаюць водныя турыстычныя маршруты, што набылі вядомасць яшчэ ў савецкія часы [**10**]. У выпадку ўзмацнення прапаганды воднага турыстычнага адпачынку на Полаччыне, стварэння баз, якія б забяспечвалі жадаючых неабходным турыстычным рыштункам, і ўсталявання шыльдаў на месцах існавання замкаў колькасць турыстаў у цёплы перыяд года магла б павялічыцца. А спыненне водных турыстаў у вёсках, што знаходзяцца побач з мясцінамі, звязанымі з пэўнымі гістарычнымі падзеямі, паспрыяе развіццю сельскага турызму, калі знойдуцца такія інтузіясты.

На Полаччыне не захавалася сярэднявечных фартэцый. Але ўзвядзенне якога-небудзь рэканструяванага драўлянага замка паблізу ад Полацка, звязанага з пэўным перыядам гісторыі, і падрыхтоўка ваколіцы для прыёму турыстаў на шматдзённы перыяд не патрабуе непамерных выдаткаў. Прыватны капітал пры спрыяльным заканадаўстве

і падаткаабкладанні ў стане арганізаваць такую справу. Існаванне турыстычна-гатэльнага комплексу ля Полацка ў выглядзе рэканструяванага замка значна ўзмацніла б магчымасці Полаччыны ў барацьбе за турыстаў. Такі комплекс можна стварыць, напрыклад, пры ўпадзенні ракі Тураўлянкі ў Заходнюю Дзвіну. Па-першае, у гэтым месцы ў другой палове XVI стагоддзя існаваў замак і захаваўся да нашых дзён яго план [**11**, с. 541]. Па-другое, комплекс будзе ў непасрэднай блізкасці ад Полацка. Па-трэцяе, прывабна выглядае навакольная прырода. Пачцвёртае, побач пралягае водны турыстычны маршрут.

Сёння па ўсёй Еўропе захоўваецца пастаянна высокі інтарэс да асобы Напалеона і падзей 1812 года. У сувязі з гэтым падаецца выгадным для далейшага паспяховага развіцця турыстычнай галіны ў Полацку распрацаваць турыстычныя маршруты, звязаныя з вайсковымі падзеямі на Полаччыне ў 1812 годзе. Але больш дэталёвыя прапановы могуць быць прадстаўлены толькі пасля правядзення даследавання на стан падрыхтаванасці і прыдатнасці асобных мясцін, напрыклад, у ваколіцах вёскі Клясціцы, для выкарыстання ў турыстычных мэтах.

Такім чынам, у нашы дні дзяржаўная ўлада звяртае пільную ўвагу на праблемы развіцця турызму, і некаторыя станоўчыя зрухі набіраюць сілу. Не ўсё, праўда, магчыма вырашыць толькі адміністрацыйна-каманднымі метадамі. Для паспяховага развіцця і павелічэння даходаў ад турыстычнай галіны важна забяспечыць прыход у гэтую сферу прыватнага капіталу. Тым не менш, турыстычны патэнцыял рэспублікі за апошнія гады значна павялічыўся. У такіх умовах будзе ўзрастаць і канкурэнтная барацьба паміж асобнымі экскурсійна-турыстычнымі комплексамі краіны. Полаччына валодае пэўнымі перавагамі перад іншымі цэнтрамі дзякуючы гістарычнаму аспекту, найлепшаму на Беларусі музейнаму патэнцыялу, прыродным рэсурсам. Важнымі застаюцца задачы па паляпшэнні турыстычнай інфраструктуры, у першую чаргу гатэльнага абслугоўвання, рэкламавання Полаччыны турыстычнай, асабліва за межамі Беларусі, пашырэння шэрагу неардынарных турыстычных рэсурсаў і г.д. Толькі тады Полацк можа заняць перадавыя пазіцыі ў турызме і будзе прыносіць выключную долю даходаў у гарадскі бюджэт.

**Літаратура**

**1**. Организация туризма: учеб. пособие / А.П. Дурович, Г.А. Бондаренко, Т.М. Сергеева и др.; под общ. ред. А.П. Дуровича — 2-е изд., испр. — Мн.: Новое издание, 2005. — 640 с.

**2**. Шаповал Г.Ф. История туризма. 2-е изд. — Мн.: РИВШ БГУ, 2002. — 256 с.

**3**. Экономика и организация туризма. Международный туризм.; И.А. Рябовой, Ю.В. Забаева, Ю.Л. Драчевой. М.: Изд-во «Кронус», 2005. — 576 с.

**4**. Лахманенка Л. Турызм – шанс для развіцця тэрыторый // Звязда. — 2006. — 2 сакавіка (№ 47–48). — С. 3–4.

**5**. Бортник И. Туризм в Беларуси // Экономическая газета. — 2005. — 25 октября (№ 81). — С. 6.

**6**. Телятко Е. Древний и вечно молодой // Народная газета. — 2006. —22 июня (№ 138). — С. 2.

7. Москаленко Г. Истоки Белой Руси // 7 дней. — 2006. — 16 ноября (№ 46). — С. 8.

**8**. Залесская С. Жемчужина земли белорусской // Белорусская нива. — 2006. — 11 апреля (№ 59). — С. 5.

**9**. Потемкин Ю. Из воряг в греки тысячу лет спустя / http:/ www.epolotsk.com/index/php/General news 2006-11-07.

**10**. Кокарев Ю.М. По рекам и озерам Белоруссии. 2-е изд. — М.: Физкультура и спорт, 1975. — 136 с.

**11**. Якімовіч Ю. Тураўлянскі замак./ Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т 6. Кн. 1: Пузыны — Усая / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 2001. — 591 с.: іл.

# Традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб прафілактыцы дзіцячых хвароб у дародавы перыяд

**Філіпенка Уладзімір Сяргеевіч,**
*старшы выкладчык*
*кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі*
*Полацкі дзяржаўны універсітэт*

Класічныя работы пачынальнікаў этнаграфічнага вывучэння Беларускага Падзвіння, а найперш М.Я. Нікіфароўскага, Ф.Л. Вярэнькі і А.А. Шлюбскага, змяшчаюць багацейшыя, але яшчэ недастаткова распрацаваныя ў айчыннай этналагічнай навуцы звесткі па традыцыйнай народнай медыцыне. Разам з сучаснымі палявымі фальклорна-этнаграфічнымі матэрыяламі, назапашанымі выкладчыкамі і студэнтамі Полацкага дзяржаўнага універсітэта на працягу 1995–2006 гг., яны ўтвараюць грунтоўную базу для даследавання традыцыйных уяўленняў беларусаў Падзвіння пра хваробы.

І класічныя, і зусім нядаўнія этнаграфічныя крыніцы пераканаўча сведчаць аб тым, што істотная частка хвароб, якія дыягнастуюцца і лекуюцца ў межах сістэмы народнай медыцыны, адносяцца або да выключна «дзіцячых», або з'яўляюцца надзвычай характэрнымі для дзяцей. Выяўленню найбольш адметных рысаў гэтых хвароб з пункту гледжання іх этыялогіі і прафілактыкі ў найбольш адказны, дародавы, перыяд і прысвечана дадзеная работа.

Як слушна заўважае слынны расійскі спецыяліст ў галіне традыцыйнай духоўнай культуры славян А.Я. Леўкіеўская: «само выкананне ўсіх прынятых у традыцыі рытуалаў, прадпісанняў і забаронаў, незалежна ад іх канкрэтнай семантыкі, ... можна разглядаць як абярэг» [**1**, с. 7]. Адным з важнейшых механізмаў забеспячэння здароўя дзіцяці і засцеражэння яго ад усялякай немачы з'яўляецца строгае пільнаванне роднымі яму людзьмі, і асабліва бацькамі, пэўнай сістэмы санкцыяваных грамадствам паводзін. Сапраўды, сучасныя палявыя матэрыялы даюць выдатныя ілюстрацыі перакананасці ў гэтым: «Хваробы не ад Бога. Хвароба можыць быць, як цярпенне за многа сваіх пакаленняў, каторыя рабілі дрэнна. Вот, каб Бог ім у патустароннім міры прасціў. Хвароба можыць быць, як цярпенне за сваіх блізкіх, нават знаёмых, каб іх выбавіць ад

зла» [**2**]; «Цяпер жа яны (бацькі — **У.Ф.**) нічога не прызнаюць, дзеці раджаюцца ўсе бальныя. Бацькі гарэлку п'юць, куруць, б'юцца… Вот і раджаюцца уроды. А тады самі б'юцца, душуцца… Ён родзіцца, а ў яго ўжо няма таго, што нада нармальнаму рабёнку» [**3**].

Няздольнасць жыць у ладзе з роднымі, суседзямі і аднавяскоўцамі магла наклікаць непрыемнасці на ненароджанае ці, часам, на яшчэ нават не «запланаванае» дзіця. Асабліва суровае пакаранне за асацыяльныя паводзіны бацькоў цягнула за сабой скрайняе абурэнне людзей старога веку (менавіта іх традыцыйнае грамадства надзяляе найбольшым аўтарытэтам і ўскладае на іх немалую долю адказнасці за падтрыманне гармоніі соцыуму, а значыць і ўсяго існага светаладу). «Я цебе яшчэ вот скажу, — адзначае паважаная знахарка з Шумілішчыны, — што маткам маладым нада чэсна сваіх дзяцейваспітываць. Калі стары чалавек скажа што благое, то такім тое дзіця і будзе: у нас у старых энергія сільнее. А еслі жэ мы падумалі, то не на ім, а на двенадцатым пакаленні дзеці будут рождацца з якой-небудзь ерундой» [**4**].

Негатыўныя наступствы для здароўя дзіцяці, напрыклад, магла мець непасрэдная абраза прадстаўнікоў сакральнай сферы: «…У майго дзядзькі, у аднаго, не гадаваліся дзеці. А не гадаваліся дзеці ў яго за тое, што жаніўся на Вербніцу — ў самый пост. Адна нядзелька да Вялікадня, а ён тут жаніцца!… І ў гэтага дзядзькі чацвёра дзяцей радзілася, усе чацвёра ўміралі. Ды ўміралі, хай Бог абнясець, страшнай смерцю, крычалі… І ўміралі гэдак дзеці, што ў жывога і вочкі павыкачваліся і ўсё» [3]. Асаблівая павага да святаў патрабавалася ад будучага бацькі, калі жанчына ўжо хадзіла «ў цяжку». Расплатай за блюзнерства, па перакананні вяскоўцаў, станавіліся фізічныя анамаліі ў немаўляці: «У нас так на Пятра было. Жонка бярэменная была у Самоўцы, у нас тут. І, ведаю, яго Іванам звалі. Ну, і ідзець сасед і гаворыць: «Што ты сягоньня робіш? Пятро (ж сёння — **У.Ф.**)!» А ён і гаворыць: «А я во рукі адсякаю». Радзіўся гэты малец, а ручкі, як адсечаныя. Былі і пальчыкі і ладонкі, але во дагэтуль» [**5**].

У этнаграфічнай навуцы даўно замацавалася думка, што ў традыцыйных уяўленнях усходніх славян нараджэнне дзіцяці разумелася як яго перавод з «таго» свету на «гэты» [**6**, с. 100]. Паколькі цяжарная жанчына (яе ўлонне) служыла для немаўляці злучальным мостам паміж небыццём і быццём, яднаючы свет людзей ды іншасвет, шкод-

ны ўплыў апошняга мог негатыўна адбіцца як на ёй самой, гэтак і на дзіцяці. І таму менавіта на будучую маці ўскладалася асноўная адказнасць не толькі за паспяховую «дастаўку» малога, але таксама за праграмаванне яго псіхічнага і фізічнага здароўя. З другога боку, памежнасць бія-сацыяльнага статусу будучай маладой маці (у падзвінскай тэрміналогіі другой паловы XIX ст. — «цяжарнай пярвосцінкі» [7, с. 2]), якая ўжо пакінула дзявоцтва, але, не нарадзіўшы, канчаткова не набыла трывалы статус жанчыны, выштурхоўвала яе на перыферыю «поля культуры» і набліжала да непрадказальнага і патэнцыйна небяспечнага «поля прыроды». Мінімізацыя негатыўных наступстваў гэтых непазбежных кантактаў, апрача іншага, патрабавала ад цяжарнай строгага пільнавання цэлага шэрагу прадпісанняў. Згодна з меркаваннем расійскай даследчыцы Т.Б. Шчапанскай, усіх іх яднае функцыя блакіроўкі любых дэструктыўных кодаў [**8**, с. 155].

У першую чаргу табуяваліся любыя асацыяльныя паводзіны, якія пагражалі парушыць у цяжарнай і без таго хісткі баланс паміж элементамі «свайго» і «чужога». Асабліва гэта датычылася абразы сакральных сфераў, а таксама сварак, лаянкі ды іншых формаў непаважлівага стаўлення да іншых людзей. Праца ў святочныя дні магла выклікаць ў дзіцяці неабарачальныя псіха-фізічныя парушэнні, непадуладныя як традыцыйным спецыялістам, гэтак і сучаснай афіцыйнай медыцыне: «Рабёнку можыць быць абы-што. Былі ўсякія бальныя дзеці, але яны нейкія бальныя і паміраюць. А цяпер, як і бальныя, лечуць іх, лечуць, а толку з іх няма» [**9**]. Да канца жыцця павінны былі, паводле падзвінскіх уяўленняў, «хадзіць пад сябе» дзеці матак, якія дазволілі сабе памачыцца на «свянцоным мейсцы» (на могілках, каля капліцы або крыжа) [**7**, с. 5]. Выліванне жанчынай «у цяжкэ» памыяў ды іншых непатрэбных вадкасцяў праз вакно (вакно=канал сувязі са светам продкаў, святых і багоў [**10**, с. 167–69]), па перакананні беларусаў Падзвіння, выклікала «блюванне» дзіцяці падчас кармлення [**7**, с. 5]. Строгая рэгламентацыя плявання ў традыцыйнай супольнасці ўвогуле, багата прадстаўленая як у класічных этнаграфічных крыніцах [**7**, с. 78], гэтак і сучасных палявых матэрыялах (напрыклад, фрагмент з народнай малітвы: «*Адам і Ева на зямлю сходзілі. Адам і Ева зямных благаславілі. Адам і Ева так прыказалі, штоб мы на зямлю не плювалі*» [**11**]), тым больш датычылася цяжарнай жанчыны. У парушальніцы прынятай нор-

мы паводзінаў нараджалася празмерна «слюнявае» дзіця [**3**; **12**], г.зн. нялюдскія паводзіны будучай маткі абумоўлівалі «жывёльны» выгляд малога (параўн. з некантраляваным слінавыдзяленнем у жывёл — кароў, свіней, сабак).

Калі, напрыклад, гэткая жанчына дражніла нямога, заіку, картавага, гугнявага або шапялявага чалавека, яе будучаму дзіцяці пагражалі тыя самыя парушэнні маўлення; «сіметрычнае» пакаранне чакала малое і ў выпадку дэманстрацыі маткай «віхляў» — здзеклівай імітацыі мімікі, жэстаў і паходкі [**7**, с. 3]. Асаблівую важнасць, згодна з народнымі уяўленнямі, падобнае табуяванне набывала на ранняй стадыі цяжарнасці: «У нас тут была жэншчына… так у яе была інвалітка дзевачка. Дык гаварылі, што хадзіла нейкая старчыха. Яна, бярэменная, пасмяялася з яе, дык у неё была дачка — не дай Бог якая! Дык цем более з такіх людзей нельзя смеяцца, да палавіны (тэрміну цяжарнасці), з палавіны ўжо...» [**13**].

Як адзначаў яшчэ крыху за стагоддзе таму М.Я. Нікіфароўскі, паўсюдна па Віцебскай губерні лічылася, што «вельмі карысна цяжарнай пазычацца», або «пазыка цяжарнай — каўдун» (г.зн. натуральная для яе стану прыхамаць). Хаджэнне «ў пазыкі» павінна было станоўча адбіцца і на ходзе цяжарнасці, і на родах, а адмова ад выканання яе просьбы нават пагражала гаспадарам стратай таго, што яна прасіла, праз выкраданне, псаванне мышамі або пажар, [**7**, с. 5]. Сучасныя палявыя этнаграфічныя матэрыялы сведчаць аб заканчэнні эры гэтулькі ідылічных дачыненняў. На думку вяскоўцаў, мышы ўсё адно атакуюць хату, куды прыйшла цяжарная-просьбіт, як бы ні надумаў паступіць гаспадар: даць [**14**] або адмовіць [**13**]. Таму людзі старога веку пераконвалі і працягваюць пераконваць жанчын «у цяжкэ» ўстрымлівацца ад пазыкаў. У адказ на нанясенне непазбежнай шкоды гаспадар мог папсаваць яе яшчэ ненароджанае дзіця. Звычайна рабілася шкода тварыку дзіцяці: «Еслі нет, не дасі, тады нада: яна пашла — па парогу секлі. Трылупы палучаецца дзяцёнак. Губа рассечана, заяча губа» [**15**]. Гэткія ж вынікі магла мець звычайная сварка: «Адна жыла ў Вухвішчах, помню, я яшчэ дзеўкай была. Там баба была ў палажэнні і завялася з аднэй бабай. Яна выхадзіла, а тая ўзяла перасекла парог… І радзіла з рассечанай губою. Радзіўся як заяц — разьбітая губа» [**13**].

Паколькі дзверы ў народных уяўленнях атаясамліваліся з ротам [**16**, с. 91] і, як вынік, парог — з вуснамі, то нанясенне па ім удару, згодна з прынцыпамі імітацыйнай і кантактнай магіі, павінна было адбіцца менавіта на вуснах малога. З іншага боку, таксама магчыма разглядаць залежнасць шкоданоснага механізму засякання ад факту пераступання («засвечвання») цяжарнай жанчынай парога. Згодна з дадзенымі М.Я. Нікіфароўскага, на Падзвінні ліхадзей мог секануць і па іншых драўляных аб'ектах, праз якія пераступіла жанчына: па бервяну, калодзе або палене. Лічылі, што ў гэтых выпадках дзеці нараджаліся з пасечанымі вуснамі або вушамі, бяспалымі або з лішнімі пальцамі [7, с. 4].

Цяжарнай трэба было сцерагчыся кідання ў яе нядобразычліўцамі і адкрытымі ворагамі неядомых прадметаў і рэчываў (дзіця будзе іх есці), і яшчэ больш — распаленым жалезам, вуглямі, галаўнёй, лучынай ці нават «сярнічкамі» (запалкамі): малое будзе пакутаваць на «вогнік» (хваробу, што праяўляецца як запаленне скуранога покрыва) або на прастудныя захворванні (таксама запаленчы працэс) [7, с. 8].

Стаянне ці хаджэнне (г.зн. таксама «засвечванне») жанчыны «ў цяжкэ» на «пілувінах» (апілках, што застаюцца пасля пілавання) з часам павінны былі выклікаць у дзіцяці «рызбчку» (вострыя болі ў страўніку, а магчыма, адзін з мясцовых варыянтаў хваробы «грызь») [7, с. 4]. У іншым выпадку пераступанне магло звязвацца са з'яўленнем у малога «вадзянкі» — вадзяністай пухліны: «Раней драніцы дралі і кліны такія рабілі дзеравянныя. Гэта вот, і я, мусіць, не замеціла і перашагнула гэты клін. А як бярэменная ходзіш, гэта дзяцёнку ўліяіць, асобенна ў первай палавіне (цяжарнасці — **У.Ф.**). Перашагнеш кліны... і вот адно ядзёрачка (яічка) добрае, а другое, як вадзіцай набегшы» [**17**]. Да сур'ёзных наступстваў, на думку беларусаў Падзвіння, прыводзіла наступанне на крывыя прадметы (хамут, абручы, дуга, палоззі) – дзіця абавязкова стане гарбуном [7, с. 4]. У этналагічнай літаратуры, аднак, падкрэсліваецца пазнейшы характар падобнага ўяўлення. Як можна меркаваць, першапачаткова ўважаўся за небяспечны толькі кантакт з прадметамі, што мелі непасрэднае дачыненне да каня — хтанічнай істотай, звязанай са светам памерлых [**18**, с. 96].

Паўсюдна на Падзвінні лічылася вельмі непажаданым сядзенне цяжарнай жанчыны на камяні. У адпаведнасці з логікай кантактнай магіі, гладкасць яго перадавалася малому: «Ужо як у палажэнні была, бярэменная… Ну і калі-небудзь сяду на камень… Бабкі казалі мне: «Няльзя садзіцца на камень!» Ну і вот, дзевачка ў мяне радзілася. І вы прадстаўце – цэлы год не было валасоў на галаве! А можа, каб я болей садзілася, можа б саўсём не выраслі, не знаю» [**19**].

Парушэнне гастранамічнага этыкету — ежа і піццё ўпоцемках (цяжарная нібыта блытала дзень і ноч) — спараджала падобную, але ўжо хваравітую ў сваіх праявах часавую дэзарыентацыю дзіцяці — «начніцы» [7, с. 6]. Есці з посуду, у якім гатавалася ў печы ежа, не дазвалялася з тае прычыны, што ў малога чарнявай, нібыта закурадымлены гарнушок або латка, будзе скура, асабліва на твары [7, с. 6]. Сімвалічная блізкасць цяжарнай да «таго» свету, якая магла праяўляцца ў сувязі (узгаданая вышэй магчымасць «прывесці» ў хату мышэй) і паважлівым абыходжанні з хтанічнымі жывёламі (забарона забіваць змей [**20**]), абумоўлівала табуяванне спажывання зайчаціны: «Ну ўсё можна есці, толька кроме зайчыны гэтай нельзя. А то касыя рабяты будут» [**13**].

Акрамя таго, будучай маці строга забаранялася апранаць мужчынскае адзенне. Парушэнне прадпісання пагражала дзіцяці пераменай полу, што на позняй стадыі цяжарнасці магло выклікаць яго двухполасць [7, с. 5–6].

Скрайне непажаданымі для здароўя дзіцяці былі любыя псіхаэмацыйныя ўзрушэнні маці ў перыяд яе цяжарнасці. Найперш гэта датычылася моцнага пярэпалаху. «З упуду» малое магло захварэць на прыпадак (эпілепсію): «У нас у дзярэўні загарэлася, была, хата тут… Як прабегла, а ў мяне ж рабёнак, я ж яшчэ бярэменная была! Як спужалася з гэтым рабёнкам! І ўсё — радзіўся ў мяне такі слабенькі, худзенькі, сразу тады... Чатыры месяца ў мяне пабыў, і стала ў няго «дзецкая» (эпілепсія — **У.Ф.**). Дзе мы ня ездзілі, дзе не хадзілі, загаварвалі. Сказалі мне, што ён памрэць. І памёр, чатыры месяца было і памёр» [**21**]. У «лепшым» выпадку «з упуду» цяжарнай маткі дзіця магло стаць картавым або заікам [7, с. 8]. Лічылася небяспечным для нармальнага развіцця і здароўя дзіцяці залішняя ўвага («зазіранне») з боку цяжарнай да люд-

зей з цялеснымі адхіленнямі (кульгавых, сляпых, сухарукіх ды інш., а таксама карлікаў і веліканаў). Моцнае ўражанне ад убачанага магло правакаваць узнікненне адпаведнага недахопу ў малога [7, с. 3].

Адмоўнае ўздзеянне на дзіця маглі аказаць таксама інстынктыўныя рухі цяжарнай, выкліканыя яе скрайнім нервовым узбуджэннем. Як слушна адзначае Т.Б. Шчапанская: «варта ўлічваць непадзеленасць псіха-саматычнага комплексу ў народных уяўленнях» [**8**, с. 154], а таму на сімвалічным узроўні нервовы жэст быў ідэнтычным перапуду і, значыць, падвойваў негатыўны эфект адчутага. Дотык з перапуду да свайго цела адбіваўся на целе ў малога: «Сабака калі спужае, няльзя во гэдак чапаць. Пятакі такія ў малога. Да! Чорныя» [**22**]; «Ну, на пажар калі глядзіш – гэта нічога. Але нельга датрагавацца да свайго цела. Калі глянеш на пажар і схопісься за ліцо, то застаюцца точна пальцы. Красныя. І яны ўжо радзімыя называюцца. А мама мая ня верыла ў гэта… І ўзяла сябе за кумпячок так рукой. І точна: усе гэтыя пяць пальцаў адбіліся ў малыша на жопцы» [**23**]. (У літаратуры таксама выказваецца цікавая думка пра магчымую сувязь табуявання пажару для цяжарнай з прычыны ўспрыняцця агню — праз далёкія адгалоскі старажытнага абраду трупаспалення — у якасці атрыбута смерці [**8**, с. 154]).

Эмацыйная напружанасць, непазбежная пры візуальным кантакце з памерлым чалавекам, асабліва з родным ці знаёмым, ужо сама па сабе павінна была накладаць на цяжарную пэўныя абмежаванні. Акрамя таго, ёй не раілі падоўгу глядзець на нябожчыка для прадухілення ў дзіцяці «бледнай немачы» («бледны будзець» [**14**]) або жаўцізны («Гаворят: «Не сматрі ты на яго! А то рябёнак будзе жоўты, як этат (памерлае дзіця — **У.Ф.**) рябёнак» [**24**]). Цікава адзначыць, што, паводле звестак М.Я. Нікіфароўскага, табуяванне залішняй увагі да нябожчыка носіць абсалютны характар, сучасныя ж палявыя матэрыялы сведчаць пра яго адноснасць: «Ну, гаворать, на пакойніка есьлі (паглядаць — **У.Ф.**), то абязацельна нада ў красным платку ілі кофта штоб красная… А есьлі ўжо пойдзеш (на могілкі — **У.Ф.**), ну, бываець жа родсцьвеннік. Ну так, нада, каб што-та краснае было» [**14**]. Адзенне чырвонага колеру як сімвала жыцця і здароўя павінна была нейтралізаваць негатыўнае ўздзеянне. Асцярожнасць у дачыненні нябожчыка як сімвалічнага ўвасаблення замагільнага свету знаходзіла свой працяг у шэрагу іншых

прадпісанняў цяжарнай, напрыклад, у забароне падоўгу глядзецца ў ваду і люстэрка — каналы сувязі паміж «гэтым» і «тым» светам. Іначай, дзіця магло нарадзіцца касавокім [7, с. 3].

Яшчэ адзін выпадак актыўнага выкарыстання традыцыйнай супольнасцю вестытатыўнага (г.зн. звязанага з вопраткай) коду як абярэгу – рэкамендацыя цяжарнай жанчыне апранаць на вечарыны, асабліва на вяселле, дзе існавала рэальная пагроза «сурокаў» («урокаў»), парную колькасць любога прадмета адзення (дзве хусткі, два паясы, дзве спадніцы і г.д.). У адваротным выпадку дзіця магло нарадзіцца з няпарнымі органамі або часткамі цела (вочы, вусны, рукі, ногі і г.д.) [7, с. 6]. (Для засцеражэння ад «ліхога вока» выкарыстоўвалі таксама іншыя абярэгі, напрыклад, нашэнне на адзежы шпількі).

Маргінальнасць бія-сацыяльнага статусу «цяжарнай пярвосцінкі», згодна з уяўленнямі беларусаў Падзвіння, выклікала да яе прыхільнае стаўленне хатняй, асабліва сабак, кошак, курэй, і нават лясной жывёлы (ваўкоў, мядзведзяў, дзікоў і змеяў) [7, с.2]. Аднак небяспека пераходу тонкай грані паміж зонай «свайго» (акультуранага і чалавечага) і «чужога» (прыроднага і жывёльнага) дыктавала асаблівую асцярожнасць цяжарнай пры падобных кантактах. Яшчэ й сёння, напачатку XXI стагоддзя людзі старога веку практычна ў адзін голас сведчаць пра тое, што анамальная валасатасць немаўлятаў звязана з неасцярожнасцю іх матак: «А гэта жэншчыне нада бярэменнай хадзіць спакойна, акуратна. Не нада ні ката каршнёй кавырацъ, нікога. А тады між плеч (малога) увідзіш, гэту поўстачку, і яна яму муліцца» [**17**]. Неспакойныя паводзіны ўначы ў дзяцей часта тлумачацца інфарматарамі менавіта казытаннем кацінай або сабачай «шарosткай» – гэта «нашніцы» [**25**], «крактуны» [**26**; **27**] або «крыктуны» [**28**]. Бяссонніца і моцны крык, у сваю, чаргу, маглі выліцца ў грыжу/»грызь», калі малое «накрычыць пуп» (паўсюдна на Падзвінні). І калі гэтым хваробам яшчэ можна было даць рады, і яны з часам адступалі, то ў некаторых выпадках празмерная валасатасць была ўжо невылечнай: «У С-не дзьве сястры жывуць. У адной барада расьцець. Гэта матка хадзіла ў палажэньні і біла катоў» [**27**]. Апрача таго, пашкодзіць здароўю дзіцяці мог і непасрэдны кантакт будучай маткі з хтанічнымі жывёламі. Лічылася, што прычынай

«астуды» (хутчэй за ўсё, дысфункцыя пячонкі – яна больш не «пячэ» ежу, бо «астужаная») і «гузы пад пахамі» было пранікненне да грудзей цяжарнай мышы або яшчаркі [7, с. 4].

Падсумоўваючы сказанае вышэй, трэба канстатаваць наступнае:

**1**. Згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў Падзвіння, важнейшым фактарам, што абумоўліваў здароўе дзіцяці, былі прыстойныя паводзіны яго бацькоў і нават дзядоў. Грубае або сістэматычнае парушэнне імі прынятых у грамадстве нормаў і, асабліва, знявага вышэйшых сілаў асуджала дзіця на калецтва і хваравітасць.

**2**. Строгае пільнаванне цяжарнай жанчынай, асабліва цяжарнай упершыню і падчас першай паловы тэрміну, прадпісаных традыцыяй правіл паводзінаў павінна было засцерагчы дзіця ад валасатасці (у т.л. «крактуноў» і «начніц») або недахопу валасоў, усемагчымых парушэнняў цялеснага складу (заечае губы, касавокасці, гарбатасці, бяспаласці і г.д.), некантраляванага слінааддзялення і мочаспускання, збою біялагічнага гадзінніка («начніцаў»), гермафрадытызму, хваробаў унутраных органаў («астуды», «разачкі», «вадзянкі»), пухлін («вадзянкі», «гузоў») анамаліяў скуры («бледнай немачы» і жаўцізна) ды інш. Найчасцей хваробы, што здараліся ў дзяцей, праяўляліся ў скажэнні чалавечага фізічнага аблічча і людскіх паводзінаў.

**3**. Недапушчэнне ў дзіцяці эпілепсіі (падучай або «дзецкай» хваробы), парушэнняў маўлення (картавасць і заіканне), чорных і чырвоных радзімых плямаў і нек. інш. хвароб патрабавала абароны цяжарнай ад псіха-эмацыйных ўзрушэнняў, асабліва ў сувязі з пярэпалахам («упудам»).

**4**. Для прадухілення непапраўных фізічных адхіленняў дзіцяці ў выніку шкоднага ўздзеяння «ліхога вока» («урокаў», «сурокаў») патрабавалася выкарыстання цяжарнай жанчынай прадметаў-апатрапеяў.

**Літаратура**

**1**. Левкиевская Е.Е. Славянский оберег. Семантика и структура. — М.: Индрик, 2000. — 336 с.

**2**. Запісана В.Каралём у 2005 г. ад Гажынскай Я., 1939 г.н., у в. Лявошкі Браслаўскага р-на.

**3**. Запісана аўтарам у 2006 г. ад Рудзёнак З.А., 1932 г.н., у в. Матырына Ушацкага р-на.

**4**. Запісана аўтарам у 2005 г. ад Верам'ёвай Н.Р., 1925 г.н., у в. Амбросавічы Шумілінскага р-на (нарадзілася і жыла да Чарнобыльскай катастрофы ў Краснасельскім р-не Магілёўскай вобл.).

**5**. Запісана У. Лобачам у 2002 г. ад Клопавай Е.Я., 1915 г.н., у в. Судзілавічы Ушацкага р-на.

**6**. Валодзіна Т.В. Мифоритуальный и этнолингвистический аспекты народной медицины белорусов: эпилепсия // Studia Litteraria Polono-Slavica, 6: Morbus, medicamentum et sanus — Choroba, lek i zdrowie. SOW, Warszawa, 2001, С. 99-108.

**7**. Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии. — Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. — 307 с.

**8**. Щепанская Т.Б. Пронимальная символика // Женщина и вещественный мир культуры у народов России и Европы (Сборник МАЭ, т. XLVII) / Сост. Л.С.Лаврентьева, Т.Б.Щепанская. — СПб.: Петербургское Востоковедение, 1999. — С. 149–190.

**9**. Запісана У. Лобачам у 2006 г. ад Сазонавай Н.У., 1934 г.н., у в. Пышна Лепельскага р-на.

**10**. Байбурин А.К. Жилище в обрядах и представлениях восточных славян. — 2-е изд., испр. — М.: Языки славянской культуры, 2005. — 224 с.

**11**. Запісана У. Лобачам і І. Пашкевічам у 2006 г. ад Шпет Н.А., 1936 г.н., у в. Слабада Докшыцкага р-на.

**12**. Запісана аўтарам у 2006 г. ад Свірко К.І., 1929 г.н., у в. Саланевічы Полацкага р-на.

**13**. Запісана Ю. Пракоф'евай і А. Халадковай у 2006 г. ад Смаляк І.М., 1934 г.н., у в. Старына Ушацкага р-на.

**14**. Запісана аўтарам у 2006 г ад Рудзёнак А.І., 1937 г.н., у в. Матырына Ушацкага р-на.

**15**. Запісана У. Лобачам і А. Халадковай у 2006 г. ад Зяленік Н.М, 1928 г.н., у. в. Качаны Ушацкага р-на.

**16**. Валодзіна Т.В. Чалавек і яго цела ў мове і культуры// Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т.В. Валодзіна, А.І. Гурскі, Г.А. Барташэіч, К.П. Кабашнікаў; Навук. рэд. А.С. Фядосік. — Мн.: Бел. навука, 2004. — С. 89–102.

**17**. Запісана У. Лобачам у 2006 г. ад Красковіч Г.Р., 1930 г.н., у в. Федаркі Докшыцкага р-на.

**18**. Маховская И.С. Классификация запретов дородового комплекса родиной обрядности (на материале восточноевропейской родиной обрядности) // Славяне и их соседи: Археология, нумизматика, этнология / Под ред. А.А.Егорейченко. — Мн.: Веды, 1998. — С. 95–99.

**19**. Запісана аўтарам у 2006 г. ад Кучко Я.І., 1938 г.н., у в. Быстрыца Полацкага р-на.

**20**. Запісана У. Лобачам у 2006 г. ад Падгол Н.В., 1936 г.н., у в. Царкавішча Ушацкага р-на.

**21**. Запісана У. Лобачам у 2006 г. ад Тарасевіч Яўгеніі Раманаўны, 1935 г.н., у в. Заазер'е Ушацкага р-на.

**22**. Запісана У. Лобачам у 2003 г ад Капуста Р.У., 1923 г.н., у в. Галенчына Мёрскага р-на.

**23**. Запісалі А. Курныш і В. Наважылава ў 2003 г. ад Палуевай Н.А., 1926 г.н., у в. Іст Мёрскага р-на.

**24**. Запісана аўтарам у 2005 г. ад Абалок Е.А., 1926 г.н., у в. Арлея Полацкага р-на.

**25**. Запісана І. Дабрахвалавай у 2002 г. ад Пяцюль Галіны Сямёнаўны, 1934 г.н., у в. Быкаўшчына Полацкага р-на.

**26**. Запісана А. Халмоўскім у 2002 г. ад Вацьковіч Любові Іванаўны, 1931 г.н., у в. Слабада Ушацкага р-на.

**27**. Запісана аўтарам у 2006 г. ад Пятровай А.І., 1931 г.н., у в. Надазер'е Полацкага р-на.

**28**. Запісана В. Волкавым і М. Сямашка ў 2003 г. ад Папковай А.М., 1930 г.н., у в. Гарадзішча Полацкага р-на.

# Школьны краязнаўчы музей «Мінулае Залесчыны»: дзейнасць, грамадскія сувязі і выхаваўчае ўздзеянне

**Шарыпкін Рыгор Леанідавіч,**
*кіраўнік гісторыка-краязнаўчага музея «Мінулае Залесчыны»*
*Залеская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа*

Напэўна, не трэба лішні раз гаварыць аб тым, якое вялікае выхаваўчае ўздзеянне і грамадска-патрыятычнае выхаванне закладзена ў самой сутнасці выразу «Школьнае краязнаўства і школьны краязнаўчы музей». Ідэі развіцця, арганізацыі, удасканалення школьнай краязнаўчай плыні на Беларусі з кожным годам рухаюцца ўсё далей і глыбей, а сам сэнс дзейнасці вучнёўскіх краязнаўчых гурткоў на базе школьных музеяў стаў настолькі ўсеабдымным, глабальным і духоўна неабходным, што даўно ўжо выспела патрэбнасць: краязнаўства, школьнае музеязнаўства павінны быць уключаны ў склад школьных вучэбных праграм, і павінен існаваць падручнік па краязнаўству.

Ну, а пакуль гэта мары і надзеі, хочацца проста падзяліцца вопытам нашай краязнаўча-даследніцкай працы, расказаць пра дзейнасць школьнага музея і вучнёўскага краязнаўчага гуртка, пра нашы мары і імкненні ў вялікай і неабсяжнай плыні пад назваю « Краіна Краязнаўства»...

Лучайская базавая школа Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, прадстаўніком якой з’яўляўся я да канца жніўня 2006 года, размешчана ў надзвычай маляўнічым і багатым на мінуўшчыну куточку Глыбоччыны — на тэрыторыі Залескага сельскага савета, або, як мы гаворым, — на Залесчыне. Наша дзевяцігадовая школа, на вялікі жаль, знаходзілася ў ліку малакамплектных і бесперспектыўных на будучае вясковых школак. На май 2006 года колькасць навучэнцаў складала 36 дзяцей. Асноўны накірунак выхаваўчай дзейнасці ў школе на працягу апошніх 15 гадоў быў, напэўна, самым пачэсным і духоўна неабходным для дзяцей — грамадзянска-патрыятычнае выхаванне сродкамі школьнага краязнаўчага музея і вучнёўскага краязнаўчага гуртка. З 1-ага верасня 2006 года Лучайская базавая школа спыніла сваё існаванне і зачынілася. Мы — настаўнікі і дзеці — зараз працуем і вучымся ў Залескай сярэдняй школе. Ідэя выхавання дзяцей сродкамі краязнаўства і

школьнага краязнаўчага музея не згасла. Краязнаўчы гурток дзейнічае, ну а музей «Мінулае Залесчыны» пакуль што яшчэ застаўся ў сценах ужо былой Лучайскай базавай школы; ён лічыцца філіялам Залескай СШ (пакуль мы не знайшлі памяшкання для размяшчэння экспазіцый). І таму я крыху раскажу Вам пра гісторыю нашай музейнай дзейнасці, якая, вядома, будзе прадаўжацца. Першы музейны этнаграфічны куток быў створаны і адкрыты ў школе 22 лютага 1992 года. Краязнаўчы музей «Мінулае Залесчыны» адчыніў свае дзверы 23 лютага 1999 года. Трэці музейны пакой «Музей Старой Кнігі» адкрыўся 23 лютага 2002 года. Усе тры музейныя пакоі былі аб'яднаны адной назвай — Цэнтр Культуры і Асветы. Паколькі так атрымалася, што дні ўрачыстага адкрыцця гэтых пакояў супалі, то дзень 23 лютага на Залесчыне прынята лічыць Днём Краязнаўства. Школьны краязнаўчы гурток «Наша Спадчына» мае свой герб і гімн.

Дзейнасць школьнага краязнаўчага музея ва ўмовах працы вясковай школы для нас — акенца ў найцікавейшы свет сапраўднай духоўнасці. Вучні-гурткоўцы не абмяжоўваюцца толькі простым зборам экспанатаў, для іх пошук, вывучэнне, рэстаўрацыя, размяшчэнне рэчаў даўніны сталі сэнсам дзіцячага жыцця. Можна сказаць і так, што абмежаванасць культурнага выхавання на вёсцы, асабліва ў недабранадзейных сем'ях, кампенсуецца дзіцячай краязнаўча-даследніцкай дзейнасцю. Ёсць цікавасць, непадробнае захапленне краязнаўствам, прага да нязведанага, імкненне да ведаў, урэшце , рамантыка... А гэта і ёсць выхаванне грамадзянскасці, патрыятызму, павагі да спадчыны.

Існаванне школьнага краязнаўчага музея дае шырокія магчымасці для самаадукацыі вясковых дзетак, для выхавання самастойнасці і фарміравання асобы. Заняткі краязнаўчага гуртка асабліва цікавяць дзяцей ва ўзросце 10-13 гадоў. Тэмы заняткаў адкрываюць ім вочы на дагэтуль невядомыя старонкі краязнаўчых дысцыплін: тапаніміка, геральдыка, этнаграфія, нумізматыка, баністыка, археалогія, фалерыстыка... Працуе «Школа юнага экскурсавода», дзе вучні набываюць першасныя навыкі вядзення экскурсіі па школьных музейных пакоях, вучацца самастойнасці пры працы ў краязнаўчым музеі. Экскурсіі, вандроўкі, выязныя пошукі невялікіх вучнёўскіх экспедыцыйных груп, візіты з

дзіцячымі рэпартажамі да старажылаў, ды і проста цікавыя сустрэчы-гутаркі з мясцовымі людзьмі - гэта тое, што так неабходна дзіцячаму, яшчэ не сапсаванаму маральна, сэрцу.

Дзейнасць школьнага краязнаўчага музея была б няпоўнай і непрадуктыўнай, калі б абмяжоўвалася выключна толькі зборам экспанатаў ды іх размяшчэннем на паліцах. Для таго, каб узняць аўтарытэт нашых мясцін, прыцягнуць увагу грамадскасці раёна, аднавіць багацце мінуўшчыны Залесчыны хай не ўзнаўленнем закінутых помнікаў гісторыі і культуры (гэта мы зрабіць не ў сілах ), а летапісным зборам фактаў і падзей, намі паступова, крок за крокам даследаваліся і вывучаліся ўсе магчымыя гістарычныя кропкі на тэрыторыі Залескага сельсавета. І на сённяшні дзень мы маем распрацаваны і дзеючы турысцка-краязнаўчы маршрут «Мінулае Залесчыны». Ён налічвае восем гістарычных аб’ектаў, сярод якіх можна ўзгадаць гарадзішчы жалезнага веку каля вёсак Запруддзе і Зубкі, графскі пейзажны парк сярэдзіны ХІХ стагоддзя, сядзібу роду Корсакаў-Аскеркаў-Молле ў в. Залессе-Астроўна, Мамчыну горку, апетую ў аднайменнай паэме Міхася Машары, Свята-Пакроўскую царкву ў в. Бушыкі, камень Язэпа Драздовіча. Заканчваецца гэта падарожжа па гісторыі Залесчыны наведваннем музейных пакояў у памяшканні былой Лучайскай базавай школы, дзе матэрыяльная і духоўная культура нашых мясцін паўстае ўвачавідкі — у выглядзе сабраных і адшуканых экспанатаў. Рэальны і канкрэтны крок для прапагандавання нашай спадчыны на сёння — гэта рэкламны турысцка-краязнаўчы каляровы буклет «Глыбоччына турыстычная. Залесчына», выпушчаны восенню 2005 года.

Можна прыгадаць і выпушчаныя ў рэгіянальным друку для грамадскасці краязнаўча-публіцыстычныя кніжачкі аб нашых мясцінах. Гэта — «Гісторыя Залескага маёнтка» (2000 г.) і «Гісторыя Залескага краю» (2002 г.). Змест гэтых брашур — вынік даследніцкай дзейнасці нашага краязнаўчага гуртка і школьнага краязнаўчага музея; гэта выніковая праца не магла б здзейсніцца, калі б мы працавалі ў адзіноце, адасоблена. Вось дзе закладзена яшчэ адна галоўная асаблівасць школьнага краязнаўства: яно павінна заўсёды быць на віду, ва ўзаемасувязі з іншымі навучальнымі ўстановамі, з каардынацыйнымі цэнтрамі краязнаўчай работы ў раёне, вобласці, рэспубліцы, з дзяржаўнымі музеямі і архівамі, з мясцовымі краязнаўцамі і аматарамі-даследчыкамі...

І сёння хочацца выказаць вялізную падзяку за творчыя сувязі і метадычную дапамогу і падтрымку Глыбоцкаму гісторыка-этнаграфічнаму музею, Падсвільскай турысцка-краязнаўчай базе, Глыбоцкаму раённаму міжзанальнаму архіву. Магутны творчы ўздым у школьнай краязнаўча-даследніцкай працы заўсёды выклікае дзейнасць Віцебскага абласнога аб'яднання па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі (аддзел беларусазнаўства, кіраўнік — Куржалаў А. В.). Дзякуючы ім краязнаўчыя пошукі, творчыя праекты, конкурсныя распрацоўкі гурткоўцаў Залескай школы становяцца шырока вядомымі на Віцебшчыне. А дастойны ўдзел у раённых і абласных конкурсах папулярызуе гістарычную спадчыну Залесчыны далёка за межамі Глыбоцкага раёна.

Грамадскія сувязі даюць нам магчымасці для творчых сустрэч і практычна-выніковых дзеянняў. Так адбывалася, калі пад кіраўніцтвам археолага Мядзведзева А. М. з Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Беларусі былі праведзены грунтоўныя археалагічныя раскопкі гарадзішчаў жалезнага веку ля вёсак Зубкі і Запруддзе. Прымалі ўдзел у іх вучні нашай школы; упэўнены, што для вясковых дзяцей гэта былі незабыўныя ўражанні. Ці прыгадаю візіт у нашы мясціны дырэктара Цэнтральнага батанічнага сада, акадэміка Рашэтнікава У. М. для азнаямлення са станам захаванасці пейзажнага парку ў Залессі — Астроўна і вывучэння матэрыялаў па гісторыі Залескай сядзібы ў школьным музеі.

Краязнаўчыя адкрыцці не такія ўжо і гучныя, але іншы раз здаецца, што невялікае даследаванне з удзелам нашых гурткоўцаў можа атрымаць вялікі рэзананс у межах рэспублікі. Прыгадаю такое адкрыццё дзяцей з Лучайкі, калі ў лясным урочышчы Цатоўка быў адшуканы старадаўні камень з крыжам, аб якім пакінуў свае ўражанні ў «Дзённіку» Язэп Драздовіч. Знаходка каменя Драздовіча дазволіла пашырыць краязнаўчы маршрут па Залесчыне яшчэ на адну гістарычную кропку. Аб гэтай падзеі паведаміў шэраг абласных і рэспубліканскіх газет. Паглядзець на камень Драздовіча прыязджалі даследчыкі з Мінска Ігар і Ірына Марачкіны. Плэнэр мастакоў Віцебшчыны праходзіў па Глыбоччыне і ў Шаркоўшчыне, за гонар яны палічылі прыехаць і да гэтага звычайнага каменя.

Прыезд навуковых супрацоўнікаў Беларусі на Глыбоччыну заўсёды ляжыць і праз дарогі-шляхі Залесчыны. Прыгадаю візіт прафесара Гарбацкага А. з Брэсцкага педуніверсітэта з мэтаю даследавання жыцця і культуры залескіх староверау. Або экспедыцыйны прыезд з Акадэміі Навук Беларусі фалькларыста Сівіцкага з мэтаю збору і запісу мясцовых паданняў, абрадаў, замоваў і знахарскіх сакрэтаў. Гэта былі найцікавейшыя сустрэчы і сумесныя вандроўкі-рэпартажы па нашых вёсках.

Удзел у рэспубліканскіх конкурсных праектах у краязнаўчым накірунку прыносіў іншы раз не толькі граматы і падзякі (гэта не галоўнае ), а прызнанне на высокім узроўні значымасці і важнасці нашай дзейнасці ў справе адраджэння спадчыны сваёй малой Радзімы. А ведаеце, які гонар для вучняў маленькай вясковай школы з Глыбоцкай «глыбінкі» — атрымаць у рэспубліцы дыпломы лаўрэатаў-пераможцаў за лепшы праект краязнаўчага маршруту «Мінулае Залесчыны», як гэта здарылася ў 2004 годзе... Вясковыя дзеці ўспрымаюць такую ацэнку іх даследніцкай дзейнасці як нешта неверагоднае, а потым гонар за свой музей і свой гурток штурхае іх на далейшыя пошукі і новыя адкрыцці.

Можна сказаць без перабольшвання, што існаванне ў школах краязнаўчых музеяў мае вялікае будучае. Будучае гэта заключаецца ў простай сутнасці: без беражлівых адносін да мінулага, даследавання, захавання і прапагандавання каштоўнасцей нашай спадчыны сродкамі школьных краязнаўчых музеяў мы не зможам выхаваць сапраўдных патрыётаў Беларушчыны. А сучаснае школьнае краязнаўства паказвае і даказвае: у нас ёсць магутны духоўны патэнцыял у школьнай краязнаўчай плыні, ён увесь час развіваецца і прагрэсіруе.

Апошні выязны рэспубліканскі семінар-падарожжа кіраўнікоў школьных музеяў па гістарычных мясцінах Валожыншчыны, на якім пашчасціла пабываць і мне, і маім шаноўным калегам-краязнаўцам з Віцебшчыны, паказаў, якое велізарнае духоўнае багацце зберагаецца ў краязнаўчых музеях устаноў адукацыі, якія таленавітыя дзеці займаюцца краязнаўствам, і, нарэшце, на якім дабрачынным энтузіязме і грамадзянскім сумленні нашых педагогаў трымаецца гэта магутная краіна — «Краіна Краязнаўства».

У канцы красавіка 2006 года на VII рэспубліканскіх краязнаўчых чытаннях педагагічных работнікаў у г. Магілёве прагучаў даклад пра дзейнасць краязнаўчага школьнага музея «Мінулае Залесчыны». Нашы здабыткі на ніве школьнага краязнаўства сталі шырокавядомымі для беларускай грамадскасці. Сёння мы ўдзячны старажытнаму і слаўнаму Полацку за тое, што ў рабоце гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі знайшлося месца для асвятлення дзейнасці нашага школьнага музея. Багатая гісторыя Залескага краю, старажытныя карані вёскі Залессе (якая вядзе свой летапіс з сярэдзіны XIV стагоддзя ) — неад'емная частка мінуўшчыны ўсіх нашых вёсак і гарадоў, з'яднаных адной назвай - Беларусь. І наша агульная справа — збіраць, захоўваць спадчыну нашых продкаў, ганарыцца ёю і шанаваць яе...

... Так было, так ёсць, так і будзе !

# Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі
(да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея)

Укладальнік
**Краско** Вольга Давыдаўна

Адказны за выпуск: *І.П. Воднева*
Карэктар: *В.Я. Ашуева*
Дызайн вокладкі: *В.У. Гаўрылаў*

Фармат 70х100 $^{1}/_{16}$. Папера «Data Copy».
Гарнітура «Arno Pro», «Times New Roman», «Arial».
Друк лазерны. Тыраж 50 экз.

Макетаванне і друк выкананы на абсталяванні
навукова-інфармацыйнага аддзела
Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
211400, г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 22



Полоцкъ.—Polock. № 4
Нижне-Покровская улица.